# Беларуская літаратура

*Білеты ў пытаннях і адказах*
*11 клас*

2-е выданне, перапрацаванае і дапоўненае

Мінск
ООО «Юніпрэс»
2002

УДК 882.6(075.4)
ББК 84(4Беи)я729 В36

Верціхоўская М.І.

Беларуская літаратура: Білеты ў пытаннях і адказах: 11 кл./М.І. Верціхоўская — 2-е выд., перапрац. і дап. — Мн.: ТАА «Юніпрэс», 2002. — 304 с.

ISBN 985-6660-96-3.

Кніга ўяўляе сабой адзін з варыянтаў адказаў на пытанні білетаў выпускнога экзамену па беларускай літаратуры за курс сярэдняй школы.

Канцэпцыя літаратурнай адукацыі патрабуе, каб аналіз мастацкага твора здзяйсняўся назіраннем і ўсведамленнем тых мастацкіх прыёмаў, якімі твор напісаны. Аўтар ставіў сваёй мэтай рэалізаваць асноўныя патрабаванні школьнай праграмы і канцэпцыі літаратурнай адукацыі.

УДК 882.6(075.4)
ББК 84(4Беи)я729

ISBN 985-6660-96-3

© Верціхоўская М.І., 2002
© ТАА «Юніпрэс», 2002

## Ад аўтара

У кнізе акцэнтуецца ўвага выпускнікоў на самае канцэптуальнае ў творчасці пісьменнікаў, на адметнасць стылю і творчую манеру кожнага творцы, на самабытнасць і непаўторнасць яго таленту і ўклад кожнага ў скарбонку нацыянальнай і сусветнай культуры.

Калі пытанне білета датычыцца канкрэтнага мастацкага твора, то ў адказе твор аналізуецца: вызначаецца ідэя, цэнтральная праблема і мастацкія сродкі, якімі ідэя рэалізуецца, а праблема вырашаецца.

Калі ж пытанне білета патрабуе характарыстыкі вобразаў, то вызначаецца ідэя вобразаў, іх назначэнне і роля ў выражэнні ідэі твора і тых мастацкіх прыёмаў, якімі вобраз ствараўся.

Такі аналіз скіроўвае выпускніка на ўсведамленне твора як факта мастацтва, а мастацкага вобраза як найважнейшага сродку ў рэалізацыі ідэі твора і выяўленні пісьменніцкай канцэпцыі і філасофіі.

Выпускнік заўважыць адрозненне пры аналізе лірычных, эпічных і драматычных твораў, што абумоўлена спецыфікай літаратурных родаў і жанраў

Аўтар імкнуўся дапамагчы пазбегнуць тыповай памылкі тым выпускнікам, якія свой адказ на пытанне білета зводзяць да пераказвання зместу эпічных і, як гэта нярэдка бывае, нават лірычных твораў, што наогул недапушчальна. Элементы пераказу могуць і павінны быць пры аналізе эпічных твораў ці пры характарыстыцы вобразаў, але толькі мэтавыя: для аргументацыі пэўных высноў, меркаванняў.

Канцэпцыя літаратурнай адукацыі патрабуе, каб аналіз мастацкага твора здзяйсняўся назіраннем і ўсведамленнем тых мастацкіх прыёмаў, якімі твор напісаны. Аўтар ставіў сваёй мэтай рэалізаваць асноўныя патрабаванні школьнай праграмы і канцэпцыі літаратурнай адукацыі.

Пры аналізе кожнага твора, характарыстыцы вобразаў асаблівы акцэнт зроблены на сучаснасць праблем, якія ставяцца ў творы, на эстэтычную і выхаваўчую функцыі і твораў, і вобразаў. У кнізе рэалізавана спроба сучаснага прачытання твораў школьнай праграмы, а таксама аналізуюцца многія творы найноўшай літаратуры.

Аўтар спадзяецца, што кніга не толькі дапаможа выпускнікам добра падрыхтавацца да экзамену па беларускай літаратуры, але і паспрыяе духоўнаму сталенню моладзі. Асабліва вялікі спадзеў на тое, што кнігу прыхільна сустрэнуць настаўнікі. Аўтар будзе шчыра ўдзячны сваім шаноўным калегам за водгукі і канструктыўныя заўвагі.

# Білет № 1

## 1. Тэматыка і асноўныя вобразы творчасці Францішка Багушэвіча. Трагічны пафас твораў аб жыцці беларускага сялянства

Быў ён адным з высакароднейшых людзей, якія служылі нашай зямлі...

*Э. Ажэшка*

Францішак Багушэвіч — яркая постаць у гісторыі беларускай літаратуры XIX ст., перакананы дэмакрат, заступнік народа, якому слугаваў словам і справай. У трагічныя моманты гісторыі ён стаў на абарону народа, прыняў актыўны ўдзел у паўстанні Кастуся Каліноўскага і ў часы рэпрэсій больш за 20 гадоў вымушаны быў жыць за межам! роднага краю, але і на чужыне здолеў, як ніхто іншы, паслугаваць Бацькаўшчыне. Яго заслугі перад нашай нацыяй нельга пераацаніць: ён — заснавальнік крытычнага рэалізму ў беларускай літаратуры, першы буйны нацыянальны пісьменнік, выразнік дум і памкненняў народа.

Ніхто да яго з такой мастацкай сілай не здолеў паказаць «на свет цэлы» і веліч, высакароднасць працоўнага чалавека, і яго трагедыю. Імя той трагедыі — рабства. У вершы «Чаго бяжыш, мужычок?», напісаным у форме дыялога, пытанняў і адказаў, што асабліва спрыяе рэалізму, паэт сцісла і пераканаўча паказаў усе выявы рабства (холад, голад, п'янства, прыніжэнне, абставіны, што правакуюць чалавека на ганебнае і грахоўнае):

*Чаго бяжыш, мужычок?*
*— Падганяе мароз.*
*Чамуляжыш, мужычок?*
*— Бо урадніка вёз.*
*Чаго ты п 'еш, мужычок?*
*— Бо і хлеба не еў.*

Аднак ва ўсіх сваіх творах і ў гэтым у прыватнасці паэт паўстае перад намі не толькі як таленавіты летапісец і страсны абвінаваўца бесчалавечных абставін, але і як філосаф. Паказаўшы ўсе жудасныя выявы рабства, ён папярэджвае нас, што самая страшная з усіх — рабская псіхалогія, сутнасць якой — у здольнасці прыніжацца і адначасова прыніжаць іншых, тых, хто яшчэ слабейшы за яго самога:

*Чаго ты б'еш, мужычок?*
*— Бо і сам тое меў.*

Зло спараджае толькі зло, папярэджвае нас пісьменнік.

Вялікая каштоўнасць творчасці Ф.Багушэвіча для нас сёння не толькі ў тым, што паэт-філосаф пераканаўча паказаў, як не павінна быць, якія наступствы могуць мець для чалавека нялюдскія абставіны, але найперш у тым, што стварыў эстэтычны ідэал чалавека.

Сваё маральна-эстэтычнае крэда Ф.Багушэвіч выявіў праз лірычнага героя верша «Ахвяра», які для сябе акрэсліў тыя прынцыпы, што вызначаюць сутнасць чалавека. На думку лірычнага героя, той і чалавек, хто, жывучы на гэтай зямлі, за яе, калі спатрэбіцца, «умерці гатоў»; хто ўмее з людзьмі жыць па-людску; хто валодае пачуццём уласнай годнасці, гэта значыць, не прыніжаецца і не прыніжае («каб прад меншым я носа не драў, а прад большым не корчыў спіны»), Сапраўдны чалавек, на думку паэта, гэта найперш добры сем'янін, верны муж сваёй жонцы («Чужых жон каб не вёў да граху, а сваю каб як трэба любіў»), добры бацька для сваіх дзяцей, для якіх ён — прыклад: толькі пры такой умове дзеці бацьку будуць «у слуху». Так ёміста, сцісла і вобразна паэт нагадаў нам асноўны прынцып народнай педагогікі: бацькі — «навукай прыклад» для сваіх дзяцей.

Свой эстэтычны ідэал чалавека паэт увасобіў і ў эпічных вобразах паэмы «Кепска будзе!» — Аліндарку і айчыме, надзяліўшы іх самымі лепшымі нацыянальнымі якасцямі беларуса. Чалавечую вартасць сваіх герояў пісьменнік выпрабоўвае бесчалавечнымі абставінамі, і яны з гонарам вытрымліваюць гэтыя выпрабаванні. Разам са сваімі героямі пісьменнік-філосаф дае нам урок перамогі над злом. Увасобленыя ў багушэвічаўскіх героях дабрыня, людскасць, удзячнасць, цярпенне і настойлівасць, усведамленне волі як найвялікшай чалавечай каштоўнасці былі сілай, мацнейшай за бесчалавечныя абставіны. Хто верыць і ідзе да сваёй свабоды, той абавязкова яе здабудзе.

У творчасці Ф.Багушэвіча вылучаюцца тры ўзаемазвязаныя асноўныя тэмы: паказ сацыяльнага становішча беларускага народа; патрыятычная; прызначэнне і роля мастацтва ў жыцці народа. Творы на гэтыя тэмы складаюць змест яго асноўных зборнікаў «Дудка беларуская» (выдадзены ў 1891 г. у Кракаве пад псеўданімам Мацей Бурачок) і «Смык беларускі» (выдадзены ў 1894 г. у Познані пад псеўданімам Сымон Рэўка з-пад Барысава).

Адметнай асаблівасцю творчасці Ф.Багушэвіча з'яўляецца яе фальклорная аснова. Фальклорныя рэмінісцэнцыі (пазычанні) у лірыцы паэта прысутнічаюць не толькі на ўзроўні сюжэтаў (так, верш «Гора» напісаны паводле народнай песні «А я ў горы не радзілася — само гора прыкацілася»), вобразаў, але і на ўзроўні тых жа мастацкіх сродкаў: алегорыі, сімвала, паўтораў, паэтычных народных параўнанняў і эпітэтаў. Гора ў аднайменным вершы паэта — фантастычная істота,

нейкая пачвара, ад якой немагчыма пазбавіцца. I ўсё ж пры ўсім паэт здолеў дасягнуць парадаксальнага эфекту: верш не гучыць песімістычна. Гору як невынішчальнай пачвары супрацьстаіць багушэвічаўскі герой, надзелены дзейсным, настойлівым характарам.

Верш «Гора» напісаны ў форме маналога-споведзі селяніна пра змаганне з гэтым невынішчальным цмокам. Селянін яго і ў рэчку кідае, і ў полымя-агонь, і да пня прывязвае, і ў зямлю закопвае, і нават адвозіць у Амерыку, — усё дарэмна. Верш сатырычны, у ім чуецца іронія, насмешка селяніна з свайго гора, якое не дае яму жыць, але і зламаць не можа. Чалавек іранізуе і са свайго становішча, а пакуль чалавек на такое здольны — ён непераможны. Ды і надзея ў героя ёсць, што вечна так не будзе, што ўдасца яму «заспяваць вясёла».

Адчуваецца, што маналог-споведзь — улюбёная аўтарам форма адлюстравання жыцця, бо, сапраўды, надзвычай эфектыўная: ніхто лепш пра свае пакуты не раскажа, чым сам пакутнік. I настрой у багушэвічаўскага героя мяняецца: ад іранічнага да бунтоўна-абуральнага, як у вершы «Бог не роўна дзеле». Іронія перарастае ў сарказм, здзіўленне — у гнеў, нянавісць, абурэнне бесчалавечнымі абставінамі. Такія абставіны не маюць права на існаванне, бо той, хто працуе, не можа «прыкрыцца хоць анучкай», а хто балюе — «ходзе у саеце, у золаце з плеч да ног». Выяўленню пісьменніцкага абурэння і непрыняцця такога ладу жыцця спрыяе не толькі гіпербалічнае супрацьпастаўленне, але і лексічныя сродкі — антонімы: «адзін — другі», «золата, саеты — бруд, латы».

Наступная адметная асаблівасць паэзіі Багушэвіча — палымяная публіцыстычная пафаснасць. Многія вершы маюць адзнакі публіцыстычных жанраў: верша-прамовы («Не цурайся»), верша-фельетона («Як праўды шукаюць»). А вось для выяўлення свайго разумення дарэформеннага і паслярэформеннага перыядаў гісторыі, што адрозніваюцца толькі формамі прыгнёту, паэт выдатна выкарыстаў у вершы «Быў у чысцы» і публіцыстычныя, і сатырычныя сродкі, і біблейскія рэмінісцэнцыі. Апісаўшы прыгоды і назіранні свайго героя, што трапіў у чысцец пасля смерці, Багушэвіч афарыстычна выявіў сваё разуменне тых змен і «палёгкаў» для народа, што адбыліся пасля адмены прыгону. Аксюмаранам «не надта свабодна ў гэтай свабодзе» вынес ён канчатковы прысуд і ладу, і тым, хто яго такім зладаваў.

Творчасць Ф.Багушэвіча вызначаецца і яго грамадзянскім усведамленнем ролі духоўнага ў жыцці народа. Якім павінна быць мастацтва? Каму павінен служыць мастак? Гэтай праблеме прысвечаны алегарычны верш «Мая дудка». У вобразе дудкі ўвасоблена паэзія і мастацтва наогул, у вобразе дудара, народнага музыкі — творца.

Вялікую ролю ў выражэнні ідэі твора і пісьменніцкай канцэпцыі адыгрывае кампазіцыя верша. У першай яго частцы расказваецца пра спробы дудара змайстраваць «вясёлую» дудку «ад жалю, ад смутку». Але такая не зайграла: «Га! Чаму ж не йграеш?!» У другой частцы расказваецца, як дудар зрабіў такую дудку, «каб зямля стагнала... каб слязьмі прабрала». І дудка зайграла... Ідэя верша — у апошніх афарыстычных радках: «Як крыві не стане, тады скончу гранне». Творца павінен жыць жыццём народа: разам з ім і весяліцца, і пакутаваць. Творца павінен падзяліць са сваім народам яго лес — такое разуменне Багушэвічам ролі і прызначэння мастака ў грамадстве. Вершы «Мая дудка» і «Смык» — праграмныя, адзін і другі адкрываюць зборнікі паэта.

«Бацькава, спрадвечная, святая, Богам дадзеная адзежа душы чалавека», — так вобразна, афарыстычна выявіў Багушэвіч свае разуменне ролі і сілы роднага слова ў «Прадмове» да «Дудкі беларускай». І па сённяшні дзень гэты твор — узор публіцыстыкі, пераканаўчы прыклад уздзеяння на розум і пачуцці тых, што хочуць людзьмі звацца. Пераканаўча і доказна даводзіць сваім чытачам палкі патрыёт Багушэвіч, што любоў да мовы ёсць адно з праяўленняў патрыятызму. Сваё ўсведамленне неабвержнага закону вечнасці «пакуль жыве мова — жыве народ» ён сфармуляваў у звароце да кожнага з нас: «Не пакідайце ж мовы нашай беларускай, каб не ўмёрлі». І эпітэты «святая, Богам дадзеная» — гэта не проста мастацкі прыём, а напамін усім нам, што святое — гэта тое, што мы не выбіраем (у сваім выбары мы можам і памыліцца), а што даецца нам ад нараджэння ці нараджаецца намі: нашы бацькі, радзіма, дзеці. І Мова як «святыня народа, бяссмерце яго». Здрада святому — недаравальны грэх.

## 2. Аповесць Васіля Быкава «Знак бяды», яе ідэйны змест. Вобразы Петрака і Сцепаніды

> Адно з самых недаравальных злачынстваў сталіншчыны — ліквідацыя традыцыйнай хрысціянскай маралі, спрадвечнай сістэмы элементарных жыццёвых правілаў.
>
> *В. Быкаў*

Алесь Адамовіч назваў аповесць «Знак бяды», напісаную ў 1982 г., самай антываеннай з усіх быкаўскіх твораў, бо тут вайна выкрываецца вачыма, ацэнкай тых, каму яна заўсёды здавалася такой дзікай і бесчалавечнай. У адрозненне ад цэнтральных герояў

папярэдніх быкаўскіх твораў галоўныя героі аповесці «Знак бяды» Пятрок і Сцепаніда не з'яўляюцца ні салдатамі, ні партызанамі, ні падпольшчыкамі. Але вайна прымушае і іх зрабіць свой выбар. Выпрабаванне герояў сітуацыяй выбару — адметная асаблівасць творчасці Васіля Быкава, верным якой, як і праўдзе жыцця, ён застаецца заўсёды.

Перамежаваны паказ сучаснага і мінулага характэрны для творчасці В. Быкава. Гэтым прыёмам дасягаецца глыбокі псіхалагізм твора. Быкаў не мог здрадзіць сабе і няўмольнай ісціне: усё мае свае вытокі, нічога выпадковага не бывае; наперакор жыццю і самым складаным абставінам Чалавек застаецца верным сабе і сваім маральным прынцыпам.

Аднак назначэнне рэтраспекцый (зварот у мінулае) у гэтым творы не толькі дзеля матывацыі ўчынкаў герояў і дасягнення псіхалагізму.

Па словах Васіля Быкава, «адно з самых недаравальных злачынстваў сталінчшыны — ліквідацыя традыцыйнай хрысціянскай маралі, спрадвечнай сістэмы элементарных жыццёвых правілаў, звычайна не надта паважанага, але нязменнага ў жыцці здаровага сэнсу. Некалі імі ў поўнай меры валодаў народ, цяпер жа не валодае ніхто».

Назначэнне рэтраспекцый — паказаць заканамернасць і сувязь паміж звёнамі сталінізму і фашызму ў адным ланцугу бязмерных пакут беларускага народа. Масавы генацыд, разбурэнне гнёздаў, калечанне лёсаў, давядзенне людзей да адчаю, крах веры, ідэалаў... Разрываюцца самыя моцныя сувязі паміж людзьмі— кроўныя, родначныя. Жаніх, вымушаны «раскулачваць» нявесту, даведзены да адчаю, канчае жыццё самагубствам. Але самае страшнае, як зазначае пісьменнік, разбураецца векавая народная мараль, ствараюцца абставіны, што правакуюць чалавека на выяўленне не самых лепшых яго якасцей, нават «мабілізуюць», рэалізуюць самыя ганебныя. Нават больш — ганебнае заахвочваецца, а бар'ераў для «мярзотнасцей» ужо не існуе, яны знічшаны.

Даносы Каландзёнка каштавалі адным жыцця, а другім — страты веры ў справядлівасць. Гэты «ні мужык ні баба», няшчасны, у многім абдзелены прыродай чалавек, адчуў, што прыйшоў яго зорны час, калі настала панаванне такіх, як ён. Ён стаў героем, яго цяпер ухваляюць за брудныя справы, а яго даносы — друкуюць. Не без яго дапамогі чарговай ахвярай калектывізацыі стала сям'я Ладзіміра Багацькі. Сумленным змагаром за новае жыццё, якое, верылася, будзе светлым, шчаслівым, быў старшыня калгаса Лявон Багацька, але і яго знішчыла рэпрэсіўная машына... Багацькі, а такі трагічны лес!

В. Быкаў у аповесці «Знак бяды» некалькі разоў акцэнтуе ўвагу чытача на «гаваркім» прозвішчы сваіх герояў. Да прыкладу, калі Пятрок, адказваючы на пытанне Чарвякова, упершыню адчуў няёмкасць за сваё прозвішча: «так недарэчна прагучала яно на гэтым хуцавым ... падворку». Аўтарская дэталь («у Выселках палова вескі былі Багацькі, а другая палова Недасекі, Гужы і сям'я Ганчарыкаў») у сітуацыі раскулачвання Ладзіміра Багацькі набывае сімволіка-трагічнае гучанне.

Тая праўда, тая трагедыя, якую зведаў і сам пісьменнік яшчэ ў дзяцінстве, засталася і знайшла сваё хвалюючае мастацкае ўвасабленне ў аповесці. Так успамінае Васіль Быкаў сваё, як ён сам вызначыў, «нешчаслівае дзяцінства»:

«Раптам заплача маці. Такога ніколі не было, калі нешта там здаралася ў яе з бацькам, яна проста маўчала. А тут — наўзрыд, давячыся слязьмі, плача. Я, помню, прачнуўся, падхапіўся. Аказваецца, учора арганізаваліся ў калгас і сёння, значыць, раніцай прыехалі і з засекаў, з кадушак у пуньцы забралі ўсё насенне. А гэта якраз час сеяць. І чым дзяцей карміць, і што самой есці? Ну вось з гэтага пачалося. Трохі бульбы было, мяшалі з травой. І такое харчаванне працягвалася шмат гадоў. Зямля благая, ураджаі дрэнныя. Бацька ж з маці працавалі штодня. А прыносяць паўмяшка. Гэта ўсё, што за год зарабіў. А яшчэ і пастаўкі, падаткі з прысядзібнага агарода...»

Наогул, жыццёвая аснова аповесцей (прыгадаем, што правобразамі Петрака і Сцепаніды з'явіліся бацькі пісьменніка) — яшчэ адна асаблівасць творчасці Васіля Быкава. Аднак было б вельмі спрошчана і павярхоўна ўсведамляць назначэнне гэтых галоўных вобразаў толькі ў сцвярджэнні трагізму вайны і яе ўсенароднасці. Гэтая аповесць да ўсяго, бадай, самая філасофская. І філасофія твора выяўляецца не толькі рэалістычнымі сродкамі, але найперш праз умоўнасці, знакі, сімвалы, што і вылучае гэты твор з усёй творчасці Васіля Быкава як самы дасканалы і высокамастацкі не толькі па змесце, але і па форме. Адзін з крытэрыяў мастацкай вартасці любога твора вычарпальна сфармуляваны Гі дэ Мапасанам: «Геніяльным з'яўляецца толькі такі твор мастацтва, які адначасова ўяўляе сабой сімвал і дакладнае выражэнне рэчаіснасці». Аповесць «Знак бяды» ў поўнай меры адпавядае гэтаму крытэрыю.

У аповесці мноства ўмоўнасцей і сімвалаў. Скрыпка Петрака — сімвал таленавітасці беларускага народа. Хата Петрака і Сцепаніды — сімвал Беларусі. Іх калодзеж — сімвал невычэрпнай сілы народа. Крыж на Петраковай Галгофе — увасабленне веры, якая здольна дапамагчы чалавеку застацца Чалавекам нават у абставінах, якія

мацней за яго... А сама Галгофа— сімвал зямелькі-карміцелькі, якая для герояў — гэта як Радзіма, як маці. Ёй не здраджваюць, нават калі яна няўдаліца ці пакутніца. Адна дарога ў чалавека — несці свой крыж да канца, раздзяліць з маці-карміцелькай яе лёс. Маці-прырода і сын-чалавек — неаддзельныя. Бомба — сімвал стоенага народнага гневу, усенароднай барацьбы. «Бомба чакала сваёй пары...» Палаючы дом Сцепаніды і Петрака — таксама сімвал. Не пастка, а непрыступная крэпасць, помнік чалавеку, які змагаецца з абставінамі да апошняга і перамагае ў гэтай барацьбе, бо перамога заўсёды вызначаецца сілай духу.

Мноства ў творы і непасрэдных знакаў-вешчуноў бяды. Мёртвая птушка — народны знак-вяшчун усіх пакутніцкіх віхураў, што пранясуцца над гэтым полем, так шчодра палітым чалавечым потам. Спілаваны камсамольцамі крыж — знак парушанай, адрынутай веры, якая і дапамагала нашым героям вытрымаць усе нягоды і выпрабаванні. А парушана вера — і, як сказаў Купала, чорт «загаціў пекла да варотаў», загаціў, заўважым гэта, задоўга да той навалы, імя якой — карычневая чума. Тайфунамі пранясуцца над гэтым полем і сталіншчына, і фашызм. І яшчэ трэба падумаць, які ж з тайфунаў страшнейшы.

Асаблівасць быкаўскіх сімвалаў, што яны народныя, бо ўвасабляюць векавую народную мараль. Знак бяды — не паспець аддаць пазычаныя грошы чалавеку пры яго жыцці. У тым, што Пятрок не паспеў аддаць Чарвякову грошы, не яго віна, а бяда, трагедыя. Але ж колькі народнай мудрасці і перасцярогі ўсім нам і ў гэтай прыкмеце знаку: усяму свой час. Паспей зрабіць дабро бліжняму, пакуль яму гэта яшчэ патрэбна. Спазніцца з добрай справай — паспрыяць злу.

Знакаў бяды ў творы вельмі многа, але ў загаловак вынесены нейкі адзін. Які ж са знакаў пісьменнік лічыць самым страшным, самым гранічным знакам бяды? Ключ разгадкі сэнсу назвы твора — ва ўсведамленні ідэі і філасофіі галоўных вобразаў.

Пятрок і Сцепаніда — носьбіты векавой народнай (а сам Васіль Быкаў падкрэсліў: хрысціянскай!) маралі і мудрасці, увасабленне самых лепшых, высакародных чалавечых і, заўважым, нацыянальных якасцей. Пятрок і Сцепаніда Багацькі — пісьменніцкі ідэал і выразнікі яго, пісьменніцкага, светапогляду і філасофскай канцэпцыі.

Часам заўважаецца павярхоўнае і памылковае «прачытанне» і ўсведамленне галоўных вобразаў як антыподаў: моцная духам, гераічная і бескампрамісная ў сваёй святой барацьбе з нелюдзямі Сцепаніда — і слабы, палахлівы, прагматычны, апантаны прагай выжыць любой цаной Пятрок. Моцныя, выключныя асобы ў

выключных абставінах — яшчэ адна асаблівасць творчасці Быкава. Моцнай асобай, на думку некаторых чытачоў, і нават крытыкаў, у творы з'яўляецца толькі Сцепаніда.

Літаратуразнавец Дз. Бугаёў у артыкуле «Па законах праўды і чалавечнасці» піша: «Няма ніякіх падстаў супроцьпастаўляць Петрака Сцепанідзе, хоць такія спробы рабіліся ў крытыцы... Гэта не памяшала некаторым даследчыкам папракаць Петрака за тое, што ён нічога не зрабіў для набліжэння перамогі».

Як нічога выпадковага не бывае на свеце, так нічога выпадковага няма ў творы такога майстра слова, як Васіль Быкаў. Усё: падтэкст, дэталі, рэтраспекцыі, умоўнасці, імёны і прозвішчы персанажаў — усё працуе на ідэю твора. І Сцепаніда, і Пятрок — Багацькі. У іх усё адно на дваіх: і Галгофа, і крыж, і валёнкі — і лёс. Разлучыла іх толькі смерць. Вобраз Петрака — парадаксальны. Нават некаторыя выявы, як нам здаецца, слабасці, канфармізму — сведчанне яго духоўнай сілы і велічы. Вельмі моцны ў Петраку інстынкт самазахавання, імкненне выжыць у экстрэмальнай сітуацыі, прага і воля да жыцця. Як справядліва зазначае Ян Баршчэўскі, «чалавек, шукаючы ратунку ад смерці, хапаецца за саломінку». Асуджэння варта толькі «хаванне за спіны іншых» (цытата з сачынення, змешчанага ў кнізе для абітурыентаў). А за чые спіны хаваўся Пятрок, цераз каго пераступіў, каго падаслаў пад ногі, ратуючыся ад смерці?

Усе мы на грэшнай зямлі жывём, на ёй нават святыя — грэшнікі. Юнацкі максімалізм адмаўляе зямное і «грэшнае» ў святых. Адвечнае, мудрае — народнае «можа як абыдзецца, калі з імі па-добраму» — успрымаецца як згодніцкае «абы было ціха». Гэты вобраз як ніякі іншы ў творчасці Васіля Быкава патрабуе ад нас здольнасці ўбачыць незвычайнае ў звычайным, сілу — у слабасці, узвышанае — у зямным, радасць — у смутку...

«Слабы» Пятрок заўсёды дапамагаў моцнай Сцепанідзе, калі яе сіла аказвалася слабой перад сілай абставін. Прыгадаем, як не змагла яна паехаць у Мінск да Чарвякова, каб выратаваць Лявона Багацьку, — паслала Петрака. І той паехаў, хоць гэта патрабавала ад яго і фізічных, і маральных высілкаў. Паехаў, бо разумеў, што жыць хочацца не толькі яму... Прыгадаем, як каршуном узвіўся ён, як кінуўся ратаваць сваю Сцёпу (Сцепанідай яна была для ўсіх, для яго — Сцёпа, ён жа для ее не Пятрок, а Петра!), калі тую хацелі расстраляць за хітрыкі з Бабоўкай.

Моцная Сцепаніда не раз адступала перад сілай Петрака. І калі не боты, а, далажыўшы пазычаныя грошы, ён купіў... скрыпку. І калі пайшоў тую скрыпку ратаваць: яна ўжо і пераржагналася, у думках

развітаўшыся з ім навек. Палахлівец? І калі ён, наперакор іх агульнаму жаданню завалодаць Яхімаўшчынай, пасля бяссоннай, пакутлівай ночы разваг і хістанняў катэгарычна адмовіўся: «Не пайду, і ўсё. Не магу я...» І гэта слабы чалавек?! Дык якую ж сілу трэба мець, каб стрымаць сябе, не пераступіць, не даць волю адвечнаму чалавечаму «я!», «мае!», «мне!». Ды яшчэ ў сітуацыі, калі само шчасце плыве табе ў рукі!

Сіла незвычайнай моцнай асобы якраз і вызначаецца мяжой, бар'ерам, які яна, асоба, пераступіць не можа. Вызначаецца не тым, што яна можа, а наадварот — чаго не можа. Зноў парадокс! Яго выдатна сфармуляваў Васіль Быкаў, характарызуючы Сцепаніду: «Але яна рэдка калі адмаўлялася ад сваіх намераў, бо часта адмовіцца ад іх ёй патрабавалася больш сілы, чымсьці іх здзейсніць».

Сіла незвычайнай, свабодалюбівай асобы вызначаецца яшчэ і яе стаўленнем да чужой свободы, чужой сілы, найперш — да свабоды блізкіх ёй людзей. Свабодны чалавек ніколі не замахваецца на свабоду іншага, не прыніжае яго.

Мы захапляемся свабодалюбствам, пачуццём уласнай годнасці, сілай, мужнасцю Сцепаніды. А каму яна найперш абавязана гэтай свабодай? Пісьменнік падкрэслівае, што знявага «выклікала ў яе абурэнне і нянавісць. Сапраўды, такога з ёй ніколі не здаралася», «ніхто яшчэ не падняў на яе руку — ні бацька на малую, ні потым Пятрок».

Надзелены большай жыццёвай мудрасцю, мацнейшым, чым у Сцепаніды, інстынктам самазахавання, Пятрок адразу распазнаў усю заганнасць, нават злачыннасць савецкай улады, якая ўсталёўвалася, якой яны вымушаны былі падпарадкавацца. Здаровы розум Петрака не прымаў таго, што ўсёй душой і сэрцам прыняла Сцепаніда, прагнучы шчасця, верачы ў справядлівасць. Верай і праўдай стала служыць яна гэтай уладзе. Актывістка, стаханаўка — сумленне Выселкаў! І ён не абмяжоўваў яе актыўнасць, бо бярог яе пачуцці, не разбураў тую веру, не адбіраў у яе мару аб шчасці. Чым гэта скончылася, яскрава паказана ў аповесці: пакутніцкую смерць Багацькі прынялі ад рук тых, «кто был ничем», каго выявіла, мабілізавала і паставіла сабе на службу савецкая ўлада. Ці, як у выпадку з Гужам, супрацьпаставіла сабе, падзяліўшы людзей на сваіх і чужых, зрабіўшы іх лютымі ворагамі адзін аднаму. Якая ўлада — такія і слугі...

Пятрок і Сцепаніда — нацыянальныя тыпы. Гэта ў ментальнасці нашага народа — жыць з працы рук сваіх, потам і мазалямі здабываць кавалак хлеба. «Зямля — аснова ўсёй айчыне», зямля — карміцелька. Колькі разоў ты ёй пакланішся, столькі разоў ты — Чалавек.

Усе жыццёвыя прынцыпы быкаўскіх герояў грунтуюцца на хрысціянскіх запаведзях. Біблейскія рэмінісцэнцыі (пазычанне) на такім узроўні ў аповесці адметнасць. Усе ўчынкі нашых герояў матываваны менавіта выкананнем вечных законаў: нельга пабудаваць сваё шчасце на няшчасці іншых. Не будзе шчасця на зямлі чужой, адабранай, праклятай яе гаспадаром. Адабраць, украсці — вялікі грэх. Нельга радавацца, калі побач з табой нехта плача, пакутуе. Сцепанідзе стала сорамна перад панам Адолем за сваю непрытоеную радасць. Чалавек не бязгрэшны, але Сцепаніда пакутуе, дакарае, раскайваецца і гоніць прэч са сваёй душы нявартыя Чалавека страсці і пачуцці. А мы? Ці заўсёды галоўным суддзёй у нашых паўсядзённых учынках бывае нам наша сумленне? Ці заўсёды мы так пакутуем, вагаемся, перш чым сказаць, зрабіць, пайсці ці вярнуцца, і рашуча, як Пятрок, сказаць сабе: нельга! Нельга — і ўсё, як бы таго ні хацелася...

Яшчэ адзін, бадай, самы забыты ў наш час, прынцып Петрака і Сцепаніды: трэба быць літасцівым нават да свайго ворага, асабліва калі ён павержданы. Нельга здзекавацца з таго, ад каго вызваліўся, а трэба знайсці ў сабе сілу паспагадаць, зразумець пераможанага і зрынутага. Вядома, пан Яхімоўскі не быў Петраку і Сцепанідзе ворагам. І, як гэта нярэдка бывае ў жыцці, халоп наравіць выцяць, «лягнуць» павержанага пана. Такая натура ў хама. Ды толькі не такія Пятрок і Сцепаніда. Ворагам пана Адолю аб'явіла савецкая ўлада, а ворагаў яна знішчаць умела. «Вам сказана: любіце бліжняга свайго і ненавідзьце ворага свайго. А я кажу вам — любіце ворагаў вашых, дабраслоўце ненавіснікаў і праклёншчыкаў вашых, рабіце дабро крыўдзіцелям і ганіцелям вашым...» (з Евангелля). Вельмі па-людску абыходзяцца з панам Адолем яго ўчарашнія батракі. І пахавалі па-хрысціянску. Мабыць, ведалі нашы продкі тое, чаму не вучаць сёння нас: паспагадаць пакутніку, наведаць хворага, пахаваць нябожчыка — справы, якімі ратуюцца нашы душы.

Паклапаціцца найперш пра калек і сірот (прыгадаем клопат Сцепаніды пра Янака, смерць якога яна ўсвядоміла таксама як знак вялікай бяды), паспагадаць, дарадзіць, зняць з душы камень, ратаваць другога, нават калі небяспека пагражае самому, — такія Пятрок і Сцепаніда.

Трагічна вырашае пісьменнік канфлікт чалавека з нелюдзямі. Сцэны гібелі Петрака і Сцепаніды таксама сімвалічныя. Самыя лепшыя, самыя высакародныя і чыстыя душой гінуць пакутніцкай смерцю ад рук сваіх жа суайчыннікаў.

Аповесць «Знак бяды» — не толькі самы антываенны, але і самы нацыянальны з усіх твораў Васіля Быкава. У чым жа гэта нацыянальнае ў творы? Васіль Быкаў у публіцыстычных артыкулах не раз даводзіў, што самая вялікая трагедыя беларускага народа звязана з несупыннымі войнамі, рэпрэсіямі, у выніку якіх вынішчаецца генафонд нацыі, гінуць самыя лепшыя, а значыць, вынішчаецца векавая народная мараль, духоўнасць як найвялікшае багацце нацыі, што вядзе да разрыву повязі вякоў і пакаленняў.

«Порвалась связь времен» — і рушацца царствы, сем'і, рушыцца ўсё. Гэтым творам Васіль Быкаў паказаў вытокі і нашых сённяшніх бед і няшчасцяў, нашай бездухоўнасці. З нічога і будзе нішто. Адкуль жа нам быць духоўна багатымі, калі многія Багацькі загінулі... Аднак усведамленне страты не здымае адказнасці чалавека за ўчынкі і стан душы. Многія Багацькі загінулі, але духоўнае багацце і духоўны вопыт засведчаныя ў кнігах. Скарыстанне ці ігнараванне яго цалкам залежыць ад чалавека, яго выбару.

Сімвалічныя, знакавыя не толькі гібель Петрака і Сцепаніды, але і тое, ад каго яны сваю смерць прынялі. Сталінізм і фашызм — прычына самай вялікай трагедыі беларускага народа, які не быў гаспадаром на сваёй зямлі, як і Багацькі ў сваёй хаце. Няволя, нясіла... Але ж усё мінаецца, і рабства таксама не бывае вечным. Трагедыя наша ў тым, што Багацькі так і не дачакаліся ўнукаў, не сустрэліся з імі ў гэтым жыцці. І не перадалі ім векавую народную мараль і тыя прынцыпы, па якіх жылі і ад якіх не адступіліся нават пад страхам смерці. І тым гэты знак папераджальны і для ўсіх нас...

**3. Прачытаць на памяць верш Пімена Панчаша «Зварот»**

Меднастволы, як выліты, высіцца бор,
Зацвітае на ўзлессі блакітны чабор,
Заглядзелася сонца у люстра азёр, —
Гэта ты, мая Беларусь!

Сіні ранак. Дзяўчына збіраецца жаць,
На плячы маладзік — серабрысты серп,
А наўкол наліўныя сады ляжаць,
Бурштыновыя яблыкі у расе, —
Гэта ты, мая Беларусь!

Я нямала прайшоў за вайну дарог,
А цябе такой непаўторнай збярог...

Бой мацнее!
Я хутка к табе прыйду,
Да грудзей набалелых тваіх прыпаду,
Пакланюся лясам і палеткам шырокім.
Толькі цяжка праходзіць апошнія крокі
Да цябе, мая Беларусь!

Толькі страшна мне думаць пра тую хвіліну,
Калі гляну у вочы я роднай краіне.
Буду хату шукаць, — а знайду руіны,
Буду маці гукаць, — адгукнецца магіла
На погосце старым пад вярбою пахілай.
Што ж, якой ты ні будзеш —і ноччу, і раннем,
Я пазнаю цябе, я не здраджу табе.
Перанесла ты гора і катаванні
І зрабілася мне даражэй і радней.
Асушу твае слёзы,
Залячу твае раны,
Кожны ліст твой распраўлю рукою старанна.
Узніму з папялішчаў твае гарады я,
Насаджу каля вёсак сады маладыя,
Каб ты вечна цвіла
І у шчасці расла,
Дарагая мая Беларусь!

# Білет № 2

## 1. Грамадска-палітычная і публіцыстычная дзейнасць Кастуся Каліноўскага. Газета «Мужыцкая праўда»

Той толькі жне, хто пасее. Так сейце ж дзецюкі, як прыйдзе пара, поўнай рукой...
*«Яська — гаспадар з-пад Вільні»*

За некалькі дзён да трагічнай гібелі Кастусь Каліноўскі ў змрочнай адзінокай камеры турэмнага казэмата напісаў свой славуты зварот «Да беларускага народа» — дакумент надзвычайнай сілы, мужнасці і пачуцця.

«Пісьмо з-пад шыбеніцы» — гэта перадсмяротны наказ Кастуся Каліноўскага, яго запавет беларускаму народу, развітальнае слова: «Прымі, народзе, па шчырасці маё слова прадсмертнае... Калі пачуеш, што браты твае б'юцца за праўду і свабоду, тады і ты не аставайся ззаду, но, ухапіўшы за што зможаш, — за касу, сякеру — і цэлай грамадой ідзі ваяваць за сваё чалавечае і народнае права, за сваю зямлю радную...»

Заключныя радкі гэтага звароту перарастаюць у прачулы верш «Марыська чарнаброва, галубка мая!», дзе пяшчота да каханай зноў змяняецца развітальным акордам:

*Бывай здаровы, мужыцкі народзе,*
*Жыві ўшчасці, жывіў свабодзе...*

Марозным веснім ранкам 22 красавіка 1864 г. на Лукішскай плошчы ў Вільні на царскай шыбеніцы загінуў найвыдатнейшы сын нашай зямлі, імя якога залатымі і агністымі літарамі ззяе ў гісторыі нацыянальна-вызваленчай барацьбы.

Лёс наканаваў яму кароткую, але яркую жыццёвую дарогу рэвалюцыянера і творцы. Але ён, вялікі Араты і Сейбіт беларускай зямлі, зрабіў за свае 26 гадоў у многа разоў больш, чым усе яго папярэднікі, каб баявы кліч «За нашу і вашу свабоду!» сабраў у адзін саюз беларускі, рускі, польскі і літоўскі народы.

Кастусь Каліноўскі адзін з першых звярнуўся да беларускага слова, вывеў родную мову са сферы бытавога ўжывання, зрабіў яе моваю дзяржаўных дакументаў. Каб узняць беларускага селяніна на барацьбу, трэба было звярнуцца са словамі на яго матчынай мове. Роднае слова хутчэй пранікне пад саламяную страху, лепш запаліць сэрца і

дойдзе да разумення простага чалавека. Роднае слова заўсёды робіць цуцы!

Грамадска-палітычныя перакананні Кастуся Каліноўскага пачалі складвацца яшчэ ў Свіслацкай гімназіі. З народных глыбінь, добра ведаючы рабскае жыццё беларускага селяніна, яго беззямелле і галечу, прыйшоў ён у 1855 г. у Маскоўскі універсітэт, адкуль восенню таго ж года перавёўся на юрыдычны факультэт Пецярбургскага універсітэта. Тут ён зблізіўся з рэвалюцыянерамі і стаў адным з кіраўнікоў антыўрадавай арганізацыі. У 1860 г. Каліноўскі, закончыўшы універсітэт са ступенню кандыдата права, вяртаецца на радзіму і становіцца рэвалюцыянерам-прафесіяналам, жывучы на нелегальнам становішчы пад рознымі прозвішчамі. Згуртаваў у Гродне тайнае таварыства, хадзіў ад вёскі да вёскі, клікаў сялянства на барацьбу за зямлю і волю.

У ліпені 1862 г. чыноўніцкую машыну царскай Расіі затрэсла ліхаманка, на ногі была ўзнята ўся жандармерыя і паліцыя Гродзеншчыны. Ва ўсіх цыркулярах, загадах і даясеннях чарнілася і скланялася газета «Мужыцкая праўда», некалькі экземпляраў якой трапіла ў рукі царскіх апрычнікаў.

Усё ў гэтай газеце было неспадзявана крамольным: і бунтарскі дух, і антыцарскія настроі, і суровая крытыка «ўсеміласцівага» маніфеста. Была тут яшчэ адна немалаважная крамола: газета напісана на мове беларускага селяніна, на мове, якая афіцыйна забаронена. «Гэту мужыцкую праўду напісаў і пісаць будзе Яська — гаспадар з-пад Вільні», — чыталі царскія чыноўнікі апошнія радкі і называл! яе ў даносах і рапартах: «бунтоўная брашура»; «разбур альная газета»; «дзёрзкая пракламацыя»; «лятучыя лісткі разбуральнага зместу»; «ганебная адозва»; «агідны лісток».

Аб тым, што «Мужыцкая праўда» — гэта менавіта газета (а не адозва ці пракламацыя), сведчыць перыядычнасць, нумарацыя і пастаянная назва выдання, цана нумара, знешні выгляд (тэкст друкаваўся на абедзвюх старонках), а таксама— што вельмі важна! — выказванне самога К. Каліноўскага. У «Пісьме з-пад шыбеніцы» ён засведчыў: «І да нашага кутка даляцела газетка, і мы яе з увагай прачыталі...»

«Мужыцкая праўда» выдавалася на беларускай мове, І друкавалася лацінкай; захавалася сем яе нумароў. Месца выдання газеты дакладна невядома. Некаторыя гісторыкі лічаць, што ў Беластоку, другія — у Гродне, трэція — у Вільні, чацвёртыя — у Белавежскай пушчы. Некаторыя нумары (№ 5 і 7) выдаваліся двойчы. У йапісанні і выданні газеты апрача К. Каліноўскага прымалі ўдзел арганізатары паўстання 1863 г., паплечнікі К. Каліноўскага — Валерый Урублеўскі, Фелікс Ра-

жанскі. «Мужыцкая праўда» выклікала цікавасць і сярод перадавой эміграцыі. Пра рэпрэсіі за распаўсюджванне газеты пісаў герцэнаўскі «Колакал», назваўшы яе «лятучымі лісткамі». Шосты нумар газеты быў цалкам перадрукаваны польскім часопісам «Glos Wolny», што выходзіў у Лондане.

«Мужыцкая праўда» — узор палымянай публіцыстыкі, і па сённяшні дзень яна — прыклад уздзеяння на розумы і пачуцці. У ёй даступна і вобразна гаварылася пра складаныя палітычныя падзеі. Кожны яе нумар — гэта страсны маналог, звернуты да сялян-«дзецюкоў». Каліноўскі таленавіта выкарыстаў традыцыйнаю форму народнай гутаркі, фальклорную сімволіку (напрыклад, народнае паўстанне для яго — сяўба), гістарычныя факты, якія могуць быць павучальнымі і пераканаўчымі для чытача. Публіцыстыка Каліноўскага, насычаная яркімі параўнаннямі, народным! фразеалагізмамі і трапнымі гутарковымі зваротамі, — мастацкая публіцыстыка. К. Каліноўскі, дасканала валодаючы жывой беларускай мовай, вядзе простую і сардэчную размову з селянінам: «Працуе бацька цяжка на дзеткі свае, гадуе маці сына, ночанькі не спіць, а цар, сабача яго вера, як гэты воўк, закраўшыся, вяліць лавіці, у дубы скуці і гнаці ад радні далёка...»

Цэнтральная праблема ўсіх нумароў «Мужыцкай праўды» — праблема зямлі і волі. К. Каліноўскі выкрываў хвалёны царскі маніфест, драпежніцкую сутнасць рэформы 1861 г., высмейваў наіўную веру ў «добрага» цара. «Шэсць гадоў ужо прайшло, — пісалася ў першым нумары газеты, — як пачалі гаварыць аб свабодзе мужыцкай. Гаварылі, вытлумачвалі і пісалі шмат, а нічога не зрабілі. А гэты маніфест, што цар з сенатам і з панамі для нас напісаў, то такі дурны, што чорт ведае, да чаго ён падобны, — ніякай у ім няма праўды, няма з яго для нас ніякай карысці».

Выкрываючы антынародную аснову царскай улады, К. Каліноўскі гаворыць пра дэмакратычную сутнасць сапраўднага ўрада: «Не народ зроблены для ранду (ураду), а ранд для народу».

Паўстанне К. Каліноўскага — адна з самых гераічных і трагічных старонак нашай гісторыі. Паўстанне 1863 г. было патоплена ў крыві. Мураўёў-вешальнік загадаў пакараць на Беларусі і ў Літве 128 чалавек, а каля 10 тысяч было рэпрэсавана судом. Беларускае слова, якое ўпершыню за доўгі час выйшла з-пад сялянскай страхі на шырокі грамадскі прастор, якім загаварылі маніфесты і адозвы часовага паўстанцкага ўрада Літвы і Беларусі, зноў было забаронена.

Жыццё і подзвіг К. Каліноўскага стануць тэмай многіх твораў пісьменнікаў, кампазітараў, мастакоў.

## 2. Кандрат Крапіва — байкапісец. Ідэйная накіраванасць яго баек, іх мастацкія асаблівасці. Сатыра і гумар у байках

Я ў мастацкім агародзе
Толькі марная трава.
А якая? Смех, дый годзе:
Я — пякучка-крапіва
*Кандрат Крапіва*

Пра адметную асаблівасць і байкі як жанру, і сваёй творчасці таксама найлепш сказаў сам байкапісец і драматург Кандрат Крапіва, растлумачыўшы да ўсяго і сэнс свайго псеўданіма:

*Хто сустрэўся быў са мною,*
*Дакрануўся раз ці два,*
*Дык той ведае ўжо, хто я:*
*Я — пякучка-крапіва.*

Кандрат Крапіва (К.К. Атраховіч) паставіў перад сабой мэту «ўмяшацца ў жыццё і сёе-тое ў ім падправіць». Кожны творца тую ж самую мэту рэалізуе і той жа мэты дасягае пасвойму, адпаведнымі яго таленту сродкамі. Для К. Крапівы такім сродкам, дзейснай зброяй, здольнай патрапіць ва ўсё і ўсіх, што патрабуе ўмяшання і выпраўлення, з'яўляецца сатыра — злы, здзеклівы смех. А жанры, у якіх гэтай зброяй можна патрапіць у «дзесятку», — фельетоны, памфлеты, сатырычныя вершы і байкі. Абібокі, прыстасаванцы, падхалімы, п'яніцы, махляры, самаўпэўненыя і пыхлівыя дурні — вось аб'екты крапівінскага таленту. Дурань перастае быць ваяўнічым і небяспечным, калі яго дасціпна высмеяць.

Аднак байка да ўсяго яшчэ і філасофскі жанр. Мудрасць у байцы выяўляецца не наўпрост, а іншасказальна — алегарычна. Алегорыя — іншасказанне, перадача думкі і абстрактных паняццяў праз прадмет (адушаўлёны ці неадушаўлёны) ці слоўна-вобразны знак: хітрасць — праз вобраз лісы, упартасць — праз вобраз асла. Раскрыць алегарычны сэнс байкі — гэта і значыць акрэсліць яе ідэйную накіраванасць.

У вобразе дыпламаванага Барана сатырык высмеяў ваяўнічую шэрасць і дурасць, ахвочую да розных знешніх «атрыбутаў» яе «выключнасці»: званняў, дыпломаў, пасад, чыноў. У вобразе махальніка Іванова — самую агідную якасць чалавека: страту чалавечай годнасці, халуйства і падхалімства. У вобразе Бабы, што стала «памагаць... седзячы на возе», — бюракратаў, якія пазашываліся ў кабінетах і з усяе сілы імкнуцца пераканаць усіх у сваёй кіпучай дзейнасці, а на самай справе толькі перашкаджаюць працаваць іншым. Яны —

пухіры на целе народа, яго крывасмокі. Без такіх бы «каня як чорт панёс», а з імі — воз ні з месца.

У вобразе саманадзейнага Каня ўвасоблены «да славы прагныя, ды вузкія ў плячах». Такія не ўсведамляюць свайго бяссілля і нікчэмнасці, а вінавацяць усіх навокал ці абставіны, якія быццам перашкаджаюць рэалізаваць іх «выключнасць» і «геніяльнасць».

У вобразе ганарыстага Парсюка паказана ўся небяспечнасць пыхлівых і ганарыстых, бо такія пазбаўлены самакрытыкі, здольнасці бачыць, «што ў самога на лычы». Затое «ганарыстыя парсюкі» вельмі падазроныя, помслівыя: «і так ён Падсвінака грызянуў, што той за сажняў пяць адскочыў».

У вобразах палітычнай байкі «Сава, Асёл ды Сонца» сатырык «праўду едкіх слоў» адрасаваў не толькў фашысцкім совам і іх хаўруснікам. У байцы наогул паказана барацьба дабра са злом. Перамога ў барацьбе (у тым аптымізм пісьменніка) абавязкова будзе належаць дабру рана ці позна, бо, «каб Сонца засланіць, вушэй асліных мала».

І ўсё ж камічнага эфекту, такога, каб «рагатала ўся Беларусь» (як пра тое сказаў Іван Навуменка ў артыкуле, прысвечаным крапівінскаму таленту), сатырык дасягае толькі, спалучыўшы трапнасць і загадкавасць алегорыі з выдатна створанай камічнай сітуацыяй. Байка — эпічны жанр. Нездарма яе справядліва лічаць сатырычнай камедыяй у мініяцюры. А ў камедыі, як і ў любым драматычным творы, аснова, па словах самога ж Крапівы, — гзт&канфлікт. Без яго твор разваліцца. І для байкі як сатырычнай камедыі ў мініяцюры вельмі важна камічная сітуацыя на трывалым падмурку канфлікту, што вырашаецца йразманалогі, а часцей — дыялогі.

Камічная сітуацыя — гэта тая, у якой «героі» вымушаны выявіць самыя ганебныя свае якасці, бо там для іх ужо падрыхтавана «пастка», не трапіць у якую можна толькі «апублікаваўшы» ўсе свае «даброты». Каб пякучка-крапіва змагла папячы рукі-ногі «многім абармотам», трэба ім палезці «за агуркамі». Кандрат Крапіва — геніяльны майстар і канфліктаў у творах, і камічных сітуацый.

Нагадаем толькі самыя кульмінацыйныя моманты камічных сітуацый некаторых баек К.Крапівы і вызначым іх ролю ў дасягненні мэты пісьменніка «сёе-тое ў жыцці паправіць».

*Але тут здарыўся скандал:*
*Пралезлі праз хамут канёвы персі й ногі,*
*І затрымаўся ён аж ледзь на жываце...*

(«Саманадзейны Конь»)

«Да славы прагныя ды вузкія ў плячах» найлепш выяўляюцца менавіта ў справе, у сітуацыі ўлады, на пасадзе. І тады ўсім стано-

віцца відавочна, што кароль жа голы! Відавочна, што вялізны хамут не мог затрымацца на іх шыі, што воз, якога яны так праглі, нельга пацягнуць з хамутом на жываце.

*І наш Асёл за працу ўзяўся шчыра:*
*Як можна вушы свае шырай*
*Ён растапырыў распластаў*
*І проці Сонца стаў...*

(«Сава, Асёл ды Сонца»)

Праўда, дабро непераможныя, і ўсе намаганні «Сонца засланіць» аслінымі вушамі — марныя.

*...Вось толькі сядуў каляіну,*
*Плячом пад кола таркану*
*І к чорту воз перавярну.*

(«Жаба ў каляіне»)

Сіле можа супрацьстаяць толькі большая сіла, а «пад кола Жаба не падлазь» — такая філасофія байкі.

*І дзіва дзіўнае было там цэлай часці,*
*Што можна з халастых ды ўсе пяць куль папасці.*

(«Махальнік Іваноў»)

Падхалімства, як і зло наогул, — бязмежнае, у падхалімаў няма ніякіх прынцыпаў, маралі.

*І вось за дурасць гэту*
*Яго вучоным раз празвалі нейк насмех,*
*А каб двара не перабег,*
*На шыю прывязалі мету.*
*— Вось, — кажуць, — і дыплом табе.*
*Што гэта за «дыплом» Баран ні «мя», ні «бэ»,*
*Аднак жа перад Кошкаю пачаў ён ганарыцца...*

(«Дыпламаваны Баран»)

Дурасць і тупасць самі па сабе не існуюць. Яны заўсёды ў пары з пыхай, высакамер'ем — псіхалагічна тонка заўважыў сатырык. І заадно папярэдзіў, што вялікая небяспека ідзе не ад бараноў, а ад бараноў дыпламаваных, не ад дурасці і шэрасці, а ад дурасці ваяўнічай.

*Ці верыце яшчэ вы, мілыя мае?*
*Ён (Казёл) нават малако дае.*

(«Сваяўства»)

Падхалімства, пратэкцыянізм, дыктатура — таксама «жывёлы з аднаго хлява». Мэты іх вядомыя, для дасягнення іх не грэбуюць ніякімі сродкамі і на ўсё гатовы тыя, што вядуць казла да ўлады. Яны будуць пець яму гімны і запэўніваць усіх, што ён нават малако дае. Сатырык папярэджвае, што ў падобных сііуацыях, каб не стаць

заложнікам інтрыг, шарлатанства жывёл «з аднаго хлява», важна ўсведамленне, што малако «ляпей кароўе».

Кампазіцыйна і бытавыя, і палітычныя байкі складаюцца з дзвюх частак: апавядальнай, у якой эфект камізму дасягаецца камічнай сітуацыяй і алегарычнымі вобразамі, і маралі, вываду. Адметнасцю гэтай часткі крапівінскіх баек з'яўляецца трапна сфармуляваная філасофія. Многія ўдалыя, ёмістыя вобразныя выслоўі сатырыка сталі крылатымі: «Каб Сонца засланіць, вушэй асліных мала», «Другі Баран ні «бэ» ні «мя», а любіць гучнае імя», «Як ты свінню ні кліч, яе заўсёды выдасць лыч», «Кіраваць-то ты кіруй, ды не вельмі тузай»; «да славы прагныя, ды вузкія ў плячах», «памагаць, седзячы на возе».

### 3. Прачытаць на памяць байку Кандрата Крапівы (на выбар)

**Дзед і Баба**

Ехаў Дзедка на кірмаш,
З ім на возе — Баба.
Конік з вышяду — дарма,
Ды цягнуў ён слаба:
Меў не болей двух гадоў,
Як суседзі кажуць.
Баба ж тая — сем пудоў
Сама меней важыць.
Пад узгорак або ў гразь —
Конь насілу возьме.
Стала Баба памагаць...
Седзячы на возе.
Што ж, каню другі гадок,
Дык яна — за білы
Ды нагамі ў перадок
Пхне, як мае сілы.
— Кінь, дурная, бо зганю! —
Дзед тут Бабе кажа.
— Ты паможаш так каню,
Як хваробе кашаль.
— Ах ты, ёлупень стары! —
Баба Дзеда лае. —
Стой жа тут, хоць ты згары!
Мне бяда малая.
Потым — гоп яна з калёс,
Села ля дарогі,

А каня як чорт панёс, —
Дзе ўзяліся й ногі!
Ва ўстановах часам ёсць
Вось такія ж «бабы»:
Здэцца, й робяць яны штось,
Але справы слабы.
Ды такая не ўцячэ!
Скажам ёй нарэшце:
Мо без вас было б лягчэй?
Паспрабуйце злезці!

**Дыпламаваны Баран**

Ў адным сяле (не важна — дзе)
Хадзіў Баран у чарадзе.
Разумных бараноў наогул жа нямнога,
А гэты дык дурней дурнота —
Не пазнае сваіх варот:
Відаць, што галава слабая.
А лоб дык вось наадварот —
Такога не страчаў ніколі лба я:
Калі няма разумніка другога,
Пабіцца каб удвух,
Дык ён разгоніцца ды ў сцену — бух!
У іншага дык выскачыў бы й дух,
А ён — нічога. І вось за дурасць гэту
Яго вучоным раз празвалі нейк насмех,
А каб двара не перабег,
На шыю прывязалі мету.
— Вось, — кажуць, — і дыплом табе.
Што гэта за «дыплом»,
Баран ні «мя» ні «бэ»,
Аднак жа перад Кошкаю пачаў ён ганарыцца:
— А што ж ты думала, сястрыца!
Хіба мне пахваліцца няма чым?
Дыплом я заслужыў, здаецца ж, галавою,
І не раўнуйся ты са мною.
— Аб гэтым лепей памаўчы, —
Сказала яму Кошка. —
Каб ты быў разумнейшы трошка
Ды розумам раскінуць мог авечым,
То ўбачыў бы, што ганарыцца нечым,

Бо заслужыў ты свой дыплом
Не галавой, а лбом.
    Другі баран ні «бэ», ні «мя»,
    А любіць гучнае імя.

**Ганарысты Парсюк**

Бывае, праўда вочы коле...
Раз гнаў пастух свіней у поле.
Адзін вялізарны Парсюк,
Які абегаў вёску ўсю,
За раніцу абшнырыў завугolle,
Цяпер такі меў выгляд важны,
Што носа не дастаць і сажнем —
Вышэй за ўсіх ён сам сябе лічыў,
А што ў самога на лычы,
Не бачыў гэтага, аднак.
І вось адзін тут Падсвінак,
Які заўважыў бруд раней,
І кажа: — Дзядзечка, твой лыч у брудзе!
Нязграбна гэта й між свіней,
А што ж, калі заўважаць людзі?
Парсюк наставіў хіб,
Парсюк раз'юшан:
— Цераз цябе я чырванець прымушан!
Такое мне сказаць асмеляцца нямногія,
Дык гэта ж — дэмагогія! —
Парсюк наш лаецца — не даравацъ клянецца:
— І месца мокрага, — крычыць, — не застанецца!
Ты мой свінячы гонар закрануў! —
І так ён Падсвінака грызянуў,
Што той за сажняў пяць адскочыў.
Парсюк не надта быў ахвочы
Глядзецца праўдзе ў вочы.

# Білет № 3

## 1. Тэма Радзімы і яе будучыні ў лірыцы Максіма Багдановіча

Беларусь, твой народ дачакаецца
Залацістага, яснага дня.
*М. Багдановіч*

Самым гарачым, самым трапяткім, самым святым пачуццём Максіма Багдановіча была любоў да Радзімы, да маці-Беларусі. Яна зрабіла яго паэтам, яна дала сэнс яго самаахвярнаму жыццю, яна пакінупа яго ў памяці нашчадкаў.

Народжаны ў Менску, асірацелы ў Гродне, вывезены пяцігадовым з Беларусі, ён на доўгія гады быў адарваны ад роднай зямлі, ад матчынай мовы і бабуліных казак, ад пошуму наднёманскіх бароў і вясёлага булькатання крынічак. Вучыўся ён у Ніжнім Ноўгарадзе і Яраслаўлі, каханне сваё напаткаў над матухнай-Волгай, а ўсе сілы і магутны талент аддаў да астатку, да апошняй кроплі «краіне-браначцы» — Беларусі.

Шчымлівым болем за «краіну-браначку», за яе «цёмны, сляпы» народ прасякнута ўся патрыятычная лірыка М. Багдановіча. Матывамі яго лірыкі была не толькі бязмежная любоў да Радзімы, але і ўсведамленне сацыяльнай несправядлівасці, няволі і нясілы, што вынішчае ыайперш «дух народны», не дазваляе гэтаму самабытнаму краю расквітнець, а яго таленавітаму народу быць гаспадаром на сваёй зямлі:

*Народ, Беларускі Народ!*
*Ты цёмны, сляпы, быццам крот.*
*Табою ўсягды пагарджалі,*
*Цябе не пушчалі з ярма*
*І душу тваю абакралі:*
*У ёй нават мовы няма!*

У 1911 г. у час першай паездкі на Радзіму М. Багдановіч наведаў у Вільні беларускі музей, пазнаёміўся з рукапісамі старажытных кніг, з узорамі старадаўняга мастацкага ткацтва беларусаў. Ён быў ашаломлены багаццем «святой зямлі», таленавітасцю люду, «каторы моцнымі рукамі стварыў усе багацтвы на зямлі», а «сам даўно сляпы ад слёз і ўжо забыўся аб ратунак». Бунтоўнае непрыняцце такіх абставін, захапленне духоўнай спадчынай Беларусі знайшло мастацкае ўвасабленне ў цыкле вершаў «Старая Беларусь». Найбольшага ўздзеяння на сэрцы людзей ён дасягнуў вершам «Слуцкія ткачыхі», у якім дзівосным чынам спалучыліся элегічны светлы смутак, захапленне сапраўднай

красой і роднага краю, і яго таленавітых людцоў і надзея на лепшую долю тых, хто варты людскага і гожага:

*А за сцяной смяецца поле,*
*Зіяе неба з-за акна,*
*І думкі мкнуцца мімаволі*
*Туды, дзе расцвіла вясна...*

Любоў да Радзімы была святым пачуццём, што вызначыла лес паэта, яго адданае слугаванне Бацькаўшчыне. Гэтае ж пачуццё найбольш прываблівала яго ў іншых людзях. Іх высакароднасць, іх настальгічныя пачуцці ўслаўлены паэтам у вершах «Эмігранцкая песня» і «Як Базыль у паходзе канаў».

Трывожным сэрцам, у якім пануе «за краіну радзімую жах», напісаны неўміручыя радкі «Пагоні». Створаны паэтам вобраз «Старадаўняй Літоўскай Пагоні» прымушае чытача задумацца, перагледзець свае каштоўнасці, усвядоміць усю марнасць марнасцей і нікчэмнасць прагматычных памкненняў. Разам з лірычным героем верша і чытач таксама успомніць «Вострую Браму Святую», былую славу нашай Бацькаўшчыны. Падзяляючы з паэтам яго высакародны гнеў і пагарду да тых, што забылі Бацькаўшчыну, «адракліся, прадалі і аддалі ў палон», найперш перагледзім здабыткі і каштоўнасці ва ўласных душах... І нам, як лірычнаму герою верша «Пагоня», ёсць за што сказаць сваёй Радзіме: «Ты прабач...» Але Яна чакае ад нас найперш добрых спраў.

Трывога і «за краіну радзімую жах» ніколі не вынішчалі ў паэтавым сэрцы веру і надзею на яе лепшую долю і будучыню. Паэзія Багдановіча самотная, элегічная і адначасна аптымістычная і жыццесцвярджальная:

*Беларусь, твой народ дачакаецца*
*Залацістага, яснага дня.*
*Паглядзі, як усход разгараецца,*
*Сколькі ў хмарках залётных агня...*

Адным з крытэрыяў мастацкай вартасці любога твора з'яўляецца асацыятыўнасць. Паэзія М. Багдановіча ў поўнай меры адпавядае і гэтаму крытэрыю. Дасканалым у мастацкіх адносінах творам з'яўляецца санет «Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...», філасофія якога выяўляецца менавіта праз асацыятыўныя сувязі і мастацкі паралелізм з ярка выяўленай антытэзай жыцця і смерці. У першай апавядальнай частцы, што складаецца з васьмі радкоў, — апісанне падзеі, якая ўразіла сваёй неверагоднасцю. У тысячагадовай магіле знойдзены засохшыя зернейкі, жыццёвая сіла якіх «збудзілася і буйна ўскаласіла парой вясенняй збожжа на раллі».

Філасофская думка заключана ў другой частцы санета (двух тэрцэтах — трохрадкоўях):

*Вось сімвал твой, забыты краю родны!*
*Зварушаны нарэшце дух народны,*
*Я верую, бясплодна не засне,*
*А ўперад рынецца, маўляў, крыніца,*
*Которая магутна, гучна мкне,*
*Здалеўшы з глебы на простор прабіцца.*

Так праз асацыятыўныя сувязі розных жыццёвых з'яў (зярнят засохлых, здольных праз тысячу гадоў прарасці «парой вясенняй», і абуджаных духоўных сіл народа) паэт сцвярджае аптымістычную ідэю вечнасці жыцця народа, веру ў абуджэнне яго духу і нацыянальнае адраджэнне.

Пра асабістую трагедыю, трагедыю чалавека, што ўсяго сябе без астатку аддаў Радзіме, а вымушаны быў увесь час жыць далека ад яе, пра свае душэўныя пакуты і гаючую сілу прошчы, якой і была для яго Радзіма, паэт сказаў пранізліва і аптымістычна:

*Поломаны жыццём, чакаючы магілы,*
*Радзімая зямля, прынікнуўя к табе,*
*І бодрасць ты ўліла ў слабеючыя жылы,*
*Зварушыла маёй душы драмаўшай сілы,*
*І месцаў ёй з тых пор няма ўжо больш жальбе.*

Не жальба, не адчай, а вера ў сваю Радзіму, духоўнасць народа, яго адраджэнне была вызначальнай у паэзіі М. Багдановіча. Цэльнасць і «аб шыраце духоўнай» дбандакляравана, пакінута паэтам як запавет:

*Жывеш не вечна, чалавек,*
*Пераҗыві ж умомант век.*

Так жыў сам паэт. Спраўдзілася яго надзея на тое, што ў яго вершах, народжаных, як ён сам пра тое пісаў, «калі грудзі падымала хваля пачуцця», чытачы знайшлі сугучнае сваім думам і пачуццям. Многія яго радкі сталі крылатымі: «Жыві і цэльнасці шукай, аб шыраце духоўнай дбай», «Усё знікае, праходзіць, як дым, светлы ж след будзе вечна жывым».

Кім быў і ёсць Максім Багдановіч для нашага народа, вычарпальна і афарыстычна сказаў Ул. Караткевіч у вершы “Багдановічу”:

*Бо як ёсць у народа такія –*
*Не загіне давеку народ.*

## 2. Народ у трылогіі «На ростанях». Вобразы сялян-палешукоў

Ідзіце ж к народу, як добрыя дзеці,
Ідзіце, злучайце яго...

*Якуб Колас*

Майстэрства Коласа-рэаліста, Коласа-філосафа і гуманіста, сапраўды народнага і нацыянальнага песняра, з асаблівай сілай выявілася ў створаных ім нацыянальных тыпах беларускага народа. У творчасці Якуба Коласа ўвасоблены ідэалы і памкненні, побыт і традыцыі, культура і ментальнасць нашага народа.

Заслуга Коласа перад нашай нацыянальнай культурай найперш у тым, што ён не абмежаваўся паказам цяжкага становішча народа, а пайшоў далей за сваіх папярэднікаў. Ён апаэтызаваў простага працаўніка, раскрыў яго багаты духоўны свет. Эстэтычны ідэал прыгожага ён знаходзіў у рэчаіснасці і найперш у народзе. У трылогіі «На ростанях» (1923-1954) — першым творы нацыянальнай прозы — ён здолеў зрабіць сацыяльны зрэз грамадства пачатку XX ст., паказаў не толькі ўзаемаадносіны народа і інтэлігенцыі, іх узаемаабагачэнне, але і іх эвалюцыю пад уздзеяннем пераломных момантаў гісторыі, у прыватнасці пад уздзеяннем першай рускай рэвалюцыі.

Чытач «бачыць» народныя вобразы трылогіі вачамі Лабановіча. Чытацкае стаўленне да таго ці іншага персанажа ў многім вызначаецца адносінамі Лабановіча да яго. Ды і сам галоўны герой інтэлігент Лабановіч выпрабоўваецца пісьменнікам адносінамі да народа ў першую чаргу. Нам перадаецца захапленне Лабановіча дабрынёй бабкі Мар'і, у вобразе якой пісьменнік увасобіў лепшыя нацыянальныя рысы беларускага народа: здольнасць зразумець бліжняга свайго, паспагадаць, дапамагчы і разам з тым супрацьстаяць злому, брыдкаму, нялюдскаму. Сваё пісьменніцкае ўсведамленне і стаўленне да народа Колас найчасцей выяўляе праз думкі, словы, учынкі галоўнага героя: «ніхто, як простая сялянская душа, не патрап'іць так знайсці тыя добрыя словы і выразы, што ідуць ад другой душы, каб уцішыць і заспакоіць яе раны».

Колас — майстар дыялога. Гэтым мастацкім прыёмам ён асабліва часта карыстаецца пры абмалёўцы і стварэнні тых персанажаў, назначэнне якіх у трылогіі — паказаць іх уздзеянне на рост свядомасці Лабановіча. Размовы Лабановіча з дзядзькам Марцінам якраз і дапамаглі маладому настаўніку ўбачыць селяніна знутры. Менавіта дзядзька Марцін адкрывае вочы Лабановічу на тое, што народ жыве бедна не праз сваю нядбайнасць, а таму, што не мае ўласнай зямлі, не з'яўляецца гаспадаром: «Арэндная плата павышана,

а плаціць няма з чаго. Із пашаю цесна, забаронена ўсюды, толькі дзе ступіць жывёла, зараз і штраф плаці. Няма, брат, простому чалавеку ні волі, ніразгону». У вобразе дзядзькі Марціна ўвасоблена і ўслаўлена мудрасць народная, той здаровы розум, якім заўсёды кіраваўся просты чалавек у сваім нялёгкім жыцці.

Каларытным вобразам дзеда Мікіты пісьменнік сцвярджае сілу беларускага народа. Дзед Мікіта вылучаецца і здзіўляе ўсіх незвычайнай сілай. Фізічная праца зрабіла палешукоў дужымі, моцнымі, вынослівымі. Са здзіўленнем слухае Лабановіч расказ пра старога Грыгора, які ў мядзведзіцы адабраў медзведзянятка і прынёс яго з лесу. «Крэпкі народ, хоць і жыве ў балотах», — думае Лабановіч.

Асаблівае захапленне пісьменніка выклікаюць дзяды, «аздобленыя сівізною, маршчынамі і пачэснымі лысінамі». «Тэта былі аграномы-самавучкі, тлумачальнікі розных прыгод жыцця. Яны ведалі, у які дзень, у якую нават часіну трэба выязджаць з сахою ў поле, пры якіх умовах трэба сеяць тую ці іншую збажыну».

У вобразах бацькі і сына Бязручак, вобразах дзяцей пісьменнік паказаў адвечнае імкненне нашага народа да святла, навукі. І не толькі імкненне, а здольнасць да яе, пашану да кнігі, друкаванага слова наогул.

Вялікую ролю ў паказе народа і выяўленні адносна яго пісьменніцкай канцэпцыі адыгрываюць легенды і паданні. Народ паказаны як ахоўнік вечнасці і збіральнік скарбаў, у якіх — памяць, душа народа, яго вопыт і мудрасць. Нездарма жыве ў памяці народа легенда пра Яшукову гару, у якой засведчана праўда пра жудасныя звычаі ў часы прыгону, пра вынішчальныя і спусташальныя войны з чужынцамі. Пан Яшук, з якім расправіўся народ, не быў выключэннем сярод прыгоннікаў. З гэтымі легендамі і паданнямі жыве людская мара аб волі.

Вобразам Цімоха Жыгі пісьменнік пераканальна паказаў, што з цягам часу мара аб волі абавязкова здзейсніцца. Калі сярод народа ёсць такія мудрыя, цвярозыя і непадкупныя, здольныя хай сабе пакуль толькі на бунт, на пратэст, то ў такога народа ёсць будучыня. Пакуль што ў змаганні з Захарам Лемешам Цімох адзінокі, бо Лемешу ўдалося перад «выбарамі» адных запалохаць, другіх спаіць. Але добры пачатак — справе вянец. Цімох Жыга — першая ластаўка. «Будзе бура! Павінна быць навальніца!» — даводзіць пісьменнік і вобразам Жыгі.

Таленавіты, высакародны і мудры народ жыве на зямлі беларускай. Але жыве не па-людску. Так далей жыць нельга! Але дзе ж тая сіла, што здольна змяніць жыццё народа, вартага лепшай долі?

Пытанне гэтае не давала спакою Лабановічу, вырашэнню яго ён прысвяціў сваё жыццё. Вобразам Аксёна Каля пісьменнік адказаў і на галоўнае пытанне трылогіі: сіла, якая здольна змяніць жыццё народа, — у ім самім, бо сам народ і ёсць такая сіла. Колас-рэаліст выпісаў гэты вобраз пераважна рамантычнымі сродкамі. Аксён Каль - асоба моцная, выключная, незвычайная, надзеленая вялікай сілай, дапытлівым розумам, рашучасцю і смеласцю, здольнасцю арганізаваць і павесці за сабой людзей. Пра гэтага нязломнага праўдашукальніка, які сам не можа жыць спакойна, не церпіць несправядлівасці і «другіх катурхае», Лабановіч часта думае, што ён мог бы стаць «строгім пракурорам за грамадскія справы», «бязлітасным помснікам за сялянскую крыўду». Ён цвёрда верыць «у тую адвечную праўду, якую так прагна чакае народ». Аксён Каль лічыць. што сялян ашукалі кручкатворы-чыноўнікі, панскія прыслужнікі, а таму добраахвотна выступае даверанай асобай ад грамады ў спрэчках з панам Скірмунтам. І ў воласці яго ведаюць як небяспечнага для ўлад чалавека, бо ён будзіць сялянскую думку, узнімае на барацьбу з няпраўдай.

Абмалёўваючы гэты вобраз рамантычнымі сродкамі, не хаваючы свайго захаплення ім, пісьменнік праўдзіва паказаў і «памылкі» свайго героя, тыповыя і для сялян, і для інтэлігенцыі таго перыяду гісторыі. Аксён Каль наіўна думае, што вінаватыя ва ўсім толькі чыноўнікі, і верыць у «добрага» бацюхну-цара. Каб падарваць гэтую веру, Лабановіч даводзіць да свядомасці Аксёна Каля, што цар заўсёды абараняе паноў, а таму ніякія прашэнні і хадайніцтвы сялянам не дапамогуць, пераконвае, што цар самы першы прыгнятальнік і вораг народа.

Вобразам Аксёна Каля пісьменнік пераканальна паказаў эвалюцыю ў свядомасці сялян, уплыў інтэлігенцыі на рост свядомасці народа.

У трэцяй кнізе трылогіі паказана народная ўдзячнасць інтэлігенцыі за служэнне яму. Сяляне вёскі Мікуцічы па сваім жаданні ахоўваюць нелегальны з'езд настаўнікаў. Пазней сяляне не дазволяць прыставу арыштаваць настаўнікаў: «Натоўп сялян і іхні варожы настрой да паліцыі былі прычынаю таго, што прыстаў паспяшаўся змыцца, не закончыўшы вобыску і нікога не арыштаваўшы».

**3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Якуба Коласа «Сымон-музыка» (на выбар)**

1
О, край родны, край прыгожы!
Мілы кут маіх дзядоў!
Што мілей у свеце божым
Гэтых светлых берагоў,
Дзе бруяцца срэбрам рэчкі,
Дзе бары-лясы гудуць,
Дзе мядамі пахнуць грэчкі,
Нівы гутаркі вядуць;
Гэтых гмахаў безгранічных
Балатоў тваіх, азёр,
Дзе пад гоман хваль крынічных
Думкі думае прастор;
Дзе увосень плачуць лозы,
Дзе вясной лугі цвітуць,
Дзе шляхом старым бярозы
Адзначаюць гожа пуць?

2
Брацце мае, беларусы!
У той кнізе людскіх спраў
Сам лес, мусіць, для спакусы
Гэты край нам адзначаў.
Тут схадзіліся плямёны
Спрэчкі сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць,
А нас цяжка ў сэрца раніць,
Пад прыгон узяць навек,
Нашы скарбы апаганіць,
Душу вынесці на здзек,
Каб у віры той ашукі
Знішчыць нашы ўсе сляды,
Каб не ведалі і ўнукі,
Хто такія іх дзяды.
І лілася кроў нявінна,
Швед набытак наш паліў,
А ўрад царскі самачынна

Тут гвалтоўнасці тварыў,
Будаваў астрог народу
І барбарскім капылом
Мерыў волю і свабоду,
А культуру нёс з казлом.
І без жалю капытамі
Конь казацкі тут ступаў
І збажынку з ярынамі
Талачыў і драсаваў.

3
Родны край! ты разарваны,
І на захад ад мяжы
Пан пыхлівы, надзіманы
Моцна сцягвае гужы,
Каб з варшаўскае майстэрні
Беларусу сшыць халат,
Ды ні ксёндз, ні пан не верне
Плынь гісторыі назад!
Эх, чаго нам не прыйшлося,
Брацце мілыя, ужыць!
Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць
Невядомых, непрызнаных,
Не аплаканых нікім,
Толькі ў полі адспяваных
Ветру посвістам пустым!
Дык хіба ж мы праў не маем,
Сілы шлях свой адзначаць
І сваім уласным краем
Край свой родны называць?

# Білет № 4

## 1. Літаратура эпохі Адраджэння. Мікола Гусоўскі. «Песня пра зубра»

...Багацце духоўнае — злата дзяржавы.
*М. Гусоўскі*

Эпоха Адраджэння (XIV-XVI ст.) на Беларусі — залаты век нашай Бацькаўшчыны, эпоха, якая вызначалася найперш тым, што беларуская мова ў Вялікім княстве Літоўскім была мовай каралёў і кавалёў — дзяржаўнай мовай. На беларускай мове была выдадзена першая Канстытуцыя — Статут Вялікага княства Літоўскага (у трох рэдакцыях: 1529, 1566, 1588 гг.), а таксама багаты збор дзяржаўных дакументаў— Літоўская метрыка.

Гэтая эпоха дала свету такіх тытанаў беларускай культуры, як Францыск Скарына, Мікола Гусоўскі, палымяных змагароў за нацыянальныя традыцыі Мікалая Радзівіла Чорнага, Сымона Буднага, Васіля Цяпінскага, складальнікаў першых грунтоўных граматык і слоўнікаў Мялеція Сматрыцкага і Лаўрэнція Зізанія. Эпоха Адраджэння характарызавалася на Беларусі патрыятычным пафасам, ідэямі Асветніцтва і гуманізмам. У літаратурнай творчасці гэтага перыяду напачатку пераважалі жанры сярэднявечнай літаратуры, творы царкоўна-рэлігійнага зместу: асобныя кнігі Бібліі, жыціі і хаджэнні.

З жанраў свецкай літаратуры адзначым летапісы, якія адлюстроўвалі гістарычныя падзеі, апісвалі жыццё гістарычных асоб. Летапісы набліжаюцца да мастацкай літаратуры, бо нярэдка летапісцы звярталіся і да вуснапаэтычных крыніц, пераказвалі цікавыя гісторыі, легенды, паданні. Самым значным летапісным помнікам з'яўляецца «Летапіс вялікіх князёў літоўскіх». У «Беларуска-літоўскім летапісе 1446 года» змешчана «Пахвала вялікаму князю Вітаўту» — панегірык, у якім услаўлялася палітыка гэтага князя, накіраваная на ўзмацненне і ўзвышэнне Вялікага княства Літоўскага як магутнай еўрапейскай дзяржавы.

Выдатным помнікам летапіснай літаратуры з'яўляецца «Хроніка Быхаўца». Адметная асаблівасць гэтага твора — эмацыянальная, вобразная, займальная форма апісання падзей. У яркіх апавяданнях «Хронікі» расказваецца пра гераічныя паходы і бітвы (бітву пад Грунвальдам у 1410 г. з крыжакамі і ў 1506 г. пад Клецкам з татарамі). «Хроніка Быхаўца» — твор выразна патрыятычнага гучан-

ня. Ён быў выклiканы, вiдаць па ўсiм, глыбокiм роздумам аўтара аб лёсе Бацькаўшчыны, калi над ёй навiсла пагроза страты самастойнасцi i незалежнасцi.

«Многiя народы Еўропы з удзячнасцю пакланiлiся б ад сябе i ад нашчадкаў таму свайму сыну, якi б пакiнуў iм у спадчыну падобны твор», — так сказаў пра Мiколу Гусоўскага i яго генiяльную паэму адзiн з яе перакладчыкаў на нямецкую мову. Дзякуючы таму, што напiсана яна была не на беларускай, а на лацiнскай мове, упершыню ў гiсторыi сваёй культуры Беларусь вуснамi свайго сына напрамую гаварыла з iншымi народамi пра сваё жыццё, сваю гiсторыю.

Еўрапейскую славу i прызнанне вялiкi пачынальнiк славянскай лiтаратуры атрымаў толькi праз 500 год: у 1980 г. ва ўсiм свеце, паводле календара мiжнародных дат ЮНЕСКА, адзначаўся яго паўтысячагадовы юбiлей.

Творчую спадчыну М. Гусоўскага складаюць акрамя слыннай паэмы «Песня пра зубра» (1523) яшчэ дзве («Новая i славутая перамога над туркамi ў лiпенi месяцы» (1524), «Жыццё i подзвiгi св. Гiяцынта» (1525)), адзiнаццаць вершаў. Менавiта з яго твораў, i асаблiва з паэмы «Песня пра зубра», i ўзяты звесткi пра жыццё паэта, яго асобу. Мяркуюць, што нарадзiўся Гусоўскi недзе каля 1480 г. у сям'i паляўнiчага з дружыны вялiкага князя.

Жыццё будучага паэта было звязана з лукам, канём, небяспекай палявання: «Змалку ад бацькi вучыўся ў бясконцых паходах», «рэкi лясныя, Дняпра паўнаводнага строму пераплываў я з канём у паходзе за зверам».

Пачатковую адукацыю Мiкола набываў дома, на радзiме, на роднай мове: «Свет даўнiны вывучаў я па кнiгах славянскiх, граматах рускiх кiрылiцай пiсаных...» Пасля вучыўся ў Польшчы, Iталii. Дасканала валодаў лацiнскай мовай, на якой пiсаў не толькi свае паэтычныя творы, але i вёў справы на дыпламатычнай службе ў складзе польскалiтоўскай мiсii ў Ватыкане. (М. Гусоўскi суправаджаў у Рым палiтыка i рэлiгiйнага дзеяча Эразма Вiтэлiуса, сакратара вялiкакняскай канцылярыi.)

Гiсторыю напiсання паэмы М. Гусоўскi засведчыў у прадмове i першых радках твора.

*Неяк у Рыме пры цiжме людзей незлiчонай*
*Сведкам вiдовiшча быў я — бою быкоў на арэне.*

Хтосьцi параўнаў гэта з зубрынай аблавай, Гусоўскi пагадзiўся з такiм параўнаннем i расказаў пра паляванне на зубра ў пушчах роднага краю. «Праслухаўшы ўсё ў захапленнi, мне загадалi адразу ж

узяцца за працу, каб успаміны свае, пераліўшы ў памер вершаваны, песняй зрабіць і пра нас, і пра нашы аблавы».

Так дзякуючы таленту і багатаму жыццёваму вопыту паэта паэма сапраўды стала песняй яго сэрца, гімнам Бацькаўшчыне, летапісам жыцця на зямлі «пад зоркай Палярнай».

Паэма наватарская, незвычайная і па змесце і па форме. У ёй няма звыклай скразной сюжэтнай лініі. Яе змест сапраўды пра тое, што вынесена ў поўную назву твора: «Песня пра постаць, дзікі нораў зубра і паляванне на яго». Аднак у чытача складваецца ўражанне, што апісанне канкрэтных рэалій, хай сабе і надзвычай напружаных, экзатычных, поўных рызыкі і небяспекі, — гэта толькі зачэпка, падстава, каб расказаць пра не менш важнае. Аўтар расказаў пра тое, што яго хвалявала і трывожыла, чым жыла яго душа, — пра Бацькаўшчыну, яе народ, яго звычаі і традыцыі, яго мары і памкненні, пра мінулае і будучае слыннага краю «пад зоркай Палярнай». Таму большую частку паэмы складаюць лірычныя і філасофскія адступленні, выяўленне асабістых паэтавых поглядаў на вечныя праблемы, якія хвалявалі яго і яго народ.

Праблемы вайны і міру, дабра і зла, жыцця і смерці, духоўнага і матэрыяльнага, адказнасці Асобы перад народам, чалавека і прыроды, дзяржаўнасці і суверэнітэту — вось далёка не ўсе тыя праблемы, якія з незвычайнай мастацкай сілай ставяцца і вырашаюцца паэтам-філосафам.

Гледзячы на сваю Радзіму з далёкай Італіі, паэт бачыў тую небяспеку, якую неслі княству міжусобныя войны, што аслаблялі яго, спусташалі: «І ад сваіх міжусобіц мы ўсе не дужэем...» Трывогай і болем перапаўняецца сэрца паэта ад усведамлення таго, што яго чароўны край з'яўляецца фарпостам барацьбы з залатаардынцамі, тэўтонамі і туркамі, што несупынныя войны каранаваных уладароў віхурай праносяцца праз гэты край і вынішчаюць цвет нацыі.

*Б'юцца князі-ваяводы, а стогнуць народы:*
*Воіны ж гінуць у тых і другіх у сутычках,*
*Што ім той смерд — наша гора і нашы пакуты?*
*Ім бы свайго дамагчыся, а ты хоць залiся*
*У горкіх слязах. За мурамі рыданняў не чутна —*
*Значыць, гандлюй і крывёю і лесам падданых.*

Антываенная накіраванасць, гуманістычны пафас паэмы робяць яе надзвычай сучаснай. Па-максімалісцку бунтоўны і катэгарычны паэт, калі гаворыць пра падпальшчыкаў вайны — «зямных уладарцаў», якім не дае спакою «сверб панавання». Надзённа гучыць

яго заклік: «Спынім жа войны!» І заклік адрачыся ад спраў, «што нас душаць няшчадна», таксама сучасны.

Адметнай асаблівасцю паэмы і яе кампазіцыі з'яўляюцца рэтраспекцыі (зварот у мінулае) — апісанне княжання Вітаўта і яго «вячыстых» спраў.

Цэнтральнай праблемай твора з'яўляецца праблема дзяржаўнасці і суверэнітэту. Ад чаго залежыць росквіт і моц дзяржавы? На думку Гусоўскага — ад дзяржаўцы. Якім павінен быць дзяржаўца, каб краіна квітнела і была недасягальнай для ворагаў, была незалежнай? Што павінна быць прыярытэтным у палітыцы такога дзяржаўцы? Вобразам князя Вітаўта паэт даў адказ на вечнае і надзённае пытанне. Свой ідэал дзяржаўцы паэт-філосаф знайшоў у мінулым, у гісторыі Вялікага княства Літоўскага, княжанне Вітаўта для якога было залатым векам.

*Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы*
*Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,*
*І называюць той век залатым.*

Нельга не захапляцца мудрасцю нашага слыннага земляка, які паўтысячагоддзя таму нагадаў нам пра галоўны закон вечнасці, «закон прирожений», — не хлебам адзіным жыве чалавек. А калі толькі хлебам, то не будзе і яго... Афарыстычна, вобразна сфармуляваў ён гэты закон, папярэдзіўшы нас пра бяду, калі той закон парушым:

...Мне такздаецца, што гэтай шаноўнаю назвай Век той названы па простой прычыне: дзяржаўца Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы.

Апісанню «вячыстых» спраў Вітаўта, яго клопатаў пра «багацце духоўнае» як «злата дзяржавы» прысвечана ў паэме шмат старонак. Пры князю Вітаўту нашы продкі жылі ў прававой дзяржаве. Першай у Еўропе прававой дзяржаве, у якой панавала сіла закону, а не закон сілы, і была гарантавана роўнасць усіх перад сілай закону!

*...Прагнасць нажыцца пад шыльдаю варты закона,*
*Сквапнасць — загрэбці кавалак у бліжняга з рота —*
*Ён тыранічнымі сродкамі так пратараніў,*
*Што на вякі нават завад іх выведсяў княстве.*
*Кім бы і чым бы ні быў ён пры іншых заслугах,*
*Нават за гэта адно я пяю яму славу.*
*Густа ён справамі век насяліў свой, і водгук*
*Спраў тых вячыстых патрапіў і ў гэтую песню.*

Наватарскай гэтая паэма з'яўляецца і паводле галоўнага вобраза. Цэнтральны персанаж — зубр — набывае вобразна-сімвалічны сэнс. Ён — вобразнае ўвасабленне роднага краю, выяўленне характару і

ментальнасці народа, яго былой магутнасці, сілы і адвагі. Гусоўскі надзяляе зубра здольнасцю мысліць, чуйна рэагаваць на дабро і зло. Зубр — звер міралюбівы, бяскрыўдны, калі яго не патрывожыць. І ён жа — круты, раз'ятрана-бязлітасны, калі вымушаны абараняцца. І ў статку зубрыным, нібы ў чалавечай сям'і, пануе згода, узаемаадказнасць і ў той жа час «субардынацыя»:

*...Тому іх выручка: гуртам —за кожнагаў статку,*
*Кожны ж — за гурт і за ўсіх, беспарадкаў — ніякіх.*
*Дужы са слабым уладай дзяліцца не стане...*

Твор вылучаецца і сваёй энцыклапедычнасцю, і нацыянальным каларытам. Тут усё наша і пра нас. Як сказаў Янка Сіпакоў, «гэта нашы вочы ў мінулае. Паэма нібы машына часу дапамагае нам сягаць праз стагоддзі, у даўніну, каб пачуць і нават убачыць, як жылі нашы продкі, чым займаліся, што іх радавала і што засмучала». У той жа час яна скіроўвае чытача на роздум пра сучаснае і будучае.

**2. Раман Кузьмы Чорнага «Пошукі будучыні», яго асноўныя праблемы**

Чалавек — гэта цэлы свет.
*Кузьма Чорны*

Вайна і фышызм у рамане «Пошукі будучыні», як пісаў А. Адамовіч, паказаны і асэнсаваны Кузьмой Чорным «з вышыні філасофска-гістарычнага і мастацкага вопыту чалавецтва». На прыкладзе падзей, што адбываліся ў мястэчку Сумлічы і яго ваколіцах, аўтар адлюстраваў барацьбу беларускага народа супраць фашысцкіх захопнікаў. Лёс герояў твора прасочваецца на працягу многіх гадоў (у часы імперыялістычнай, храмадзянскай і Вялікай Айчыннай война}'). Гэтаму садзейнічае прыём рэтраспекцыі.

Цэнтральнай праблемай філасофскага рамана Кузьмы Чорнага з'яўляецца праблема шчасця. Яна вызначае і многія іншыя праблемы: духоўнага і матэрыяльнага, вечнага і марнага, любові і нянавісці, праблемы бацькоў і дзяцей, шлюбу і сям'і.

Усе героі рамана «Пошукі будучыні» апантаны прагай шчасця, настойліва ідуць да яго, толькі кожны разумее шчасце па-свойму. Усё «золата свету» і магчымасць валадарыць усім светам, усю славу свету аддаў бы Нявада і стаў бы «прасіцца і маліцца: пусціце, калі ласка, дайце мне шчасце спаўзці з гэтага трона: я колькі год жыта не сеяў, кала нават не зачасаў, у кузні каня не каваў, у млыне мукі не малоў, раллі не нюхаў, ботаў не мазаў, капусты не сёрбаў, не наслухаўся

ўволю, як пеўні спяваюць, як людзі па-людску гавораць». Удзельнік імперыялістычнай і грамадзянскай войнаў, вязень канцлагера і ваеннапалонны, які даўным-даўно пакінуў дачушку Волечку і родныя Сумлічы, марыць пра шчасце хлебароба і сейбіта на роднай зямлі. Радзіма для яго — Волечка і шыпшына: «Без Волечкі і шыпшыны няма для мяне і роднай бацькаўшчыны. Як жа гэта так жыць, каб чалавеку на свеце не было за што душой зачапіцца».

І Сымон Ракуцька, як і Нявада, бачыць сэнс жыцця ў сям'і, яе дабрабыце, забяспечанай будучыні дзяцей. Трагічны, пранізлівы і шчымлівы гэты вобраз. Заслуга Чорнага ў тым, што ён стварыў пераканаўчы псіхалагічны партрэт беларуса з яго адметнай нацыянальнай рысай — любоўю да радзімы, роднага гнязда, клопатам пра дзяцей, сям'ю: «Чалавек гэты быў дзіўны. Як ніхто іншы, ён пільнаваўся свайго гнязда, якое стала, хоць і марудна, складаў саломіна за саломінай». Гэта ў ментальнасці беларуса — пільнавацца свайго гнязда, ратаваць яго ад каршуноў і наперакор усяму зноў віць, калі разбурыць віхурай...

Прагай менавіта таго, ад чаго без вагання адмовіўся б Нявада, апантаны Шрэдэры, старэйшы і малодшы,— прагай золата, з якім яны звязваюць усе свае думкі пра будучыню. Таму і пусціліся яны ў небяспечнае падарожжа, каб выправіць ранейшую «памылку», знайсці і забраць падараванае некалі Волечцы за ўратаванне золата. Гэтыя людзі дзеля абагачэння гатовы на ўсё: на рабунак, марадзёрства. Жонка Шрэдэра Гертруда, жывучы ў маёнтку, падараваным ёй акупантамі, думае, што дасягнула шчасця, што сын-заваёўнік і войска фюрэра забяспечаць ёй багатае жыццё. Яе ніколькі не мучаць сумленне і думка, што адабранае, нарабаванае шчасця не прынясе, што за ўсё трэба будзе заплаціць. І расплата чакала іх на гэтай зямлі: жанчына гіне, а муж не мае сіл нават пахаваць яе. Не вярнуў назад золата і Шрэдэр-старэйшы, што двойчы прыходзіў на нашу зямлю: у першую імперыялістычную вайну — з мячом, у другую — пад аховай мечаносцаў. Загінуў ад кулі партызана Кастуся Лукашэвіча, мужа Волечкі Нявады. Так і не паспеў разабрацца ні ў сабе, ні ў тым, ці прынесла яго золата шчасце і карысць каму-небудзь іншаму. «Хто з мячом да нас прыйдзе...»

Філасофскія праблемы вырашаюцца ў рамане ў характэрнай для стылю Чорнага манеры. І гэты твор, як некаторыя іншыя (раман «Трэцяе пакаленне», аповесць «Насцечка»), напісаны ў лепшых традыцыях і па законах псіхалагічнага дэтэктыву. Найбольшую ролю ў выражэнні ідэі твора і вырашэнні праблем адыгрывае сюжэт, у якім мноства невыпадковых выпадковасцей, шмат таемнага і загадкавага.

Усе героі — у пошуку будучыні: усе іх мары аб шчасці звязаны з будучыняй, дзеля якой яны гатовы пакутаваць, трываць, а некаторыя, як Шрэдэры, нават «пераступіць» маральныя законы. Іх шляхі да будучыні (а яна ў кожнага, як і разуменне шчасця, свая, ім самім абмаляваная і ў марах пабудаваная) перакрыжоўваюцца, бо перакрыжоўваюцца і іх інтарэсы.

Разуменне шчасця і сродкі для дасягнення мэты падзяляюць іх на праведнікаў і зладзеяў. Твор цэментуе думка, што нічога выпадковага на свеце не бывае, што ў жыцці і выпадковасці не выпадковыя, што за ўсё на свеце трэба плаціць. Герояў (і «праведнікаў», і «зладзеяў») аб'ядноўвае тое, што ўсе яны — натуры моцныя, настойлівыя ў дасягненні сваіх мэт, і ў гэтай настойлівасці выключныя, здольныя на выбар: «Лепш грызці зямлю ў родным кутку, чым каб цябе ліхім ветрам кідала па чужым свеце». Так думае Нявада. Іншыя героі вырашаюць, што для іх «лепш», што важней, і ад гэтага рашэння залежаць і шляхі іх, і лёсы.

Выбарам вызначаецца і выпрабоўваецца і другое пакаленне ў рамане — Волечка Нявада і Кастусь Лукашэвіч. У гэтых вобразах увасоблена аўтарскае ўсведамленне кахання і сям'і як найвялікшай каштоўнасці чалавека. Каханне і ёсць тое золата, якое адно і варта Чалавека, якім і ўзнагароджвае яго лес за духоўнае багацце, цярпенне...

У літаратуры няшмат твораў, дзе б з такой мастацкай сілай было засведчана, як двое людзей, што сышліся спачатку толькі з-за спагады адно да другога, сышліся, каб выжыць у гэтым бязлітасным свеце, змаглі дажыць да кахання. Старонкі, прысвечаныя нараджэнню гэтага кахання, самыя светлыя і лірычныя ў рамане. І што закаханым багацце! Што ім тое золата, якое яны трымаюць у шуфлядцы стала, як нейкі клубок нітак, калі багацце і золата ў іх душах! У абмалёўцы гэтых вобразаў і апісанні нараджэння кахання мастак-псіхолаг па-майстэрску карыстаецца дэталлю, запаволенымі бытавымі замалёўкамі, быццам вучыць і нас бачыць узвышанае ў зямным, паэзію — у прозе. Прыгадаем сцэну, як Волечка і Кастусь выпрабоўваюцца «спакусай» спажыць кавалак цудам ацалелай пад страхой каўбасы. Кастусь, намалаціўшыся да стомы, ідзе ў хату і бачыць на стале спакуслівую каўбасу, якую яму перад гэтым прапаноўвала Волечка з'есці. Зіркне ў акно — адарве маленькі драбок і смакуе. Але сорам за сябе стрымлівае яго. Тое ж самае перажыла пасля Кастуся і

Волечка і таксама здолела перамагчы сябе. Назаўтра «яны з'елі яе ўдваіх, кусаючы, як згаварыўшыся, многа хлеба і мала каўбасы, каб надалей расцягнуць прыемнасць». Майстэрства пісьменніка ў ства-

рэнні такіх псіхалагічных сцэн можна параўнаць са здольнасцю ў кроплі ўбачыць цэлы свет.

Сінтэз рэалістычных і сімволіка-алегарычных вобразаў у рамане (Крыжа як сімвала пакут і ачышчэння; Вялікага і Малога скрыжаванняў як сімвалаў вечнага жыцця і руху; Будучыні, якая схавана ад пакаленняў і да якой яны нястомна ідуць; Часу — выдатнага лекара людскіх ран і шрамаў на целе Радзімы) забяспечвае значнасць і маштабнасць твора і тых агульначалавечых праблем, што ў ім вырашаюцца. Такім гарманічным спалучэннем рэальнага і ўмоўнага дасягаецца мастацкая вартасць твора, чым і тлумачыцца яго ўздзеянне на розумы і душы людзей.

**3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы М. Гусоўскага «Песня пра зубра» (на выбар)**

1
Прагнасць нажыцца пад шыльдаю варты закона,
Сквапнасць — загрэбці кавалак у бліжняга з рота —
Ён тыранічнымі сродкамі так пратараніў,
Што на вякі нават завад іх вывеўся ў княстве.
Кім бы і чым бы ні быў ён пры іншых заслугах,
Нават за гэта адно я пяю яму славу.
Густа ён справамі век насяліў свой, і водгук
Спраў тых вячыстых патрапіў і ў гэтую песню.

2
Княжанне Вітаўта лічаць усе летапісцы
Росквітам княства Літоўскага, нашага краю,
І называюць той век залатым. Разбяромся:
Мне так здаецца, што гэтай шаноўнаю назвай
Век той названы па простай прычыне: дзяржаўца
Перад багаццем і шчасцем зямным пастаянна
Ставіў багацце духоўнае — злата дзяржавы.

3
Край наш багаты драўнінай, нічога не скажаш,
Ды не адно хараство ў ім — лясы, нібы хмара.
Нашы лясы — гэта наша скарбонка і свіран,
Наша камора жывіцы, і дзёгцю, і ягад,
Мёду і воску, куніцы і рознай дзічыны.
Так што купец чужаземны, тугой калітою

Не паскупіўшыся, можа раскінуцца шчодра
І на таргах, і на менах — тавараў удосталь.
Тут і сасновыя бёрны, і брусе, і кроквы,
Дуб на шалёўкі — купляй і будуйся, бязлесны.
Толькі за нашу гатоўку — гатоўкай на бочку!
Сосны ў нас гоніць у ствол, як трыснёг — у сцяблíну;
Хмаркі, здаецца, павіслі на макаўках кронаў.
Водарам кветак з вясны і да позняга лета
Пушча напоена, нетры яе і прылескі —
Месцы ігрышчаў і гульбішчаў моладзі сельскай.

# Білет № 5

## 1. Ідэйная накіраванасць камедыі Кандрата Крапівы «Хто смяецца апошнім»

> Няхай жа ведаюць усе свінні — мамантавыя і немамантавыя: калі каторая з іх паспрабуе пакасціць... будзем біць проста па пятачку!
>
> *Кандрат Крапіва*

Спецыфіка драматычнага твора абумоўлена тым, што ён прызначаны для пастаноўкі на сцэне. Галоўная роля ў выражэнні аўтарскай задумы, пісьменніцкай канцэпцыі і філасофіі ў драматычным творы належыць канфлікту. «Канфлікт — аснова п'есы», — сцвярджаў К.Крапіва і выдатна рэалізаваў гэтае асноўнае патрабаванне да драматычнага твора ў сваёй літаратурнай спадчыне. Майстэрства ствараць канфлікты ён выявіў яшчэ ў жанры байкі, якая, як вядома, з'яўляецца, па сутнасці, сатырычнай камедыяй у мініяцюры.

На канфлікт у творы, вастрыню праблемы ў ім указвае ўжо сама назва п'есы, якая ўяўляе сабой самае, бадай, галоўнае пытанне жыцця: хто смяецца апошнім? Хто пераможа зло? Што неабходна, каб перамагчы зло і смяяцца апошнім? Прыгадаем крылатую народную мудрасць: добра смяецца той, хто смяецца апошнім.

Вялікую ролю ў вырашэнні канфлікту адыгрываюць сюжэт і кампазіцыя камедыі. Ужо ў яе экспазіцыі (размова цёці Каці з Нічыпарам) відавочна расстаноўка сіл дабра і зла. Глядач атрымлівае поўнае ўяўленне пра атмасферу, што пануе ў навуковым інстытуце, які ўзначальвае невук і прайдзісвет Гарлахвацкі. Адны займаюцца навукай, а другія — інтрыгамі, плёткамі і іншымі бруднымі справамі, што не маюць ніякага дачынення не толькі да навукі, але і да прыстойнага жыцця наогул. Глядач папярэджаны таксама і пра небяспечнасць Гарлахвацкага, які можа з'есці нават самога Чарнавуса, як пра тое гаворыць цёця Каця.

Завязкай у творы з'яўляецца той момант, які вымагае ад зла дзеяння: зло вымушана стаць ваяўнічым, бо яму пагражае небяспека. Напамін Гарлахвацкаму з Масквы, што яму неабходна пацвердзіць свой статус вучонага — напісаць навуковую працу, і падштурхнуў Гарлахвацкага на авантуру.

Дзеянне дасягае сваёй кульмінацыі ў сцэне, калі Гарлахвацкі прымушае Тулягу напісаць за яго дысертацыю, і яшчэ большага

напружання, калі Гарлахвацкаму ўдаецца заручыцца падтрымкай аўтарытэтнага вучонага Чарнавуса, папярэдне ашальмаваўшы яго. Гарлахвацкаму сапраўды ўдаецца так зблытаць карты, што «свой свайго не пазнаваў». Панаванне зла поўнае і, здавалася б, канчатковае — «няпраўда праўду акілзала і едзе людскасці на спіне». Дабро не толькі зрынута, растаптана, але і пастаўлена на службу злу. Пра такую сітуацыю выдатна сказаў Купала: «Аслу з напоўненай машною леў акаваны лапы ліжа».

У выражэнні канфлікту паміж дабром і злом таленавіты камедыёграф Крапіва карыстаецца і сатырычнымі сродкамі, найперш — камічнай сітуацыяй. Камічная сітуацыя для сатырычнага твора — тое ж самае, што экстрэмальная для трагедыйнага. Першая найлепшым чынам выяўляе сутнасць сатырычнага персанажа, бо дзеля выратавання ён вымушаны выявіць свае далека не лепшыя якасці ў камічнай сітуацыі. У камедыі «Хто смяецца апошнім» такіх сітуацый мноства. Прыгадаем тую, калі Гарлахвацкі, ратуючы сваю шкуру, прымушае 60-гадовага Тулягу лезці праз акно і сыграць ролю палюбоўніка Зіначкі Зёлкінай. Мастацкая вартасць камічнай сітуацыі вызначаецца навізной і вычарпальнасцю ў характарыстыцы галоўных вобразаў, што нясуць асноўную нагрузку ў выражэнні ідэі, а не толькі геданістычным уздзеяннем на гледача.

Што ж новага для гледача дае гэтая сітуацыя? Ён жа і да гэтага меў мноства магчымасцей пераканацца ў палахлівасці Тулягі і праз дыялогі, і праз дэталі («Я і на свет нарадзіўся Тулягам. І дзяды і прадзеды мае былі Тулягі»), І пра амаральнасць Гарлахвацкага, здавалася б, меў поўнае ўяўленне. Глядач ведаў, што Гарлахвацкі — «свінтус», але не думаў, што такі «грандыёзус». Сапраўды, мяжа на свеце ёсць усяму, бязмежная толькі людская подласць. Да гэтага палахлівасць Тулягі выклікала ў гледача смех, зараз — страх. І страх ужо не за Тулягу, а за сябе самога, бо кожны глядач убачыў у Тулягу, як у люстэрку, сябе. Убачыў свае заганы і слабасці, а ўбачыўшы, жахнуўся ад усведамлення: што ж можа стацца з любым чалавекам, да якой жа «гадости, низости, мерзости» (М. Гогаль) можа дакаціцца чалавек, калі дасць волю сваім заганам! Менавіта гэты момант стаў кропляй, што перапоўніла чашу цярпення Тулягі, і ён усвядоміў, які ён «баязлівы, нікчэмны чалавек, маладушны да нізасці». І яму «сорамна стала», як сам ён у тым прызнаецца Левановічу. Першая ступенька на нялёгкім шляху да свайго вызвалення адолена, а далей — самы моцны пратэст ідзе з грудзей самага слабога.

Заслуга Крапівы найперш у тым, што ён з уласцівым яму майстэрствам стварае не толькі знешні, але і ўнутраны канфлікт —

канфлікт чалавека з ворагам, як сядзіць у ім самім. Вобраз Тулягі нясе найбольшую нагрузку ў выражэнні філасофіі твора, аб чым сведчыць зноў жа назва яго: апошнім смяецца той, хто быў пагарджаны і прыніжаны, але хто здолеў узняцца з каленяў, перамог сябе. Самая цяжкая, але і самая вартая чалавека перамога — перамога над самім сабой. Крапіва-філосаф усім творам і найперш вобразам Тулягі сцвярджае, што перамога над злом, над «свінтусамі-грандыёзусамі» магчыма толькі ў выніку перамогі над сабой. Гэта і ёсць самая першая і галоўная ўмова перамогі ў такім баі.

Усімі даступнымі сатырыку-камедыёграфу сродкамі (маналогамі, дыялогамі, камічнымі сітуацыямі, іроніяй і гратэскам, дэталямі і вострым дынамічным сюжэтам) К. Крапіва паказвае зло ва ўсіх яго выявах (здзек, шантаж, непрафесіяналізм, падхалімства) і адмаўляе яго. А адмаўляючы, сцвярджае, што «свінтусаў», каб яны не сталі «грандыёзусамі», трэба «біць проста на пятачку». Перад імі не трэба сыпаць бісер, бо яны растопчуць яго і, абярнуўшыся, з'ядуць таго, хто сыпле перад імі бісерам. Акордным момантам у сцвярджэнні гэтай філасофіі з'яўляецца апошняя, заключная сцэна — абарона Гарлахвацкім сваёй «дысертацыі». Гэта — баль Дабра, а не сатаны. У мастацкіх адносінах сцэна настолькі геніяльна вышсана, што сапраўды з'яўляецца парадам-але і выключна ўсіх мастацкіх сродкаў, якімі так па-майстэрску валодае Крапіва-драматург: Акрамя маналогаў і дыялогаў у ёй — і гратэск, і іронія, і дэталі, і камічная сітуацыя. Да ўсяго ж яшчэ менавіта ў гэтай сцэне пісьменнік дасягае найбольшай афарыстычнасці ў выражэнні сваёй філасофіі: «такі свінтус грандыёзус можа шмат шкоды нарабіць. Баяцца іх, аднак жа, не трэба. Свінячыя маманты могуць жыць толькі там, дзе ім спрыяе клімат, — у атмасферы баязлівасці, разгубленасці, а там, дзе пануе мужнасць, чэснасць, яны жыць не могуць і хутка выдыхаюць. Няхай жа ведаюць усе свінні — мамантавыя і немамантавыя: калі каторая з іх паспрабуе пакасціць у нашай савецкай навуцы, будзем біць проста па пятачку».

Невыпадкова многія з выразаў камедыі сталі крылатым^ узбагацілі нашу мову трапнымі выслоўямі, як узбагаціў Крапіва мову свайго твора «залацінкамі» народнай мудрасці: «працуюць і смаку не чуюць», «аж пыл курэў», «хто ў боб, а хто ў гарох», «душа ў пятках»...

Усім творам і вобразамі Левановіча і Веры ў прыватнасці драматург даводзіць, што перамога над злом магчыма толькі пры агульных намаганнях усіх сумленных і здаровых сіл у грамадстве, славіць высакароднасць і здольнасць людзей дапамагчы іншым у сітуацыі, якая можа быць небяспечнай для іх саміх. Дабро толькі тады дабро, калі яно дзейснае, калі здольна абараніць сябе і справу, якой яно

служыць. Вобразам Чарнавуса пісьменнік славіць прафесіяналізм, адданае служэнне справе. Адначасова ён папярэджвае, што філасофія «мая хата з краю» можа нашкодзіць і таму, хто яе прытрымліваецца, і справе, якой служыць адданы і сумленны чалавек. Чарнавус выдатна ведаў і разумеў сутнасць Гарлахвацкага, якую вычарпальна, хоць і з уласцівай яму тактоўнасцю, вызначыў Туляга: «Свет пройдзеце, другога такога не знойдзеце». Ведаў, але стараўся адмежавацца ад усяго, спадзеючыся, што ні яго, ні яго справы гэта не закране. Вельмі шкодная і небяспечная пазіцыя, гэтаму і ў жыцці, і ў гісторыі «мы тьму примеров слышим», як гаварыў І. А. Крылоў.

Напісаная ў 1939 г., камедыя была вельмі смелай для свайго часу. Нялёгкім быў яе шлях на падмосткі сцэны. Аднак першы спектакль па п'есе стаў падзеяй у гісторыі тэатральнага мастацтва, бо аб'яднаў цэлае сузор'е талентаў: Туляга — Барыс Платонаў, цёця Каця — Лідзія Ржэцкая, Зіначка Зёлкіна — Стэфанія Станюта. Упершыню п'еса была пастаўлена ў час дэкады беларускага мастацтва ў Маскве. Чакае яна свайго пастаноўшчыка і сёння, бо твор гэты геніяльны, а праблемы, узнятыя ў ім, вечныя і надзённыя, урокі, якія дае нам Крапіва-філосаф, вельмі карысныя і патрэбныя.

**2. Асноўныя матывы і вобразы паэзіі Янкі Купалы. Тэма народнага жыцця і любоў да Радзімы ў творчасці паэта**

І з усіх песняроў мне мілей і бліжэй
Роднай мовы пясняр — неўміручы Купала.
*Н. Гілевіч*

Ніхто лепш, як сам Янка Купала, не сказаў пра яго запаветную мару, жыццёвае і пісьменніцкае крэда:

*З цэлым народам гутарку весці,*
*Сэрца мільёнаў падслухаць біцця...*

Народ і Бацькаўшчына — найвялікшы для яго скарб, а любоў да іх — пачуццё, што вызначыла і жыццё Янкі Купалы, і яго паэзію.

«У народ і край свой толькі веру і веру ў самаго сябе», — так па-максімалісцку катэгарычна акрэсліў для сябе паэт тыя абсягі, на якіх ён быў уладаром.

Першы купалаўскі верш «Мужык», надрукаваны ў 1905 г. у газеце «Северо-Западный край», стаў адначасова і праграмным творам паэта, бо вызначыў усю яго творчасць.

Заслуга Янкі Купалы перад нашай нацыяй і народам у тым, што ён, здолеўшы ўвабраць у сябе лепшыя дасягненні і традыцыі сваіх

таленавітых папярэднікаў Багушэвіча і Цёткі, пайшоў далей за іх. Ён першы, хто з незвычайнай сілай, «на свет цэлы», сказаў і аб нашай мары, і аб нашым праве «людзьмі звацца».

Верш «Мужык» напісаны ў форме маналога, чым дасягаецца рэалізм і выключная пераканаўчасць, а значыць, і ўздзеянне на чытача. Сапраўды, ніхто лепш пра пакуты чалавека не раскажа, чым ён сам. І ўсё ж наватарства і мастацкая вартасць верша заключаюцца найперш у сіле, з якой паэт здолеў сказаць пра да гэтага нікім нязнанае — годнасць і гонар беларуса. Менавіта другая кампазіцыйная частка верша з'яўляецца сімвалічнай і вызначальнай для ўсёй творчасці Янкі Купалы:

*Але хоць колькі жыць тут буду,*
*Як будзе век тут мой вялік,*
*Ніколі, браткі, не забуду,*
*Што чалавек я, хоць мужык.*
*І кожны, хто мяне спытае,*
*Пачуе толькі адзін крык:*
*Што хоць мной кожны пагарджае,*
*Я буду жыць! — бо я мужык!*

Сцвярджэнне думкі пра годнасць, жыццястойкасць і непераможнасць свайго народа будзе лейтматывам гучаць у многіх творах паэта:

*Жыў беларус — і будзе жыць!*

Верш «А хто там ідзе?», які Максім Горкі справядліва назваў «гімнам беларусаў», напісаны ўжо дыялогам, каб узмацніць эфект уздзеяння «на свет цэлы». Пытаецца нехта, быццам ідзе голас з неба. І гэты «нехта» вядзе размову з «цэлым народам», імя якому — беларусы:

*А хто там ідзе, а хто там ідзе*
*У агромністай такой грамадзе?*
*— Беларусы.*

Ідэя верша афарыстычна сфармулявана ў апошняй страфе:

*А чаго ж, чаго захацелась ім,*
*Пагарджаным век, ім, сляпым, глухім?*
*— Людзьмі звацца.*

Марачы «з цэлым народам гутарку весці», паэт здолеў «на свет цэлы» ад імя свайго народа заявіць пра яго годнасць і гонар, яго мары і памкненні. Якуб Колас назваў гэты верш праграмай і лозунгам беларускай паэзіі. Будзе справядліва назваць яго і праграмай нацыянальнага адраджэння.

Захапленне прыгажосцю і веліччу працоўнага чалавека вызначае рамантычную ўзнёсласць, урачыстасць і вобразнасць верша «Жняя». Прыгажуня-працаўніца параўноўваецца з сонцам («уся сама — як

сонца»), з царыцай («як сама царыца ў залатой кароне»). Метафарычнасцю пейзажнай замалёўкі ўслаўляецца гармонія чалавека і прыроды, выяўляецца пачуццё захаплення сапраўднай прыгажосцю, якой і з'яўляецца зямля і на ёй — чалавек.

*Вецер абнімае*
*Стан яе дзявочы,*
*Сонца ёй цалуе*
*Шыю, твар і вочы.*
*Каласкі хінуцца*
*Перад ёй паклонна,*
*Дзівіцца ігруша*
*На мяжы зялёнай.*

У эпічным вершы «Сын і маці», напісаным у форме дыялога, паэт быццам вызначыў для сябе і для нас тры святыні, якія павінны быць у душы кожнага з ыас, калі хочам «людзьмі звацца». Гэтыя святыні — Радзіма, народ і мова. Усімі сваімі творамі Янка Купала заклікае і вучыць нас «любіць свабоду, родны край і мову». Некаторыя яго вершы напісаны ў форме звароту непасрэдна да нас. Радкі такіх вершаў гучаць і як мудрая парада, і як наказ, і як запавет:

*Не шукай ты шчасця, долі*
*На чужым далёкім полі,*
*Гэт, за шумным лесам-борам,*
*За шырокім сінім морам*
*Не шукай ты шчасця, долі!*
*Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,*
*Там, дзе маці над калыскай*
*Табе песні напявала,*
*Як налога калыхала,*
*Толькі ўмей шукаці блізка!*

(«Не шукай...»)

Настойлівы і непахісны Купала і ў сваім перакананні, што пакуль жыве мова — жыве і народ. Любоў да мовы, ва ўсведамленні Купалы, ёсць адно з праяўленняў любові да Радзімы і народа, залог неўміручасці народа і ўмова яго нацыянальнага адраджэння. Гэтая думка з'яўляецца лейтматывам патрыятычнага верша «Роднае слова», напісанага ў форме звароту да святыні, якой для ўладара «беларускай песні» з'яўляецца родная мова:

*Бяссмертнае слова ты, роднае слова!*
*Ты крыўды, няпраўды змагло;*
*Хоць гналі цябе, накладалі оковы,*
*Дый дарма: жывеш, як жыло!*

Радзіма — гэта святыня, дадзеная нам Богам, бо яе не выбіраюць, яна нам засталася «ад прадзедаў спакон вякоў», яе любяць як маці, яе не выбіраюць, не мяняюць. У вершы «Спадчына», якім адкрываецца аднайменны зборнік, выдадзены ў 1922 г., няма характэрных для Купалы-рамантыка высокіх эпітэтаў. І гэта тлумачыцца не толькі трагічным для Радзімы часам, калі быў напісаны верш: Беларусь была акупавана, яе зрабілі арэнай ваенных дзеянняў. Адступаючы, нямецкія войскі перадавалі яе белапалякам, над ёю — «крык варонiных грамад на могілкавым кладзьбішчы». Лёс нашай Бацькаўшчыны рэдка калі быў шчаслівым, аднак паэт знаходзіў у сабе сілы складаць «гімн пабедны сярод крыжоў, магіл», знаходзіў для выяўлення сваёй любові і захаплення красой роднага краю і прыгожа-квяцістыя эпітэты. У гэтым жа вершы — «стары амшалы тын», «дуб апалены». Эфект уздзеяння на чытача дасягаецца менавіта адсутнасцю «прыгожа-квяцістага», рамантычнага, яркага, узвышанага. Быццам бы ўсё дзеля таго, каб не зацьміць галоўны вобраз — вобраз спадчыны як найвялікшага скарбу для чалавека: тое мілае, дарагое і прыгожае, што роднае.

*Жыве з ім дум маіх сям 'я*
*І сніць з ім сны нязводныя.*
*Завецца ж спадчына мая*
*Ўсяго Старонкай Роднаю.*

Філасофія верша, сцвярджэнне таго, што любоў да спадчыны павінна быць дзейснаю, заключана ў страфе

*І ў белы дзень, і ў чорну ноч*
*Я ўсцяж раблю агледзіны,*
*Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,*
*Ці трутнем ён не з 'едзены.*

Радзіма і свобода, незалежнасць — для паэта паняцці непадзельныя. Ніхто з беларускіх паэтаў пачатку стагоддзя з такім запалам, мужнасцю, таленавітасцю і так паслядоўна не адстойваў, не бараніў ідэю нацыянальнага адраджэння і незалежнасці, як Янка Купала. Усведамленне волі і незалежнасці як найвялікшай каштоўнасці нацыі было вызначальным у яго светапоглядзе, а значыць, і ў творчасці:

*Хай Беларусь, мая старонка,*
*Ўваскрэсне к вольному жыццю.*

Заклікаючы свой народ «на вялікую нараду, на вялікі сход», паэт дакляруе яму вырашыць самае галоўнае пытанне:

*Як жыць мае, пажываці*
*У родным краі, ў роднай хаце, —*
*Як заводзіць лад:*

*Ці жыць далей у няволі,*
*Ці разжыцца новай доляй,*
*Новы узнесць пасад.*

(«Час!»)

**3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы «Спадчына»**

Ад прадзедаў спакон вякоў
Мне засталася спадчына;
Паміж сваіх і чужакоў
Яна мне ласкай матчынай.

Аб ёй мне баюць казкі-сны
Вясеннія праталіны,
І лесу шэлест верасны,
І ў полі дуб апалены.

Аб ёй мне будзіць успамін
На ліпе бусел клёкатам
І той стары амшалы тын,
Што лёг ля вёсак покатам;

І тое нуднае ягнят
Бляянне-зоў на пасьбішчы,
І крык вароніных грамад
На могілкавым кладзьбішчы.

І ў белы дзень і ў чорну ноч
Я ўсцяж раблю аiледзіны,
Ці гэты скарб не збрыў дзе проч,
Ці трутнем ён не з'едзены.

Нашу яго ў жывой душы,
Як вечны светач-полымя,
Што сярод цемры і глушы
Мне свеціць між вандоламі.

Жыве з ім дум маіх сям'я
І сніць з ім сны нязводныя.
Завецца ж спадчына мая
Ўсяго Старонкай Роднаю.

## Білет № 6

### 1. Матывы і вобразы паэзіі Ніла Гілевіча

Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе:
Мы —дзеці роднае сям'і,
І —дзеці Маці-Беларусі,
І — дзеці Матухны-Зямлі.
*Н. Гілевіч*

Ніл Гілевіч — летапісец нашай сучаснасці. Талент яго шчодры, багаты, разнастайны. Ён і вядомы перакладчык, і вучоны-фалькларыст, і педагог, і крытык, і публіцыст, і грамадскі дзеяч. І ніхто з сучасных нам паэтаў з такой палкасцю і таленавітасцю не паказвае і не даказвае, што «цяжка шлях нам церабіць да Беларусі», як народны паэт Ніл Гілевіч. Яго творчая спадчына — гэта мастацкае ўвасабленне шляху беларусаў да... Беларусі. Славячы красу і веліч роднага краю («Край мой беларускі, край», «Я хаджу, закаханы...» і інш.) і ўсё тое людскае, добрае, што, безумоўна, ёсць у родных дзецях гэтай зямлі, паэт даследуе вытокі, прычыны і таго, што не можа не трывожыць і не засмучаць: і наша «манкурцтва», і многія іншыя выявы бездухоўнасці... Даследуе і часам не знаходзіць тым выявам вытлумачэння:

*Відаць, пракляцця знак ляжыць*
*На нас ад роду, і таму*
*Так цяжка шлях нам церабіць*
*Да Беларусі!*
(«Шлях да Беларусі»)

Лірычны герой верша ўсведамляе ўсю небяспеку бездухоўнасці, што аддаляе нас ад святыні — роднай зямлі: «О, як далека нам яшчэ да Беларусі!»

Парадаксальная думка! Мы ж тут, на гэтай зямлі жывём, навошта ж нам яшчэ ісці да яе? І як наогул ісці туды, дзе мы і так, здавалася б, ёсць? Пакуль што, можа, і ёсць. Але — ці будзем?.. У вершы відавочная біблейская рэмінісцэнцыя пра выхад іудзеяў з егіпецкага рабства. Доўгім і пакутніцкім быў той шлях, але нават і пасля яго на абяцаную Богам зямлю ступілі толькі нашчадкі тых, хто да яе ішоў, — вольныя людзі.

У паэзіі Ніла Гілевіча — адказ на пытанне, ад чаго нам трэба вызбавіцца, каб быць вартымі нашай «святой зямлі» і дайсці да Беларусі. Асноўным зместам многіх зборнікаў паэта, і ў прыватнасці аднаго з

апошніх — «На высокім алтары», з'яўляецца лёс беларускай мовы і культуры, духоўнасць народа, памяць яго і будучыня.

Боль і гнеў, вера і надзея, каханне і захапленне, пяшчота і замілаванне, туга і папрок, гнеў і расчараванне — уся гама пачуццяў у лірычных, філасофскіх і публіцыстычных вершах Ніла Гілевіча.

Многія вершы, прысвечаныя роднай мове і клопату пра яе існаванне (а значыць, і пра існаванне нацыі!), напісаны ў форме звароту да сучасніка. Паэт-філосаф па-бацькоўску ўшчувае, пераконвае, папракае, імкнучыся паўплываць на нашы душы і розум:

*Брат мой! Братка мой! Братачка родны!*
*Адкажы — сам сабе адкажы:*
*Чым зрабіўся табе непрыгодны*
*Скарб бясцэнны тваёй жа душы?*
*Ад чаго так бяздумна, бязмоўна*
*Ты яго выракаешся сам?*
*І чаму табе так усё роўна,*
*Што аборай становіцца храм?*

(«Адкажы!»)

Не слухаюць дзеці свайго бацьку... І ў вершы на тую ж тэму — «За драбніцу» —гучыць ужо іншая інтанацыя: саркастычная, гнеўная і абуральная:

*Зноў нас хваляць! Ізноў — за холуйства!*
*І мы ўдзячна прымаем хвалу...*

Вычарпаўшы да канца ўсе магчымасці пераканаць нас, прымусіць задумацца, ужо самой назвай верша «Вы не яе — вы сябе прыніжаеце» аўтар нагадвае вечныя ісціны: ніколі не будзе паважаны іншымі той, хто сам сябе не паважае. Недавер, падазронасць і нават гідлівасць у самавітых людзей выклікае той, хто свайго роднага выракаецца...

Праблемам нацыянальнага адраджэння прысвечана і адна з апошніх кніг паэта «Любоў прасветлая: Роздумы ў вершах і прозе аб роднай мове».

Спалучэнне лірычнага і эпічнага, пяшчотнага і гнеўнага, элегічнага і гумарыстычнага — яшчэ адна адметная асаблівасць творчасці Ніла Гілевіча.

Пакаленне Ніла Гілевіча прынята называць пакаленнем, дзяцінства якога апалена вайной. Яму было дзесяць, калі пачалася Вялікая Айчынная. Трагедыю народа ён надзвычай хвалююча, таленавіта паказаў не толькі ў сваіх шматлікіх вершах, але і ў аўтабіяграфічнай аповесці «Пра час і пра сябе». Трагедыю народа паэт раскрыў праз трагедыю дзяцей, чым тлумачыцца сіла ўздзеяння гэтага твора на

чытача. У паэме «Заручыны» сцвярджаецца, што не меншым выпрабаваннем для нашага народа было і пасляваеннае ліхалецце: голад, нястачы, а да ўсяго — скалечаныя вайной лёсы і душы людскія. У паэме паказана трагедия закаханых, нязбытныя мары і надзеі.

Значнай падзеяй у літаратуры, дасканалым у мастацкіх адносінах з'яўляецца твор «Родныя дзеці» (1985) — першы ў беларускай літаратуры раман у вершах. У гэтым філасофскім па сутнасці, арыгінальным па форме і кампазіцыі творы паэт здолеў панарамна і разам з тым глыбока псіхалагічна адлюстраваць сучаснае жыццё беларускага народа, выявіць сутнасць душы беларуса. Акрамя таго, у ім пастаўлены і прааналізаваны тыя праблемы, ад вырашэння якіх залежыць не проста многае, а ўсё ў нашым грамадстве — існаванне нас як нацыі і народа наогул: захаванне гістарычнай памяці, прыроды, духоўнай спадчыны — усяго таго, што і з'яўляецца «златам дзяржавы», як вызначыў духоўнасць яшчэ М. Гусоўскі.

Сюжэт рамана «цэментуе» апісанне лёсу адной сям'і, родных дзяцей адной маці, 70-гадовы юбілей якой і стаў нагодай, каб сабраць іх усіх за бяседным сямейным сталом. У кожнага — свая дарога, свой лёс, сваё шчасце.

Галоўным вобразам Сцяпана Якубавіча Вячоркі — таленавітага кампазітара, музыканта — паэт сцвярджае, што сіла творцы — у еднасці са сваім народам, родным краем, што лёс народа і лёс мастака непадзельныя. Свайго героя паэт выпрабоўвае самымі рознымі абставінамі: адносінамі дароднай сям'і, народа, каханай, выпрабоўвае памяццю, сумленнем, часам. Перад намі Асоба — моцная, духоўна багатая, гарманічная, здольная на самааналіз, пераацэнку каштоўнасцей у сваёй душы, да таго ж асоба дзейная, здольная змяніць сваё жыццё ў адпаведнасці з перакананнямі.

Кампазіцыя твора даволі арыгінальная. У ім чатырнаццаць раздзелаў, аб'яднаных у пары. Раздзелы «Белы май», «Ганьба», «Разлад», «На ўзвеях часу» з'яўляюцца ўспамінамі Сцяпана пра студэнцкія гады, каханне да Альжбеты Францаўны Кудзёлкі, майскія шчаслівыя вечары. Праз успаміны свайго героя паэт не толькі дасягае псіхалагізму, даследуе вытокі і матывы ўчынкаў героя, але і дае многія ўрокі чытачу. Паэт папярэджвае маладых, што вялікае і моцнае каханне адначасова вельмі кволае, далікатнае пачуццё, што яго лёгка страціць, а за страту гэтую давядзецца плаціць усё жыццё. Твор адметны тым, што ў ім павучальныя і выхаваўчыя ідэі раскрываюцца аўтарам без маралізатарства, праз розныя жыццёвыя калізіі.

Аўтарскія філасофскія адступленні пасля першых шасці пар раздзелаў прысвячаюцца важнейшым праблемам сучаснасці: адказнасці чалавека перад Радзімай, сям'ёй, бездухоўнасці, п'янства, выхавання моладзі, развалу сям'і, бяздумнага і бяздушнага стаўленння да Матухны-Зямлі, занядбання святынь і сапраўдных каштоўнасцей, якімі і з'яўляюцца сям'я, родная зямля:

*Ніхто немучыцца дакорам,*
*Ніхто не думае пра грэх.*

Аўтарская канцэпцыя, філасофія твора выяўляецца не толькі праз сюжэт, лірычныя адступленні, але і праз рэплікі, дыялогі, маналогі герояў:

*Ад дармаедства ўся распуста:*
*Нішто душу не губіць так,*
*Як незаробленая луста,*
*Якою сыціцца лайдак.*

І з гэтым нельга не пагадзіцца. Своеасаблівым рупарам аўтарскай пазіцыі і філасофіі ў творы з'яўляецца вобраз дзядзькі Лёксы. Гэты чалавек надзелены мудрасцю, развагай, дабрынёй і чыстым сумленнем, да ўсяго яшчэ і пачуццём гумару, што робіць яго слова асабліва важкім, аўтарытэтным у народзе, а вобраз гэты — эстэтычна прываблівым для чытача.

Пісьменніцкі ідэал чалавека выяўлены і ўвасоблены ў родных дзецях Сохвіі Пятроўны: і ў Сцяпане, і ў нястомным працаўніку, верным мужу і добрым бацьку сваім дзецям Тамашу, і ў іх сястры і швагру Вінцусю (узор сапраўднай сям'і!). Але найперш пісьменніцкі ідэал выяўлены ў вобразе маці і сфармуляваны ў тосце Сцяпана ў гонар маці:

*Хвала таму, хто ў трудным часе*
*Без мітусні і без ныцця*
*Сваё праходзіць... Так, як мама...*

Сваё ж пісьменніцкае перакананне, якім не павінен быць чалавек, паэт рэалізаваў у вобразахЮзіка Бэнся і Мікіты Рэпы. Характар Мікіты раскрываецца праз яго мову, такую ж скалечаную, як яго лес: «На ўсё жыццё Мікіта Рэпа застаўся з крыўдаю на лес». Апісаннем жыццёвай калізіі з дзяцінства Мікіты паэт зноў дае нам урок і папярэджвае пра тое, што здрада бацькоў, іх несумленныя ўчынкі моцна раняць дзяцей і калечаць іх лёсы. Крыўду на бацьку Мікіта перанёс на ўсіх людзей, зрабіўся крыўдлівым, нялюдскім, прыдзірлівым да ўсіх і ўсяго. І мова яго, засмечаная русізмамі і канцылярызмамі,— адзежа яго душы: беднай, прэтэнцыёзнай, пыхлівай. Пра прыгажосць вясновай раніцы Мікіта расказвае: «Бывае, выйдзеш вутрам з хаты — так благавухае сярэнь, аж нос зрываюць араматы!» У стварэнні гэтага

вобраза найлепшым чынам выявіўся дар сатырыка, які рэалізаваны Нілам Гілевічам таксама і ў многіх сатырычных зборніках.

Галоўная ж ідэя паэмы і адначасова пісьменніцкі наказ нам усім быць сваёй сям'і, Радзіме і зямлі-карміцельцы роднымі дзецьмі, а не пасынкамі сфармуляваны ў афарыстычных радках, што вынесены ў эпіграф да адказу на білет: «Мы — тройчы дзеці ў вечным крузе...»

Калі будзем роднымі дзецьмі, то наперакор усяму дойдзем да Беларусі:

*Равуць вятры, грымяць грамы,*
*Пыл засціць вочы нам, іўсёж,*
*І ўсё ж мы дойдзем, дойдзем мы*
*Да Беларусі!..*

**2. Сацыяльная і маральна-філасофская праблематыка рамана Кузьмы Чорнага «Трэцяе пакаленне»**

Страціўшы духоўную аснову, грамадства згубіла і нармальны здаровы сэнс.

*В. Быкаў*

Як сказана ў Бібліі, усяму — свой час: час нарадзіцца і час паміраць, час раскідаць камяні і час збіраць камяні... І ў Бібліі ж сказана: «Яшчэ я пад сонцам пабачу: месца суду — а ў ім беззаконне, месца праўды, а там — няпраўда...» Здольнасць пабачыць тут і цяпер, дзе суд, а дзе беззаконне, дзе праўда, а дзе няпраўда, дадзена вельмі нямногім. Большасць жа гэта пабачыць толькі праз некаторы час, бо толькі час — самы справядлівы і бесстаронні суддзя.

Сёння відавочна, бадай, усім, хто здольны бачыць, што ні той лад, ні яго мараль, ні яго прынцыпы, ні яго «каштоўнасці», пра якія расказваецца ў рамане «Трэцяе пакаленне», не вытрымалі выпрабавання часам. Рухнула тая жудасная машына, але ж колькі ахвяр укруціла яна ў свой барабан, колькі лёсаў скалечыла, колькі гнёздаў раскідала, разбурыла!..

Кузьма Чорны не раз у сваіх артыкулах даводзіў, што пісьменніка павінны цікавіць падзеі не самі па сабе, а тое, які ўплыў яны робяць на чалавека. І сюжэт, і вобразы рамана сведчаць пра тое, што пісьменнік ставіў мэту паказаць уздзеянне савецкай улады на чалавека, вызваленне яго ад уласніцкай псіхалогіі, паказаць цяжкасці станаўлення савецкай улады і ўсталёўвання новых узаемаадносін

паміж людзьмі, выявіць новы, савецкі, бальшавіцкі падыход да такіх вякамі сфарміраваных каштоўнасцей, як сям'я, працавітасць...

Як бачым, ужо сама задума вымагае ад твора сацыяльнай і маральна-філасофскай накіраванасці і заглыбленасці. Як жа рэалізавана ў рамане задума аўтара, у чым жа ён нас пераканаў? Наколькі ўдалося таленавітаму пісьменніку-псіхолагу паказаць (як і патрабавалася тады ад усіх пісьменнікаў, што пісалі «па загаду сэрца», а сэрцы — «належалі партыі») савецкую ўладу як самую гуманную на зямлі, якая ўстанаўлівалася ў імя і на карысць такіх, як Міхал Тварыцкі?

Вельмі арыгінальныя і цікавыя пісьменніцкія сродкі, якімі задума рэалізавана. І найперш сюжэт як найважнейшы сродак у эпічным творы. Сюжэт у рамане дэтэктыўны. Раман напісаны па законах дэтэктыўнага жанру, бо ў ім ёсць усе атрыбуты дэтэктыву: злачынствы, злачынцы і пакаранне; ёсць следства і суд. Назарэўскі судзіць Міхала, прыводзіць неабвержныя «доказы» яго віноўнасці. Такім доказам з'яўляюцца не толькі ўтоеныя ім знойдзеныя грошы, але нават закарэлая ад поту яго світка. Яна, на думку Назарэўскага, сведчыць калі не пра кулацкую прыналежнасць Тварыцкага, то пра яго філасофію кулака. Толькі ён сваё кулацкае нутро пад той світкай прыхаваць хоча, дэманструючы сваю беднасць і батрацкасць. Следства дапамагае весці жонка абвінавачанага, нават сама праводзіць вобыск: «Вельмі вырасла да Міхала варожасць. Часамі нават з'яўляліся адзнакі злараднага жадання: каб няйначай знайсці які-небудзь доказ яго вінаватасці. Увечары яна запаліла ліхтар і нанава перавярнула ўсё ў клеці. К вечару гэтага дня яна дайшла да самага большага напружання нерваў».

Некаторыя хістанні і «няўпэўненасць у дачыненні да мужа і да свайго ўчынку» яна перамагла і заявіла на мужа. Пры гэтым яшчэ і параіла Назарэўскаму: «Трэба дамагацца ад яго, каб сказаў, дзе больш грошы. А не — то няхай давядзе фактамі, а не пустымі словамі, што грошай у яго больш няма». Што ж, Чорны не паграшыў супраць праўды. Як сказаў Твардоўскі: «Тут ни убавить, ни прибавить — так это было на земле!» Страшным грахом і злачынствам сталіншчыны, бальшавізму Васіль Быкаў назваў вынішчэнне адвечнай народнай маралі. Усё можна, усё апраўдана ідэяй. Ніякіх сумненняў і ваганняў нават у дачыненні да самых блізкіх людзей. Таго патрабавала новая ідэалогія, новыя прынцыпы новай улады. Сын ішоў на бацьку, брат — на брата, жонка — на мужа. Рваліся сувяз!, якія вякамі, тысячагоддзямі нельга было разарваць, — кроўныя. Сям'я як найвялікшая каштоўнасць і святыня («сям'я — падмурак царквы», сказана ў Бібліі) таксама адрынута. Усё — на службу ідэалогіі.

Адметная асаблівасць пісьменніцкага стылю — мойная, выключная асоба ў выключных абставінах — у поўнай меры выяўлена і ў рамане «Трэцяе пакаленне». Доўгі час літаратурная крытыка фарміравала ў чытача ўсведамленне аб моцы і сіле Міхала Тварыцкага ў яго апантанасці да нажывы і багацця. На такое прачытанне вобраза скіроўвала вучня і школа, наладжваючы «ўрокі-суды над Міхалам Тварыцкім». Зусім не звярталася ўвага на тую мужнасць і сілу, з якой і Міхал, і Зося (таксама, безумоўна, модная, выключная асоба!) вытрымлівалі жыццёвыя нягоды і выпрабаванні. І тут Чорны-псіхолаг і рэаліст не паграшыў супраць праўды, надзяліўшы герояў тыповай для ўсяго нашага народа якасцю — выключнай працавітасцю, цягавітасцю і вынослівасцю. Прачытаўшы раман, нельга не пагадзіцца з высновай вучоных, якія даводзяць, што працавітасць — катэгорыя не столькі маральная, колькі біялагічная, бо яна— сведчанне моцнага інстынкту самазахавання. Лянота, нядбайнасць і гультайства — праграма на самавынішчэнне. З працавітасцю цесна звязана і вынікае з яе яшчэ адна якасць, што ў ментальнасці нашага народа наогул, — імкненне быць гаспадаром на сваёй зямлі, стварыць надзейны падмурак для годнага жыцця сваіх дзяцей, клопат пра іх.

Усімі гэтымі якасцямі ў поўнай меры валодае Міхал Тварыцкі як прадстаўнік свайго народа. Сілу ён мае незвычайную. Аднак жа (і гэта таксама пераканаўча паказана ў рамане) на ўсякую сілу ёсць іншая сіла. Злачынства савецкай улады яшчэ і ў тым, што яна справакавала людзей на выяўленне і рэалізацыю не лепшых маральных якасцей. Вялікае назначэнне дэталі ў сцвярджэнні гэтай думкі. Пісьменнік пастаянна падкрэслівае прыкметы нялюдскага і нават звярынага ў абліччы Міхала, у лёсе якога ўсё рушыцца. З прыходам новай улады жыццё яго не толькі не палепшылася, а наадварот, ускладнілася новымі праблемамі, якія ўжо не вырашаліся нават яго нястомнай працавітасцю і дбайнасцю.

Час быў такі, што ўсе спрадвечныя каштоўнасці былі не проста адрынуты, а аб'яўлены шкодніцкімі: патрыятызм — нацдэмаўшчынай; працавітасць — кулацкай сквапнасцю; клопат пра заўтрашні дзень — прагай да нажывы; вернасць сям'і і дзецям — слабасцю і здрадай уладзе. Усё перавернута з ног на галаву. І таго, хто праціўіўся такому перавароту, ламалі. Сведчанне таму не толькі лес Міхала Тварыцкага, які два гады адсядзеў у турме, а вярнуўся «крышталёна чыстым» і пазбаўленым «перажыткаў» мінулага. Сам Кузьма Чорны восем месяцаў адпакутаваў у турме, дзе яго катавалі, білі гумавымі шлангамі па галаве... У чым тое «ачышчэнне» героя, акрамя таго, што ён забівае Толіка Скуратовіча, пісьменнік нам не паказвае. Гісторыя

дапісала раман за яго: выявы вынішчэння спрадвечнага і лепшага ў чалавеку (любові да сваёй зямлі-карміцелькі, працавітасці, дбайнасці, клопату пра сваіх бацькоў і дзяцей, вернасці сваёй сям'і) балюча адчуваюцца і сёння.

Пісьменнік ставіў перад сабой мэту паказаць уздзеянне падзей на свядомасць чалавека — гэта значыць, паказаць эвалюцыю яго душы. Абсалютным крытэрыем эвалюцыі душы любога чалавека з'яўляецца змена і замена нянавісці на любоў, помсты — на літасць, непрымірымасці — на згоду і даравальнасць...

Выдатна паказана ў рамане, як пачуццё любасці, згоды, удзячнасці, што нарадзілася ў душы Зосі-падлетка да Міхалкі, яе захапленне яго працавітасцю, дзякуючы якой яны і здолелі выжыць разам, гэтыя два адзінокія асірацелыя чалавекі, саступіла месца варожасці, злараднаму жаданню «знайсці які-небудзь доказ яго вінаватасці». Былі «моманты і хістанні, была няўпэўненасць», але «яна перамагла ўсё гэта». Вось такая адбылася «эвалюцыя»...

Выпрабоўваючы сваіх герояў бесчалавечнымі абставінамі, пісьменнік прымушае нас задумацца над вечнымі праблемамі: вернасці і здрады; сям'і як найвялікшай каштоўнасці чалавека і грамадства; віны і трагедыі; адказнасці чалавека перад сям'ёй і грамадствам... Вызначальнай і цэнтральнай у рамане з'яўляецца праблема магчымасцей чалавека ў сітуацыі, якая мацнейшая за яго. Не ў тым віна Зосі Тварыцкай, якая, прагнучы лепшай долі, паверыла, як быкаўская Сцепаніда, у змены да лепшага, што так шчодра абяцаліся новай уладай. Віна ў тым, што яна, аддана служачы ёй, «перамагла» ў імя яе ўсё лепшае, што было, несумненна, у яе душы: любоў, спагаду, удзячнасць, вернасць, абвостранае пачуццё справядлівасці, шчырасць, даверлівасць.

Даць волю ці паставіць у сваёй душы заслон варожасці, нянавісці, «злараднаму жаданню» віноўнасці бліжняга свайго залежыць толькі ад чалавека. Трагедыя Міхала ў тым, што самыя лепшыя і чалавечныя якасці яго асобы былі адрынуты, пакараны. Самыя ж горшыя былі справакаваны нялюдскімі абставінамі. У яго трагедыі — трагедыя ўсяго народа, трагедыя пакалення, якому было наканавана нарадзіцца і жыць у часы «карэннага пералому». І пералом той прайшоўся найперш па душах людскіх.

**3. Прачытаць на памяць верш з сучаснай беларускай паэзіі**

**Трэба дома бываць часцей**

Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.
Не забыць, як падвялы аер
На памытай падлозе пахне,
Як у студню цыбаты асвер
Запускае руку да пахі.
Не забыць сцежкі той, што цябе
На дарогу выводзіла з дому,
Што у хаце там быў рубель
У цане і па курсу старому.
Не забыць, як марозам злым
Клямка пальцы пячэ балюча
І адкуль на стале тваім
Бохан свежага хлеба пахучы.
Помніць свой на іржышчы цень,
Не забыць, як завуць суседа,
Не забыць, як пяе пад дзень
За вясёлым сталом бяседа.
Помніць кожнай мясціны спеў,
Кожны кут у прыціхлай хаце.
Лесу дзякаваць, што паспеў
Ты пачуць блаславенне маці.
Трэба дома бываць часцей,
Трэба дома бываць не госцем,
Каб душою не ачарсцвець,
Каб не страціць святое штосьці.

*Р. Барадулін*

**Дабрата**

Нялёгка быць даверлівым і шчырым,
Нялёгка крыўды даўнія забыць;
Яны звісаюць, як цяжкія гіры,
І замінаюць верыць і любіць.

Нялёгка добрым быць,
хоць нам не трэба

Ні легка запрацованага хлеба,
Ні танных поспехаў, ні скідак, ні удач,
Ні вырашаных іншымі задач.

Ні тых пахвал, што легка раздаюцца
Сябрамі за абедзенным сталом,
Ні плётак, што вужакамі віюцца
І патыхаюць зайздрасцю і злом.

Усё праходзіць, быццам дождж няроўны, —
І боль, і злосць, і дробная брыда,
А застаецца важны і галоўны
І самы светлы талент — дабрата.

*С. Грахоўскі*

# Білет № 7

## 1. Літаратура Старажытнай Русі. Асветніцкая дзейнасць Кірылы Тураўскага і Еўфрасінні Полацкай

Шануем мы бацькоў імёны,
Навука й прыклад нам яны.
*У. Жылка*

Літаратура Старажытнай Русі (XI-XIII стагоддзі) вызначылася прыняццем хрысціянства, для распаўсюджання якога патрэбны былі кнігі, пісьменныя людзі. У IX ст. выдатныя славянскія (балгарскія) асветнікі Кірыла і Мяфодзій на аснове грэчаскага алфавіта стварылі славянскую азбуку і зрабілі першыя пераклады на стараславянскую мову твораў рэлігійнага зместу. З Балгарыі гэтыя творы пранікалі на Русь. Цэнтрамі перапіскі былі манастыры, дзе збіраліся і захоўваліся цэлыя бібліятэкі рукапісных кніг.

Напачатку ў старажытнай літаратуры пераважалі творы перакладныя. Асаблівае пашырэнне мелі асобныя кнігі Бібліі («Евангелле», «Псалтыр», «Апостал»), зборнікі пропаведзяў і казанняў, жыціі — апавяданні пра людзей, якіх царква прызнавала за святых.

Кампазіцыя большасці жыцій такая: рытарычны ўступ; аповед пра нараджэнне святога дзіцяці, дабрачыннасць бацькоў яго; дзяцінства і юнацтва, пострыг; апісанне вучэння падзвіжніка, яго подзвігу; пахвала святому. Выдатнымі ўзорам жыцій з'яўляецца «Жыццё Еўфрасінні Полацкай» — таленавіты твор невядомага аўтара, напісаны прыкладна праз паўстагоддзя пасля смерці асветніцы. Вобразнасць — адметная асаблівасць гэтага твора: «Еўфрасіння— арол, што, лунаючы ў небе, праляцеў ад захаду і да ўсходу, як прамень сонечны прасвятліў зямлю Полацкую».

Жыціі і летапісы маюць вялікае культурна-гістарычнае значэнне не толькі як помнікі нацыянальнай мовы і літаратуры, але і як каштоўная крыніца вывучэння багатага гераічнага мінулага нашага народа. Слушна сцвярджае А.Мельнікаў, што яны даюць магчымасць «зведаць, што думалі, чым захапляліся нашы далёкія і не вельмі далёкія продкі, у што верылі, чым ганарыліся, што любілі, чым грэбавалі».

Самым выдатным і дасканалым у мастацкіх адносінах агульнаславянскім помнікам старажытнай пары з'яўляецца «Слова пра паход Ігаравы».

У цэнтры «Слова...» — няўдалы паход старажытнарускіх князёў на полаўцаў у 1185 г. Паэт часта гаворыць пра славу дзядоў, славу продкаў, якой не ўсе нашчадкі вартыя. Сярод мінулых князёў паўстае перад намі вобраз незвычайнага полацкага князя, праўнука Уладзіміра Святаславіча і легендарнай Рагнеды, які цалкам, на думку аўтара, адпавядае крытэрыям ацэнкі гістарычнай асобы. Ні аднаму князю XI ст. не аддаў паэт столькі ўвагі, не сказаў столькі цёплых слоў, як Усяславу Чарадзею. Ён акружаны ў паэме таямнічым арэолам князя-чараўніка, надзелены незвычайнымі здольнасцямі ператварацца ў ваўка. Мудрым і дзейным валадаром, што княжыў ажно 57 гадоў, паказаны Усяслаў, які «вешчую меў душу ў дзёрзкім целе».

Праз рэтраспекцыі аўтар «Слова...» здолеў і раскрыць цяжкі лёс легендарнага князя, і выказаць сваё захапленне тым, каго лічыць ідэалам дзяржаўцы, ставячы яго ў прыклад сучасным яму князям, якія сваімі міжусобнымі войнамі аслабляюць дзяржаву і робяць яе даступнай для ворагаў. Вобразнасць, асацыятыўнасць, насычанасць метафарамі («душу веюць ад цела», «засеяны касцямі»), эпітэтамі («Нямігі крывавыя берагі») — адметнасць «Слова...». Яно палоніць нас музычнасцю паэтычнай мовы, трапнасцю метафар, дакладнасцю. Бітву, напрыклад, паэт параўноўвае з малацьбой і пірам. Паводле адной з літаратурных версій, якую не абвяргаў самы дасведчаны даследчык «Слова...» Дзмітрый Ліхачоў, аўтарства помніка магло належаць нашаму слыннаму земляку Кірылу Тураўскаму.

Сучаснікі назвалі яго другім Златавустам, «што ярчэй за ўсіх праззяў на Русі», вобразна і вычарпальна вызначылі сутнасць і значэнне яго асветніцкай дзейнасці: «Радуйся, свяціцелю, бо найсвятлейшым вучэннем сваім асвятліў землі Рускія! Радуйся, сонца, што асвятляе розумам Божым азмрочаных і цёмных!»

Старажытнабеларускі пісьменнік і прамоўца, дзеяч хрысціянскай царквы эпохі Кіеўскай Русі Кірыла Тураўскі на аснове дасканалага вывучэння Бібліі выпрацаваў самабытны стыль урачыстага царкоўнага красамоўства. Ён пакінуў 8 «слоў» — казанняў, аповесці-прытчы, 30 малітваў і некалькі канонаў. Яго творчасць, як і Біблія, вызначаецца сцвярджэннем вечных каштоўнасцей, выкарыстаннем прыёмаў іншасказання, алегорыі, сімвалізацыі, супастаўленнем умоўнага і рэальнага. Да прыкладу, «Прытча пра чалавечую душу і цела» (ці «Слова пра сляпога і кульгавага») — евангельская рэмінісцэнцыя пра руплівага гаспадара, які паставіў ля варот двух вартаўнікоў — сляпога і кульгавага — у надзеі, што злодзеяў кульгавы ўбачыць, а сляпы пачуе; самі ж яны не змогуць абакрасці гаспадара. Здарылася інакш: сляпы і кульгавы, аб'яднаўшы свае сілы (сляпы нёс кульгавага, а

кульгавы паказваў дарогу), прабраліся ў сад гаспадара і прысвоілі яго дабро. У вобразе сляпога Кірыла Тураўскі паказаў чалавечую душу, у вобразе кульгавага — цела. Галоўная ідэя — у сцвярджэнні гармоніі цела і душы, перавагі духоўнага над матэрыяльным.

Узорам рэалізацыі прыёмаў іншаказання (алегорыі, сімвалаў) як адметнасці стылю Кірылы Тураўскага з'яўляецца «Слова на Вялікдзень»:

*Сёння праз пакаянне не стала зімы грахоўнасці*
*і лёд нявер'я ўсведамленнем Бога растоплены.*

Прырода ў словах Кірылы Тураўскага мае сімвалічнае значэнне: сонца — Хрыстос; месяц— сімвал усяго, што цьмянее ад промняў сонца; зіма— сімвал грахоўнага; лёд — сімвал бязвер'я.

Пра дзейнасць асветніцы Еўфрасінні Полацкай, пра яе заслугі перад нашай нацыяй і ўздзеянне на нашы душы лепш, чым напісана ў «Жыцці...», ёй прысвечаным, сказаць нельга: «Была яна дапамогай пакрыўджаным, суцяшэннем засмучаным, распранутым — адзеннем, хворым — наведаннем ці, проста кажучы, — для ўсіх была ўсім».

Шасцёра сыноў знакамітага князя-вешчуна Усяслава Чарадзея ўзбагацілі радаводнае дрэва полацкай дынастыі Рагвалодавічаў шматлікімі атожылкамі. Нямала Чарадзеевых нашчадкаў увайшло ў гісторыю. Але найбольшую славу прынясуць Полацку пасля Усяслава не ваяры. Зрабіць гэта наканавана было яго ўнучцы — Еўфрасінні Полацкай. Яе жыццё, «як промень сонечны», прасвятліла «зямлю Полацкую».

Заслуга яе перад нашай нацыяй не толькі ў мецэнацтве і перапісванні кніг, не толькі ў садзеянні будаўніцтву Спасаўскага сабора, распісанага унікальнымі фрэскамі. З яе імем звязана і стварэнне ў 1161 г. полацкім майстрам Лазарам Богшам па яе заказе нацыянальнай рэліквіі — крыжа. Крыж адшукаў і некаторы час (да 1929 г.) ашчадна зберагаў дырэктар Беларускага дзяржаўнага музея Вацлаў Ластоўскі. Страчаная і адноўленая нашым сучаснікам — мастаком Міколам Кузьмічом — святыня дарагая нам і надпісам-клятвай на ёй: «...Калі ж не паслухаецца хто і вынесе з манастыра, хай не дапаможа яму святы крыж ні ў жыцці гэтым, ні ў будучым, хай пракляты будзе ён святой жыватворнаю Тройцаю ды святымі айцамі 300 і 50 (?) сямі сабораў святых айцоў і хай напаткае яго доля Іуды, які прадаў Хрыста. Хто ж асмеліцца ўчыніць такое ... валадар або князь, або епіскап ці ігумення, або іншы які чалавек, хай будзе на ім гэты праклён. Еўфрасіння ж, раба Хрыстова, што справіла гэты крыж, здабудзе вечнае жыццё з усімі святымі...» (пераклаў У Арлоў).

Надпіс зроблены на царкоўнаславянскай мове, але ў ім відавочны ўплыў жывой беларускай мовы з яе аканнем, асабліва ўплыў лексікі. Зусім верагодна, што тэкст гэтай «клятвы» прадыктавала майстру Лазару Богшу Еўфрасіння Полацкая, каб навекі захаваць у сваім горадзе гэты сімвал палітычнай самастойнасці і культурнага росквіту Полацкага княства — старажытнага правобраза Беларусі. Надпіс цікавы як факт літаратурнага мастацтва, як выяўленне ў слове святой душы нашай нябеснай заступніцы — Еўфрасінні Полацкай.

### 2. Трагедыя Хведара Роўбы і яго сям'і ў аповесці Васіля Быкава «Аблава»

Свет, што раздзіраецца між дабром і злом, чакае не элегічных песняпенняў, а лекара і выратоўцы.

*В. Быкаў*

Пра злачынствы сталіншчыны, пра трагедыю нашага народа ў эпоху «карэннага пералому», пра тое, як «крывёю напоўніліся поймы рэк», як бурліла «адчаем слёз людскіх разводдзе», напісана шмат твораў мемуарнай, дакументальнай і мастацкай літаратуры. Тэме калектывізацыі, сталіншчыны, адлюстраванню «праклятага» часу і яго трагічнага ўздзеяння на лёс народа прысвяціў таксама многія свае творы і Васіль Быкаў. Трагічным, знакавым, філасофскім і папераджальным творам на гэтую тэму з'яўляецца аповесць «Аблава». Пра аблаву на народ, пра яго пакуты ў гулагаўскіх архіпелагах пісалі многія. Васіль Быкаў здолеў дасягнуць максімальнага ўздзеяння на чытача тым, што паказаў аблаву, паляванне сына на роднага бацьку.

Чытача не могуць не ўразіць старонкі пра пакуты і смерць дачкі Хведара Волечкі, пра яго пакуты і прыніжэнні ў Котласе, страту жонкі, пра «жорстакае і няшчаднае» ў гэтым моры чалавечай азвярэласці. Зместам свайго твора пісьменнік пераконвае: чалавек становіцца лютым нелюдзем, калі настае нялюдскі час. «І ў ссылцы ён даволі нагледзеўся на ўсялякія выкруты чалавечых лёсаў, начальніцкую жорсткасць без мэты, ці якая мела адну мэту — здзек». І ўсё ж ні Хведар Роўба, ні чытач не былі падрыхтаваны да таго, што чакала наперадзе...

Спачуваючы Хведару Роўбе, ураджаныя яго пакутніцкім шляхам дадому, мы баяліся сустрэчы яго з тымі, па чыёй «міласці» ён прыняў такія пакуты. Мы баяліся зайздрослівага Мікіты Зыркаша, які не мог стрываць, што больш удачлівы гаспадар купіў малатарню, і таму

напісаў данос, нібыта Роўба тую малатарню выкарыстаў дзеля эксплуатацыі сялян. Небяспечнай і трагічнай для Роўбы магла быць сустрэча з «гарластым актывістам» Зміцерам Цыпруковым, які некалі не хацеў аддаць пазычаную ў Хведара трыццатку і з гэтай прычыны прапанаваў раскулачыць менавіта яго. Разнарадкі на высылку трэба было выконваць. Вось і стала гэтая прапанова апошняй кропляй у вырашэнні чалавечага лесу. Нястомны працаўнік, дбайны гаспадар Хведар Роўба вельмі здзіўлены, што на брыгадзірскай пасадзе ў яго Нядолішчы апынуўся гэты самы лайдак Зміцер — «самы няўклюдны гаспадар, у якога некалі здохла кабыла ад бяскорміцы, бо з'ела страху за зіму і не хапіла». Ён «за жыццё не навучыўся плясці лапцей (заўжды пляла яму жонка)», але затое «горла меў добрае, мог накрычаць на каго хочаш», таму і выбіўся ў начальнікі.

Праз успаміны Хведара Роўбы пісьменнік паказвае ўсю заганнасць, д'ябальскую і мэту, і сілу той улады, якая мабілізавала і рэалізавала менавіта тых, хто «был ничем», як спявалася ў песні-гімне той улады, хто быў непаважаны, неаўтарытэтны ў народзе «праз гультайства, праз нядбайства» сваё. Настаў зорны час для няўклюдных і не здатных на годнае і самавітае жыццё. А каб панаванне іх было поўнае, пачалі яны з даносаў і выжывання тых, хто ім замінаў. Злачынная ўлада і набірала сабе на службу злачынцаў і нелюдзяў.

Сюжэт і кампазіцыя аповесці падначалены задуме паказаць самае страшнае злачынства сталіншчыны і яго наступствы, уздзеянне на тыя пакаленні, якія будуць жыць пасля.

Пакутніцкі і доўгі шлях Хведара дадому, у яго Нядолішча, да роднага сына, на якога ўсе надзеі і спадзяванні, гісторыя Роўбавага жыцця завяршаюцца трагедыйным акордам выключнай сілы. Аказваецца, тыя выпрабаванні пакутамі ў бесчалавечных абставінах, у якіх «людзі гінулі як мухі ад непасільнай працы, галадухі і сухотаў, якія валілі нават дужых маладых мужчын... найбольш, аднак, ад сумутугі па родных мясцінах, ад нуды вечнага з імі расстання», — яшчэ не мяжа. Аблаву на Хведара Роўбу (загоншчыкі — аднавяскоўцы, раённае начальства і актыў, а таксама пагранічнікі) узначальвае яго родны сын Міколка. Ён калісьці не трапіў разам з бацькамі ў высылку, бо служыў у войску. Большы жах уявіць немагчыма.

Глыбокае пранікненне ў псіхалогію чалавека, даследаванне вытокаў і матываў учынкаў — адна з асаблівасцей творчасці В. Быкава. «Божа мой, Божа, чаму мне выпала гэткая доля? Чаму я такі бядак?» — нанава перажывае сваю трагедыю Хведар, трапіўшы ў родную вёску, пастаяўшы на зруйнаванай роднай сядзібе. А незадоўга

да сваёй гвалтоўнай смерці зноў будзе разважаць: «А можа, гэта яму пакаранне ад Бога?»

Сапраўды, як жа так здарылася, што некалі жаласлівы сынок, які ў дзяцінстве «дужа шкадаваў маці» і даглядаў «бедалагу курачку» са зламанай нагой, які «надта прыхільна памкнуўся да зямлі і гаспадаркі, рана пачаў рабіць плячо ў плячо з бацькам», быў схільны і здольны да вучобы, выступае як самы закляты вораг уласнага бацькі? Мы звыклыя думаць, што нелюдзямі становяцца абдзеленыя ласкай і любоўю, адрынутыя і нешчаслівыя. У Міколкі зусім іншы лёс. Дзяцінства яго нават у той складаны, нялёгкі час дзякуючы менавіта сям'і, бацькам не было «ўкрадзеным» і нешчаслівым.

Гісторыяй жахлівай здрады Міколкі пісьменнік папярэджвае пра д'ябальскую сілу дыктатуры, сталіншчыны, асабліва небяспечную для маладых. Сістэма знішчала чалавечнае ў чалавеку і правакавала на нялюдскае, а гэта намнога прасцей зрабіць з юнымі душамі, каб перайначыць іх. У школьныя гады Міколка і стаў перайначвацца, бо ўступіў у камсамол і займеў там пасаду сакратара ячэйкі. Ён з захапленнем прыняў «гарластую мітусню» камсамольцаў і хутка вызначыўся сваёй жорсткасцю. Гэта ён дамогся выключэння з камсамола за дробную правінку свайго даўняга сябрука Міхалінінага Шуркі. І здрада сяброўству, калі ёй надавалася палітычная падаплёка, лічылася доблесцю і праслаўлялася ў літаратуры, якая выдавала такую здраду за непахісную прынцыповасць. «Прынцыповы» Міколка змікіціў што да чаго і хутка пайшоў угору, стаў урэшце «вялікім начальнікам у раёне» — «партийным сакратаром». І начальнікам жорсткім. «Малады, а нібы той цівун!», «Усё мацюгом ды пагрозай, Сібір'ю палохае...» — кажуць пра яго людзі.

Палохае, бо і сам баіцца, што ў яго ёсць вялікая «пляма» ў біяграфіі — раскулачаны бацька. Афіцыйны тагачасны лозунг «Сын за бацьку не адказвае» быў фарысейскім. Адукаваны і прадбачлівы Роўбаў Міколка гэта добра ведае і таму парывае сувязі з роднымі, а потым і ўвогуле адракаецца ад бацькоў. І адмаўляецца не для прыліку, а ўсур'ёз, каб давесці сваю поўную адданасць новай уладзе. І выступае як самы закляты вораг роднага бацькі. Так пад націскам бесчалавечных абставін рабілі тады многія, каб зберагчы сваё жыццё. Праўда, большасць гымушаны былі рабіць з болем душэўным, фармальна. На гэта спадзяецца і Роўба, шукаючы сыну чалавечае апраўданне: «Пэўна ж, то не па сваёй волі — ён змушаны! Можа, яму загадалі?»

І ўсё ж пісьменнік настойлівы ў сваім перакананні, што былі той здрадзе не толькі знешнія прычыны. Настойлівы В. Быкаў у тым, што нічога выпадковага не бывае, што і ў сітуацыі, якая мацнейшая за

чалавека, у яго ёсць права, якое не дадзена забраць нікому, — застацца чалавекам. Сам Хведар вызначыў прычыну не толькі ўласнай трагедыі, але і ўласнай віны. Яго бацькоўская і чалавечая віна, што быў памяркоўным, талерантным і пасіўным, калі ламалася вера ў душы яго сына, калі «маўкліва дазволіў Міколку вынесці з хаты» абразы. Абразы, як і спілаваны камсамольцамі крыж на Петраковай Галгофе, — сімвал адрынутай веры. Галоўнае — вынішчыць веру, векавую народную мараль, пераступіць бар'ер, а далей ужо ўсё дазволена, усё магчыма.

У аповесці з незвычайным трагізмам і мастацкай сілай паказана самае страшнае злачынства сталінізму — знішчэнне векавой народнай маралі. Яго вынікам стаў разрыў самых моцных сувязей паміж людзьмі і пакаленнямі — кроўных, роднасных. Для нас жа аповесць — суровы напамін аб трагічным мінулым народа і адначасова папярэджанне пра тое, наколькі згубная для чалавека страта духоўнага і бездухоўнасць, узведзеная ў ранг дзяржаўнай палітыкі.

**3. Прачытаць на памяць верш пісьменніка-земляка**

**Полаччына**

Не шукайце красы за морамі,
Узбярэжжаў з крыштальнымі зорамі, —
Прыязджайце да нас на Полаччыну,
Пахадзіце яе прасторамі.
Тут азёры, як неба, сінія,
У чаротах чароды гусіныя,
А на дне Млечным Шляхам свецяцца
Трапяткія гурты язіныя.
Навальніцы грымяць над кручамі,
З гор бягуць ручаі грымучыя,
Тут ля Дрысы сасонкі звонкія,
Над Дзвіною бары пявучыя.
Тут вясёлкай сонца акружана,
Усміхаецца з кожнай лужыны.
Тут на кожнага закаханага
Салаўёў па чатыры тузіны.
Тут дзяўчаты ўсе — чарнабровыя,
На палях ільны двухметровыя...
Тут пад кожным курганам і каменем —
Ці быліна, ці казка чароўная...

*Г. Бураўкін*

# Білет № 8

**1. Характарыстыка творчасці Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча. Дунін-Марцінкевіч і фальклор**

Стаў сеяць па-свойму ўсё тое,
Што мы далей сеем сягоння.
*Янка Купала*

Жыццё В. Дуніна-Марцінкевіча — яскравы прыклад адданага служэння Бацькаўшчыне і народу не толькі словам, але і справай. У фальварку Люцынка недалёка ад Івянца, у вясковай цішы, ён не толькі пісаў свае творы. Дунін-Марцінкевіч адкрыў тут школу для сялянскіх дзяцей, у якой настаўнічалі яго дачка Каміла і сын Міраслаў. Пачынальнік беларускай драматургіі стварыў і першы нацыянальны тэатр, быў яго рэжысёрам-пастаноўшчыкам і нават акцёрам. У 1864 г. ён быў арыштаваны па падазрэнні ў напісанні антыўрадавых выданняў і больш за год знаходзіўся пад следствам у мінскай турме. Старэйшую яго дачку Камілу за ўдзел у паўстанні пад кіраўніцтвам К. Каліноўскага выслалі ў Салікамск.

Змены ў светапоглядзе пісьменніка вызначылі істотную, прынцыповую розніцу паміж яго дарэформеннай і паслярэформеннай творчасцю. Творчасць Дуніна-Марцінкевіча прынята падзяляць на два перыяды.

Дарэформенныя творы вытрыманы ў духу рамантызму. У іх рэалізаваны такія элементы светапогляду Дуніна-Марцінкевіча, як ідэалізаванае ўспрыманне жыцця, аптымізм, надзея на рэформы, якія павінны змяніць жыццё народа да лепшага, любоў да народа, захапленне яго таленавітасцю і працавітасцю. Пісьменнік прапануе свае метады ўздзеяння на «кепскіх» паноў: перавыхаванне, а калі неабходна — пакаранне і абмежаванне іх у дзеяннях. Пісьменнік заклікае ўсіх да чалавечнасці, да згоды і паразумення ў грамадстве.

Вялікі поспех выпаў на долю оперы «Ідылія», музыку да якой напісаў Станіслаў Мянюшка. Спектакль быў пастаўлены ў Мінску ў 1852 г. аматарскім калектывам пры ўдзеле самога Дуніна-Марцінкевіча, яго сям'і. Аўтар лібрэта быў рэжысёрам-пастаноўшчыкам спектакля, а таксама выконваў у ім ролю войта Навума Прагаворкі. В. Дунін-Марцінкевіч фактычна стаяў ля вытокаў новага нацыянальнага тэатра — не толькі як драматург, але і як рэжысёр і акцёр аматарскай сцэны.

Пастаноўку п'есы «Ідылія» («Сялянка») на падмостках Купалаўскага тэатра здзейсніў таленавіты рэжысёр Мікалай Пінігін. Аншлагі спектакля сведчаць пра таленавітасць твора, актуальнасць яго гуманістычных ідэй. Час паказаў, што надзеі пісьменніка на перавыхаванне паноў былі марныя, але тая мастацкая сіла, з якой драматург сказаў пра духоўнае багацце народа, яго культуры, сцвярджэнне вечных ісцін і ўслаўленне вечных каштоўнасцей, робяць твор цікавым і для нашага сучасніка.

Вобразам галоўнай гераіні пісьменнік славіць каханне, сцвярджае гармонію знешняй і ўнутранай прыгажосці, дае ўрокі паспяховай барацьбы са злом. План Юліі вывесці на чыстую ваду і пакараць жорсткага камісара Выкрутача паспяхова здзейснены дзякуючы яе вынаходліваму розуму і палкаму жаданню шчасця, лепшай долі для народа. Самым каларытным у камедыі з'яўляецца вобраз Навума Прыгаворкі, у якім увасоблены пісьменніцкі ідэал простага чалавека і захапленне яго мудрасцю, трапнасцю і багаццем беларускай мовы, якой гэтая мудрасць і выяўляецца. Просты сюжэт, у аснове якога «хітры» план дваранкі Юліі выдаць сябе за сялянку, закахаць у сябе франкамана і ненавісніка ўсяго нацыянальнага — Лятальскага, каб паўплываць на яго стаўленне да народа, «аздабляецца» па-майстэрску створанымі камічнымі сітуацыямі, прыказкамі і прымаўкамі, якімі так і сыпле Навум Прыгаворка.

Пісьменніцкай увагай да народных песень, звычаяў і традыцый, майстэрскім іх выкарыстаннем з мэтай уславіць народ і яго багатую духоўную спадчыну вылучаецца і паэма «Гапон» (1855).

Апісаннем калізій кахання сялянскага юнака Гапона і працаўніцы-прыгажуні Кацярыны пісьменнік дасягае выключнага ўздзеяння на чытача і пераканаўчасці ў паказе тагачаснага прыгоннага жыцця сялян. Канфлікт паміж закаханымі з аднаго боку і хлуслівым амаральным аканомам з другога робіць сюжэт твора асабліва дынамічным, напружаным. Па нагаворы аканома, які таксама ўпадабаў Кацярыну, Гапона арыштоўваюць і здаюць у салдаты. Здавалася б, дабро пераможана. Аднак герой паэмы з гонарам вытрымлівае выпрабаванне, рэалізуючы пры гэтым свае самыя лепшыя якасці, — здолеў даслужыцца да афіцэра і стаць, па сутнасці, дваранінам. І ў гэтым творы, як і ў «Ідыліі», пісьменнік прапануе свай варыянт пакарання зла: там — перавыхаванне Лятальскага і выгнанне Банавантуры Выкрутача, тут — адпраўка ў рэкруты аканома. Не капай яму другому... І гэты твор, як і «Ідылія», заканчваецца вяселлем. Пані, даведаўшыся пра ганебныя ўчынкі свайго аканома, адправіла яго самога ў рэкруты, а маладых шчодра адарыла.

Асаблівасцю паэмы з'яўляецца спалучэнне эпічнага, лірычнага і драматычнага. Эмацыянальнасць аўтарскага аповеду дасягаецца і меладраматычнымі сцэнамі, і ўключэннем народных песень, і насычэннем мовы словамі з памяншальна-ласкальнымі суфіксамі, і лірычнымі адступленнямі, і драматызацыяй дзеяння. Усё гэта сведчыць пра таленавітасць твора, напісанага па законах сентыменталізму.

Цікавасцю пісьменніка да фальклору, да старажытных звычаяў і абрадаў беларусаў вызначаецца і вершаваная аповесць «Вечарніцы» (1855), дзве песні якой — па сутнасці, анекдоты з народнага жыцця. Але галоўнае ў творы — не апісаны выпадак з жыцця ці ўзяты з фальклору сюжэтны матыў, а паэтычнае аздабленне, лірычныя адступленні. У іх, як у апісанні старажытнага абраду ўшанавання продкаў, аўтар ідэалізуе мінулае, дзе быццам бы ў згодзе жылі паны і мужыкі, а князі любілі «добрых крывічан» як сваіх братоў і не давалі нікому іх крыўдзіць.

Зусім іншы погляд на шляхту і паноў-чыноўнікаў выяўлены ў творчасці паслярэформеннага перыяду. Гістарычныя падзеі і турэмнае зняволенне прымусілі В. Дуніна-Марцінкевіча зрабіць пераацэнку многіх каштоўнасцей, і як вынік — з ідылічнай яго творчасць становіцца рэалістычнай і рэзка сатырычнай.

Выкарыстаўшы ў «Пінскай шляхце» (1866) для сюжэта, на першы погляд, не вельмі значны, амаль анекдатычны факт, смешнае здарэнне, пісьменнік скіраваў увесь свой сатырычны запал на раскрыццё бюракратычнага суда і ўсёй парэформеннай рэчаіснасці. Гэта з'явілася адной з прычын цэнзурнай забароны п'есы, якая пабачыла свет толькі ў 1918 г. На глыбокім разуменні ўсёй абсурднасці, недарэчнасці паводзін герояў грунтуецца камізм твора «Пінская шляхта», жанр якога вызначыў сам пісьменнік, — «фарс-вадэвіль у адной дзеі».

Гратэскава, праз павелічальнае шкло паказана ў творы «правасуддзе» наогул, увасобленае ў вобразе Кручкова, нахабству, цынізму, непрафесіяналізму якога няма межаў. Чытаючы царскія ўказы і законы,ён дапускае такія скажэнні, ад якіх «вушы вянуць»: ён блытае эпохі, цароў, указы. Ды што там эпохі! Ён не ведае, колькі дзён у месяцы: «49 апрэля», «сенцябра 75-га дня». У гэтым вобразе пісьменнік сабраў і ў завострана-гіпербалічнай форме (праз камічныя сітуацыі, маналогі, дыялогі, мову, з дапамогай сатырычных сродкаў) паказаў усё самае характэрнае для царскага чыноўніцтва: свавольства, хабарніцтва, грубасць, п'янства і інш. І вывад напрошваецца сам сабой: улада, у якой такія «слугі», доўга існаваць не павінна і не будзе.

Складаным і супярэчлівым быў творчы шлях В. Дуніна-Марцінкевіча, як і светапогляд. Але таленавітасць пісьменніка, яго любоў да

народа, жаданне лепшай долі для яго, крытыка адмоўных з'яў вызначылі яго месца ў гісторыі беларускай літаратуры як буйнога мастака слова, заснавальніка нацыянальнай драматургіі.

Пра значэнне для нашай нацыянальнай культуры і пра сілу прыкладу В. Дуніна-Марцінкевіча для нашчадкаў сказаў вычарпальна Янка Купала:

*Жыве паміж намі дудар наш...*
*Жыць кожны так будзе, мой братку,*
*Хто родну старонку палюбіць,*
*Майляў добры сын сваю матку.*

**2. Сучасная беларуская паэзія, яе тэмы і вобразы (на прыкладзе творчасці двух-трох аўтараў)**

Ёсць у паэта свой аблог цалінны.
*А. Куляшоў*

Пакуль паэты будуць пець —
Не быць Радзіме безыменнай,
Зямлі бацькоў — не анямець!
*Н. Гілевіч*

Беларуская сучасная паэзія — сквецце талентаў, якое вызначаецца самабытнасцю і непаўторнасцю кожнага, бо кожны, паводле афарыстычнага выразу А. Куляшова, капае «рэчышча ўласнай ракі», якую скіроўвае ў акіян сусветнай культуры.

*Сапраўднаму паэту трэба мець*
*Уласны курс і вугал свой атакі, —*

так вобразна і вычарпальна вызначыў паэт У. Скарынкін галоўнае патрабаванне да кожнага творцы, што шчыруе на ніве паэзіі: у кожнага павінен быць свой голас, свой почырк. «Аблог цалінны» сэрцаў людскіх, якія, як папярэджваў класік, «цвёрдыя, быццам з камення», падуладны толькі дару выключнай сілы.

Сучасная беларуская паэзія прадстаўлена паэтамі розных пакаленняў і рознай творчай манеры. Гэта і вядомыя майстры паэтычнага радка, чыё дзяцінства было апалена вайной (А. Лойка, Н. Гілевіч, А. Вярцінскі, Р. Барадулін, В. Зуёнак, Я. Сіпакоў), і пакаленне, народжанае ў цяжкія пасляваенныя гады (С. Законнікаў, У. Някляеў, А. Разанаў, Я. Янішчыц), і паэты, якія адчулі радасць творчай працы ў 70-80-я гг. (Л. Дранько-Майсюк, А. Бадак).

Тэматыка сучаснай паэзіі надзвычай разнастайная: Радзіма, бацькоўскі дом, родная мова, гістарычнае мінулае, прырода, экалогія, чарнобыльская трагедыя, праца, каханне...

Рэквіемам па загінуўшых, абеліскам героям і напамінам быць пільнымі і берагчы мір з'яўляюцца «Рэквіем па кожным чацвёртым» А. Вярцінскага, «Абеліск» Я. Янішчыц.

Герой многіх твораў — чалавек працы. Сялянскую працу паэтызуюць А. Вярцінскі («Маці пячэ хлеб»), Е. Лось («Жніво»), Іх творы паказваюць, што працай чалавек і выпрабоўваецца, і рэалізуе сябе, і сцвярджае сябе на гэтай зямлі.

Самыя задушэўныя радкі шматлікіх вершаваных твораў прысвячаюцца Радзіме. Паэты ўзнімаюць пытанне аб адказнасці чалавека за зберажэнне яе прыгажосці, заклікаюць да гармоніі, адзінства чалавека з прыродай. У паэме «Чорная быль» С. Законнікаў спрабуе асэнсаваць прычыны трагедыі, папярэджвае аб наступствах духоўнага Чарнобыля:

*Кал і ж і зараз ты не загукаеш,*
*А будзеш жыць пад страхам і прынукай,*
*Чарнобыль не такіяшчэ чакае*
*Тваю зямлю, теаіх дзяцей і ўнукаў.*

Вялікае месца ў сучаснай паэзіі займае тэма кахання. Вершам «Ты пакліч мяне. Пазаві» Яўгенія Янішчыц зноў нагадвае ўсім вечную ісціну, што «пачынаецца ўсё з любві». Для выяўлення стану душы, вартага чалавека, і сцвярджэння думкі, што каханне — самая галоўная з усіх каштоўнасцей, якая робіць немагчымае магчымым, паэтка выкарыстала аксюмаран, што найлепш і вызначыў загадкавую сілу гэтай найвялікшай тайны і найвялікшага дару: «прыручаюцца салаўі». Паэтам і закаханым падуладна тое, чаго не можа ніхто, — прыручыць салаўя.

Магчыма, нехта з чытачоў усвядоміць метафару «прыручаюцца салаўі» як напамін паэтэсы пра тое, што «мы ў адказе за тых, каго прыручылі». Каханне як вялікі дар патрабуе ад закаханых і вялікай працы душы, пра што даводзіў і Маленькі Прынц з аднайменнага твора СентЭкзюпе ры.

«Сто паэтаў цягнуць хорам, ты — салістам», — так пра унікальнасць паэтычнага дару Рыгора Барадуліна сказаў Пімен Панчанка. Сапраўды, яго вершы нават без подпісу пазнаюцца па яркай вобразнасці, метафарычнасці, унутраннай рыфме, выразным гукапісе.

Балючая памяць пра апаленае вайной маленства пранізвае паэмы «Блакада», «Куліна». Матыў чакання з вайны родных і блізкіх моцна і трагічна гучыць у вершы «Бацьку»:

*Каторы раз сыходзіць снег...*
*Далюў вярталіся суседзі.*
*Я кожному насустрач бег*
*І чуў кароткае: «Прыедзе».*

Нямала радкоў прысвяціў паэт матчынай хаце, роднай вёсцы, кутку, дзе былі зроблены першыя крокі, дзе вучыўся, спаткаў першае каханне («Ушацкай школе», «Світанняў я з табой не сустракаў...»). Шчымлівыя, пранізлівая барадулінскія радкі аб вернасці бацькоўскаму дому робяць чалавека лепшым, напамінаюць кожнаму пра святыні, здрада якім — вялікі грэх:

*Трэба дома бываць часцей,*
*Трэба дома бываць не госцем,*
*Каб душою не ачарсцвець,*
*Каб не страціць святое штосьці.*

Паэзія Барадуліна пазбаўлена маралізавання, публіцыстычнасці, але часам паэт звяртаецца непасрэдна да нас, каб папярэдзіць пра тое, што трэба зрабіць неадкладна, бо можна спазніцца...

*Наведвайце бацькоў,*
*пакуль яны жывыя,*
*Пакуль дымяцца коміны —*
*наведвайце бацькоў.*

Бадай, галоўным у творчасці Р. Барадуліна з'яўляецца вобраз маці. Яна — пачатак жыцця, ідэал чалавека, зберагальніца маральных каштоўнасцей, а неруш матчынага слова — невычэрпная крыніца паэта. Маці прысвячаецца адна з апошніх кніг паэта «Евангелле ад Мамы» (1995).

Назва зборніка «Міласэрнасць плахі» (1992) вызначае яго філасофскі змест і адначасова ўласцівую толькі Р. Барадуліну манеру выяўлення думак і пачуццяў — метафарычную, парадаксальную.

Асабліва характэрным для творчасці Р. Барадуліна апошніх гадоў з'яўляецца верш, пра які ўхвальна азваўся В. Быкаў, — «Лёс да кожнага прыходзіць босы...». Біблейская рэмінісцэнцыя, метафарычнасць спрыяюць выяўленню філасофскай думкі пра поўную залежнасць чалавека ад лёсу, як і пра поўную свабоду выбару, якім і вызначаецца сутнасць чалавека. Працытуем яго поўнасцю:

*Лёс да кожнага прыходзіць босы,*
*ЯкХрыстос,*
*Каб бядзілі кожнага турботы,*
*Як абуць свой лёс у лапці, боты.*
*А яму не занасіць калёсы:*
*Боссю — каб нячутна! —*

*Ходзіць лёс.*
*Ты, нявольнік, вольны выбраць путы,*
*Пасталы змяніць на кірзачы,*
*Грукай збітьш, як парог, абцасам,*
*Смелы і ў руцэ з кавалкам ласым,*
*Помні заўсягды пра лес разуты,*
*Ногі босому не адтапчы.*

Метафарычнасць, прычым індывідуальная, аўтарская, вылучае гэты філасофскі верш. Па сутнасці, ён уяўляе сабой вянок метафар і аўтарскіх перыфраз.

Паэтам-філосафам у беларускай літаратуры заслужана лічыцца і Анатоль Вярцінскі, толькі філасафічнасць сваіх твораў ён выяўляе ў характэрнай для яго манеры. Пра што б ні пісаў паэт, ён праз асацыятыўныя сувязі падымаецца да філасофскага абагульнення.

У вершы «Гавары са мной ласкава...» апісваюцца ўзаеміны лірычнага героя з дачкой. Яна на нейкую бяскрыўдную, здавалася б, заўвагу заплакала наўзрыд і праз слёзы ўвесь час паўтарала: «Гавары са мной ласкава! гавары са мной ласкава!» Паэт разам са сваім героем прыходзіць да высновы:

*Пачуццё справядлівасці, годнасці ўласнай,*
*Мабыць, разам з жыццём нам прырода дае.*

Верш «Медсястры» таксама заканчваецца філасофскім вывадам, з якім нельга не пагадзіцца:

*Не ўсе хочуць быць добрымі,*
*Ды хочуць усе дабраты.*

Афарыстычнае выяўленне філасофскай думкі — асаблівасць лірыкі А. Вярцінскага. Так, да прыкладу, думку пра тое, што чалавек не павінен умешвацца ў асабістыя справы іншых, але ён не павінен быць абыякавым да людской бяды, паэт сфармуляваў у вершы «Бачу я...», які ўяўляе сабой афарызм.

*Бачу я: нехта некога любіць —*
*Гэта іх справа, гэта іх права;*
*Бачу я: нехта некога губіць —*
*Тут і мая ўжо справа.*

Усёй сваёй паэзіяй А. Вярцінскі сцвярджае ідэі дабра, міру, згоды, узаемаразумення паміж людзьмі: «Варожасць — самае горшае ў свеце людскім пачуццё. Дружыце — і будзе харошае, прыгожае ваша жыццё».

Ідэяй бесканфліктнага жыцця як умовы нашага існавання, гуманістычным пафасам прасякнута ўся творчасць паэта. Яго лірычны герой — інтэлігентны, выхаваны, памяркоўны чалавек, які схільны да

развag, да пераацэнкі каштоўнасцей, здольны ўбачыць высокае неба ідэала («адзін са зборнікаў паэта так і называецца: «Высокае неба ідэала»):

*Я не супраць гнева,*
*Ды я за тое, каб нас*
*Не білі ні справа, ні злева.*
*Ні ў профіль, ні ў анфас.*
*Каб годнасці нашай і гордасці*
*Ніхто не наносіў абраз,*
*Каб не было неабходнасці*
*Рашаць: ці біць у адказ?*

(«Вы зразумейце правільна...»)

Верш «Чалавек маленькагароста...» вельмі цікавы сваёй арыгінальнай формай выяўлення аўтарскай пазіцыі адносна таго, што чалавек не бязгрэшны. Таму людзі павінны быць тактоўнымі адзін да аднаго, даравальнымі, цярпімымі да хібаў і да таго, што ад чалавека сапраўды не залежыць. Але галоўнае і вызначальнае ў чалавеку — людскасць — залежыць ад яго, і чалавек за гэта ў адказе.

*Чалавек маленькага роста,*
*Чаму не рос, па чыёй віне?*
*Чалавек адказвае проста:*
*«Гэта залежыць не ад мяне».*
*Чалавек маленькага розуму,*
*Мог ты быць разумнейшым ці не?*
*Чалавек адказвае цвяроза:*
*«І гэта залежыць не ад мяне».*
*Чалавек душы маленькай,*
*Мог ты лепшым быць ці не?*
*Чалавек маўклівы нейкі,*
*Не адказвае ён мне...*
*Мабыць, цяжкае гэта пытанне,*
*Чалавек маўчыць нездарма:*
*Хібам нашым ёсць апраўданне,*
*Подласці апраўдання няма.*

Асаблівасць вершаў Вярцінскага яшчэ і ў тым, што яны лёгка запамінаюцца. І не толькі таму, што, выяўляючы агульначалавечае і людскае, выяўляюць і нашы асабістыя пачуцці, думкі. Яны надзвычай арганічныя па сваім гучанні, рытмізаваныя. Рыфма вершаў моцная, мэтавая, сэнсавая. Рыфмуюцца не толькі канчаткі вершаваных радкоў, а часам некалькі складоў і нават цэлае слова: роста — проста; лю-

біць — губіць; Талаша — малыша; распасцёрты — чацвёрты; года — пагода.

Адчувальна, што многія радкі вершаў А.Вярцінскага створаны пад уплывам фальклору (асабліва прыказак і прымавак).

Паэт плённа працуе ў розных жанрах і спрыяе сціранню ўмоўных межаў паміж імі. Ён першы ў беларускай літаратуры стварыў новы жанр прозапаэзіі, які ўяўляе своеасаблівы пераход ад вершаванай да празаічнай мовы.

**3. Прачытаць на памяць верш з беларускай паэзіі на філасофскую тэму**

Вершы Барадуліна «Лёс да кожнага прыходзіць босы...» і Вярцінскага «Чалавек маленькага роста...» змешчаны ў адказе на другое пытанне. Прапануем і трэці верш:

**Шлях да Беларусі**

За векам век плыве-цячэ,
А мы ідзём, ідзём... І што ж?
О, як далека нам яшчэ
Да Беларусі!
Ужо няўсцерп нам крыж пакут,
І мы крычым, крычым, але —
Не дакрычаліся пакуль
Да Беларусі.
А можа быць, яна — міраж,
І ўсе мы трызнім? Бо чаму ж
Не далятае голас наш
Да Беларусі?
Відаць, пракляцця знак ляжыць
На нас ад роду, і таму
Так цяжка шлях нам церабіць
Да Беларусі.
Равуць вятры, грымяць грамы,
Пыл засціць вочы нам, і ўсё ж,
Усё ж мы дойдзем, дойдзем мы
ДаБеларусі!

*Н. Гілевіч*

# Білет № 9

## 1. Духоўнае багацце чалавека ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля»

Мы твае, зямелька, людзі.
*Якуб Колас*

Няма ў нашай таленавітай літаратуры песняра, які б з такой мастацкай сілай, як Якуб Колас паказаў узвышанае ў зямным, прыгожае — у будзённым, вечнае — у імгненным, які быў бы такім настойлівым у сцвярджэнні думкі, што самае прыгожае «ў свеце Божым» — зямля і на ёй чалавек. Ужо радкамі ў пачатку паэмы «Новая зямля»:

*Маезнаёмыя няўзрачны,*
*Нічым не слаўны і нязначны —*

народны пясняр быццам «правакуе» чытача на спрэчку з ім. Якой жа сілай і значнасцю трэба валодаць, каб з такой мужнасцю і без страты сваёй душы вынесці ўсе тыя выпрабаванні, што выпалі на долю яго «знаёмых»! Героі Коласа ўсім нам даюць урок, як нават у бесчалавечных абставінах ад чалавека залежыць галоўнае — застацца чалавекам, бо абсягі поўнага валадарства чалавека — яго ўласная душа.

Героі Коласа зямныя, рэальныя і адначасова асобы моцныя, выключныя, сіла якіх — у бязмежнай любові да сваёй зямлі-карміцелькі, да бліжняга свайго і найперш да сям'і і родных дзяцей.

Моцную асобу вызначае «одна, но пламенная страсть» (М. Лермантаў) — мэта, да якой яна ідзе так, як ішоў Міхал («станоўка, ненарокам ішоў да мэты крок за крокам»). Мэта і невынішчальная мара, ад якой Міхал не адрокся нават на Божай пасцелі, — Воля:

*Бог не судзіў мне бачыць волі*
*І сыпаць зерне ў свае ролі...*

Здзяйсненне гэтай мары ён дакляруе і наказвае тым, хто будзе жыць пасля яго:

*Вядзі ж ты рэй, вядзі... адзін...*
*Як лепшы брат, як родны сын.*

Мэта ў многіх людзей можа быць адна, але шляхі да яе розныя. Менавіта шлях і тая настойлівасць, з якой чалавек па ім ідзе, і вызначаюць яго сутнасць. Міхал перакананы, што адзіным шляхам да волі з'яўляецца «свая зямля» як аснова ўсяму. У светапоглядзе Міхала — народнае ўсведамленне зямлі як найвялікшай каштоўнасці нацыі:

Зямля незменіць і не здрадзіць, Зямля паможа і дарадзіць, Зямля дасць волі, дасць і сілы, Зямля паслужыць да магілы, Зямля дзяцей твоіх не кіне, Зямля — аснова ўсёй айчыне.

Лексічнай анафарай «зямля» паэт дасягае эфекту малітвы, бо зямля ва ўсведамленні беларуса — святыня, абяцаная Богам. І здрада ёй — вялікі грэх.

Зямля для коласаўскіх герояў — гэта і промень волі і свабоды; гэта і ўмова рэалізацыі сваіх прыродных якасцей, хлебаробскага таленту, які з усіх талентаў самы святы; гэта і гарантыя дабрабыту; гэта і залог годнага і людскага жыцця для нашчадкаў, клопат пра якіх — спрадвечная рыса характару беларуса. Сапраўды, зямля —скарб, бяздоннае багацце.

Каб узвысіць свайго героя, Колас праводзіць яго праз самыя цяжкія і страшныя, ва ўяўленні Міхала, выпрабаванні — беззямелле і як вынік яго — рабства, здзек, прыніжэнне. Але жыццёвыя калізіі («Міхал як толькі ажаніўся, тады ж ад бацькі аддзяліўся, бо стала цесна. З той прычыны пайшоў на сплаў ён, на віціны...») толькі ўмацавалі яго мару:

*Купіць зямлю, прыдбаць свой кут,*
*Каб з панскіх выпутацца пут,*
*І там зажыць сабе нанова:*
*Свая зямля — вось што аснова!*

У вобразе Міхала ўвасоблены пісьменніцкі ідэал чалавека. На такіх, як Міхал, стаіць свет і трымаецца наша зямля. Працавітасць, сумленнае стаўленне да справы, хай сабе і нялюбай, прымусовай (не сваёй і не на сябе), клопат пра дзяцей, іх будучыню, мудрасць — далека не поўны пералік добрых якасцей Міхала. І ўсё ж дамінуючым і вызначальным у яго жыцці з'яўляецца пачуццё ўласнай годнасці і свабодалюбства. Так, Міхал цярпімы і цярплівы («Маўчы, калі ёсць хлеб у роце»), але да пэўнай мяжы —пакуль не прыніжаецца яго чалавечая годнасць. Ён здольны «хоць раз, ды добра агрызнуцца». Агідна бачыць яму, як прыніжаюцца іншыя: «Цьфу ты, мардасіна пагана!»

І ўсё ж пачуццё ўласнай годнасці Міхала вызначае не толькі яго здольнасць не прыніжацца ні пры якіх абставінах. З гэтым вобразам звязана пісьменніцкае ўсведамленне сапраўднага пачуцця ўласнай годнасці. Свабодны толькі той чалавек, ва ўяўленні Коласа, хто не замахваецца на свабоду іншых, не абмяжоўвае свабоды бліжняга свайго. Доказ таму— братэрскія адносіны да Антося і павага, з якой ставіцца Міхал да жонкі, маці сваіх дзяцей. Мы захапляемся мудрасцю, годнасцю і свабодай Ганны. А каму яна абавязана сваёй свабодай? Нічога ідэальнага на свеце не бывае, але сям'я Міхала і

Ганны, узаемаадносіны паміж імі — выключэнне з гэтага правіла. Павага, з якой ставіцца Міхал да людзей, а найперш — да жонкі, не можа не захапляць.

Самы галоўны бацькоўскі клопат у Міхала пра сваіх дзяцей — каб яны ніколі не былі рабамі. «Дык трэба грунт мець пад нагамі, каб не бадзяцца батракамі», — даводзіць герой сваім дзецям. Таму і да яго строгасці, а часам і суровасці ў адносінах да дзяцей мы ставімся з разуменнем і павагай. Уражваюць сямейныя сцэны, калі Міхал падзіцячы адчайваецца з-за някемлівасці і хітрасці аднаго, нядатнасці да вучобы другога сына. Затое якой радасцю поўніцца яго бацькоўскае сэрца, калі ён бачыць у сваіх дзецях тое добрае, што якраз і дае надзею на іх вольнае і людскае жыццё у будучым, тады, калі ён ужо не зможа пра іх клапаціцца.

Праз вобразы Міхала, Ганны і Антося выяўлена і пісьменніцкае стаўленне да народнай педагогікі, асноўнымі прынцыпамі якой з'яўляюцца прыклад бацькоў, іх любоў да дзяцей, што не выключае, а наадварот, уключае і строгасць. Добрых дзяцей вучыць граза, а не лаза, сцвярджае народная мудрасць. Пра «папружку» Міхал больш нагадвае дзецям, чым пускае яе ў ход (толькі аднойчы, ды і то, калі Алесь не ацаніў тактоўнасці і далікатнасці бацькоў і не скарыстаў шанс самаму выправіць сваю памылку): «Калі пайдзе навука туга— паходзіць бацькава папруга!», «Цыц, не смець казаць мянушку, а то здыму на вас папружку!»

Пісьменніцкі ідэал жанчыны, жонкі і маці, нястомнай працаўніцы і ахоўніцы сямейнага ачага ўвасоблены ў вобразе Ганны. Не можа не здзіўляць тактоўнасць гэтай простай сялянскай жанчыны, тонкасць яе натуры і багацце душы. Ад яе залежыць духоўнасць усёй сям'і; цеплыня, шчырасць і лад. Усё ад яе і праз яе. Яна — носьбіт народнай мудрасці і маралі, яна — носьбіт вечнасці: традыцый, звычаяў. Яе любяць і шануюць усе ў сям'і, а першы прыклад павагі дае зноў жа Міхал.

Вялікага эстэтычнага ўздзеяння на чытача паэт дасягае вобразам дзядзькі Антося. Яму прысвечаны самыя светлыя, самыя радасныя старонкі паэмы. Гэтым вобразам славіцца не толькі працавітасць, духоўная сіла і веліч народа, але і яго таленавітасць.

Дзядзька — адароная ад прыроды, яркая, багатая натура, майстар на ўсе рукі: «што ні замысліць— то ўсё зробіць», дагнаная ім да ладу «каса не косіць — каса брые, і шчытнякі бярэ сухія, бо ў дзядзькі рукі залатыя», «за дзядзьку людзі просяць Бога». Дзядзька — дбайны гаспадар, «ва ўсім парадак і лад любіць». Нястомны працаўнік, ён «адзін за двух на сваім карку цягнуў ярэмца хлебароба».

Але найбольш поўна выявіўся талент дзядзькі Антося ў педагогіцы, у выхаванні сваіх пляменнікаў. Лёс яго склаўся так, што ён, адналюб па сваёй прыродзе (каханая Наста, не дачакаўшыся Антося са сплаву, «яго змяніла на другога»), бескарысліва аддаў свае сілы сям'і брата, яго дзецям, іх шчасцю і дабрабыту. За яго дабрыню і любоў усе ў сям'і плацілі яму таксама любоўю:

*Дык і не дзіва, што любілі,*
*Што на руках яго насілі.*

Любоў да ўсяго, што яму дарага і міла, вызначае і стан душы гэтага чалавека, і сутнасць яго таленту.

Вялікае назначэнне партрэта ў абмалёўцы гэтага вобраза:

*...Ён невысок, ненадта ёмак,*
*Ды карчавіты і няўломак,*
*А волас мае цёмна-русы,*
*І зухаўскія яго вусы*
*У меру доўгі, густаваты,*
*Угору чуць кашцы падняты;*
*А вочы шэры, невялічкі,*
*Глядзяць прыветна, як сунічкі,*
*Але раптоўна і адразу*
*Не расчытаеш іх выразу:*
*То смех, то хітрасць з іх бліскае,*
*То дабрата, але якая!*

Праз гэты партрэт пісьменнік выяўляе і філасофскую думку, што прыгожае для кожнага чалавека тое, што ён любіць, што яму дарага. Самі па сабе адзнакі паставы і рысы яго аблічча прыкметамі прыгажуна наўрад ці могуць быць («ён невысок»; «а вочы шэры, невялічкі»), Але гэта рысы чалавека, якога любяць і які любіць, — і тым усё вызначана: прыгожае тое, што мілае, роднае, дарагое. Вялікую ролю ў стварэнні гэтага эстэтычнага вобраза адыгрывае гумар. Менавіта выкарыстаннем гумару як мастацкага сродку дасягаецца ўздзеянне гэтага вобраза на чытача. Гумар узвышае героя і адначасова робіць яго даступным, родным і блізкім кожнаму чытачу. Антось зачароўвае непасрэднасцю сваёй натуры і рэдкай для людзей здольнасцю пасмяяцца з самога сябе, што сведчыць Пра яго дабрыню, розум і аптымізм: «Які ж ты, хлопча, нецярпячка, няхай цябе затопча качка!»; «Забілі зайца, не забілі, але ж, брат, гуку нарабілі». Сваё кухарскае «вынаходства» самакрытычна ацэньвае так: «Паскудства, брат, і не пытайся!»

Узвышэнню коласаўскіх герояў, носьбітаў лепшых народных якасцей, садзейнічае і прыём кантрасту. На фоне сатырычных вобразаў паноў веліч і прыгажосць, мудрасць і шчырасць чалавека працы, які

да ўсяго ўмее хараша адпачываць, весяліцца, правіць святы, яшчэ яскравей, яшчэ відавочней.

## 2. Камедыя Андрэя Макаёнка «Выбачайце, калі ласка!». Характарыстыка вобразаў і праблем, узнятых у творы

...Іх неабходна судзіць усенародным трыбуналам.
*А. Макаёнак*

Трыбуналам над моцкіньмі, каліберавымі, над падхалімамі, прыстасаванцамі, прайдзісветамі і авантурыстамі розных калібраў і рознай моцы з'яўляецца творчасць Андрэя Макаёнка.

Нельга не пагадзіцца з крытыкам Дз. Бугаевым, што сатырычнай камедыяй «Выбачайце, калі ласка!», змагаючыся з недарэчнасцямі ў калгасных хлебапастаўках, А. Макаёнак «на самай справе ўдарыў па галоўных падвалінах нашай таталітарнай сістэмы». Ён высмеяў і паказаў небяспечнасць таго, на чым яна трымалася, — паказуху і падман, якім было пранізана афіцыйнае жыццё ад верху да нізу. А дзе падман, там і падхалімства, і казнакрадства, і рабаўніцтва працоўнага чалавека, — злачынства і зло ў самых розных выявах.

Макаёнак з'яўляецца таленавітым вучнем і прадаўжальнікам лепшых традыцый К. Крапівы. Майстэрства і талент Макаёнка выявіліся ў стварэнні канфлікту, які, як вядома, з'яўляецца асновай драматычнага твора.

Аснову камедыі складае канфлікт паміж прыстасаванцамі і кар'ерыстамі Каліберавым і Моцкіным, што бачаць сваю галоўную задачу ў тым, каб «у першую чаргу разлічыцца з дзяржавай» любымі метадамі, і здаровымі сіламі, якія «ўзначальвае» калгасніца Ганна Чыхнюк. Ідэя твора і выяўлена ў маналогу Ганны Чыхнюк, у яе пярэчанні Калібераву: «Галоўная задача — у першую чаргу добры ўраджай вырасціць, а потым сабраць яго так, каб ніводнае зярнятка не прапала. Тады і з дзяржавай разлічымся. Мы свой доўг помнім. І калгасніку трэба за сваю працу атрымаць, і налета каб было што пасеяць».

Маналог з'яўляецца прысудам усёй сістэме, пры якой магчымы такі абсурд, такія злачынствы, здзейсненыя не кім-небудзь, а самім кіраўніцтвам. «Гэта па-гаспадарску?! У людзей жа работа з рук валіцца, кал і бачаць такое кіраўніцтва».

Гэтымі словамі сялянкі выяўлена аўтарская пазіцыя і перакананне, што самай страшнай сілай валодае зло, надзеленае ўладай. Праз такое «кіраўніцтва» ў людзей не проста работа «з рук валіцца» — валіцца, рушыцца вера ў справядлівасць, парадак. У выніку пасту-

пова разбэшчваецца народ, за што і «неабходна судзіць усенародным трибуналам» моцкіных і каліберавых. І за слоўнай, прыгожа аформленай, хоць і абсурднай, шыльдай, што іх «галоўная задача — у першую чаргу разлічыцца з дзяржавай» (галоўны лозунг таталітарнай сістэмы — чалавек для дзяржавы), хаваецца іх «сапраўдная задача». Моцкіны і каліберавы імкнуцца любымі сродкамі прасунуцца вышэй па службовай лесвіцы хоць бы ўседзець у тым крэсле, якое пад імі зараз.

Мова Каліберава — яго самахарактарыстыка; яна адпавядае тым сродкам, метадам, якімі дасягаецца мэта і рашаецца галоўная задача: «Не зробіш — дух вон, жылы на тэлефон!», «Я цябе ў парашок сатру!», «Такі сабантуй арганізую, што моташна стане», «Гайкі трэба тужэй закручваць сваім работнікам». Такая лексіка, такі стыль кіраўніцтва — такая і ўлада. Бойкая ўлада; па ўсім відаць, што ўсталявалася яна надоўга. Але не назаўсёды.

Дынаміка сюжэта, кульмінацыя ў п'есе дасягаецца драматургам апісаннем хаўрусу кар'ерыста значнага калібру (раённае начальства!) з авантурыстам і прайдзісветам, выкрутлівым спрытнюгам Моцкіным. Як дзялок і махінатар Моцкін, бадай, пераўзыходзіць свайго непасрэднага начальніка, хоць пасаду займае значна ніжэйшую — ён усяго толькі раённы ўпаўнаважаны па хлебанарыхтоўках. Каліберaў свядома дае згоду на махінацыі, прапанаваныя Моцкіным. Дамовіўшыся з дырэктарам спіртзавода (яшчэ адзін хаўрус!), раённае кіраўніцтва атрымала фіктыўныя квітанцыі, што збожжа здадзена. У кожнага з хаўруснікаў свой інтарэс: Моцкін прагне заняць галоўную пасаду на базе «Заготзбожжа», дырэктар спіртзавода Печкуроў— дабудаваць за дзяржаўны кошт шыкоўны дом. У гэтым хаўрусе кожны з іх гатовы ў выпадку чаго перакласці віну, усе свае грахі на чужыя галовы і найперш на галовы адзін другому. Нічым не грэбуюць, ні перад чым не спыняюцца, каб дарвацца да ўлады, «да славы прагныя, ды вузкія ў плячах» (К. Крапіва), каб займець «вялікі хамут» — больш высокую пасаду і шыкоўнае жыццё.

Выдатным майстрам камічных сітуацый, дэталяў праявіў сябе Макаёнак, учыніўшы трыбунал над злом. Асабліва ўражвае сцэна, калі хаўруснік Каліберава Моцкін адкрыта здзекуецца з сімулянта, што імітуе ў канцы п'есы моцны прыступ: «У яго ж камень у пячонках! Булыжнік!.. Кінце дурня строіць!» А потым бліскучы сатырычны эфект, выкліканы гэтым «булыжнікам», яшчэ дапаўняецца не менш з'едлівай рэплікай Ганны: «За пазухай у яго камень, а не ў пячонках».

Адна з галоўных вартасцей камедыі заключаецца ў дасканалым пісьменніцкім умельстве індывідуалізаваць мову персанажаў. Так, у вобразе Гарошкі вызначальнай з'яўляецца бліскучая моўная знаходка

драматурга — прыгаворка персанажа: «Хоць круць-верць, хоць верць-круць». Гэтая прыгаворка трапна выяўляе і супярэчлівы характар героя, і яго становішча. Не пазбаўлены сумлення і цвярозага сэнсу Гарошка, як ні круціцца, а ўсё роўна не можа ўсім дагадзіць і часцей мусіць рабіць насуперак свайму гаспадарскаму пачуццю і чалавечаму разуменню.

А ў дадатак да ўсяго драматург вынаходліва вар'іруе гэтую прыгаворку. Печкуроў, здзекуючыся з палахлівага бедака, суцяшае яго і раіць прывучацца да рызыкоўных аперацый: «А ты, Гарошка, не круць-верць, а круць-круць». Любімымі слоўкамі Гарошкі камедыя і завяршаецца, прычым вельмі эфектна, на ўзроўні крапівінскага «свінтуса грандыёзуса», якога трэба біць проста па пятачку. Цяпер Гарошкава прыгаварка гучыць ужо з вуснаў Ганны Чыхнюк і адрасуецца Каліберавy і Моцкіну: «Хоць круць-верць, хоць верць-круць, адкажуць!»

Назвай «Выбачайце, калі ласка!» пісьменнік сцвярджае, што такім кіраўнікам даўно пара было сказаць, падабаецца ім гэта ці не: злазь з даху — не псуй гонту! На заўвагу, што іхні старшыня «вельмі добры чалавек», Ганна Чыхнюк прамаўляла па-свойму: «Жонцы трэба лагодны характар... Калгасу гаспадар патрэбен, ды добры гаспадар...» У падтэксце сёння прачытваецца і большае: гаспадар патрэбны быў і ўсёй краіне. Бо ад гаспадара, дзяржаўцы, як сцвярджалі яшчэ мудрыя нашы продкі, залежыць росквіт і багацце краіны, дабрабыт і годнае жыццё народа.

**3. Прачытаць на памяць верш з пейзажнай лірыкі**

Вечар на захадзе ў попеле тушыць
Кучу чырвоных кавалкаў вугля;
Ціха ўсё; вецер лістка не зварушыць,
Не скалыхнуцца ні траўкай паля;
Цёмныя цені даўжэй у лагчыне,
Птушкі прыстаўшай марудней палёт;
Сумна плыве маладзік бледна-сіні
Ў небе вячэрнім, зялёным, як лёд;
Іскрацца зорак сняжынкі маркотна,
Збожжа пакрылася шызай расой...
Кіньма жа думкі аб долі гаротнай,
Хоць бы на момант спачынем душой!

*М. Багдановіч*

# Білет № 10

## 1. Карціны роднай прыроды ў паэме Якуба Коласа «Новая зямля». Жанравыя асаблівасці паэмы

Малюнкі родныя і з'явы!
Як вы мне любы, як цікавы!
*Якуб Колас*

Нацыянальнае як умова і крытэрый мастацкага шэдэўра сусветнай культуры, якім і з'яўляецца паэма «Новая зямля», выявілася і ў майстэрстве Коласа-пейзажыста.

Энцыклапедычнасць паэмы, яе жанр і кампазіцыя спрыяюць таму, што перад намі паўстае вобраз роднага краю ва ўсе поры года: ранняй вясной, у летнюю спёку, і калі «на ніцях белай павуціны прывозяць восень павучкі», і зімой, калі мароз «ідзе, сярдзіта пагражае, па даху гонтамі страляе». Мароз — мастак, «на небе ставіць троны, вянцы на месяц ускладае, на снезе зоркі рассыпае; і так прыгожа, так старанна бярозе белай тчэ убранне».

Прырода ў паэме — не толькі фон, але і дзеючая асоба, жывая істота, і апісвае яе вобраз Колас-рэаліст часцей за ўсё рамантычнымі сродкамі, робячы для гэтага «героя» сваей паэмы выключэнне. Мароз у паэме не толькі мастак, будаўнік, але і «штукар»: «не раз, жартуючы, загубіць таго, хто ў лапы пападзецца, яшчэ над бедным насмяецца: «Прыляж, бядача, ты з дарогі, няблізкі хатнія парогі... Прыляж, сагрэйся, мой пахілы, пакуль табе прыбудуць сілы. А я салодкі сон навею і гожай казкаю сагрэю...»

Чытаючы паэму, мы можам уявіць усход сонца і летнюю раніцу, пачуць жураўліны клёкат і спеў жаўрука, пабываць на квітнеючым лузе і пясчаным беразе.

*Усход жыве, у сход палае,*
*Слупы-праменні падымае.*
*Івосьяна, жыцця крыніца...*

«Малюнкі родныя і з'явы», прырода роднага краю для коласаўскіх герояў — «жыцця крыніца», крыніца радасці і натхнення, гаючая сіла, што таксама, як і плён працы, «цешыць душу леснікову». Ніхто так, як Колас, з такой мастацкай сілай не паказаў гармонію чалавека і прыроды. «Прырода з людзьмі жыве супольна», — падкрэслівае паэт.

Сюжэт «Новай зямлі» грунтуецца на апісанні гісторыі жыцця сям'і Міхала. І аснова гэтага жыцця — нястомная праца, якая, як і прырода, услаўлена, апаэтызавана Коласам:

*Эх, час касьбы, вясёлы час!*
*І я ім цешыўся не раз.*
*І з таго часу па сягоння*
*Мне сонцам свеціць Панямонне!*

Хараство навакольнага свету і праца хлебароба падаюцца як непадзельнае, вышэйшай красы адзінства. Паэт у аднолькавай ступені захапляецца і прыгажосцю прыроды, і веліччу чалавека працы. Метафарычнасцю, вобразнасцю вылучаецца і апісанне прыроды («елка ў пäрЫі з хваіною, абняўшысь цесна над вадою, як маладыя ў час кахання, ў апошні вечар расставання), і апісанне працы, яе плену: снапы «стаяць, бы лялечкі якія, глядзяць, як госці дарагія». Малацьба асацыіруецца з музыкай: «Не малацьба, а бубнаў хоры!.. Бічы кладуцца так рытмічна, само гудзенне іх музычна». Дзядзька Антось не арэ, а «тчэ сахою кросны-ролі».

Усведамленне роднай зямлі і яе прыроды як найвялікшай каштоўнасці ў паэта настолькі моцнае, што ў лірычных адступленнях ён звяртаецца да радзімы, родных мясцін, як да маці, і просіць у яе дапамогі і благаславення для сваіх любімых герояў. Аўтар пераканаы, што радзіма для чалавека — прошча:

*Дзень добры, родная ліясціна!*
*Спаткай ты нас, як маці сына*
*Па часе доўгае разлукі*
*І разгарні прыветна рукі*
*Для тых, хто змушаны ў няволі*
*Жывіцца хлебам твайго поля...*

Афарыстычна матывавана паэтава просьба ўзброіць «надзеямі грудзі» герояў: «бо мы твае, зямелька, людзі!»

Жанр паэмы (яна ліра-эпічная) праз лірычныя і філасофскія адступленні садзейнічае выяўленню аўтарскай думкі, што родная зямля для кожнага чалавека — зямля святая, надзеленая надпрыроднымі сіламі. Гэтая філасофская думка гучыць ужо ў лірычным уступе, якім і пачынаецца паэма:

*Мой родны кут, як ты мне мілы!...*
*Забыць цябе не маю сілы!*
*Не раз, утомлены дарогай,*
*Жыццём вясны мае убогай,*
*К табе я ў думках залятаю*
*І там душою спачываю.*

Менавіта ў родным краі чэрпалі таксама сілы, спачын і лекі для душы і героі паэмы, калі былі ў нялёгкай дарозе да сваёй мэты — да волі.

Лейтматывам волі і новай зямлі прасякнута ўся паэма. Эпічныя раздзелы паэмы размешчаны так, што паслядоўна паказваюць вытокі мары Міхала, шлях яго і яго сям'і да яе здзяйснення.

Апісанне жыццёвых калізій, што здараюцца з героямі, спрыяе панарамнаму паказу ўсёй Беларусі, а не толькі некаторых яе мясцін. Пярэбары сям'і Міхала ў Парэчча, паездка братоў у Заблонне да Хадыкі («прад імі Случчына ляжала, старонка міла і багата») і дзядзькі Антося ў Вільню — галоўныя моманты знешняга дзеяння. Прыём вандровак, па-майстэрску выкарыстаны паэтам, садзейнічае выяўленню аўтарскай думкі пра тое, што дадзеная нам Богам зямля — найбагацейшы край, у якім ёсць выключна ўсё, што неабходна для жыцця чалавеку. Толькі «ўсё гэта — скарбы чужаніцы, магната князя Радзівіла», чужая краса і багацце. Але «што краса без аўладання»?

Верай у лепшы лёс сваёй зямелькі, у якой толькі і можна «пазычыць сілу», у лепшую долю народа гэтай зямлі прасякнута ўся паэма:

*Жыві ж, наш край!*
*Няхай надзея*
*Гарыць у сэрцы і мацнее...*

### 2. Тэма гістарычнага мінулага Беларусі ў сучаснай беларускай прозе (на прыкладзе двух-трох аўтараў)

Мінулае вучыць нас, як жыць сёння.
*Я. Баршчэўскі*

...І каб вякі маім спявалі ротам...
*У. Караткевіч*

Без мінулага няма будучага. Памяць пра мінулае заўсёды скіравана ў будучыню. Цяжка пераацаніць ролю і значэнне твораў беларускай літаратуры на гістарычную тэму, а таксама заслугу перад нашым народам даследчыкаў мінулага У. Караткевіча, М. Ермаловіча, Л. Дайнекі, У. Арлова, В. Чаропкі, В. Іпатавай, К. Тарасава і іншых. Іх творы вяртаюць нашаму народу памяць. Без памяці пра мінулае народ пазбаўлены будучыні.

Як «прарыў у мінулае» вызначаюць зробленае Уладзімірам Караткевічам у даследаванні гісторыі, мастацкім яе асэнсаванні і адлюс-

траванні. «Роўнага яму няма і наўрад ці будзе»,— сказаў В. Быкаў пра У. Караткевіча. Высокая ацэнка, справядлівая. Аднак грамадзянскі і пісьменніцкі подзвіг Міколы Ермаловіча таксама заслугоўвае самых высокіх эпітэтаў. Гэтая постаць і зробленае ёю для нашай нацыі яшчэ чакае свайго вартага даследчыка, але і сёння ёсць усе падставы сцвярджаць, што М. Ермаловіч з'яўляецца захав ліікам вечнасці і папулярызат. ра.л вельмі важных для нашага сучасніка момантаў гісторыі. Ім створана навуковая літаратура пра гістарычнае мінулае. Каштоўнасць яго дзейнасці вызначаецца аб'ектыўнасцю і высокім прафесійным узроўнем даследавання. Асэнсаванне ім полацкага, новагародскага і віленскага перыядаў у станаўленні дзяржаўнасці грунтуецца на глыбокім вывучэнні, супастаўленні дакументаў, летапісаў, хронік адносна гэтых перыядаў. Не сакрэт, што ў сучасных даследаваннях, як навукоўцаў, так і творцаў, назіраеццатэндэнцыя да ідэалізаванай, часам суб'ектыўнай ацэнкі некаторых момантаў гісторыі і гістарычных асоб. М. Ермаловічу ўдалося пазбегнуць гэтага. Ён кіраваўся толькі адным прынцыпам: праўда, праўда і яшчэ раз праўда.

Супастаўляючы часам супярэчлівыя ацэнкі рознымі летапісцамі, аўтарамі хронік адных і тых гістарычных падзей і асоб, Мікола Ерамаловіч у кнізе «Старажытная Беларусь» вывярае падзеі часам, смела адхіляе і выключае тыя з іх, якія гэтага выпрабавання часам якраз і не вытрымліваюць. Так, да прыкладу, ён здолеў паказаць князя Вітаўта не толькі як модную легендарную, уплывовую на час і падзеі асобу, але і як у многім супярэчлівую асобу, трагічную і не да канца свабодную ў сваіх дзеяннях ад абставін, часу і гісторыі — ад усяго таго, што прынята называць Лесам.

Мастацкаму ўвасабленню гістарычных падзей прысвечаны раманы Леаніда Дайнекі «Меч князя Вячкі», «След ваўкалака» і «Жалезныя жалуды». У цэнтры іх — вядомыя гістарычныя асобы Вячаслаў Барысавіч, Усяслаў Чарадзей, Рагнеда, Міндоўг і інш. Філасофскае асэнсаванне мінулага з пазіцый сучаснасці — адметнасць гістарычных твораў Л. Дайнекі.

Кампазіцыя рамана «Меч князя Вячкі» спрыяе выяўленню аўтарскай думкі пра тое, што лёс дзяржаўцы і лёс народа — лёс адзіны. Першыя раздзелы рамана прысвячаюцца то паралельнаму паказу дзяцінства і юнацтва будучага князя паўночнага фарпоста Полацкага княства Кукенойса — Вячкі, то апісанню трагічнага лёсу Мірошкі ці шляху да волі Якава Палачаніна. Здавалася б, лёсы іх, як і ўмовы жыцця, зусім розныя, але потым жыццёвыя шляхі іх сыходзяцца, і далей князь і воін не разлучаюцца да самай смерці.

Князь па-геройску гіне пры абароне крэпасці. Падчас бою яму адсеклі руку, але і перад самай смерцю Вячка здолеў перадаць свой меч перамогі Якаву Палачаніну. Меч у творы — сімвал барацьбы за незалежнасць, сімвал непераможнасці духу і знак пераемнасці гераічных спраў розных пакаленняў і непарыўнай сувязі паміж імі.

Сюжэт рамана востры, напружаны, дынамічны, напоўнены драматычнымі калізіямі. Твор атрымаўся белетрыстычным у добрым сэнсе слова, бо сюжэт і моцныя асобы, выпрабаваныя жорсткімі, незвычайнымі абставінамі, спрыяюць эстэтычнаму ўздзеянню на чытача. Апісваючы жыццё князя ад самага дзяцінства, пісьменнік даследуе вытокі адданага служэння народу, сцвярджае, што нічога выпадковага на свеце не бывае. У 16-гадовым узросце юнак даў клятву, што да апошняга ўздыху будзе бараніць сваю Айчыну ад чужынцаў І гэтую клятву Вячка не парушыў. Чалавек вялікай душы, крыштальнага сумлення і моцнай волі, ён выступіў за аб'яднанне сіл у барацьбе з ворагамі. Л. Дайнека карыстаецца прыёмам кантрасту, каб узвысіць свайго героя. Антыподамі Вячкі ў рамане з'яўляюцца вобразы полацкага князя Уладзіміра, апантанага прагай славы, і літоўскага князя Дайгерута, які замест паходаў на тэўтонаў збіраў даніну. Дзеянні ж князя Вячкі, накіраваныя на ўмацаванне княства, за два стагоддзі да Грунвальдскай бітвы 1410 г. паклалі падваліну ў гэтую вялікую перамогу над крыжакамі. Вячка даў прыклад, як трэба змагацца за незалежнасць і забяспечыць перамогу ў барацьбе, умацоўваючы краіну, аб'ядноўваючы ўсіх ідэяй незалежнасці.

Кульмінацыйным момантам у творы з'яўляецца эпізод, калі галоўны герой выпрабоўваецца выбарам. Пісьменнік надзяліў свайго героя не толькі лепшымі якасцямі сына сваёй зямлі, але і бацькоўскімі пачуццямі да свайго дзіцяці. Ён — верны муж і клапатлівы бацька. Лёс падрыхтаваў яму самае моцнае з усіх выпрабаванняў: выбар паміж радзімай і дачкой Соф'яй. Ворагі выкралі яго пяцігадовую дачку і за яе вызваленне запатрабавалі палову зямлі і палову горада. Псіхалагічна тонка выпісана сцэна сустрэчы бацькі з дачкой, сустрэча, якой ворагі спадзяваліся зламаць Вячку. На гэтую сустрэчу ён пайшоў з надзеяй: «Ідзі, Халадок, да Клімяты. Ён піша полацкі летапіс. Хай напіша там, што я, кукенойскі князь, люблю сваю зямлю, дужа моцна люблю і пакладу за яе галаву. І напіша хай там, што я дужа люблю сваю дачку. Зямля, Халадок, будзе пустою, ледзяною, калі няма на ёй роднай душы. Хай напіша ў летапісе, што я бяру на сябе ўсю адказнасць перад Богам за тое, што адбудзецца».

Гэтым трагічным эпізодам пісьменнік сцвярджае думку, што сутнасць чалавека вызначаецца выбарам, што дзяржаўца адказны не

толькі за сябе, але за народ і радзіму, што лёсы дзяржаўцы і народа непадзельныя.

Заслуга Л. Дайнекі не толькі ў тым, што ён змог узнавіць духоўную атмасферу таго часу, стварыць уражлівыя, незвычайныя па сваёй эстэтычнай сіле вобразы старажытных беларусінаў, ліцвінаў, але і напоўніў свае творы сучасным гучаннем, прымусіў нас задумацца над вечнымі каштоўнасцямі.

Адметная асаблівасць гістарычнай прозы У. Арлова — даследаванне лёсавызначальных перыядаў (ад часоў стварэння «Слова пра паход Ігаравы» да паўстання К. Каліноўскага); вылучэнне арыгінальных версій розных гістарычных падзей (так у апавяданні «Каля дзікага поля» робіцца спроба выявіць беларускія карані ў радаводзе аўтара «Слова...»); філасофскае асэнсаванне гістарычных падзей і пастаноўка сучасных праблем пры адлюстраванні мінулага.

Асаблівую каштоўнасць уяўляюць творы У. Арлова, заснаваныя на дакументах гісторыі горада Полацка: «Еўфрасіння Полацкая», «Таямніцы Полацкай гісторыі», «У пошуках украдзенага скарбу». Аўтар на аснове гістарычных кніг, архіўных запісаў, навуковай літаратуры раскрыў рамантычныя і драматычныя старонкі жыцця асветніцы і апякункі зямлі беларускай, якая была «памочніцай пакрыўджаным, зажураным суцяшэнне, распранутым адзенне, хворым наведванне». У кнігах акцэнтуецца ўвага на светапоглядзе князёўны, яе самаадданым служэнні Бацькаўшчыне, актыўным удзеле ў адкрыцці школ, будаўніцтве храмаў, стварэнні крыжа.

З усіх кніг пра Еўфрасінню Полацкую вылучаецца кніга «Жыватворны сімвал Бацькаўшчыны», якая мае падзагаловак «Гісторыя Крыжа Еўфрасінні Полацкай». Кніга расказвае пра стварэнне Лазарам Богшам славутага крыжа, яго драматычны лёс, загадкавае знікненне ў першыя дні Вялікай Айчыннай вайны, пошукі ў наш час. Раздзел «Адраджэнне святыні» прысвечаны творчаму подзвігу беларускага майстра Міколы Кузьміча, дзякуючы таленту якога крыж быў узноўлены. 27 снежня 1997 г. святыня была асвечана і вернута на спрадвечнае месца — у збудаваны па заказе полацкай асветніцы Спасаўскі храм.

**3. Прачытаць на памяць урывак з паэмы Якуба Коласа «Новая зямля» (на выбар)**

1
Мой родны кут, як ты мне мілы!..
Забыць цябе не маю сілы!

Вось як цяпер, перада мною
Устае куточак той прыгожа,
Крынічкі вузенькае ложа
І елка ў пары з хваіною,
Абняўшысь цесна над вадою,
Як маладыя ў час кахання,
Ў апошні вечар расставання.
І бачу лес я каля хаты,
Дзе колісь весела дзяўчаты
Спявалі песні дружным хорам,
З работ ідучы позна борам.
Няслісія зыкі песень здольных,
Ў лясах раз-пораз адбівалісь,
І ім узгоркі адклікалісь,
І радасць біла ў песнях вольных.
А хвоі, елкі векавыя
Пад зыкі песень маладыя
Маўчком стаялі ў нейкай думе,
І ў іх ціхусенечкім шуме
Нязлось вячэрняе маленне
Ўгару, святое аддаленне.

2
Каля пасады лесніковай
Цягнуўся гожаю падковай
Стары, высокі лес цяністы.
Тут верх асіны кругалісты
Сплятаўся з хвоямі, з дубамі,
А елкі хмурымі крыжамі
Высока ў небе выдзялялісь,
Таемна з хвоямі шапталісь.
Заўсёды смутныя, бы ўдовы,
Яны найбольш адны стаялі,
І так маркотна пазіралі
Іх задуменныя галовы!
Лес наступаў і расступаўся,
Лужком зялёным разрываўся;
А дзе прыгожыя загібы
Так міла йшлі каля сядзібы,
Што проста імі б любаваўся.
А знізу гэты лес кашлаты

Меў зелянюсенькія шаты
Лазы, чаромхі ці крушыны,
Алешын ліпкіх, верабіны.
Глядзіш, бывала, і здаецца,
Што скрозь сцяну галін жывую,
Скрозь гэту тканку маладую
Ні мыш, ні пташка не праб'ецца.
Цякла тут з лесу невялічка,
Травой заросшая крынічка,
Абодва берагі каторай
Лазняк, ракітнік абступалі;
Бруіліся ў цяньку іх хвалі
І ў луг чуць значнаю разорай
Ішлі спакойна між чаротаў,
Рабілі многа заваротаў,
Аж покі ў Нёман не ўцякалі.

# Білет № 11

## 1. Францыск Скарына — беларускі першадрукар і асветнік

…І Скарына наш друк распачаў
За паўвека да Фёдарава.
*П. Панчанка*

У тым, што мы ёсць сёння як нацыя і грамадзяне, найпершая заслуга Францыска Скарыны. Без яго ўсведамленне нас як нацыі і народа ў свеце было б праблематычным.

Тытан эпохі Адраджэння, асветнік-гуманіст, вучоны, пісьменнік і перакладчык, заснавальнік кнігадрукарства ва Усходняй Еўропе, мастак... Ён не толькі наш першы доктар навук — ён першы беларускі універсітэт. У яго творчай спадчыне — пачаткі ўсіх нашых пачаткаў, бо ён і філосаф, і філолаг, і гісторык, і эстэтык, і педагог, і батанік, і медык.

Слаўны «сын з Полацка» (нарадзіўся каля 1490 г.) атрымаў выдатную па тым часе адукацыю ў Кракаўскім універсітэце, а затым у Падуанскім універсітэце ў Італіі, дзе ў 1512 г. бліскуча вытрымаў экзамен на годнасць доктара медыцыны. У славутай Зале Сарака Падуанскага універсітэта ёсць фрэска Джыакома Форна з надпісам: «Францыск Скарына з Полацка». Але не медыцына і не вольныя мастацтвы сталі сэнсам яго жыцця. Ён «ізбрал оставіті в науце і в кнігах вечную славу і память свою». Яго кнігі на роднай мове, дакляраваныя «людем посполітым» «к доброму научению», былі і «Богу ко чти», і народу нашаму паходняй.

Мецэнатам Якубу Бабічу і Багдану Онкаву абавязаны мы тым, што наш слынны зямляк змог рэалізаваць свой дар: уславіць Бога і наш народ на векі вечныя. У 1517 г. ён едзе ў Прагу, каб стварыць першае ў гісторыі ўсходніх славян выдавецтва, дзе і выдае першую кнігу «Псалтыр». Скарына бачыў у гэтай кнізе «детям малым початок всякое добра навукі, дорослым помноженія в науце». У тым жа годзе выходзіць і другая кніга Бібліі «Ісус Сірахаў», у якой Скарына, добра ўсведамляючы значэнне зробленага ім, змясціў і свой уласны партрэт. Надзвычайная смеласць! Яго маглі абвінаваціць, што прыраўняў сябе да Бога, і спаліць на кастры. Да 1520 г. ён надрукаваў у Празе 22 кнігі Бібліі. Выданне Скарыны і па сённяшні дзень здзіўляе і захапляе ўзроўнем кнігадрукавання. Афармленне старонак, тлумачэнне ў тэксце і на палях неразумелых «людем посполітым» слоў (скарынінскія

глосы), аздабленне тэксту малюнкамі, ілюстрацыямі — усё характарызуе Скарыну як выдатнага і таленавітага кнігавыдаўца. Яго традыцыі выкарыстоўваюцца і ў сучасным кнігадрукаванні.

Згодна з ацэнкамі спецыялістаў, Скарынавы кнігі ўяўляюць выключную з'яву як паводле колькасці змешчаных у іх гравюр, так і паводле тэхнікі выканання. Высакаякасныя ілюстрацыі, якія ўпершыню даў Скарына, служылі не толькі для эстэтычнага аздаблення, але і для раскрыцця мастацкіх вобразаў. Усяго ілюстрацый — 51. Скарына выкарыстоўваў гравіраваны тытульны ліст, прабелы паміж словамі, абзацы. Друкуючы кнігі на роднай мове, клапаціўся, каб усё было зразумела кожнаму чытачу, рабіў пераклады і тлумачэнні: горлица — сівоворонка; хлябінн — продукт; холми — узгоркі; арьтемиде — богини; крижали — дьски; тмами темь — десяти тысещми; да насладится — приятна будеть.

Скарынавы глосы і тлумачэнні слоў непасрэдна ў тэксце — першыя лексікаграфічныя спробы, таму Ф. Скарына — наш першы лексікограф. Каб «люду паспалітаму» было зразумела значэнне слова «псалтыр», ён параўноўвае гэты музычны інструмент з усім вядомымі гуслямі: «Псалтыр іграе падобна да гусляў, бо як пяе сам цар і прарок: «Хваліце Госпада псалтыром і гуслямі...» І раздзел Бібліі назву мае ад псалтыра, што да гусляў падобны. Толькі гуслі маюць шмат струнаў, а псалтыр усяго дзесяць, як пра тое ў Бібліі сказана: «Хваліце Госпада псалтыром дзесяціструнным!»

У прамове да «Эклезіяста» слова «еклесіяст» Скарына перакладае як Саборнік, тлумачыць гэтую назву так: «Нарицается же сия книга Соборник, понеже не ко единому человеку в ней пишеть, но ко всему собору людей, а не единого человека мысль и кохание являеть, но всего собора».

Найбольшую мастацкую каштоўнасць уяўляюць Скарынавы прадмовы і пасляслоўі да кожнай кнігі Бібліі і да самога выдання, якія складаюць аснову яго літаратурнапубліцыстычнай спадчыны.

Кампазіцыя прадмоў і пасляслоўяў Скарыны складаецца з пераказу зместу, сюжэта эпічных кніг Бібліі, як, напрыклад, «Эсфір», «Юдзіф», «Выхад», ці вызначэння жанравых асаблівасцей лірычных кніг, як «Псалтыр»; тлумачэння слоў і выразаў праз параўнанні, асацыяцыі (псалтыр параўноўваецца з гуслямі); з вываду, вызначэння ідэі кнігі — «даконаны суть», якая па-філасофску, вобразна, афарыстычна выяўляецца Скарынам.

Такі пераказ кніг Бібліі з элементамі разважання спрыяў і папулярызацыі сюжэтаў і ідэй Кнігі кніг, і выяўленню Скарынавых поглядаў, філасофіі пісьменніка-патрыёта.

Так, пераказваючы кнігу «Юдзіф», Скарына акцэнтуе ўвагу чытача на гераічным учынку Юдзіфі ў імя свайго народа. У час асады роднага горада яна пранікла ў стан ворага, спакусіла военачальніка Алаферна і, скарыстаўшы момант, адсекла яму галаву. У канцы пераказу Скарына падымаецца да філасофскага абагульнення, афарыстычна выяўленага ў несмяротных радках:

*Понеже от прирожения*
*звери, ходящие в пустыни,*
*знают ямы своя;*
*птицы, летающие по возьдуху,*
*ведають гнёзды своя;*
*рыбы, плавающие по морю и в реках,*
*чують виры своя;*
*пчёлы и тым подобныя*
*боронять ульев своих, —*
*тако ж и люди,*
*и где зродилися и ускормлены суть по бозе,*
*к тому месту великую ласку имають.*

Прадмовы і пасляслоўі Ф. Скарыны — узор публіцыстыкі. Многія ўрыўкі з яго публіцыстычнай спадчыны — дасканалыя вершы. І ў згаданым вышэй урыўку кожны радок — сэнсавая і інтанацыйна-сінтаксічная еднасць. Менавіта такая кампазіцыйная структура свабоднага верша. Паўтаральная інтанацыя, выражаная ў перыядзе, вызначае своеасаблівы рытм верша як адзін з галоўных яго атрыбутаў.

Вельмі сціпла і вычарпальна пераказаў Ф. Скарына і сюжэт кнігі «Эсфір» пра подзвіг сваячкі і выхаванкі пабожнага іудзея Мардахея — Эсфір. Персідскі цар ажаніўся з Эсфір, што выклікала зайздрасць прыдворных, асабліва ў Амана, гордага царскага любімца. Раззлаваны годнасцю Мардахея, Аман вырашыў знішчыць і яго, і ўсіх іудзеяў у Персідскім царстве. І ён дабіўся згоды ад цара на такі карны ўказ. Мардахей запатрабаваў, каб Эсфір заступілася за свой народ. Рызыкуючы жыццём, Эсфір з'явілася без запрашэння да цара і пераканала наведаць падрыхтаваны ёю пір, у час якога звярнулася да цара з просьбай пра абарону: «...царица Есфер выбавила их от побития и выпросила от царя места противные на погубление всея родины и помощников Амановых и на избавление иудеов».

Філасофскі вывад, «даконаны суть», сам Ф. Скарына аформіў вершаваным чатырохрадкоўем, падкрэсліўшы і такі аспект сваёй дзейнасці, як паэтычны.

*Не копай под другом своим ямы,*

*Сам ввалишся в ню.*
*Не став, Амане, Мардохею шибенице,*
*Сам повиснет на ней.*

Гэты верш да ўсяго сведчыць пра цесную сувязь літаратурнай Скарынавай спадчыны з фальклорам.

Адзін з даследчыкаў творчасці Кірылы Тураўскага Юрый Лабынцаў лічыць Ф. Скарыну яго непасрэдным спадкаемцам:

*Да подай нам на землю мир, грехом очищение, немощным здравие, смутным потешение, ненадёжным надежду, воюющим за веру Христову победу, пленникам избавление, нагим одеяние, сиротам хлебокормление, по морю плавающим тишину, во путь шествующим пристанище, обидимым споможение, и всем христианам спасение, а по смерти царство небесное, яко один человеколюбец и Бог наш.*

У гэтым Скарынавым тэксце пераемнасць не толькі паводле жанру (малітва), але і паводле вобразных сродкаў, асацыятыўнасці, рытмізаванасці мовы. Галоўнае — у сцвярджэнні ім вечных ісцін і каштоўнасцей.

Пераканаўчым доказам і сведчаннем паэтычнай спадчыны Ф. Скарыны з'яўляюцца аформленыя ім вершам дзесяць запаведзяў у прадмове да кнігі «Выхад». Ф. Скарына піша, што кніга апавядае пра выхад іудзеяў з егіпецкага рабства, пра іх 40-гадовы пакутніцкі шлях да зямлі абяцанай, пра дапамогу Госпада на гэтым пакутніцкім шляху: «яко манну Бог послал с небеси на пищу и воду вывел от тверда каменя и к питию людем во пустыни», як караў егіпцян дзесяццю напасцямі, «иже наведе рукою Моисеевою на всю землю египетскую», як «десятеро приказание им дал, написано на досках каменных».

*Первое: Веруй в бога единого!*
*Второе: А не бери надармо имени его!*
*Третье: Помни дни светые святити!*
*Четвёртое: Отца и матку чтити!*
*Пятое: Не забивай ни едина!*
*Шестое: И не делай грьху блудна!*
*Седмое: Не вкради что дружнего!*
*Осмое: А не давай сведецтва лживого!*
*Девятое: Не пожедай жены ближнего!*
*Десятое: Ни имения или речи его!*

У гэтым творы відавочны акрамя рытму і такі атрыбут вершаванай мовы, як рыфма, прычым сумежная.

Пераказваючы сюжэты біблейскіх кніг, Скарына ў прадмовах акцэнтуе ўвагу чытача на самых важных і афарыстычных момантах

Біблії — на законах вечнасці, сабраных у ёй і дакляраваных людзям: «Закон прнроженый в том наболей соблюдаем бывает: то чинити иным всем, что самому любо ест от иных всех, и того не чинити иным, чего сам не хощеши от иных имети... Сей закон прироженый написан ест в серии единого каждого человека», «...Наиболей любовь ко всем да соблюдает, ежели ест совершенна над все иные дарования, без нея же ничто поспешно ест». Надзённа гучыць Скарынаў напамін нам усім, што валадарыць светом любоў, бо яна самая дасканалая з усіх даброт і каштоўнасцей, без якой марна ўсё ў свеце.

Ф. Скарына не толькі паэт, публіцыст, лексікограф, але і літаратуразнаўца. У сваіх прадмовах ён не толькі пераказаў многія кнігі Біблії, але і зрабіў літараіуразнаўчы аналіз некаторых, звярнуўшы ўвагу на жанравую і мастацкую адметнасць лірычных твораў Біблії, у прыгатнасці, на прытчавасць. Цяжка знайсці ў каго іншага больш трапнае азначэнне прытчы як жанру, вычарпальную канстатацыю яе галоўных прыкмет — іншасказальнасці і павучальнага сэнсу. «Притчи или присловия, понеже иными слозы всегда иную мудрость и науку знаменують, а иначей ся разумеють, нежели молвлены бывають, а болши в собь сокритых тайн замыкають, нежели ся словами пишуть». А далей — вобразнае параўнанне загадкі-мудрасці прытчы з ядром у арэху, з золатам у зямлі, з сілай каштоўнага каменя. Ф. Скарына — паэт-філосаф, які не можа не здзіўляць грыгінальнасцю і трапнасцю сваіх довадаў.

Мы можам ганарыцца і тым, што ў віленскі перыяд сваёй дзейнасці («Малая падарожная кніжыца», 1522 г. і «Апостал», 1525 г.) ён заснаваў першую друкарню на тэрыторыі Беларусі. Як сцвярджалі старажытныя рымляне, «напісанае застаецца». Напісанае Скарынам — дарагая рэліквія, духоўны скарб, нацыянальная святыня. У выданнях Скарыны шматразова паўтараецца выява сонца і месяца з чалавечымі тварамі. Выбар сімвала яўна невыпадковы. Даследчыкі пісалі, што знак гэты быў створаны і абраны Скарынам «у якасці свайго асабовага герба, а мо нават і талісмана». Магчыма, у ім адлюстраванне факта нараджэння Скарыны ў год сонечнага зацьмення ў Беларусі (1486). Сёння выказваецца меркаванне, што ў выяве сонца з прамянямі і месяца — сімвал перамогі святла над цемрай, жыцця над смерцю. Знак Скарыны трактуецца як хвала і слава кнізе — крыніцы святла, мудрасці, дабрачыннасці, ведаў, кнізе, якую дакляраваў нам Скарына любіць і шанаваць, бо яна — «лекі для душы».

У беларускай літаратуры створана найбагацейшая Скарыніяна, а скарынаўскія рэмінісцэнцыі ёсць у творчасці кожнага паэта, пісьменніка, мастака. Адным з таленавітых даследаванняў у галіне літара-

туры, вартых тытана Адраджэння і гордасці нашай нацыі, з'яўляецца раман-эсэ А. Лойкі «Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае».

У вершы «Скарына пакідае Радзіму» У. Караткевіч сцвярджае думку аб недаравальнай віне зямных багоў перад такім тытанам, які вымушаны быў цярпець нягоды, нястачы, шукаць прытулку на чужыне; ствараючы ўзвышанае, жыць клопатамі пра зямное:

Выгнанне. Выгнанне. Выгнанне. Па еолі зямных багоў Спалілі браты-хрысціяне Кпігі пра бога свайго.

Вяртанне Скарыны на Радзіму і ў нашы душы залежыць ад кожнага з нас...

## 2. Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды». Вобраз Алеся Руневіча

Хто мужны, хто смелы, хто дужы,
Хто цэлем працят залатым,
Над тым неўладарныя сцюжы,
І лёс неўладарны над тым.

*У. Жылка*

Раман Янкі Брыля «Птушкі і гнёзды» створаны на матэрыяле ўласнага жыцця самога пісьменніка. Алесь Руневіч, галоўны герой рамана, амаль поўнасцю паўтарае біяграфію аўтара. Аднак у прадмове да рамана пісьменнік папярэджвае чытача, што гэта — «не аўтабіяграфія, а біяграфія адной душы», і запрашае чытача да падарожжа ў мінулае, якое змяшчае ў сабе вытокі сучаснасці і будучыні.

Раман выяўляе характэрную адметнасць стылю пісьменніка, які вызначаецца як «лірычная проза Брыля». Гэты твор з'яўляецца паэмай у прозе, а крытык У. Калеснік назваў яго раманам-паэмай, што абумоўлена сімбіёзам лірычнага і эпічнага.

Эпічнае ў рамане — гэта «адысея» юнака заходнебеларускай вёскі Пасынкі з фашысцкага палону дадому. Алесь Руневіч, як і сам аўтар, служыў у польскім войску, а калі на Польшчу напала фашысцкая Германія, трапіў у палон. Праз прызму душы галоўнага героя рамана паказаны трагічны лёс людзей, якім выпала жыць у самы драматычны перыяд XX стагоддзя, у самы цяжкі і крывавы час. Апісанне ўбачанага і перажытага Алесем Руневічам садзейнічае выяўленню аўтарскай пазіцыі і погляду на вайну як самую страшную трагедыю чалавецтва. «І навошта, скажыце, вайна? Ну каму яна, скажыце, патрэбна?..» — з адчаем усклікае простая нямецкая жанчына і расказвае высокаму русаму юнаку, які трохі разумее па-нямецку, што яе сына таксама забралі на вайну.

Адметнасцю рамана з'яўляецца і тое, што ў ім мноства эпізадычных вобразаў. Людзі, якія сустракаліся Алесю Руневічу на яго шляху да волі (уражвае не толькі першая яго спроба ўцячы з палону, але і другая, калі ён едзе ў адным вагоне з п'янымі гестапаўцамі, а потым прабіраецца прасёлкамі да сваіх) пераканалі юнака ў тым, што няма кепскіх ці добрых народаў. Ёсць кепскія палітычныя рэжымы, ёсць бесчалавечныя абставіны, якія правакуюць людзей на выяўленне і не лепшых іх якасцей. Пабыўшы сярод немцаў, пабачыўшы і зведаўшы на сабе людскасць адных і зверства другіх, ён навучыўся адрозніваць, «дзе фашыст, а дзе вечнае, народнае».

Праблема людской супольнасці, нацыянальнага і інтэрнацыянальнага — адна з галоўных у творы. Разумение таго, што ёсць людзі і нелюдзі, незалежна ад іх нацыянальнай прыналежнасці, не зняверыла юнака і дапамагло застацца чалавекам. Набытыя ім уласным горкім вопытам веды пра чалавека і свет спатрэбіліся Алесю, калі яму нарэшце ўдалося вырвацца з палону, вярнуцца на Радзіму, наладзіць сувязь з партызанамі. Алесь пакутуе, што тут, на акупаванай немцамі зямлі, усё ўспрымаецца інačай. Народная праўда такая: «што ні немец, то гад» і «адсюль ён не павінен вярнуцца». І Алесь прымае гэтую праўду!

Трагедыя чалавека, што ў бесчалавечных абставінах вымушаны ісці на другога, магчыма, такога, як ён сам, чалавека, паказана пісьменнікам надзвычай пранізліва і пераканаўча. І дасягаецца гэта найперш тым, што галоўны герой рамана — чалавек, які вылучаецца сярод іншых не толькі высокім ростам, але і высакародствам, самавітасцю, годнасцю. Чалавек чуйнай душы, вялікага розуму, Алесь не толькі сам вытрымлівае страшныя выпрабаванні, але і пакутуе, калі на яго вачах прыніжаюць іншых, калі чалавек нішчыць другога. Усё ў рамане бачыцца вачамі Алеся, усведамляецца яго розумам, адчуваецца яго душой. Ён пакутліва шукае адказу на пытанне, чаму нацыя, вядомая ўсяму свету выдатнымі філосафамі, пісьменнікамі, музыкантамі, дазволіла сфарміравацца фашызму з яго чалавеканенавісніцкай філасофіяй. Праблема гэтая надзённая і сёння, бо не знікла ў свеце пагроза дыктатуры з яе жахлівымі наступствамі.

Праз усведамленне галоўнага героя выяўляецца пісьменніцкая філасофія і перакананне, што ўсё ў чалавеку вырашае найперш чалавечае, а не сацыяльна-класавае, нацыянальна-этнічнае: «Людзі, браток, усюды людзі». Прыгадаў Алесь, як чуў дома, калі хто хваліў добрага чалавека: «Скажы ты, вось і паляк (або яўрэй ці татарын), а ўсё роўна наш (або свой) беларус...»

Свет, асабліва пасля ўсяго перажытага ў канцлагеры, гэтым «інтэрнацыянале», усведамляецца галоўным героем як «велізарны дом», у якім не можа пакуль што знайсці агульную мову чалавечая сям'я. Асабліва ўражваюць чытача старонкі, прысвечаныя людскасці сярод мора чалавечай азвярэласці. Нібы божы дар успрымае Алесь выпадковую сустрэчу з добразычлівай нямецкай фраў, якая і правяла яго наказам: «Увесь свет — вялікі дом». Неспадзяваным шчасцем была для яго сустрэча ў нямецкім канцлагеры роднай душы — паэта Крушыны.

Герой рамана Брыля — асоба моцная, выключная, незвычайная, высакародная і прыгожая. Пісьменнік выпрабаваў яго бесчалавечнымі, экстрэмальнымі абставінамі, менавіта абставінамі, а не экстрэмальным момантам, сітуацыяй. Руневіч, кінуты ў крывавы вір падзей, з годнасцю праходзіць праз усе выпрабаванні. Што гэта за сіла, якая не дала загінуць і Алесю Руневічу, і цэламу народу, дапамагла вытрымаць выпрабаванні і пранесці жывую душу праз голад і холад, дым і попел пажарышчаў, кроў і гвалт?

Герой сам дае адказ на гэтае пытанне: «Маміны казкі, расказы ды песні на прасніцы або за шчытом, мова і песні...» Пра Бацькаўшчыну — усе думкі Руневіча. Дзеля вяртання дадому ён гатовы пайсці на відавочную рызыку, на якую (і гэта пераканаўча паказана ў творы) іншыя не ідуць. І Алесь Руневіч адважаецца на рызыку і перамагае.

Філасофская думка, што Радзіма для кожнага чалавека — прошча (святое месца, надзеленае надпрыроднымі сіламі), выяўлена і ў назве твора. Як птушка да пакінутага гнязда, імкнецца герой да роднай Беларусі, ад якой адарваны не па сваёй віне, а па злой волі іншых. Для Руневіча маці-радзіма — «краіна людской надзеі, дзеля якой толькі і варта жыць на гэтым вар'яцкім свеце, дзеля якой варта ваяваць і паміраць». Прыёмам рэтраспекцый, праз шматлікія ўспаміны галоўным героем свайго маленства і дарагіх яго сэрцу людзей пісьменнік сцвярджае вельмі важную для ўсіх нас думку, што радзіма — гэта найперш сям'я. Менавіта ў сям'і Алесь Руневіч атрымаў першыя (і на ўсё жыццё!) урокі чалавечнасці, спагады, мужнасці — усяго таго, што і дапамагло яму вярнуцца ў роднае гняздо.

Даследчыкі і крытыкі справядліва вызначылі галоўную заслугу Янкі Брыля ў стварэнні рамана, які адпавядае ўсім патрабаванням інтэлектуальнай літаратуры. Філасофскі раман, пазбаўлены сацрэалістычнай пафаснасці, напышлівасці, засведчыў каштоўнасць і непаўторнасць асобы і яе духоўнага вопыту.

**3. Прачытаць на памяць урывак з прадмовы да кнігі «Юдзіф» Францыска Скарыны**

... звери, ходящие в пустыни,
знают ямы своя;
птицы, летающие по возьдуху,
ведають гнёзды своя;
рыбы, плавающие по морю и в реках,
чують виры своя;
пчёлы и тым подобныя
боронять ульев своих, —
тако ж и люди,
и где зродилися и ускормлены суть по бозе,
к тому месту великую ласку имають.

# Білет № 12

## 1. Драматургічнае майстэрства Янкі Купалы. Камедыя «Тутэйшыя». Вобразы Мікіты Зносака і Янкі Здольніка

...Апомніцеся, але каб не было запозна.
*Янка Купала*

Пра заслугі Купалы ў драматургіі, у якой ён, як і ў паэзіі, дасягнуў вяршынь высокага мастацтва, сведчыць і той факт, што галоўны наш нацыянальны тэатр носіць яго імя. Візітнай карткай гэтага тэатра з'яўляецца спектакль па п'есе Купалы — «Паўлінка». Напісаная амаль 90 гадоў таму назад, упершыню пастаўленая ў 1913 г. у Вільні, яна і па сённяшні дзень застаецца адной з самых папулярных і любімых народам беларускіх п'ес. Жамчужынай беларускага мастацтва назваў яе А. Твардоўскі. Прасякнутая здаровым народным гумарам, аздобленая фальклорнымі рэмінісцэнцыямі, яна сцвярджае вечныя каштоўнасці, спрыяе духоўнасці народа. Ужо ў сваім першым драматычным творы Я. Купала сцвердзіў сябе як выдатны майстар канфлікту і камічных сітуацый. Праталенавітасць твора сведчыць і «крылатасць» многіх выслоўяў, выразаў.

Разнастайнасць драматургічнага дару Я. Купалы праявілася і ў сацыяльна-філасофскай драме «Раскіданае гняздо» (1913), у аснове сюжэта якой — востры канфлікт паміж дабром і злом, паміж марай і рэчаіснасцю. Філасофскі змест драмы раскрываецца праз усведамленне шчасця ўсімі персанажамі. Кожны з іх шчасце разумее па-свойму і прапануе свой шлях да яго. На прыкладзе трагедыі адной сям'і Зяблікаў, аднаго раскіданага гнязда драматург здолеў паказаць трагедыю ўсяго беларускага народа напярэдадні рэвалюцыі 1905 г., імкненне народа да зямлі і волі.

Аднак без перабольшання можна сказаць, што з асаблівай сілай талент Купалы-драматурга, яго наватарства ў гэтым жанры выявіліся ў трагікамедыі «Тутэйшыя» (1922).

Ні ў чым Янка Купала як сын свайго народа не быў такім паслядоўным, настойлівым і палымяным, як у сцвярджэнні ідэі нацыянальнай годнасці беларусаў і нацыянальнага адраджэння. Рэалізацыя гэтай ідэі ў «самым складаным родзе літаратуры» дазволіла Купалу «ўзбуйняць» праблему нацыянальнага адраджэння, «падвышаць» трывогу «на свет цэлы», збіраць у адзін фокус усё тое, «што ў паэзіі выглядала рассеяным» (Я. Купала).

І ўзбуйніў, і падвысіў трывогу «на свет цэлы», і сабраў у фокус настолькі таленавіта, што ўжо самы першы спектакль ,па п'есе быў забаронены як шкодны, сама п'еса запісана ў разрад «нацыяналістычных твораў». Першы пастаноўшчык спектакля А. Папоў быў вызвалены з пасады рэжысёра ў Маскве і высланы ў правінцыю. Сапраўднае сцэнічнае адраджэнне п'есы адбылося толькі ў 1990 г. таленавітым рэжысёрам М. Пінігіным у тым жа самым тэатры, які з гонарам носіць імя славутага песняра.

Ідэя нацыянальнай годнасці і нацыянальнага адраджэння рэалізуецца драматургам праз вобразы-антыподы — Мікіты Зносака і Янкі Здольніка і праз непрымірымы канфлікт паміж імі, на якім і грунтуецца п'еса. Да Янкі Купалы свядомая,здаровая частка інтэлігенцыі шукала «ворагаў беларушчыны» паўсюдна і дзе заўгодна. Упершыню «на свет цэлы» Янка Купала забіў трывогу і паставіў дакладны дыягназ: самы страшны «вораг беларушчыны» — тутэйшыя з іх ідэалогіяй, што працуе толькі на страўнік, з іх прынцыпам «служу тым, хто больш плаціць», зноскі-неданоскі, пазбаўленыя святых пачуццяў нават да роднай маці.Такія гатовы на ўсё: «Вось вам, ясне мусье немец, гер германіш, пакуль што кантрыбуцыя, заўтра дам анэксію, а там, калі не хопіць, жонку, дзяцей залажу, меджду протчым, толькі дайце передышку». Такія, як вычарпальна сказала пра сына Гануля, — «ні богу свечка, ні чорту качарга». Ні тое ні сёе, ні к сялу ні к гораду, але якія ж небяспечныя!

У пачатку апошняй дзеі Гануля паведамляе радасным маладажонам Янку і Аленцы, што «былі і сягоння гэтыя нібы вучоныя Мікітавы» і пыталіся, які «магнэс» яго болей прыцягвае — усходні ці заходні. Малады настаўнік не задумваючыся адказвае: «Трэ было, цётачка, сказаць, што ні той, ні сёй, а тутэйшы». У гэтай паваротнай рэпліцы сканцэнтравана ідэя твора: «тутэйшасць» — самы страшны «магнэс», нацыянальная бяда. Забыццё і вырак свайго паходжання, мовы, радзімы, жыццё па прынцыпе: «Можна мець светапогляд адзін, думаць другое, гаварыць трэцяе, а рабіць чацвёртае» — вось некаторыя выявы тутэйшасці, сканцэнтраваныя ў здзекліва-сатырычным вобразе Мікіты Зносака. Нагадваем, што зноскам у народзе называюць недаразвітае, маленькае курынае яйка. Недаразвітасць пачуцця нацыянальнай, (а значыць, і чалавечай!) годнасці ў Мікіты маюць самыя ганебныя выявы: нігілізм, цынізм, здрадніцтва.

Раскрыццю вобраза спрыяюць дыялогі паміж Мікітам і Янкам Здольнікам, якога Мікіта з пагардай называе «панам дырэктарам беларускай басоты». Зносак адмаўляе ўсё беларускае, цынічна прызнаецца, што, будзь яго воля, ён увёў бы «адзіны непадзельны

рускі язык... ад Азіі да Аўстраліі, ад Афрыкі да Амерыкі і ад Смаленску да Берліну». Самахарактарыстыкай вобраза з'яўляецца мова Зносака: скалечаная і засмечаная русізмамі і іншай замежнай лексікай (у залежнасці ад сітуацыі), канцылярызмамі і словамі-паразітамі («медждy протчым»), Мова выдае і невуцтва, і маральную спустошанасць героя; як казала маці Зносака, «вучыўся, але, мабыць, недавучыўся».

Падзеі ў п'есе разгортваюцца ў складаны для беларускага народа час — 1918-1920 гг., калі адна акупацыйная ўлада змянялася другой, а Беларусь была арэнай змагання паміж Захадам і Усходам. Філасофія пісьменніка-патрыёта, яго трывога за будучыню, за скарб, што застаўся нам «ад прадзедаў спакон вякоў», і ўсведамленне таго, што ў спрэчцы паміж Захадам і Усходам адносна Беларусі ўсё могуць вырашыць тутэйшыя — прыхільнікі «страўнікава-вантробнай тэорыі», выяўляецца праз вобраз Янкі Здольніка.

Пісьменніцкае ўсведамленне ўсёй небяспечнасці тутэйшых сфакусіравана ў выкрывальнай прамове-маналогу Янкі Здольніка: «О так, так! Для вашага гонару падавай вам мацярынскі язык цароў, Мураўёвых-вешацеляў, Распуцінаў, Азэфаў і ўсея кампаніі падобнай ім, а на свой, папраўдзе для вас родны, як вы кажаце, язык вам напляваць! Эх, русацяп вы, русацяп! Але го дзе аб гэтым! Калісь вы, пане рэгістратар, апомніцеся, але каб не было запозна». Свой канчатковы пісьменніцкі прысуд манкуртам і выраджэнцам-зносакам Янка Купала таксама «даручае» вынесці Янку Здольніку: «Так! Ваш рэгістратар быў вялікае нішто і застаўся вялікім нічым». Усведамляючы, што такіх, як Зносак, змяніць да лепшага немагчыма, бо з нічога і будзе нішто, Янка Здольнік развітваецца з усімі і едзе на вёску, дзе «сонца весялей свеціць», ды і «людзі там лепшыя». Усе свае надзеі Купала ўскладае на «мілую моладзь, слаўную моладзь», якая «горы і моры» можа адолець, «сэрцам расплавіць ільдзіны». «У народ і край свой толькі» верыў Купала. У такіх, як Янка Здольнік.

І ўсё ж трагічнае ў творы наўрад ці абмяжоўваецца толькі канстатацыяй тутэйшасці і ўсяго таго, што сталася з народам, які змусілі адмовіцца ад належнага яму імя і называцца проста тутэйшымі.

Трывожнае і трагічнае ў творы звязана з Купалавым усведамленнем наступстваў тутэйшасці. Словы «каб не было запозна» папераджальныя не толькі для тых, каго, падкарміўшы, можна павесці ў любы бок. Ды і наўрад ці такія апомняцца. Не паспеюць. Як той Пакормны з байкі Ядвігіна Ш. (радаваўся, калі добра кармілі, а як «падвялі пад абух», то не паспеў апомніцца, чаму і за што). Трэба нешта рабіць, каб «запозна» не было для ўсіх. Здольнікі павінны быць

больш дзейныя, бо толькі абурацца «страўнікава-вантробнай» псіхалогіяй зносакаў, жыць там, дзе «сонца весялей свеціць» і дзе «людзі лепшыя», здольны многія. Але гэтага вельмі мала, каб наша спадчына, наш святы скарб «не збрыў дзе проч»...

## 2. Служэнне народу — асноўны абавязак мастака. Паэма Якуба Коласа «Сымон-музыка»

> Панёс ён людзям песень дар —
> Агонь душы і сэрца жар.
>
> *Якуб Колас*

Мы ўсведамляем Коласа перш за ўсё як пісьменніка-рэаліста. Аднак у яго спадчыне ёсць твор, у якім дзівосным чынам спалучана рэалістычнае, прычым на ўзроўні гістарычнага, з рамантычным. І менавіта апошняе дамінуе і вызначае жанр паэмы «Сымон-музыка» як рамантычны твор. Гэта выключэнне, зробленае песняром з яго уласнай галоўнай манеры, стыю адлюстравання жыцця, сведчыць пра асабліваe яго стаўленне і да праблемы твора, і да тых сродкаў, якімі яна вырашаецца.

Паэма прысвячаецца «беларускай моладзі». Удакладнім: той моладзі, якая, наперакор нягодам і перашкодам, цалкам аддала сябе слугаванню Бацькаўшчыне і народу, несла «агонь душы і сэрца жар» для «душою чулых», — таленавітай моладзі.

Асабліва вялікае сэнсавае значэнне мае ўступ да паэмы. Нельга не пагадзіцца з тымі даследчыкамі, якія сцвярджаюць, што ва ўступе— канцэптуальны змест твора. Уступ уяўляе сабой разгорнутую перыфразу (моўная загадка, у якой апісваецца з'ява ці прадмет, але не называецца). Некаторыя «разгадваюць» гэты ўступ як апісанне канкрэтнага твора — паэму «Сымон-музыка», якая дакляруецца таленавітай моладзі. Аднак і паэма, і ўступ-прысвячэнне маюць абагульняльны алегарычны сэнс. Разгорнутая перыфраза абазначае мастацкі твор наогул. Вобразна, афарыстычна і вычарпальна апісаны ўсе галоўныя атрыбуты твора як факта мастацтва: яго прызначэнне, аснова, вытокі («адбітак родных з'яў»), вобразнасць («у словах-вобразах»), адрасат («для вас, душою чулых...»). Кантэкстуальныя сінонімы (скарб, доўг, дар), выкарыстанне слоў у пераносным значэнні (струменіўся, спяваў), паўторы (Дзянніц маіх, дзянніц маіх мінулых; Як доўг, як дар) не толькі робяць тэкст рытмізаваным, але і выяўляюць узрушанасць, усхваляванасць, пачуццёвасць аўтара і яго

філасофскае ўсведамленне твора як таямніцы, разгадаць да канца якую не дадзена нікому, бо то — дар Усявышняга.

Такім незвычайным дарам надзелены і галоўны герой паэмы Сымонка:

У яго быў свет цікавы,
Свае вобразы, жыццё,
І ў душы яго ўсе з 'явы
Сваё мелі адбіццё.

Незвычайнасць свайго героя і яго дару паэт падкрэслівае настойліва і пастаянна: «Ну, Сымон, не чуў ніколі, каб тваіх гадкоў дзіця ды так мудра разважала...»

Рамантычнымі сродкамі (метафарамі, адухаўленнем і ўвасабленнем) апісвае паэт сілу ўздзеяння дару Сымона:

Ён зайграў, і струны горка
Адклікаліся-гулі,
Аддавала іх гаворка
Гневам, крыўдаю зямлі.

У паэме «Сымон-музыка» (як гэтага і вымагае жанр рамантычнай паэмы) модная, выключная, незвычайная асоба выпрабоўваецца выключнымі абставінамі. Выключнасць выпрабаванняў, што выпалі на долю таленавітага хлопчыка, — у іх бесчалавечнасці, жорсткасці.

Сюжэт паэмы (а ён грунтуецца на апісанні змагання героя з абставінамі, адстойвання сябе як Асобы і свайго дару, які «панёс ён людзям») уяўляе сабой своеасаблівае вандраванне Сымона ў часе і ў прасторы. Сюжэт адначасова служыць выяўленню аўтарскай думкі пра трагедыю Асобы ў грамадстве і віну грамадства, што не ўсведамляе, якім багаццем праз гэтую Асобу валодае само.

Край мой родны!
Дзе ж у свеце
Край другі такі знайсці,
Дзе б магла так, поруч з смеццем,
Гожасць пышная ўзрасці?
Дзе бы вобруку з галечай
Расквітнеў багацтва цуд,
І дзе б з долі чалавечай
Насмяяліся, як тут ?..

Імя гэтай гожасці і цуду — талент. Але як жа цяжка таленту «поруч з смеццем»! У звароце і рытарычным пытанні выяўлена аўтарскае абурэнне і бесчалавечнасцю «смецця», і людской неашчаднасцю. Талент— самае вялікае багацце і гожасць нацыі. Але як жа бяздумна, жорстка і неразумна ставімся мы да свайго ж багацця! Трагедыя,

бяда чалавеку, калі ён «не такі, як усе»: «з ім і дзеці не гулялі, не прымалі да гупьні», не раз злая рука «маладзецкі штурхане». Асабліва ўражвае і шчымлівым болем аддаецца жорсткасць бацькоў і блізкіх Сымонкі. Яны таксама зневажалі хлопчыка і здзекаваліся з яго, бо ён з яго выключнасцю і адоранасцю ўспрымаўся нават імі як «нейкі вырадак дзіўны».

Чужы чалавек аказаўся раднейшым за родных. Дзед Курыла не толькі зразумеў адрынутае ўсімі дзіця, але і паспрыяў таленту, падтрымаў яго.

Вобразам дзеда Курылы паэт славіць самы светлы і, на жаль, самы рэдкі талент — чалавечнасць. Праз гэты вобраз яшчэ мацней і настойлівей выяўляецца аўтарскае ўсведамленне трагедыі мастака ў грамадстве, «бо не любяць свет і людзі, каб іх тайнасці пазнаць, каб зашянуць у іх грудзі і зняць тайнасці пячаць...». Сапраўды, як сцвярджае і дзед Курыла, няма прарокаў у сваёй Айчыне!

Сіла ўздзеяння рамантычнага вобраза тым большая, чым настойлівей герой ідзе да мэты — нясе людзям «агонь душы і сэрца жар». А на шляху ўсё новыя выпрабаванні: смерць дзеда Курылы, сустрэча з жабраком (кантрастны вобраз, антыпод вобраза дзеда Курылы), служба на карчмара і на князя ў замку... Гэтыя сюжэтныя моманты садзейнічаюць і выяўленню пісьменніцкай філасофіі, і вырашэнню галоўнай праблемы твора: каму павінен служыць творца? У чым прызначэнне песняра і музыкі? Якім павінен быць «песень дар»?

Ужо ўступам да паэмы пісьменнік адказаў на гэтыя пытанні адназначна:

І гэты скарб, пазычаны, адбіты,
У сэрцы пераўжыты
І росамі абмыты
Дзянніц маіх, дзянніц маіх мінулых,
Для вас, душою чулых,
Як доўг, як дар
Дае пясняр.

Выключнасць і сілу свайго героя паэт сцвярджае і праз адмаўленне Сымонам тых шляхоў, якія прапаноўваліся яму абставінамі. Жабрак патрабуе ад яго песень, якія расчулілі б людзей і давалі большы прыбытак. Карчмар патрабуе грання для п'яніц, князь у замку — для паноў. Ні першае, ні другое, ні трэцяе для Сымона непрымальнае. Музыка выбірае свой шлях:

...Песні будзе ён складаць,
Ен людзей дабром атуліць,
Каб палёгку людзям даць.

Вялікая каштоўнасць паэмы як шэдэўра мастацтва і ў яе гуманістычным пафасе, і ў высокім узроўні абагульнення, філасафічнасці. Паэт з незвычайнай сілай сказаў пра нашу нацыянальную трагедыю: несупынныя войны, што вяліся на нашай зямлі, якая была арэнай бітвы для заваёўнікаў:

Тут схадзіліся плямёны
Спрэчкі сілаю канчаць,
Каб багата адароны
Мілы край наш зваяваць...

Трагедыя нашага народа ўсведамляецца паэтам найперш у тым, што вайной вынішчаецца генафонд нацыі, яе таленты:

Колькі талентаў звялося,
Колькі іх і дзе ляжыць,
Невядомых, непрызнаных,
Не аплаканых нікім...

Вялікая мара паэта, выяўленая ім у адным са шматлікіх філасофскіх і лірычных адступленняў пра тое, каб беларускі народ набыў права і магчымасць «шлях свой адзначаць і сваім уласным краем край свой родны называць». Усім сваім творам паэт сцвярджае, што толькі пры такой умове магчымы росквіт талентаў — найвялікшае багацце Беларусі.

**3. Прачытаць на памяць верш Янкі Купалы (на выбар)**

**І прыйдзе**
І прыйдзе новых пакаленняў
На наша месца грамада
Судзіці суд, ці мы сумленна
Жыццё прайшлі, ці чарада
Зняваг мінулых нас не з'ела,
Пакінуўшы свой дым і чад,
І мы па-даўняму нясмела
Жылі не ў лад і неўпапад?
Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І дабравольна, без прынук,
Самі сабой не гандлявалі,
Не неслі ў петлі дум і рук?
І ці пакінуці на памяць
Мы песень гэтакіх змаглі,
З якіх бы можна было ўцяміць,
Што мы свабоднымі былі?..
А ўжо свой выдасць непадкупны

Аб нас гісторыя прысуд,
Калі аглядам гляне рупным
І разбярэ, ў чым справа тут.
У сведкі запісы пакліча,
Паданні клікне ў час такі
І ўсё паліча, пераліча...
А суд гісторыі цяжкі!..
І засумуецца патомак,
Калі дазнаецца аб нас,
Што нейкі з нас хоць быў не зломак,
А плечы гнуў у крук не раз;
Не йшоў з адкрытымі вачыма
У свет і сцежкі не прастаў,
А ўсёй магчымасці магчымай
Таптаў сляды, сябе таптаў.

**Мая малітва**

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

Я буду маліцца да яснага сонейка,
Няшчасных зімой саграваць сірацін,
Прыветна па збожных гуляючы гонейках,
Часцей заглядаці да цёмных хацін.

Я буду маліцца да хмараў з грымотамі,
Што дзіка над намі гуляюць не раз,
Каб жаль над гаротным мелі беднотамі,
Градоў, перуноў не ссылалі падчас.

Я буду маліцца да зорак і жаліцца,
Што гасяць сябе надта часта яны,
Бо чуў, як якая з неба з іх зваліцца,
З жыцця хтось сыходзе на вечныя сны.

Я буду маліцца да нівы ўсёй сілаю,
Каб лепшаю ўродай плаціла за труд,
Збагаціла сельскую хату пахілую,
Надзеі збытымі ўбачыў наш люд.

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі

Не вылі над роднай зямлёй, нада мной.

**Не шукай...**

Не шукай ты шчасця, долі
На чужым, далёкім полі,
Гэт, за шумным лесам-борам,
За шырокім сінім морам Не шукай ты шчасця, долі!

Ты ўсё знойдзеш гэта блізка,
Там, дзе маці над калыскай
Табе песні напявала,
Як малога калыхала,
Толькі ўмей шукаці блізка!

* * *

Не шукай сабе дружакаў
Між чужынцаў, між піяўкаў,
Ні у месцы, ні ў палацы,
Ні пры лёгкай панскай працы, —
Не шукай ты там дружакаў!

Ты іх знойдзеш вельмі блізка,
Каля хаты, каля нізкай,
Дзе ганяў жывёлу змалку,
Дзе касой махаў на ранку,
Толькі ўмей шукаці блізка!

* * *

Не шукай сабе, мой братку,
З ветрам Бацькаўшчыну-матку
Ні на сушы, ні на моры,
Ні у шчасці, ні у горы,
Не шукай яе там, братку!

Яе знойдзеш вельмі блізка,
Як знаходзіць лес вятрыска,
Толькі сэрца глянь сваё ты,
І ў душу загаянь з ахвотай,
Знойдзеш Бацькаўшчыну блізка!

# Білет № 13

## 1. Тэма паэта і паэзіі ў творчасці Янкі Купалы. Дэмакратызм і народнасць яго творчасці

Я адплаціў народу,
Чым моц мая змагла:
Зваў з путаў на свободу,
Зваў з цемры да святла.
*Янка Купала*

Кожнаму вялікаму мастаку ўласціва ўсведамленне сваёй значнасці і ролі ў фарміраванні духоўнасці народа. Усведамляючы значнасць сваёй дзейнасці і таго, што напісанае застанецца, Ф. Скарына тройчы змясціў свой партрэт у Бібліі... Свой уклад у духоўнае адраджэнне нацыі Янка Купала вызначыў так:

Цяпер маймі скарбамі — думы-саколы,
Цяпер беларускай я песні ўладар.

Тэма паэта і паэзіі, тэма прызначэння мастака ў грамадстве скразная ў творчасці Янкі Купалы. Адным з першых вершаў на гэтую тэму «Я не паэта...», змест якога вонкава супярэчыць самой назве, Купала сцвярджае думку, што ў кожнай нацыі павінны быць песняры і прарокі. Такім пракокам наканавана быць яму — Янку Купалу. Парадаксальнасць назвы і вонкавая яе супярэчнасць зместу верша толькі ўзмацняе Купалава сцверджанне і ўсведамленне ім сваёй значнасці як творцы і прарока, бо ён валодае самым галоўным для такой ролі:

Долю каб бачыў у родным народзе,
А быў бы шчаслівы Янка Купала.

Думка пра адзінства лёсаў песняра і народа гучыць лейтматывам ва ўсіх яго вершах на гэтую тэму, большасць з якіх напісана ў форме лірычнага маналога-споведзі. Аднак памылкова было б усведамляць вершы паэта як яго самахарактарыстыку ці самааналіз. Гэтымі вершамі паэт адказвае не на пытанне, які ён, а на пытанне — якім павінен быць творца, у чым прызначэнне мастацтва, якая яш роля ў фарміраванні духоўнасці нацыі. А лірычнае і нават канкрэтнае, як паўтор-эпіфара «Янка Купала», — гэта мастацкі прыём выяўлення філасофскай думкі паэта. Яго вершы на тэму прызначэння мастацтва — праграмныя для кожнага паэта і творцы наогул. Паэт павінен плаціць народу бязмежнай любоўю; калі ён у рабстве — зваць «з путаў на свабоду», зваць «з цемры да святла»; складаць «гімн пабедны сярод

крыжоў, магіл»; калі ж ён у радасці — радавацца і весяліцца з ім разам.

Настойлівасць, з якой паэт сцвярджае сваё галоўнае творчае крэда, у вершы «Я не для вас...», узмацняецца анафарай і эпіфарай «Я не для вас, паны, о не»:

Кожная страфа пачынаецца і заканчваецца гэтымі гнеўнымі і аблічальнымі словамі. Гэтым творам паэт быццам дае водпаведзь і грознаму князю з паэмы «Курган», які паставіў гусляра перад выбарам:

Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям —
Поўны гуслі насыплю дукатаў!
Не пад мысль будзе песня каму-небудзь нам —
Канапляную возьмеш заплату!

«Адповедзь» — так і называецца адзін з яго вершаў. Назва яго абумовіла і змест, і форму: гэта водпаведзь панам і ўсім «ворагам беларушчыны», якія б хацелі купіць дар песняра:

Буду пець не за славу, праз вас абяцаную;
Буду пець, бо люблю свайго краю паляны.
Буду пець, бо люблю сваю песню загнаную;
Буду пець, бо мне дар гэты доляй пасланы.

Філасофскай думкай, што створанае паэтам толькі тады сіла, калі яно здольна ўздзейнічаць на народ, змяніць яго лёс да лепшага, прасякнуты верш «Мая малітва»:

Я буду маліцца і сэрцам, і думамі,
Распетаю буду маліцца душой,
Каб чорныя долі з мяцеліцаў шумамі
Ўжо больш не шалелі над роднай зямлёй.

Творчасць мастака, сцвярджае паэт, павінна быць дзейснаю, павінна быць сілаю, ад якой «вораг-мучыцель дрыжыць», а

Быць вольным хай родзяцца думкі ў нявольніка,
Хай быць чалавекам захоча брат мой.

Самай вялікай марай паэта была мара пра волю для свайго народа. Бясспрэчнай і па сённяшні дзень з'яўляецца думка паэта, што гэта магчыма толькі пры ўмове, калі беларусы захочуць «людзьмі звацца», калі «быць чалавекам захоча» кожны, бо няволя і нясіла — гэта найперш стан душы, як «пашана да пакут» — стан душы раба.

Многія творы Купалы на тэму паэта і паэзіі напісаны ў форме звароту да калег-песняроў. Яны — наказ і запавет творцам.

Верш «Песняру-беларусу» і пачынаецца з праблемнага пытання:

Пытаеш ты, якім быць трэба
Зямлі забытай песняру?

Адказ на пытанне — у многіх вершах паэта. І ўсё ж, бадай, самым вызначальным у гэтым плане з'яўляецца верш «Прарок». У самой назве — адказ. Прарокам для свайго народа павінен быць пясняр. Прарокам, бо дар, якім ён валодае, адкрывае яму такія даляшыды, што другімі не бачацца, дазваляе разумець тое, чаго іншыя не разумеюць. Прарок, як сцвярджае і У Някляеў паэмай «Прошча», павінен папярэдзіць усіх, «дзе патоп, дзе пажар, дзе вораг на межах». Біблейскія рэмінісцэнцыі ў вершы «Прарок» відавочныя: і на ўзроўні вобраза, і на ўзроўні філасофскай думкі. Верш эпічны, у аснове сюжэта яго — вандроўка прарока:

Ішоў прарок пясчанай сцежкай
З навукай новаю к людзям.

Многіх на сваім шляху ён навучыў, многіх парярэдзіў многім дапамог і дасягнуў зямлі, дзе «царства цемры панавала»:

Народ змарнеўшы таго краю
Свайго нат імені не знаў,
Як непатрэбшчына якая,
Гібеў на свеце і канаў.

Прарок — пасол святла — «прарочым голасам сваім» паклікаў людзей за сабой:

Паўстаньце, рабскія натуры,
Пакіньце свой адвечны сон...
... За мной, за мной, забраны людзе!
Я добрай доляй послан к вам
І знаю, што было, што будзе,
І вас у крыўду не аддам.

Найбольшага напружання сюжэт дасягае ў самым канцы. Апошнія радкі, што ўяўляюць сабой адказ, якога прарок чакаў «з трывогаю вялікай», — адначасова і развязка:

— Па колькі ж нам дасі чырвонцаў,
Калі мы пойдзем за табой?

Біблейская думка пра тое, што «няма пракокаў у сваёй Айчыне», узмацняецца Купалавай трывогай за свой народ, яго будучыню.

І ўсё-такі прарок, як даводзіць паэт ва ўсіх сваіх вершах, не павінен адчайвацца, нават калі пачуе і такі адказ. Уся паэзія Купалы быццам доказ закону вечнасці, што жыццё чалавека (і прарока таксама!) — гэта бясконцы ланцуг спробаў, і перамога вызначаецца вынікавасцю хаця б адной з мноства няўдалых. Калі ўдалай акажацца хоць адна спроба, ёсць шанс здзяйсняць іх зноў і зноў. Зноў і зноў прарок Купала робіць спробу і стукаецца ў сэрцы беларусаў, у якіх верыць («у народ і край свой толькі веру і веру ў самага сябе»),

Верыць, што прачнуцца: «До спаць! Паўстаньце грамадою...» Веру гэтую, як і запавет служыць толькі народу, дакляраваў ён песняру-беларусу:

> Глядзі — ўскалышацца, прачнецца
> Мільённы прыспаны народ,
> І вокліч славы пранясецца,
> Пяснярскай славы з роду ў род.

Вера песняра грунтуецца на вечнай ісціне, што калі сееш, то і жаць будзеш. У вершы, прысвечаным «песняру Альберту Паўловічу», выяўленню гэтай думкі спрыяе фальклорная асацыяцыя:

> Чым сяўцоў болей — пасеюць болей,
> Болей узойдзе, болей пажнуць,
> Чым пяўцоў болей долі-нядолі —
> Болей прасвету ў душу ўнясуць.

У творчасці Купалы ёсць нямала вершаў, у якіх ён дае адказ і на пытанне, якой жа павінна быць паэзія, якім павінна быць слова прарока, каб унесці «болей прасвету ў душы» людскія, каб у адказ на заклік прарока не спыталіся, колькі чырвонцаў ён дасць, калі пойдуць за ім.

«Песню стварыці ясну, як неба», на думку паэта, можна толькі тады, калі пясняр здолее «з цэлым народам гутарку весці, сэрца мільёнаў падслухаць біцця!». Гэтыя Купалавы словы сталі крылатымі, сталі дэвізам кожнага творцы, які марыць дасягнуць вяршыні — быць не па званні, а па сутнасці сваёй народным. Праз выяўленне самага жаданага, запаветнага («гэткай шукаю цэлы век чэсці, гэта адно мне падпорай жыцця») паэт сказаў пра агульначалавечае і вызначальнае ў творчасці кожнага паэта.

Вельмі спрошчана і нават прымітыўна было б усведамляць верш «Мая навука» як жыццяпіс Купалы, зроблены ім самім. Ужо самы першы радок верша: «Мне мудрасці кніжнай не даў бог пазнаці» — мастацкі вобраз для сцвярджэння Купалавай мудрасці. Што да «мудрасці кніжнай», то і яе Купала пазнаў, як мала хто іншы, пазнаў наперакор усяму. Нагадаем, што пецярбургскі перыяд яго творчасці, магчыма, яшчэ і таму самы плённы і дасканалы ў мастацкіх адносінах, што якраз у гэты перыяд жыцця Купала спрычыніўся да «мудрасці кніжнай» і зведаў «раскошу» пазнання, якой сапраўды быў пазбаўлены ў дзяцінстве. Ды і наогул, у нашай літаратуры няшмат песняроў такога высокага інтэлектуальнага ўзроўню, як Купала.

Верш «Мая навука» — навука для ўсіх, хто марыць «з цэлым народам гутарку весці» — быць народным. Гэта «школа» сакрэтаў, пісьменніцкая «майстэрня». У гэтым вершы Купала шчодра дзеліцца з

усімі сваёй мудрасцю і адказвае на пытанне, што яшчэ акрамя дару (дар, як вядома, ніякаму вытлумачэнню не паддаецца) неабходна песняру, каб яго слова «болей прасвету ў душу» ўнясло. Сіла песняра, сцвярджае паэт, у любові да народа, у веданні яго жыцця і найперш — яго мовы, матчынай мовы: «навучыўся я слоў беларускіх ад маці». А «дум беларускіх» спасцігнуць ні ў якой школе і ні ў якой «мудрасці кніжнай» немагчыма — «настаўнікам быў беларускі абшар», «душу акрылялі прыгожасці свету...» Што ні радок, што ні слова, то вобраз! Валадаром беларускай песні, на думку Купалы, можа стаць толькі той творца, які ўзгадаваны, успешчаны на нацыянальнай глебе. Крыніцай творчасці і натхнення для народнага паэта з'яўляюцца створаныя народам духоўныя каштоўнасці, жыццё народа, неруш матчынай мовы, прырода.

Яшчэ ў пачатку своей творчасці Купала вызначыўся ў сваім выбары — служыць толькі народу. У вершы «Слугам алтарным» ён пісаў:

Я аддаю сваю душу
Свайму няшчаснаму народу!

Верш «За ўсё», напісаны ў 1925 г. з нагоды прысваення Купалу звання народнага паэта, можна параўнаць з пушкінскім «Помнікам» і па сіле ўздзеяння і па глыбіні ўсведамлення сваёй ролі ў нацыянальнай культуры. Вялікае назначэнне ў вершы такіх лексічных сродкаў, як антонімы: («зваў з путаў на свабоду, зваў з цемры да святла», «складаў я гімн пабедны сярод крыжоў, магіл). Кантрастныя вобразы выяўляюць Купалава ўсведамленне ролі паэта ў вечнай барацьбе святла з цемрай, дабра са злом, у тым, каб здзейснілася выказаная ім у вершы «Маладая Беларусь» мара і Беларусь заняла «свой пачэсны пасад між народамі».

### 2. Раман Уладзіміра Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім», яго асноўныя праблемы і героі

Я — сэрца, мозг, душа майго народа,
Таму, магчыма, і на свет з'явіўся,
Каб мог ён зведаць праз мяне сябе,
Каб ведаў сілу ўласную і годнасць
І каб вякі маім спявалі ротам.

*У. Караткевіч*

Ён некалі паабяцаў сабе і людзям, што напіша кнігі, якія будуць чытацца на беларускай мове. І напісаў такія кнігі, якія не толькі вяртаюць нам нашу святыню-мову, але і памяць, забраную ў нас

даўно. Лепш за іншых усведамляючы, што без памяці пра свае вытокі, карані, пра мінулае ў народа няма будучыні, ён так вызначыў сваю ролю ў рэанімацыі душы і памяці:

А ў некоторым сэнсе, нават бог,
Бо занава я свой народ ствараю.

Уладзімірам Караткевічам упершыню ў гісторыі нашай культуры створана рамантычная літаратура пра мінулае, прычым на трывалым гістарычным падмурку. Рамантычнае і фантастычнае, прыгодніцкае і дэтэктыўнае ў яго творах не самамэта, не толькі для таго, каб чыталі яго кнігі і на роднай мове. Вывучаючы і даследуючы старонкі гісторыі, У. Караткевіч найперш для сябе зрабіў адкрыццё, што ў нашым мінулым ёсць адказы на пытанні, якія не толькі хвалююць нас сёння, а ад вырашэння якіх залежыць, ці будзем мы «людзьмі звацца». Дзякуючы яго кнігам, мы можам адказаць і на Купалава пытанне, «скуль, якога мы роду». Мы — народ, мы — нацыя не горшая за іншыя, у нас ёсць свае карані, а ў нашым мінулым — не толькі гаротнае, трагічнае, але і гераічнае, вартае гонару і захаплення, здрадзіць якому — не мець світання.

Нельга не здзіўляцца таму, колькі старонак гісторыі прачытана У. Караткевічам для нас, колькі «белых плямаў» зліквідавана, — і ўсё дзеля таго, каб вярнуць нам памяць, бо без памяці нам не быць... Сапраўды, як ён сам сказаў, вякі яго спяваюць ротам.

І ўсё ж найбольшая ўвага, «агонь душы і сэрца жар» У. Караткевіча прысвечана паўстанню Кастуся Каліноўскага. Нельга не пагадзіцца з пісьменнікам, што больш трагічнай і гераічнай старонкі ў нашай нацыянальнай гісторыі няма, як і самай для нас вызначальнай, павучальнай і папераджальнай.

Пра ўзвышанае і вечнае, пра гераічнае і трагічнае і напісаць належала незвычайна, і сказаць з асаблівай сілай голасу. Каб пачулі. Голас Караткевіча пра мінулае — голас рамантыка і прагматыка адначасова. Рамантычнае — пра мінулае, вартае таго, каб чэрпаць адтуль сілы і знаходзіць там адказы на пытанні сучаснага. Прагматычнае — для нас, каб запаланіць нашу ўвагу дзеля нашага ж духоўнага разняволення.

«На гістарычных сюжэтах я стварыў сваю матрыцу будучага... Кожны гістарычны сюжэт— гэта адкрытая размова з сучаснікам», — так пра сваё пісьменніцкае крэда сказаў сам У. Караткевіч. Ён «размаўляе» з намі пра многае. Яго кнігі — не толькі і не столькі пра паўстанні, войны, змаганні, а пра годнасць і гонар, пра тое, што трэба жыць не прыніжаючы і не прыніжаючыся.

Мінулае ў рамане У Караткевіча «Каласы пад сярпом тваім» вучыць, што гонар і годнасць чалавека «ў тым, каб быць незалежным з моцнымі, роўным з роўнымі, памяркоўным для ніжэйшых. У тым, каб быць добрым для жанчын, дзяцей, пераможаных. У тым, каб быць літасцівым да звяроў...».

Эстэтычная сіла ўздзеяння галоўнага героя рамана вельмі вялікая. Усведамленне Алесем таго, што ёсць самае страшнае, «страшней за чуму, вайну, страшней за ўсё на свеце», становіцца пастпова і ўсведамленнем чытача. Самае страшнае — няволя, прыгон, лічыць Алесь. Выявай прыгону з'яўляецца рабская псіхалогія, а не толькі галеча і фізічнае вынішчэнне народа. Духоўнае вынішчэнне намнога страшнейшае. Не ўсведамляць гэта — знішчыць будучыню, бо «ў рукі галодных беднякоў будуць аддадзены ворагі ўсіх краін», бо прыніжаны будуць «магутныя людзі розных народаў», як пра тое папярэджваецца эпіграфам да рамана. І адданне і прыніжэнне заўсёды адбываецца з «сякерай пры дрэве».

Рабская псіхалогія не толькі гне да зямлі перад моцнымі. «Толькі б не пападалі на калені!» —думае Мусатаў, спатольваючы сваю прагу здзекавацца і прыніжаць гэтае «быдла», як ён у думках называе ўдзельнікаў півошчынскага бунту. Рабская псіхалогія цалкам вынішчае душу, асляпляе нянавісцю настолькі, што раб гатовы знішчыць нават свайго збавіцеля. І са збавіцеля найперш і пачынае вынішчэнне і помету.

Захапляючыся смеласцю, адвагай Алеся Загорскага, прызнаючы яго высакароднасць і тое, што «цвэнькае» па-мужыцку, усё роўна некалькі разоў, як заклінанне, Корчак паўтарае:«Хай бы цябе забілі, князь». І ніякія довады, напамін пра тое, што менавіта Алесю Корчак абавязаны сваім выратаваннем ад злюцелага Кроера, на Корчака не падзейнічаў бы. Кандрат Когут слушна гаворыць, што такі напамін пашкодзіў бы, бо Корчак ганарысты: «Дагэтуль усім кажа, што смяротны Кроераў бой вытрымаў адзінай толькі сваёй жывучасцю. І раптам— на табе, панская ласка». Псіхалагічна тонка заўважана пісьменнікам, што людзі з рабскай псіхалогіяй, людзі, пазбаўленыя гонару і годнасці, асабліва ганарыстыя і зласлівыя. Грыня Паківач перасцерагае Корчака: «Ты залішнюю злосць з сябе выпусці, задушыць». Марная перасцярога: хто згубіў памяць — згубіў усё.

Мінулае ў рамане не толькі вучыць, а перасцерагае пра вялікую небяспеку прышэсця да ўлады злюцелых рабоў. Грыня Паківач даводзіць, што Корчак, калі б стаўся панам, быў бы не лепшы за Кроера: «Няма горш, як з хама пан...». «Шэрым князем» назваў Корчака і Кандрат Когут: «Каб табе ягоную (Алесеву) сілу — мы б праз

тыдзень уплакаліся б. Крывёю сплылі». Бяспамяцтва, чорная няўдзячнасць і злюцеласць Корчака-хама ўражвае. Асабліва ў эпізодзе яго расправы з Раўбічам, з якога вырашыў пачаць «народную помету», каб падвысіць свой аўтарытэт «мсціўца». Стоячы звязаным перад Корчакам, церпячы ад яго жудасныя здзекі і ў думках падрыхтаваўшыся да немінучай смерці, Яраш Раўбіч душыўся ад злосці на самога сябе: «Так па-дурному трапіць! ... Усе гады пакутваць ад рабства радзімы, рыхтаваць закалат, амаль падрыхтаваць, пусціць сваіх на аброк, чакаць паўстання...» Яшчэ адна прычына дзікунскага намеру Корчака менавіта з такіх, як Раўбіч, пачаць «народную помету» — тое, што ў Раўбіча была зброя, шмат зброі. Бо рыхтаваўся закалат супраць царызму, прыгону.

Хваляванне аўтара перадаецца і чытачу: ці змогуць зліцца дзве асобныя ручаіны і плыні, народ і шляхта, у магутным рэчышчы, каб знесці ненавісны царызм і прыгон? На гэтае пытанне адказала сама гісторыя: гэтыя плыні так і не змаглі аб'яднацца. Прыгоннае сялянства ў 1863 г. нярэдка выступала супраць паўстанцаў — шляхціцаў, не разумеючы іх мэт, не забываючы свае спрадвечныя крыўды. Гэта дазволіла Мараўёву-вешальніку хітра скарыстаць мужыкоў, аб'явіўшы, быццам шляхта была супраць адмены прыгону і таму з'яўляецца іх найпершым ворагам.

Адметнасцю стылю У. Караткевіча з'яўляецца майстэрства, з якім ён стварае станоўчага героя, што валодае незвычайнай сілай уздзеяння на чытача. І ў гэтым «роўнага яму няма і наўрад ці будзе» ў нашай літаратуры.

Цэнтральная праблема і ідэя нацыянальнага адраджэння вырашаецца і рэалізуецца пісьменнікам найперш праз вобраз Алеся Загорскага, якім «цэментуецца» сюжэт рамана «Каласы пад серпом тваім». Гэтым вобразам пісьменнік адказвае на пытанне, што неабходна, каб абудзіць народ ад сну, каб зварушыць «дух народны», рэалізаваць лепшыя якасці і сілу народную. Пісьменніцкая пазіцыя ў рамане відавочная: гісторыю творыць не толькі народ, але і канкрэтныя асобы — патрыёты, моцныя і незвычайныя, здольныя сілай свайго розуму і бязмежнай любові да народа паўздзейнічаць на яго і пазваць за сабой.

Такім у рамане паўстае перад намі Алесь Загорскі. Мяркуецца, што прататыпам вобраза з'яўляецца паплечнік К. Каліноўскага Валерый Врублеўскі. Караткевіч як тонкі псіхолаг добра разумеў, што нічога выпадковага на свеце не бывае, што ўсё мае свае вытокі, што моцная незвычайная асоба можа з'явіцца толькі ў выключных па сіле ўздзеяння на яе абставінах. Вось чаму ў рамане мноства старонак

прысвячаецца «выйсцю крыніц» — мастацкаму даследаванню не толькі вытокаў самога паўстання К. Каліноўскага, але і вытокаў фарміравання моцнай, выключнай Асобы.

Пісьменнік падрабязна апісвае сям'ю Алеся Загорскага, сапраўдную школу выхавання яго патрыятызму ў час дзядзькавання, уводзіць песню-баладу пра Міколу і Касьяна, песню, пачутую Алесем ад старога Кагута ў дзяцінстве. Белы жарэбчык з балады стаў для хлопчыка сімвалам волі народа, і вобраз гэты быў яму напамінам на ўсё жыццё, што дзеля волі і Бацькаўшчыны можна і трэба паахвяраваць усім. Вялікае месца ў рамане займае апісанне абраду пастрыжэння ў падлеткі, прысягі на вернасць Айчыне і народу. Урокі дабра, справядлівасці, годнасці і гонару атрымаў Алесь найперш у сям'і Кагутоў, замацаваў жа гэтыя ўрокі — ва ўласнай сям'і. Сям'я, сцвярджае У. Караткевіч, — выток людскасці ў чалавеку, першакрыніца ўсяго.

Урокі ўдзячнасці народу атрымаў Алесь ад свайго бацькі Юрыя Загорскага і ў час пастрыжэння ў падлеткі, калі той шчодра аддзячыў усёй сям'і Кагутоў за выхаванне ў яго сыне самых вартых чалавека пачуццяў. Урокі трывогі за свой народ, за яго выміранне («вымірaем, Алеська, выміраем!») атрымаў ад дзеда — старога Вежы. І не толькі ўрокі спагады, але і канкрэтных спраў для разнявлення народа. Вежа падтрымаў прапанову Юліяна

Раткевіча адмяніць прыгон, але большасць шляхты на дваранскай зборні прагаласавала супраць. Пра гэта дзед з горыччу і нянавісцю расказваў унуку: «Ваські Вашчылы на іх няма!» Вялікае ўздзеянне на падлетка аказала і наведанне з бацькам радавога склепа. Быццам сіла продкаў улілася ў яго з бацькавым наказам берагчы гэтую зямлю і магілы продкаў як святыні і з пажаданнем, каб ніякая сіла не здолела гэтыя святыні парушыць і адняць.

Моцная асоба вызначаецца не толькі мэтамі і настойлівай упартасцю, з якой яна ідзе да мэты, але і... слабасцю. Пісьменнік надзяліў свайго героя як незвычайнай сілай, так і высокай эмацыянальнай культурай. Чалавека вызначае не толькі непахіснасць, воля, не толькі тое, з-за чаго ён радуецца, але і тое, над чым ён абліваецца слязьмі. Тройчы ў рамане мы бачым Алеся, калі ён плача. Першы — калі слухаў песню Кагута; другі — калі глядзеў спектакль у прыгонным тэатры свайго дзеда і пасля якога папрасіў у яго вольную для таленавітай артысткі Гелены. Трэці — калі ў Вільні далучыўся не проста да «мудрасці кніжнай», але да духоўнай спадчыны свайго народа і быў ашаломлены яе багаццем. Асаблівае ўражанне і ўздзеянне на яго душу і свядомасць аказала кніга Яна Баршчэўскага «Шляхціц Завальня...». Усе тры гэтыя моманты знакавыя, паваротныя

і вызначальныя для Алеся, бо ў выніку іх ён умацаваўся ў каштоўнасцях, што ўжо былі ў яго душы, — над ім заззяла «высокае неба ідэала». Магчыма, менавіта ў такія моманты «слабасці» і выяўляецца сіла моцнай асобы.

Моцная асоба выяўляецца не толькі і не столькі пачуццямі, колькі ўчынкамі і справамі. Першым учынкам Алеся было нават не тое, з якой мужнасцю і цярпеннем вытрымліваў ён нагрузкі пасля дзядзькавання, гартуючы сябе для нялёгкага служэння Айчыне, чым здзіўляў нават суровага Вежу. Першы яго ўчынак, які сведчыў, што ён здольны не толькі ўбіраць у сябе дабро, але і аддаваць яго людзям, быў той, калі ён запатрабаваў: «Бацька! Дай Кагутам волю!» Гэтыя словы знакавыя для нашага героя, бо ён усведамляе сваё назначэнне на гэтай зямлі ў тым, каб ужо не прасіць, а даць людзям волю. Наступным самым напружаным момантам у рамане з'яўляецца той, калі падлетак, а не дарослыя мужы, што стаялі побач, схапіў за руку раз'юшанага Кроера і ўратаваў Корчака ад жудаснай смерці.

І нарэшце акорднай і ў рамане, і ў жыццяпісе Алеся Загорскага з'яўляецца сцэна бойкі ў Святаянскіх мурах, выпісаная Караткевічам у лепшых традыцыях рыцарскіх раманаў. Рыцарам сумлення паўстае перад чытачом Алесь, калі не задумваючыся кідаецца ў бой з тымі, хто цынічна заявіў, што Беларусь — ніякая не краіна, а толькі фарпост паміж Захадам і Усходам, а яго мужыкі — ніякі не народ, а «гной» і быдла, здольнае толькі працаваць на гэтай зямлі і быць яе «гноем». Пісьменнік сцвярджае гэтым момантам тое, што калі чалавек здольны заступіцца за іншага і за святыні, не аддаць іх на ганьбаванне, то ён варты таго, каб называцца Чалавекам.

Здольнікам не толькі пачуцця, слова, хай сабе і муцрага, трапнага і аблічальнага, а здольнікам дзеяння, справы з'яўляецца герой Караткевіча. Толькі дзякуючы такім асобам народ перастане быць коласам пад сярпом грубай сілы, а стане коласам «пад сярпамі волі, радзімы, паўстання, бітвы». Трагічным будзе тое жніво: магчыма, каласы памруць, але «памруць, каб вырасла новая рунь». У рамане «Зброя», які з'яўляецца сюжэтным працягам «Каласоў...» і адначасова самастойным творам, зноў галоўны герой — Алесь Загорскі. Рыцарам сумлення і чалавекам справы зноў паўстае перад намі гэты герой.

І сюжэт, і лірычныя адступленні, і пейзажныя замалёўкі, і сама назва кнігі — «Сякера пры дрэве» — усё прадказвае, вяшчуе вялікую сечу і жорсткую расправу Мураўёва-вешальніка з удзельнікамі паўстання.

Узнаўляючы старонкі гераічнага і трагічнага мінулага нашай Бацькаўшчыны, сцвярджаючы ідэю пераемнасці і повязі пакаленняў,

вяртаючы народу памяць, Уладзімір Караткевіч стварыў ідэал чалавека незвычайнай прыцягальнай сілы і ўздзеяння. Пісьменнік паказаў, якім павінен быць чалавек, жывучы на гэтай зямлі, што рабіць, каб яна заняла «свой пачэсны пасад між народамі». І ў тым найпершая заслуга Караткевіча.

**3. Прачытаць на памяць верш з беларускай паэзіі на патрыятычную тэму**

***

Я не ганю землі чужыя —
Хай іх сонца не абміне.
Толькі дзе за морам ні жыў я,
Беларусь мая снілася мне.
Так карцела — сляза закіпала, —
Каб да сэрца хаця б здалёк
Прыплывалі жалейка Купалы,
Багдановічаў васілёк...
Гэта ўсё, безумоўна, не нова.
А ці трэба, каб новым было
Поле бацькава, матчына мова
І над хатай буслова жытло?
Хіба душы свае не лечым
Ад бяздомных бядот і згрызот
Самым простым і самым вечным,
Што пранёс праз вякі народ?
І якія б шляхі ні схадзіў я,
Кліча полацкая сенажаць...
А калі не спяваць аб Радзіме,
Дык навошта наогул спяваць?

*Г. Бураўкін*

**Слуцкія ткачыхі**

Ад родных ніў, ад роднай хаты
У панскі двор дзеля красы
Яны, бяздольныя, узяты
Ткаць залатыя паясы.
І цягам доўгія часіны,
Дзявочыя забыўшы сны,
Свае шырокія тканіны
На лад персідскі ткуць яны.

А за сцяной смяецца поле,
Зіяе неба з-за акна, —
І думкі мкнуцца мімаволі
Туды, дзе расцвіла вясна;
Дзе блішча збожжа ў яснай далі,
Сінеюць міла васількі,
Холодным срэбрам ззяюць хвалі
Між гор ліючайся ракі;
Цямнее край зубчаты бора...
І тчэ, забыўшыся, рука,
Заміж персідскага узора
Цвяток радзімы васілька.

*М. Багдановіч*

# Білет № 14

## 1. Паэма Якуба Коласа «Новая зямля» — мастацкая энцыклапедыя жыцця беларускага сялянства

А праўда мне ўсяго дарожай...
*Якуб Колас*

Шмат у беларускай літаратуры сапраўды нацыянальных твораў. Але па энцыклапедычнасці выяўлення нацыянальнага як вышэйшага атрыбута мастацкай вартасці шэдэўраў роўных «Новай зямлі» няма.

Калі і наканавана нам знікнуць у свеце, то новыя цывілізацыі мелі б поўнае ўяўленне пра нас, пра беларусаў як нацыю, пра зямлю, на якой мы жылі, пра наш побыт, нашу культуру, традыцыі і звычаі, пра наш характар і ментальнасць, пра нашы каштоўнасці, пра нашы мары і памкненні толькі па адной кнізе — паэме «Новая зямля». Усё ў ёй — наша, роднае, нацыянальнае.

Найвялікшай каштоўнасцю для кожнай нацыі з'яўляецца зямля, на якой жыве народ. Для нашага народа зямля — гэта не проста тэрыторыя, а прошча, святое месца і «аснова ўсёй айчыне». Малітоўна, прачула і ўзнёсла выявіў Якуб Колас усведамленне нашым народам зямлі як маці-карміцелькі, што «не зменіць і не здрадзіць», што «дасць волю, дасць і сілу», што дасталася нам ад прадзедаў і будзе перададзена дзецям і не пакіне і іх: «зямля дзяцей тваіх не кіне, зямля паслужыць да магілы»... І прырода гэтай зямлі, «дзе елка ў пары з хваіною, абняўшысь цесна над вадою», дзе «лес кашлаты», дзе «крынічкі вузенькае ложа», дзе «зялёны луг, як скінуць вокам», дзе на дубах «чарнеюць гнёзды буславыя», — усё, усё тут нашае, беларускае, роднае. І вёсны, і «зімы з маразамі, завеі снежныя ў палях», і лета з вясёлым часам касьбы, і восень, якую «на ніцях белай павуціны» прывозяць павучкі, — таксама толькі ў нас такія.

Любоў да роднай зямлі, нястомная праца на ёй — адметныя якасці беларускага народа, вядомыя ўсяму свету. Радзіма і зямля для беларуса — «промень волі і свабоды». Трагічны лёс нашага народа, бо і геапалітычнае становішча, і багацце гэтага краю былі надта прынадныя для заваёўнікаў, што скарысталі памяркоўнасць, міралюбства, цярпенне гэтага народа. Чароўны багаты край, «ды толькі бедны яго дзеці». Аднак, хоць «вякамі дух яго забіты», невынішчальнае ў народзе імкненне да зямлі і волі. Пераканаўча паказана пісьменнікам, як

«станоўка, ненарокам, ішоў да мэты крок за крокам» яго голоўны герой, у якім увасоблены лепшыя якасці беларуса.

Вялікай заслугай Якуба Коласа з'яўляецца тое, што ён паказаў свой народ нязломным, жывучым і жыццястойкім, з моцным інстынктам самазахавання і прагай, воляй да жыцця. І першае сведчанне таму — працавітасць. За выключэннем рэдкіх хвілін адпачынку, нашы героі — у працы, дзякуючы якой

Ўсё зацвіло, загаманіла,
Бы жыватворная тут сіла
Ад сну прыроду абудзіла.

«Жыватворная сіла» — працавітасць беларуса, а працавітасць, як вядома, — катэгорыя не столькі маральная, колькі біялагічная, якая сведчыць пра жыццястойкасць народа.

Якуб Колас паказаў беларуса не толькі ў працы, але і ў адпачынку, у час святаў, прычым традыцыйных, нацыянальных, тым самым выявіў душу народа, яго беражлівае стаўленне да звычаяў і традыцый. Не толькі талентам паэта, але і яго жыццёвай мудрасцю адзначаны раздзелы «Падгляд пчол», «На каляды» і іншыя. Чытач бачыць, як героі паэмы здольныя адпачываць, ушаноўваць памяць продкаў ці ад душы павесяліцца, сустрэцца з людзьмі, блізкімі па духу. І столькі шчырасці, цеплыні, дасціпнасці і гумару ва ўзаемаадносінах паміж людзьмі!

Тонка і пераканаўча паказана і такая якасць беларуса, як умение жыць з людзьмі па-людску, гасціннасць і шчырасць, гатоўнасць падзяліцца добрым з добрымі людзьмі. Так, дзядзька Антось стаўся да ўсяго яшчэ і пчаляром заўзятым, разумна скарыстаўшы тыя багацці, што былі побач: «мора грэчкі» і векавыя ліпы, — і развёў пчол. Народная мудрасць папярэджвае: «Не любіць зайздрасці пчала». І каб людзі не зайздросцілі, каб пчолы не звяліся, нашы героі не толькі шчодра пачаставалі гасцей мёдам, але на развітанне яшчэ далі кожнаму з сабой па збанку мёду. Нельга без хвалявання чытаць, як Ганна ў час пярэбараў яшчэ раз зайшла ў пустую хату, якую ўся сям'я вельмі любіла. Ёй было шкада, што трэба зноў зрывацца з наседжанага і абжытага, але яна вярнулася, каб справіць «звычай дзядоў» — пакінуць на куце хлеб і соль для тых, хто будзе тут жыць, — ім на шчасце.

Многія раздзелы паэмы прысвячаюцца дзецям. Назначэнне гэтых раздзелаў — уславіць яшчэ адну нацыянальную якасць беларуса, спрадвечную якасць, дзякуючы якой жыў беларус — і будзе жыць! Гэта клопат пра будучыню сваю, бо дзеці і ёсць будучыня нацыі і кожнага чалавека канкрэтна. Такая пільная і кранальная ўвага да

дзяцей у паэме тлумачыцца мудрасцю песняра, які папярэджвае нас усіх і напамінае, што вытокі ўсяго — у сям'і. Свой чалавечы ідэал сям'і паэт выявіў на прыкладзе сям'і Міхала і Ганны, у якой панавалі любоў, згода, узаемапавага і шчыры клопат кожнага пра кожнага. У паэме выдатна паказаны не толькі прынцыпы векавой народнай маралі, але і прынцыпы народнай педагогікі: прыклад і сумленнасць бацькоў, іх чалавечныя ўзаемаадносіны, любоў да дзяцей, працавітасць і строгасць.

У нашай беларускай літаратуры няшмат ёсць вобразаў, у якіх з такой пераканаўчасцю і мастацкай сілай быў бы ўвасоблены дар педагога, як увасоблены ён у вобразе дзядзькі Антося. Безумоўна, гэтым вобразам славіцца наогул таленавітасць беларускага народа. Аднак, як тонка заўважана Коласам, калі прырода ўзнагароджвае чалавека, то шчодра, і не адным, а многімі талентамі. Менавіта ўслаўленню педагагічнага («ён быў настаўнікам, суддзёю..») таленту дзядзькі Антося прысвячаецца найбольш старонак у паэме, прычым, не апісальна, а пераканаўча. Мы бачым дзядзьку Антося «як жывога» ў час яго «ўрокаў» і нават у самыя крытычныя для кожнага настаўніка моманты, калі, здавалася б, ніякія меры і сродкі ўздзеяння не спрацоўваюць: «О, дзядзька спосабаў меў многа даняць праціўніка малога!»

Паэма «Новая зямля» — мастацкая этнаграфія Беларусь Натуралістычна выпісана ў творы выключна ўсё, што характарызуе побыт беларуса: забудовы, хатні інтэр'ер, прылады працы, нацыянальныя стравы, жаночыя і мужчынскія строі, танцы, песні, народныя «залацінкі». Чытаючы паэму, мы захапляемся мудрасцю і цвярозым розумам нашых продкаў: у іх не было нічога непатрэбнага, лішняга, і разам з тым яны мелі ўсё неабходнае для здаровага ладу жыцця.

Энцыклапедычнасць паэмы дасягаецца і панарамным адлюстраваннем жыцця беларускага народа. Раздзелы «Агляд зямлі», «Па дарозе ў Вільню» і «Дзядзька ў Вільні» — своеасаблівая вандроўка, «адысея» нашых продкаў да «новай зямлі». Гэты мастацкі прыём дазволіў паэту паказаць усю Беларусь «ад краю ў край». Пісьменніцкі вывад — і ў захапленні герояў («старонка міла і цікава»), і ў горкім Антосевым усведамленні, што «ўсё гэта — скарбы чужаніцы», а дух народа «забіты вякамі». І тым больш уражвае невынішчальнае імкненне нашых продкаў да зямлі і волі, усведамленне імі гэтых каштоўнасцей як найвялікшых у свеце і вартых чалавека. А любая нацыя вызначаецца менавіта тым, што яна лічыць для сябе самым галоўным і першасным. І яшчэ тым, як ставіцца да каштоўнасцей, акрэсленых ёю самой. Значнасць каштоўнасцей і тая воля, з якой героі паэмы імкнуцца імі авалодаць, дае падставы спадзявацца, што такая нацыя неўміручая.

**2. Сучасная беларуская проза, яе тэматыка, асноўныя вобразы (на прыкладзе двух-трох раманаў або аповесцей)**

> ... Адбітак родных з 'яў
> У словах-вобразах, у песнях вольнаплынных...
>
> *Якуб Колас*

> Функцыя пісьменніка заключаецца ў тым, каб у выніку яго дзеяння ніхто не змог спаслацца на няведанне свету, апраўдацца асабістай невінаватасцю перад ім.
>
> *Жан Поль Сартр*

Сівая мінуўшчына і вогненны небасхіл самай жудаснай у гісторыі чалавецтва вайны, сведкі і салдаты якой яшчэ жывуць сярод нас, трагедыя сталінскага генацыду і супярэчлівая наша сучаснасць, у якой ёсць месца любові і нянавісці з яе сатанінскімі турамі, людзі і нелюдзі, праведнікі і зладзеі — вось толькі некаторыя тэмы і вобразы сучаснай беларускай прозы. У ёй — пра ўсё, што было, што ёсць і нават пра тое, што будзе, калі не адумаемся, не спынімся, калі не заззяе над намі высокае неба ідэала, убачыць якое — залежыць ад кожнага з нас. «Адбітак родных з'яў» — лепш не сказаць пра сутнасць літаратуры як факта мастацтва.

Даследчыкі сівой мінуўшчыны бачаць сваё прызначэнне, паводле слоў Караткевіча, каб занава стварыць свой народ, у якога некалі, адбіраючы яго край, разбураючы яго гнёзды, адабралі і памяць. Памяць пра мінулае ёсць памяць пра будучыню, як ні парадаксальна гэта некаму здаецца.

Апроч навуковага адлюстравання гісторыі («Старажытная Беларусь» М. Ермаловіча, «Памяць пра легенды» К. Тарасава, «Імя ў летапісе» В. Чаропкі) у нашай літаратуры ёсць і мастацкае яе адлюстраванне — рэалістычнае і рамантычнае, нават фантастычнае і дэтэктыўнае (У. Караткевіч, У. Арлоў, Л. Дайнека). У апошні час з'явілася шмат твораў, прысвечаных постацям далёкай мінуўшчыны: А. Лойкі («Францыск Скарына, або Сонца Маладзіковае»), В. Коўтун («Крыж міласэрнасці» — пра Цётку), В. Хомчанкі («Пры апазнанні — затрымаць» — пра Ф. Багушэвіча), Р. Баравіковай («Барбара Радзівіл») і шмат іншых.

«Найбольшае зло ў нашым жыцці — спрадвечнае наша бяспамяцтва», — сцвярджае В. Быкаў. У імя памяці, пакуль не позна, трэба засведчыць і трагедыю вайны, каб яна зноў да нас не прыйшла, і

жудасныя выявы таталітарнай сістэмы і дыктатуры ў часы сталіншчыны, а таксама перыяд масавага расчалавечання і разбэшчання народа ў зусім блізкія нам часы.

У апошні час акрамя твораў-абеліскаў, твораў-рэквіемаў пра Вялікую Айчынную вайну з'явіліся творы, у якіх паказана трагедыя чалавека, якога не забілі, але які забіваў сам ці не змог супрацьстаяць неапраўданаму забойству, вынішчэнню нявінных ахвяр, не выкліканых ваеннай неабходнасцю. Вобразам Змітрака Барэйкі з аповесці «Пакахай мяне, салдацік» В. Быкаў зноў і зноў праклінае вайну і гаворыць пра небяспеку і фашызму, і бальшавізму.

На тэму бальшавіцкага таталітарызму напісана шмат твораў: «Зона маўчання» С. Грахоўскага, «Пабуджаныя» Г. Далідовіча, «Яжовыя рукавіцы», «Пекла» П. Пруднікава, «У кіпцюрох ГПУ» Ф. Аляхновіча, «Скураное паліто», «Рубец» Я. Скрыгана і інш. У апавяданні В. Быкава «На Чорных лядах» расказваецца пра трагедыю Слуцкага паўстання 1920 г. супраць бальшавізму. Восем знясіленых, без ежы і патронаў, чалавек адважваюцца на самагубства: яны капаюць сабе яму і па чарзе кладуцца ў яе. Матыў жуцаснага выбару — не «пацягнуць на пакуты іншых, тых, дзеля каго, па сутнасці, распачалі» паўстанне. З васьмі застаўся жыць толькі 15-гадовы Валодзька Сулашчык, якому камандзір даручыў закапаць і зраўняць з зямлёй магілу паўстанцаў. Выратаванне Валодзькі — не толькі момант сюжэта, але і сімвал бяссмерця, самаахвярнасці ўдзельнікаў Слуцкага паўстання. Праз трагедыю герояў твора пісьменнік паказаў нацыянальную трагедыю і сутнасць бальшавізму як самай страшнай выявы таталітарнай сістэмы.

У апавяданні В. Быкава «Жоўты пясочак» машыну рэпрэсій, што набірае свае шалёныя абароты і прагне ўсё новых і новых ахвяр, сімвалізуе машына, у якой вязуць на расстрэл няшчасных людзей. Змест твора складаюць жыццяпісы кожнай ахвяры і абсурдных абставін, што прывялі іх да магілы.

Сімвалічны і эпізод, звязаны з лёсам былога супрацоўніка НКУС Сурвілы. На яго сумленні не адно загубленае жыццё — ён верна служыў сістэме, «не па службе, а па душы» вынішчаючы «ворагаў народа». Але надышоў і яго час, калі сістэма, адпрацаваўшы яго, бязлітасна выкінула і прыраўняла да тых, каго ён з асалодай забіваў з пісталета ў патыліцу. Былы кат да самага канца не верыць у блізкасць сваёй смерці, а, зразумеўшы яе непазбежнасць, патрабуе для сябе асобнай магілы, каб не ляжаць у зямлі побач з розным «быдлам». І нават сам капае сабе магілу, не ведаючы, што ляжаць усё роўна

давядзецца з «быдлам» Лёс катаў і лёс ахвяр, сцвярджае В. Быкаў, лёс аднолькавы.

Даследаванне сучаснасці — таксама «адбітак родных з'яў», але, на жаль, не тых, якія лечаць душу і ўзвышаюць яе. Летапісцы сучаснасці, канстатуючы розныя выявы бездухоўнасці, даследуюць яе вытокі, б'юць у набат, б'юць трывогу, заклікаюць грамадства спыніцца, адумацца, папярэджваюць пра вялікую небяспеку, што падсцерагае нас усіх, калі не зробім надежных высноў. Ужо адны толькі назвы твораў найноўшай беларускай літаратуры, прысвечаных праблемам сучаснасці, гавораць самі за сябе: «Труба» (В. Быкаў), «Годдэмана» (Г. Марчук), «Сатанінскітур», «Падзенне» (І. Шамякін), «Грабавыя» (С. Патаранскі), «Гон» (А. Кірвель), «Крыж» (А. Варановіч), «Пралік Валанцэвіча» (В. Какорыч), «Лішняе дзіцяя, або Амплітуда жаданняў» (У. Дамашкевіч), «Ноч перад нядзеляй» (З. Прыгодзіч), «Божачка, ратуй!» (М. Райчонак), публіцыстычнае даследаванне «Чаму крача воран» (Стах Дзедзіч) і шмат іншых.

Дысануе назвам усіх пералічаных твораў назва аповесці І. Сурмана «Вясельная ноч», але змест яе зусім не пра каханне і галоўнае свята жыцця чалавека. Сітуацыя, апісаная ў творы, жудасная і трагічная: маладыя паехалі распісвацца, а ў гэты час паміраe бацька, які да гэтага доўга і цяжка хварэў. Перад жонкаю нябожчыка стаіць выбар: спыніць усё і ладзіць хаўтуры ці... Яна выбірае другое, жадаючы дабра дачцэ, баючыся перашкодзіць яе шчасцю, і хавае труп у хаце, дзе ўжо ладзяць вяселле, рыхтуюцца да яго. Ці будзе шчаслівай такая сям'я? Забыліся мы пра векавую народную мараль, адрынулі яе, не звяртаем увагі на папераджальныя знакі бяды, што пасылае нам неба і маці-прырода. Нашы продкі на працягу года пасля смерці каго-небудзь у сям'і не ладзілі вяселляў, бо зрабіць інакш лічылася і вялікім грахом, і нядобрым знакам.

Пра тое, што мы ўжо на парозе, переступаць які нельга, што ўжо вечар, за якім будзе чорная ноч і можа не наступіць «раніца ў нядзельку», ужо білі трывогу летапісцы сучаснасці 60-80-х гг. Але мы не паслухаліся і не пачулі вечавага звону, як назваў літаратуру В. Быкаў.

Працэсы расчалавечвання чалавека, яго маральна-духоўнага здзічэння пачаліся не сёння. Яны ажыццяўляліся на працягу недзяржаўнага існавання народа і асабліва ва ўмовах таталітарнай сістэмы. Надзвычай імкліва гэтыя працэсы развіваюцца ў наш час.

Думка пра тое, што чалавек аднойчы, няхай сабе і ў абсурдных бесчалавечных абставінах, пайшоў супраць сумлення і тым самым загнаў сябе, фігуральна кажучы, у трубу, стаў не толькі ахвярай, але і

хаўруснікам абсурдных абставін, — скразная ў апавяданні В. Быкава «Труба».

Сюжэтны каркас апавядання складае анекдатычная ў сваёй аснове гісторыя пра тое, як загадчык дома культуры Валера Сарока загінуў у газаправоднай трубе. Літаратуразнавец Дз. Бугаёў у кнізе «Спавядальнае слова» адзначае, што ў апавяданні «Труба» ўласцівыя стылю В. Быкава рэалістычныя дэталі дзякуючы асацыяцыям набываюць сімвалічны сэнс. Сімвалічная і сама назва твора. Асацыяцый у апавяданні многа.

Да прыкладу, сімвалічна-шматзначнай выглядае ў кантэксце твора і спакуса зручна ўладкавацца ў трубе, з якой Валера потым не мог вылезці. Дз. Бугаёў піша: «У пэўным сэнсе нешта падобнае да таго, што здарылася з быкаўскім героем, адбылося і з усімі намі, з нашым грамадствам. Кіруючыся спакуслівай, але, як аказалася, утапічнай камуністычнай ідэалогіяй, яно таксама выбрала, здавалася б, надзейны і самы кароткі шлях да ўсеагульнага шчасця, а ў канчатковым выніку загнала сябе ў тупік, фігуральна кажучы — у трубу, з якой мы ніяк не можам выбрацца і пасля развалу краіны, якая з гонарам заяўляла, што пракладвае дарогу да лепшай будучыні ўсяму чалавецтву. Жыццё, як разважае Валера, «здаецца, забрыло ў тупік».

Дз. Бугаёў адзначае, што ў апавяданні шмат разоў фіксуецца парадаксальнасць, якая часта даходзіць да абсурду. З падтэкставай глыбінёй і сімвалічнай шматзначнасцю выпісаны фінал апавядання. Скупая і эмацыянальна стрыманая канстатацыя: Валера «не дапоўз да газакампрэсарнай станцыі нейкіх дзвесце метраў». На той жа станцыі яго чакала выратаванне! Такой канцоўкай з адценнем прытчавай павучальнасці пісьменнік сцвярджае тое ж, што сцвярджаў і А. Камю: «Вяслуй да канца!» Нават калі шансаў на выратаванне ўжо, здавалася б, няма ніякіх, нават калі цвёрда ведаеш, што загінеш, — усё роўна вяслуй!

Паводле сцверджання Сартра, функцыя пісьменніка заключаецца ў тым, каб папярэдзіць усіх пілігрымаў на дарозе жыцця, што іх чакае, калі яны «падкароцяць» дзеля палёгкі свой крыж. Каб «ніхто не змог спаслацца на няведанне свету, апраўдацца асабістай невінаватасцю перад ім».

Для гэтай мэты В. Быкаў выбраў прыём самааналізу свайго героя. Гэтым прыёмам раскрываецца ўнутраная механіка і, калі можна так сказаць, логіка яго падзення, а ў апавяданні — «загону ў трубу». Пісьменнік фіксуе пэўныя моманты маральнага падзення Валеры Сарокі. Тое, да прыкладу, што Валера даволі лёгка, без унутранага

пратэсту згадзіўся стаць даносчыкам, спадзеючыся атрымаць лепшае размеркаванне на працу, наўрад ці можна аднесці да віны абставін. А з гэтага кроку і пачаўся шлях да прорвы. Так паступова з памагатага ён стаў «нявольнікам камуністычнай сістэмы». Вырашэнне праблемы віны і трагедыі, праблемы адказнасці чалавека за свае ўчынкі і іх наступствы вызначае канцэпцыю апавядання і яго трагедыйна-болевы пафас.

Большасць пералічаных твораў акцэнтуе ўвагу чытача на такой пагражальнай для ўсяго грамадства выяве і наступствах бездухоўнасці, як развал сям'і. «Сям'я — падмурак Царквы», — настойліва даводзіў апостал Павел у сваіх Пасланнях («Евангелле»), Сям'я — падмурак духоўнасці грамадства, а значыць, і яго самога. Самае страшнае (пра тое даводзіў В. Быкаў у аповесцях «Знак бяды» і «Аблава»), калі рвуцца повязі паміж пакаленнямі, калі рвуцца самыя моцныя сувязі паміж людзьмі — кроўныя. Страшна, калі бацькі адрынулі дзяцей, здрадзілі ім. Героя апавядання М. Райчонка «Божачка, ратуй!» прадалі бацькі-наркаманы. І ўвесь твор — аповед пра ўцёкі і ратункі хлопчыка, на якога палююць наёмныя забойцы, бо ў дзіцяці да ўсяго яшчэ і рэдкая група крыві. Страшна, калі дзеці пераступілі цераз бацькоў і нават цераз іх трупы... Герой аповесці М. Зарэмбы «Пятля» павесіўся на... крыжы. Нясцерпны крыж пакут яго сумлення за ўсвядомлены грэх і віну перад маці, якую сваім п'янствам і бязладным жыццём звёў у магілу. Змест твора ў асноўным і складае дыялог сына з маці перад сарачынамі.

Падзенне — такі канчатковы прысуд стану душ людскіх, зроблены Іванам Шамякіным ва ўсіх аповесцях, сабраных у кнігу «Сатанінскі тур». У аповесці «Без пакаяння» трагедыя нашага грамадства па прычыне бездухоўнасці паказана праз трагедыю дзіцяці, вымушанага сярод раскошы і сытасці некаторых «новых» калаціцца ад холаду, зведаць голад, страх і ўкрасці батон (перад гэтым хлопчык прасіўся на працу, каб зарабіць на хлеб і пакарміць хворую маці). Бізнесмен, каб напалохаць злодзея, страляе шротам, але трапляе ў вуха хлопчыка... Уцёкі ад пакарання (апісанне іх займае значную частку аповесці), сцвярджае пісьменнік, магчымыя, але нельга ўцячы ад сябе. Самаапраўданне героя (яго ўнутраныя маналогі, успаміны складаюць большую частку твора) — спосаб даследавання пісьменнікам прычын таго, як былы камсамольскі функцыянер дайшоў да забойства дзіцяці.

Пазіцыя І. Шамякіна відавочная і непрыхаваная. Такое падзенне і вар'яцтва стала магчымым, лічыць пісьменнік, даследуючы і іншыя выявы зла ў кнізе «Сатанінскі тур», толькі ў выніку перабудовы і дэмакратызацыі, да якой грамадства было не падрыхтавана. Перабу-

дова і дэмакратызацыя стала той бесчалавечнай сітуацыяй, якая і справакавала самыя мярзотныя якасці людзей, справакавала людзей на нялюдскасць. Перабудова — тая сітуацыя, калі магчыма здзяйсненне прынцыпу «лаві момант»: усе вакол хапаюць, рвуць — спяшайся і ты! З такой высновай нельга было б не пагадзіцца, калі б пісьменнік даследаваў яшчэ і прычыну прычын. Мярзотнасці людскія, што драмалі да пары да часу, назапашваліся і выпешчваліся той сістэмай, якую (і гэта нельга адмаўляць!) апяваў і ўслаўляў І. Шамякін у многіх сваіх творах. Так, ён, безумоўна, з уласцівым яму майстэрствам паказваў і канфлікты, што былі ў камуністычным мінулым, аднак гэтыя канфлікты заўсёды вырашаліся майстрам белетрыстыкі на ўзроўні перамогі дабра над злом. А калі так вырашаюцца канфлікты ў грамадстве — яно чалавечнае, справядлівае, а лад жыцця і абставіны маюць права на існаванне, бо, сапраўды, без канфліктаў, без зла не бывае нават у самым пажаданым грамадстве.

Не страшна, калі ў жыцці ёсць зло, страшна — калі яно ваяўнічае, калі «няпраўда праўду акілзала і едзе людскасці на спіне», як пра тое даводзіў яшчэ Купала вершам «Разлад». Пісьменнік жа Іван Шамякін не хацеў бачыць, што ўжо ў апетым ім грамадстве выпешчваліся «свінтусы» да памераў «грандыёзусаў», што чорт «загаціў пекла да варотаў», і сёння зло, прарваўшы ўсе шлюзы, хлынула і ў наша жыццё, і, на жаль, у нашы душы. Мы сёння не толькі назіраем «сатанінскі тур», сатанінскі баль зла, але (і ў тым трагедыя нашага грамадства) вымушаны быць на тым балі, так ці іначай, але быць.Толькі ж заўсёды ў чалавека ёсць выбар хаця б на тым балі не танцаваць — застацца чалавекам. Не паехаць, не ўдзельнічаць у «сатанінскам туры». Герой аповесці «Сатанінскі тур» сілай абставін вымушаны быў на яго згадзіцца, хоць жонка сэрцам чула бяду, не хацела таго тура. Узнікла сітуацыя (дарэчы, жыццёвая, апісаная на старонках прэсы), пры якой удзельнікі сатанінскага камерцыйнага тура ў Польшчу некалі дзён (у спёку!) вазілі з сабой труп аднога з удзельнікаў тура. Турысты не захацелі вярнуцца, калі здарылася трагедыя, каб не цярпець страт і выдаткаў. А пра страту сваіх душ мала хто думаў, а тыя, што і падумалі, аказаліся ў меншасці. Нясіла дабра заўсёды ператвараецца ў зло.

Філасофія аповесці А. Варановіча «Крыж» выяўляецца найперш праз устаўную легенду-прытчу пра крыж.

...Па жыццёвай дарозе ішлі два чалавекі, несучы кожны свой крыж. Знясільваючай была тая дарога. Першы цярпліва трываў, а другі, каб лягчэй было ісці, адпілаваў частку даўжэйшага крыжовага канца — і ісці адразу стала лягчэй.

І падышлі яны да прорвы. І першы паклаў цераз яе свой крыж і прайшоў па ім, як па кладцы. Тое ж самае зрабіў і другі, ступіў на свой крыж і... Не хапіла якраз таго, адпілаванага раней кавалка...

Кожны па жыцці нясе свой крыж. І ў кожнага ёсць магчымасць выбару. Чалавек заўсёды вызначаецца выбарам. Зрабіў свой выбар і Стах, галоўны герой аповесці А. Кірвеля «Гон». Ён таксама падпілаваў свой крыж, каб лягчэй было ісці, і стаў целаахоўнікам Арнольда і слугой д'ябла. Перад смерцю прыгадваў: не раз раструшчваў людзей, як і птушанят у гняздзе. Цыганка прадказала яму смерць ад пчол. Паралізаваны пасля ранения Стах пачаў вяртацца да жыцця. Каханне, што сустрэў тут, у бальнічнай палаце, аказалася сілай, мацнейшай за ўсе лекі. «Пчолы» прыляцелі якраз у той момант, калі асабліва захацелася выжыць. Прыйшлі «сябры», вывезлі нямоглага на калідор, «клапоцячыся», каб паветра даць яму болей, а тры «пчалы», выпушчаныя кілерам з дома насупраць, амаль нячутна ўпіліся ў маладое цела.

Цана чалавечаму жыццю — капейка! Нават не капейка, а шэсць бутэлек партвейну, якія купіў Іван Рубаў (апавяданне С. Патаранскага «Грабавыя»), атрымаўшы сімвалічныя ва ўсіх адносінах «грабавыя» (месца падзей канкрэтызавана — Брагін). Забілі на Вялікдзень! З-за шасці бутэлек партвейну!

Разлад, разводы, сіроцтва пры жывых бацьках, разбэшчанне і дэградацыя моладзі, п'янства (у тым ліку і жаночае, як пра тое б'е трывогу Г. Багданава ў рамане «Паляванне на Любаву») — далека не ўсе выявы духоўнага Чарнобыля, засведчаныя летапісцамі нашай сучаснасці.

На жаль, бадай ні ў адным творы не паказана сіла, што здольна супрацьстаяць злу. Толькі канстатацыя зла. Некаторых герояў, праўда, мучыць яшчэ сумленне, часцей на ўзроўні самаапраўдання, некаторыя імкнуцца ратаваць свае душы ад зла, але ці то ўжо позна, ці то сілы няроўныя... Ды і не будзе ўратавання душы без пакаяння. Галоўны герой аповесці І. Шамякіна з сімвалічнай назвай «Без пакаяння», забіўшы галоднае дзіця, не раскаяўся і не пакаяўся. Яго ўнутраныя маналогі — пошукі самаапраўдання, а самаапраўданне, паводле хрысціянскай маралі,—таксама вялікі грэх і падмурак для ўсё новых і новых грахоў.

Без пакаяння зваліўся ў выкапаную ім самім магілу быкаўскі Сурвіла («Жоўты пясочак»), без пакаяння жыве недзе, адкупіўшыся ад пакарання, шамякінскі герой Акунда. Без пакаяння доўгі час жыло і ўсё наша грамадства: і каты, і ахвяры — усе. А без пакаяння не можа быць спадзеву на духоўнае ўратаванне. Мы жывём у грамадстве, дзе да гэтага часу ніхто не ўзяў на сябе адказнасць і не пакаяўся за самае

страшнае ў гісторыі чалавецтва злачынства — за генацыд свайго ж народа ў часы сталіншчыны і бальшавізму.

З належнай сілай мастацкага ўздзеяння большасць твораў на тэму сучаснасці ставяць праблемы. Але не вырашаюць іх. Дарэчы, як сцвярджаюць філосафы, назначэнне мастацтва — не вырашаць праблемы, а толькі менавіта ставіць іх, бо мастацтва наогул нічога не вырашае, ад яго нічога не залежыць. Вырашаць — толькі нам самім, «бо ўсё залежыць ад нас», як і даводзіць В. Быкаў.

Лаўрэат Нобелеўскай прэміі, французскі пісьменнік А. Камю ў філасофскім трактаце «Міф пра Сізіфа» разглядае працу Мастака як разнавіднасць «сізіфавай працы». А. Камю параўнаў працу пісьменніка з подзвігам Сізіфа. Гэтым параўнаннем ён не прынізіў ролю творцы ў грамадстве, а сцвердзіў стаіцызм, годнасць і свайго героя-вязня, і подзвіг Мастака. Мастак, як і Сізіф, здзяйсняе спробу за спробай асвятліць агульным сэнсам існаванне, узбагаціць чытача сваім духоўным вопытам. Ад чытача залежыць, ці скарыстае ён гэты вопыт.

І Творцу-Мастаку, паводле філасофіі А. Камю, наканавана зноў і зноў паднімаць цяжкі камень на вяршыню гары. І пісьменніку наперакор усяму, нават уласнаму ўсведамленню марнасці высілкаў, трэба, як гаварыў адзін з герояў камюсаўскага рамана «Чума», «добра рабіць сваю справу. Рабіць так "як калі б..."». Камюсаўскае «як калі б...» азначае: як калі б быў упэўнены, што перайначыш свет ці хаця б асобнага чалавека.

Аднак ні свет, ні асобнага чалавека перарабіць нельга (за самога чалавека гэтага не зробіць ніхто!). І ўсё роўна: кожны павінен «добра рабіць сваю справу». Для пісьменніка «добра рабіць сваю справу» — каб у выніку гэтай справы «ніхто не змог спасла́цца на няведанне свету, апраўдацца асабістай невінаватасцю перад ім».

**3. Прачытаць на памяць урывак з Якуба Коласа «Новая зямля»**

**Дзядзька-кухар**
Наш мілы дзядзька, наш Антоні,
Ў дзіцячым часта быў палоне;
Вось так гуртом яго абсядуць
І час работы яго крадуць;
Насі «катла», кажы ім казкі,
Ідзі на поплаў з імі ў краскі,
Давай адказы на пытанні,
Тлумач ты ім усё дазванне:
Адкуль, з чаго дзе што бярэцца,

Вось гэта, тое як завецца
І чаму так, чаму не гэтак?
Прыхілен дзядзька быў да дзетак.
Ён быў настаўнікам, суддзёю,
Калі, бывала, між сабою
Паспорацъ дзеткі ці паб'юцца,
Дык да каго тады звярнуцца,
Як не да дзядзькі, да Антося?
Ох, слаўна з дзядзькам ім жылося!
Яшчэ замецце, што з малымі
Ён размаўляў як са старымі,
І з імі радзіўся, спрачаўся —
Як роўны з роўнымі трымаўся!
Калі ж хто, часам, з ім не зладзіць,
То дзядзька толькі вус пагладзіць,
Але не скажа ён нічога,
Бо ведаў, чым даняць малога, —
Гаворыць з тым, з кім дзядзька ў згодзе.

# Білет № 15

## 1. Якуб Колас. «На ростанях». Вобраз Лабановіча. Духоўны свет, маральная высакароднасць героя

Адзінай мэты не зракуся,
І сэрца мне не задрыжыць.
Як жыць, дык жыць для Беларусі,
А без яе — зусім не жыць.
*Л. Генілош*

Вялікая заслуга Якуба Коласа ў стварэнні шырокага панарамнага палатна, у якім — «адбітак родных з'яў» і лесу нашага народа ў адзін з самых пераломных момантаў гісторыі. Але яшчэ большая яго заслуга ў тым, што ўпершыню ў гісторыі беларускай літаратуры галоўным героем такога буйнога твора стаў інтэлігент. Ды які інтэлігент! Літаратуразнаўцы і крытыкі не раз канстатуюць той факт, што нават самым таленавітым творцам лепш удаюцца адмоўныя персанажы як увасабленне носьбітаў зла, якімі пісьменнікі, «адмаўляючы, сцвярджаюць». Што ж, і адмаўляючы, можна і трэба сцвярджаць. Вялікая сіла ўздзеяння на чытача таленавіта выпісанага адмаўлення. Але намнога большага ўздзеяння дасягае творца, калі, сцвярджаючы, сцвярджае. Калі стварае вобраз, здольны стаць эстэтычным ідэалам для чытача.

Па сіле ўздзеяння на чытача сваёй прыгажосцю, маральнай высакароднасцю ўпоравень з вобразам Лабановіча стаяць толькі вобразы інтэлігентаў Алеся Загорскага («Каласы пад сярпом тваім» У. Караткевіча) ды Алеся Іванавіча Мароза («Абеліск» В. Быкава).

Нагадаем і яшчэ адну заслугу Якуба Коласа ў стварэнні вобраза інтэлігента Лабановіча. Вобраз гэты выпісаны не рамантычнымі, а выключна рэалістычнамі мастацкімі сродкамі, чым дасягаецца эфект блізкасці да нас ідэалу пры ўсёй яго ўзвышанасці. Ён зямны і рэальны, яго вышыня на ўзроўні неабходнасці і дастатковасці, якой, калі пастараемся, можам дасягнуць і мы. Ён жыве тымі ж клопатамі, што і мы. Тымі, ды толькі не так, як мы... Як большасць з нас. Любімым мастацкім прыёмам Коласа-рэаліста з'яўляецца правядзенне свайго героя праз многія выпрабаванні, большасцю з якіх, падкрэслім гэта, выпрабоўваліся ці абавязкова будзем выпрабоўвацца ўсе мы.

Найперш Якуб Колас выпрабоўвае свайго героя адносінамі да народа і Радзімы. Пра стаўленне Лабановіча да простага люду сведчаць не толькі дыялогі з а. Кірылам, калі ён палымяна даводзіць, што ў тым адмоўным, якое хай сабе і ёсць у мужыку, вінаваты не ён

сам, а бесчалавечныя абставіны, вінаваты паны. Сведчаць таксама паважлівыя адносіны Лабановіча да людзей, з якімі жыве побач, да бабкі Мар'і, напрыклад. Яе думкі цікавяць яго, а ўчынкі — наогул захапляюць маладога настаўніка шчырасцю і чалавечнасцю.

Выключна ўсё ў вобразе Лабановіча вызначаецца адзінай мэтай. Ён марыць змяніць да лепшага жыццё тых, каго ён любіць, каго лічыць вартым годнага і людскага жыцця. Ад сваёй мэты ён не адракаецца нават пад пагрозай небяспекі. Менавіта гэтая мэта вызначае і выбар яго прафесіі — шлях, якім можна было паслутаваць народу і Бацькаўшчыне. Мастацкая каштоўнасць гэтага вобраза да ўсяго яшчэ і ў тым, што ён выпісаны ў эвалюцыі. Спачатку Лабановіч лічыў, што шлях народа да лепшай долі ляжыць праз асвету. Таму і стаў ён настаўнікам, цалкам прысвяціўшы сябе дзецям. Настаўніцкае крэда Лабановіча— «абуджаць крытычны розум дзіцяці», вучыць так, каб да ўсяго падыходзілі свядома, каб стараліся дазнацца прычын любой з'явы. Гэты падыход не страціў сваёй актуальнасці і сёння.

Няма іншага шляху служэння народу ў мірны час, як сумленная праца і прафесіяналізм у той справе, якую робіш.

Лабановіч усім нам дае прыклад сумленнага стаўлення да сваіх абавязкаў настаўніка. У працы выяўляюцца лепшыя яго якасці як чалавека і інтэлігента: розум, дасведчанасць, прага прафесійнага росту, любоў да дзяцей, павага і спагада, дабрыня і шчырасць. І вынік быў: яго вучні лепш за вучняў з іншых школ вытрымалі экзамены. Здавалася б, так, як шчыраваў Лабановіч на духоўнай ніве, — норма. Але так, на жаль, не было паўсюдна. Каб узвысіць свайго героя, Колас не раз карыстаецца прыёмам кантрасту, ствараючы Лабановічу фон з саханюкоў, панямонскіх «інтэлігентаў», якія ў сваёй працы бачылі толькі сродак існавання ці нават нажывы (Саханюк за напісанне ліста браў з салдатак плату салам).

Мы пастаянна бачым Лабановіча ў яго настаўніцкіх клопатах: вось далёка за поўнач рыхтуецца ён да ўрокаў; вось ён едзе ў суседнюю вёску, каб павучыцца ў больш вопытнага калегі (і пераконваецца, што ў таго вучыцца няма чаму); вось стрыжэ вашывых дзетак, вось купляе беднай сіраціне кашульку; вось збірае на лекцыю і дарослых... Любоў да народа, Радзімы, яе прыроды, нагадвае нам гэтым вобразам Колас, павінна быць дзейснаю. Мы не знойдзем на старонках трылогіі слоў, якімі Лабановіч пераконвае сваіх вучняў, каб яны любілі прыроду. Але мы бачым, як настаўнік з дзеткамі саджаюць дрэўцы. Дарэчы, у гэтага эпізода жыццёвая аснова, як у трылогіі — аўтабіяграфічная. Якуб Колас, ужо будучы знакамітым пісьменнікам, пісаў лісты люсінцам (настаўнічаў пасля семінарыі ў вёсках Люсіна і Пінкавічы на

Палессі) і пытаўся: «Дарагія мае люсінцы, як там растуць нашы дрэўцы, якія мы саджалі з вучнямі?»

Герой Коласа не статычны. Ён жыве, думае, разважае, дзейнічае, памыляецца, спатыкаецца, пакутуе, расчароўваецца і зноў устае — зноў дзейнічае! Горка ўсведамляць яму, што яго шчыраванне нікольві не змяніла да лепшага жыццё дарагіх яму людзей. Яны як жылі ў брудзе і нястачах, так і жывуць. У родных сваіх Мікуцічах ён прапануе асушыць балота і зрабіць грэблю, але і гэты праект яго застаўся нерэалізаваным. Дзядзька Марцін доказна давёў яму, што праект сам па сабе варты ўвагі, але нерэальны, бо зямля вакол — панская, не народная. Сапраўднай рэвалюцыяй у свядомасці Лабановіча было адкрыццё, вычытанае ў нелегальнай брашуры, што самы найпершы пан і вораг народа — цар, ад якога спагады і дапамогі чакаць нельга.

Адносіны з рэвалюцыянеркай Вольгай Віктараўнай Андросавай паднялі яго яшчэ на адну прыступку лесвіцы да ісціны. Аказваецца, у руска-японскай вайне, калі жадаеш волі народу, не перамогі, а паражэння трэба жадаць.

Людзі бачылі ў настаўніку свайго дарадчыка, саюзніка, таму і сход, дзе абмяркоўвалася тактыка барацьбы з панам Скірмунтам за затокі, правялі не дзе-небудзь, а ў школе. Праўда, і на гэты раз, жадаючы дабра людзям, Лабановіч, па сутнасці, стрымаў іх гнеў і тым самым дапамог і пану, і паліцыі.

І зноў настаўнік на раздарожжы, на ростанях, у роздуме, якім жа шляхам ісці да вызначанай мэты, ад якой ён, наперакор усім няўдачам і нягодам, не адступіўся, не адрокся. Небяспечны і рызыкоўны выбірае ён шлях — шлях рэвалюцыянера. Але і тры гады турэмнага зняволення не пераканалі яго ў няправільнасці абранага шляху, бо не вынішчылі ў ім галоўнае і святое пачуццё — любоў да людзей і Бацькаўшчыны, палкае жаданне бачыць іх вольнымі і шчаслівымі. Моцная, незвычайная натура і адначасова зямная і рэальная.

Важнае назначэнне ў выражэнні ідэі твора наогул і ў стварэнні вобраза інтэлігента Лабановіча старонак аб панямонскай «інтэлігенцыі». Пісьменнік-рэаліст не толькі адлюстраваў праўду жыцця і паказаў, што ў ім ёсць белае і чорнае, высакароднае і нізкае, ёсць інтэлігенты і лжэінтэлігенты. У рэвалюцыі 1905 г. удзельнічала і ўнесла свой дастойны ўклад самая здаровая і свядомая частка інтэлігенцыі. Адлюстраваўшы гістарычныя падзеі, Колас сцвердзіў думку пра адзінства лёсаў народа і інтэлігенцыі.

Пісьменнік выпрабаваў свайго героя да ўсяго яшчэ і спакусамі, «балотам», «смуродам мястэчковага балота». І трэба зазначыць, што тое выпрабаванне было самым цяжкім на шляху Лабановіча, бо ён

нават «укачаўся» ў бруд гэтага балота: прайграў і праматаў за адну ноч усе грошы, заробленыя нялёгкай працай за год! А грошы тыя ён вёз маці і дзядзьку Марціну, якія марылі купіць зямлю. Аднак гэтым пісьменнік паказаў зусім не слабасць Лабановіча, а сілу «балота», калі яно здольнае было хоць на нейкі момант прыцягнуць (не ўцягнуць,не!) нават такіх моцных духам і розумам, як Лабановіч. Ён здолеў «адчуць смурод мястэчковага балота» і вырвацца з яго, заплаціўшы, безумоўна, за адзін з галоўных урокаў у сваім жыцці. «Самае галоўнае — не страціць усведамлення ўласных памылак», — вось вынік таго ўрока, афарыстычна і дакладна сфармуляваны самім Лабановічам.

Гэта коласаўская мудрасць і яго ўрок усім нам, яго папярэджанне, што лепш балота абысці, бо не ўсе мы такія моцныя і стойкія, як Лабановіч, не ўсе адразу здольны адчуць «смурод балота», а калі і адчуем, то можа быць позна: яно засмокча і праглыне. Філасофія пісьменніка і тая мастацкая сіла, з якой яна рэалізавана, вельмі актуальныя сёння, калі спакусаў і «балот» на шляху маладых намнога больш, чым на шляху Лабановіча. З кім павядзешся — ад таго набярэшся. У Панямонь лепш не завітваць, балота — абысці!

«Намацаць галінамі сонца», адрынуць злое, вучыцца ў добрага (нагадаем, што акорднымі ў эвалюцыі светапогляду Лабановіча былі ўзаемаадносіны з Аксёнам Калем, у выніку якіх ён зразумеў: сіла, што зменіць жыццё народа, — сам народ), смела і настойліва ісці па дарозе, свядома выбранай самім, можа толькі моцная Асоба. Такой Асобай і з'яўляецца сапраўдны інтэлігент Лабановіч. Ён дае нам урок, як, жывучы зямнымі клопатамі, застацца Чалавекам і нават «намацаць галінамі сонца», сілай сваёй душы павесці за сабой іншых.

### 2. Асноўныя матывы, вобразы і мастацкія асаблівасці лірыкі Петруся Броўкі

Імкнуцца праўду расказаць
Заўсёды сэрцам чыстым.
*П. Броўка*

Публіцыстычная накіраванасць, пафаснасць — вызначальная адметнасць стылю і творчай манеры П. Броўкі. Сведчанне таму і назвы яго першых зборнікаў: «Гады як шторм», «Прамова фактамі».

Творы П. Броўкі называюць паэтычным летапісам народнага жыцця. Удакладнім: аднаго яго боку. І гэты бок жыцця «адбіты», адлюстраваны жыццесцвярджальна, аптымістычна, пафасна ў творчасці П. Броўкі:

У добрым калгасе бліз Нёмна сівога
Я знаў аднаго каваля маладога...
...Не зоркім паглядам, не постаццю гнуткай
Праславіўся хлопец — праславіш рукі.
Мне нават казаліў калгасе аднойчы:
«Ён выкуе месяц, як толькі захоча.
Павесіць паўноччу на белай бярозе —
Каторы сапраўдны — ніяк не адрозніш!»
(«Каваль»)

Пафас творчасці паэта вызначае тэма працы, размах аднаўленчага будаўніцтва (вершы «Каваль», «Архітэктар», «Бондар», паэма «Хлеб»).

«Не буду я стаяць на раздарожжы, вачамі сумнымі глядзець удалячынь», — гэта катэгарычная заява яго лірычнага героя шмат у чым вызначае і сутнасць паэзіі П. Броўкі. У ёй пераважае адно пачуццё — аптымізм. Акрамя паэзіі ваеннага перыяду, у якой гучаць трыюжныя і трагічныя ноты, а вершы сапраўды напісаны голасам сыноўняга сэрца, у яго творчасці няма змрочных фарбаў. Сёння мы ведаем, што час, у які выпала нарадзіцца і жыць паэту, не мог быць падставай для падобнага бязмежнага аптымізму. Магчыма, матывам яго стала бязмежная ўдзячнасць П. Броўкі за ўсё, чаго дасягнуў у жыцці. Нарадзіўся ён у 1905 г. у мнагадзетнай сям'і, у якой кавалак хлеба быў святам:

Дзяцінства незабыўны час!
Я рос паміж дажджоў, вятроў,
Я пераходзіў з класа ў клас —
Ад качак, свінняў да кароў.

Наўрад ці сціплы, чулы чалавек, якім быў П. Броўка, пайшоў супраць сумлення і быў няшчырым, калі славіў час і чалавека працы, якому выпала жыць у гэтым часе. І такім бачыўся, такім усведамляўся ён паэту. Толькі добры калгас «бліз Нёмана сівога», толькі кавалёў і бондараў, якіх «праславілі рукі», ён ведаў. У гэтым плане творчасць паэта цікавая для нас і як сведчанне таго часу і яго ўплыву на творцу.

Звернемся да твораў П. Броўкі, якія вытрымалі выпрабаванне не тым часам, у які ён пісаў, а часам наогул, які з'яўляецца самым нестаронні́м суддзёй.

А вытрымала выпрабаванне найперш яго лірыка, матывам якой было святое пачуццё да Радзімы і ў час ваеннага ліхалецця, і ў мірны час. Лірычны герой верша «Рана» — салдат-патрыёт. Восем ран

пакінула на яго целе вайна, але самая незагойная — рана на целе паланёнай Радзімы. І загаіць яе можа толькі зварот на вольную зямлю:

...Каб чабору таго,
Каб тае медуніцы,
Каб паветра з бароў
Што пад Мінскам у нас.

Назва эпічнага верша «Кастусь Каліноўскі» вонкава супярэчыць зместу яго, бо верш пра подзвігі партызан у гады Вялікай Айчыннай вайны. Галоўны герой верша — партызан Каліна. Фантастычным прыёмам славіцца яго сіла, якой ён бароніць людзей ад фашыстаў:

Калі ён пачуе, як ворагі скачуць,
Калі ён пачуе сірочыя плачы...
І будзь ён пад Бугам ці далей дзе, можа,
Ён шабляй дастане да самай Бярозы,
Да сэрцаў варожых,
І кацяцца галавы катаў у лозы.

Пра партизана складаюць легенды, а па беларускай зямлі «пайшла пагалоска»: зноў з'явіўся Кастусь Каліноўскі. «Сілай магутны, душою агністы», ён наводзіць жах на ворагаў, яго кулі даганяюць варожую варту за сотні кіламетраў і вызваляюць дзяўчат з палону.

Назвай твора, параўнаннем звычайнага сялянскага хлопца з правадыром паўстання 1863 г., фальклорнымі рэмінісцэнцыямі паэт сцвярджае думку, што ў самы крытычны для Радзімы час патрэбна незвычайная сіла і любоў да народа, роўная сіле і любові Каліноўскага.

Ідэя верша «Родныя словы» сфармулявана ў радках, што сталі крылатымі:

Дзяды і бацькі нашу мову стваралі,
Каб звонка звінела, была, як агонь.

Выдатную і пераканаўчую форму выяўлення думкі, што мова — душа народа, што творца мовы — народ, абраў паэт: ён слухае «гаваркія» родныя словы: «Як многа гавораць мне назвы такія...» А назвы родныя роднай зямлі гавораць пра галоўнае: «што продкі любілі спакойную працу», што «трываць не хацелі абразы і слёз».

Узорам філасофскай лірыкі ў творчасці П.Броўкі з'яўляецца верш «Як ліст дубовы...». Мастацкая вартасць гэтага дасканалага твора вызначаецца асацыятыўнасцю выяўленай у ім думкі: чалавек павінен несці свой крыж да канца, павінен трымацца за жыццё, «як за галлё дубовы ліст». Няхай «мятлюга грае і злосны шчэрыцца мароз», чалавек павінен ісці, павінен усведамляць сваё жыццё як дар і найвялікшую каштоўнасць, адмаўляцца ад якой — неадпушчальны грэх. Асацыятыўнасць, трапнае параўнанне прагі і волі да жыцця з дубовым

лісткам, метафарычнасць дазваляюць паэту пазбегнуць уласцівай яго творчасці публіцыстычнасці і пафаснасці. У апошняй страфе яшчэ адна філасофская думка пра пераемнасць пакаленняў, повязь паміж пакаленнямі як умову вечнасці жыцця.

Мудрыя сцвярджаюць: тое, што схаваў, — прапала, што аддаў, — тваё. Такая галоўная думка верша «Ты шчодрым будзь!». Лірычны герой гэтага верша, як і верша «Сляды», — чалавек мудры, сталы, сумленны і вопытны. Мудрасць і свой вопыт лірычны герой верша «Сляды» дакляруе маладым:

Вы выйшлі ўдалеч, маладыя,
Вам доўга крочыць праз гады.
Не забывайцеся ж, якія
Вы пакідаеце сляды.

Звароты, заклікі, клічныя сказы, дзеясловы загаднага ладу, публіцыстычная лексіка («след трактарыста, след паэта, канструктара, будаўніка» і інш.) — усё гэта рысы публіцыстычнага стылю, аднак шчырасць, з якой праз свайго лірычнага героя гаворыць з намі паэт, уражвае, палоніць.

Адным з выдатных твораў інтымнай лірыкі ў нашай паэзіі з'яўляецца верш «Пахне чабор». Тая вечная думка, што валадарыць светам каханне, якое вышэйшае за ўсе пачуцці на свеце, выяўляецца праз успрыманне лірычнага героя — закаханага, чыстага, узнёслага, як і само пачуццё. У гэтым вершы дзівосным чынам спалучаецца лірычнае і эпічнае, узвышанае і зямное, шчасце і горыч, удзячнасць і шкадаванне. У гэтым вершы сцвярджаецца думка, што той і шчаслівы, хто зведаў каханне, нават калі яно і не збылося, не было ўзаемным. Лірычны герой быццам даводзіць нам: не шкадую, што не збылося, удзячны лесу, што было.

Вялікую ролю ў выяўленні пачуццяў лірычнага героя адыгрывае рэфрэн «Пахне чабор, пахне чабор...». Кожны раз у кантэксце ён напаўняецца новым зместам і выяўляе цэлую гаму пачуццяў: ад шчасця, захаплення да шкадавання і светлага смутку...

І ў П. Броўкі ёсць вершы, у якіх рубам пастаўлена пытанне:

...Паэзія сучасных дзён
Павінна быць якою?

З ракой і дзяўчынай «златакудрай», з арлом і салаўём параўноўвае яе паэт; паэзія, на яго думку, павінна «не знаць прыпынку анідзе ні днём, ні цёмнай ноччу». Галоўнае ж патрабаванне — быць праўдзівай:

Імкнуцца праўду расказаць
Заўсёды сэрцам чыстым,
Каб, як дзіцячая сляза,

Быць шчырай і празрыстай.

**3. Прачытаць на памяць верш Петруся Броўкі «Пахне чабор»**

Хіба на вечар той можна забыцца?
...Сонца за борам жар-птушкай садзіцца,
Штосьці спявае пяшчотнае бор,
Пахне чабор, Пахне чабор...

Лёгкія крокі на вузкай сцяжынцы,
Дзеўчына ў белай іскрыстай хусцінцы,
Быццам абсыпана промнямі зор.
Пахне чабор, Пахне чабор...

Выйсці б насустрач, стаць і прызнацца,
Вось яно — блізкае, яснае шчасце,
Клікнуць хацелася — голас замёр,
Пахне чабор, Пахне чабор...

Год адзінаццаць, а можа дванаццаць
Сэрца баліць, што не здолеў спаткацца,
Сэрца нязменна хвалюе дакор,
Пахне чабор, Пахне чабор...

Час той схаваўся за дальняй гарою,
Здасца хвілінай — яна прада мною...
Выйду. Гукаю. Маўклівы прастор.
Пахне чабор, Пахне чабор...

# Білет № 16

## 1. Ідэйна-эстэтычная накіраванасць паэмы «Тарас на Парнасе». Вобразы паэмы. Жанр і мова паэмы

Сказка — ложь, да в ней намек,
Добрым молодцам урок.
*А. Пушкін*

Мастацкая вартасць любога шэдэўра вызначаецца колькасцю і якасцю ўмоўнасцей у ім, спалучэннем умоўнага і рэальнага і наяўнасцю ў ім нацыянальнага. Паэма «Тарас на Парнасе» Канстанціна Вераніцына, ураджэнца в. Астраўляны, што на Віцебшчыне, цалкам адпавядае ўсім эталонным крытэрыям шэдэўра сусветнага ўзроўню. Гэта жамчужына беларускай літаратуры і праграмны твор для ўсіх пісьменнікаў, бо ў паэме ёсць адказ на самыя галоўныя пытанні: пра што і як пісаць? у імя чаго? Паэма «Тарас на Парнасе» вытрымала галоўнае выпрабаванне — выпрабаванне часам і з'яўляецца ўзорам мастацкасці для кожнага творцы.

Паэма здзіўляла і здзіўляе і крытыкаў, і самага дасведчанага, патрабавальнага і інтэлектуальнага чытача сваёй арганічнасцю, гармоніяй зместу і формы, дасканаласцю мастацкіх сродкаў. Твор паводле жанру — парадыйна-сатырычная паэма з фантастычным сюжэтам, у аснове якога — жартоўнае апавяданне пра незвычайныя прыгоды палясоўшчыка, ім самім расказанае.

Цікавы, прыгодніцкі, жартоўны твор, але якія важныя грамадска-палітычныя працэсы ў ім адлюстраваны! Якія сур'ёзныя праблемы ставяцца і вырашаюцца!

Паэма — мастацкае адлюстраванне барацьбы, што адбывалася ў рускай літаратуры ў 40-50-я гг. XIX ст. паміж прагрэсіўнымі і рэакцыйнымі пісьменнікамі за народнасць у літаратуры і супраць рэакцыйных плыняў, а таксама састарэлых канонаў класіцызму. Паводле канонаў класіцызму, галоўнымі героямі мастацкіх твораў маглі быць толькі носьбіты прыгожага — багі, гістарычныя асобы і людзі вышэйшага саслоўя і ні ў якім разе «пан сахі і касы».

Гэта— рэальнасць і гістарычная данасць. Гэты найважнейшы грамадскі і нават палітычны працэс (бо літаратура магла стаць або зброяй рэжыму, або зброяй барацьбы з ім) адлюстраваны ў паэме фантастычнымі сродкамі і праз усведамленне «палясоўшчыка з Пуцявішча». Аўтарская пазіцыя выяўляецца праз галоўнага героя,

праз яго ўспрыманне ўсяго, што дзеецца ля гары Парнас. А бойка там разгараецца не на жарты:

*Хто дужа шпарка, хто паціху,*
*Усе лезуць на гару яны*
*І, яку школе, галасуюць,*
*Гатоў адзін другога з 'есць,*
*Бо кожны морду ўперад суець,*
*Каб першым на гару узлезць.*

«На гару узлезць», узысці на Парнас — стаць несмяротным, прыраўняцца да багоў, якія, паводле міфаў, там і жывуць вечна. Неўміручасці прагнуць усе, але хто яе варты? За якія такія заслугі?

Аўтарская пазіцыя ў творы відавочная: неўміручасці варты толькі такія, як Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі, Гогаль. Яны сталі неўміручымі дзякуючы служэнню народу і паслядоўнаму адстойванню прынцыпаў народнасці ў літаратуры. «Чатыры добрых малайцы» выпісаны аўтарам з непрыхаванай сімпатыяй і захапленнем, іх надзяляе ён высокімі эпітэтамі і параўнаннямі. Перад імі (заўважым гэта) «народ раздаўся на канцы», ім не трэба штурхацца, ціснуцца ў гэтым гармідары, яны, «як бы птушкі праляцелі», «прайшлі, як павы, на Парнас». Народ і толькі народ, сцвярджае К.Вераніцын, вызначае вартасць творцы і яго несмяротнасць.

Зусім іншых сродкаў абмалёўкі і характарыстыкі «заслужило) ў аўтара рэакцыйныя пісьменнікі Булгарын, рэдактар рэакцыйнай газеты «Северная пчела», і яго паплечнік аўтар граматыкі Грэч. Першы — «сівы, кароткі, тоўсты, як чурбан, плюгавы, дужа некрасівы, крычыць, як ашалелы». Другі — «несці кніжкі пасабляе, а сам граматыку нясе, што ў семінар'ях вывучаюць». Дарма! З такім «набыткам» на Парнас не ўзлезці. Неўміручасць не для такіх! Іншы пропуск павінен быць у тых, хто прагне неўміручасці. А які ж?

Галоўную нагрузку ў выражэнні ідэі паэмы і ў выяўленні эстэтычнай канцэпцыі пісьменніка К.Вераніцына нясе вобраз Тараса — галоўнага героя, пра што і сведчыць назва твора. Праблема эстэтычнага была вызначальнай у барацьбе паміж прагрэсіўнай і рэакцыйнай літаратурай, пра што сведчыў і канцэптуальны артыкул М. Чарнышэўскага «Пра эстэтычныя адносіны мастацтва да рэчаіснасці». Прадметам мастацтва павінна быць толькі прыгожае. Але што ёсць прыгожае, вартае мастацтва?

Сімвалічным з'яўляецца ўзыходжанне Тараса на Парнас. Гэта адказ на пытанне, што ёсць прыгожае, што варта ўвагі паэтаў і творцаў наогул. Просты чалавек, носьбіт духоўнага, вечнага, у якім увасоблены эстэтычны ідэал паэта К.Вераніцына і яго адказ на

важнае для ўсяго грамадства пытанне, — менавіта ён павінен стаць героем новай літаратуры!

Заслуга К.Вераніцына ў тым, што ён не толькі адмаўляе, а найперш сцвярджае, хто павінен быць героем літаратуры і якім. Прычым сцвярджае пераканаўча, доказна, стварыўшы першы ў нашай літаратуры вобраз працоўнага чалавека такой прыцягальнай эстэтычнай сілы ўздзеяння.

Стварыў і залюбаваўся ім самім зладаваным: улюбёнасць аўтара ў свайго героя відавочная.

Сюжэт і кампазіцыя паэмы спрыяюць усебаковаму і вычарпальнаму выяўленню лепшых якасцей галоўнага героя.

Толькі ў першым раздзеле — аўтарская характарыстыка героя, акцэнтаванне увагі чытача на вызначальных якасцях Тараса — працавітасці, сумленным стаўленні да сваіх абавязкаў, за што «ў ласцы быў у пана, яго пан дужа шанаваў»:

Любіла тож Тараса й паня,
І войт ні разу не збрахаў,
Затое ж ён болота з рання
Да цёмнай ночы пільнаваў.

Адвеку нашым народам цаніліся і паважаліся такія якасці, як цвярозасць і рахманасць — міралюбства, вытрымка, цярпімасць і спакойны нораў:

Што ж, чалавек ён быў рахманы,
Гарэлкі ў губу ён не браў.

Прычым менавіта на цвярозасці як важнейшай якасці Тараса паэт акцэнтуе нашу ўвагу некалькі разоў. І калі Тарас з асуджэннем глядзіць, як «багі гарэлку піць пачалі, з насадкі ў чаркі так і льюць!», як «Зеўс тым часам насцябаўся, што носам чуць зямлю не рыў», як тых, хто «гарэлкі насцябаўся», «пад лаўку клалі спаць». І калі з агідай і сорамам вымушаны слухаць, як:

Бах сп'яну пеў такі прыпеўкі.
Што аж не можна гаварыць,
Аж засароміліся дзеўкі,
Так стаў ён брыдка развадзіць.

Багі маглі весяліцца толькі тады, калі «гарэлкі насцябалісь», а «Тарас наш не ўцярпеў», «калі зайграў дудар «скакуху»:

І ад порога, што ёсць духу,
Скакаць на хату паляцеў.
Як стаў прытаптываць атопкам,
Аж рот разявілі багі:
То ён прысвісне, то прытопне,

То шпарка пойдзе у кругі.
Глядзеў Юпітэр і дзівіўся,
І пад дудуў далоні біў...

Паэт К.Вераніцын настойлівы ў сваім перакананні, што цвярозасць — вялікая каштоўнасць нацыі і ўмова духоўнай волі і багацця чалавечай асобы. Нагадаем, што і ў паэме «Два д'яўлы», якая, паводле даследаванняў і лінгваматэматычнага аналізу, таксама належыць пяру К. Вераніцына, ён б'е трывогу, папярэджвае, што «будзіць поўна пекла наша», калі не справімся са «змеем», з п'янствам. Чорт аж двух д'яблаў паслаў на нашу зямлю, каб «нашы душы самушчаць». Хаўрус двух д'яблаў вельмі небяспечны, бо п'янства і ёсць той ланцуг і путы, што страшней за ўсе кайданы рабства, бо з любога палону можна выйсці, калі ўстаць і ісці, а путы п'янства не дадуць выйсці з рабства: чалавек становіцца рабом самога сябе.

Усе астатнія раздзелы паэмы «Тарас на Парнасе», акрамя першага, — гумарыстычна-жартаўлівае апавяданне Тараса пра яго незвычайныя прыгоды, апавяданне, у якім рэальнае і казачнае, фантастычнае дзівосным чынам пераплятаюцца. Рэальнае ў творы часам на ўзроўні гістарычнай канкрэтнасці: «Сам Пушкін, Лермантаў, Жукоўскі і Гогаль шпарка каля нас прайшлі...» Але прайшлі на Парнас — сталі неўміручымі за слугаванне народу, які перад імі пачціва «раздаўся на канцы».

Зусім рэальныя ў паэме побытавыя замалёўкі: «стаіць зазвычай панскі двор, кругом абнесен тын яловы: няйбось сюды не ўлезе вор! А на дварэ тым свінні ходзяць, каровы, козы, бараны...» Але ўсё гэтае «хазяйства водзяць» не паны і не сяляне, а... багі! А жыццё багі вядуць зусім зямное, хоць і жывуць на Парнасе. І ў іх тут, як ля гары,

Былі паны, было і зброду,
Як часам і на свеце ў нас.

Прыём парадзіравання высокага праз нізкае, сатырычна выпісаныя вобразы багоў спрыяюць выяўленню аўтарскай пазіцыі: у літаратуру прыйшоў новы герой, варты заняць месца тых, хто там дагэтуль панаваў. Аўтар сцвярджае прыход героя, новага героя, які па сваіх маральных якасцях стаіць намнога вышэй за тых, што «панавалі» ў літаратуры старой, рэакцыйнай. Час патрабуе ад літаратуры звароту да народа, патрабуе адлюстравання яго жыцця, выяўлення яго душы, яго памкненняў. Але ці варты гэты новы герой таго, каб яму прысвячаць высокае мастацтва?

Рэальным, зямным і адначасова прыгожым, цікавым з'яўляецца ў паэме Тарас. Фантастычнае, прыгодніцкае ў паэме — не толькі дзеля таго, каб зацікавіць чытача, але і каб выпрабаваць героя незвычай-

нымі абставінамі. У такіх абставінах апроч услаўленых аўтарам у першым раздзеле якасцей выяўляцца і іншыя, якія неабходны, каб герой заняў сваё належнае месца ў літаратуры. Мова Тараса, яго гумар, дасціпнасць, назіральнасць, здольнасць выказаць словам і сваё захапленне прыгажосцю («Авохці мне! Як там прыгожа! Як быццам хто намаляваў!»), і павагу да працы чалавека («Ці ж легка столькіх накарміць?!»), і абурэнне некаторымі паводзінамі багоў — усё выяўляе ў ім чалавека разумнага, разважлівага.

Ствараючы ў паэме «Тарас на Парнасе» свой пісьменніцкі ідэал чалавека, аўтар надзяліў яго не толькі цвярозасцю, але і стойкім імунітэтам да п'янства, пагардлівымі да п'янства адносінамі. Аўтар выпрабаваў свайго героя не толькі адносінамі да працы, але і праверыў на здольнасць бачыць прыгожае і адпачываць, шчыра павесяліцца без гарэлкі. У гэтым вобразе ўслаўлены ўвесь беларускі народ і ўласцівыя яму нацыянальныя якасці. Гэты твор каштоўны для нас і сваёй этнаграфічнай інфармацыяй. Усё ў ім — наша, нацыянальнае: і звычаі, і традыцыі, і гульні, і стравы, і справы. Паэма сведчыць пра тое, якімі былі нашы продкі, што ў іх лічылася каштоўным, людскім, а што заганным і ганебным.

Паэма — як каштоўны брыльянт, што мае і вартую яго аправу, — мову. Яна жывая, вобразная, багатая эпітэтамі, метафарамі, параўнаннямі, трапнымі выслоўямі: «як тараканы каля хлеба, багі паселі ўкруг стала»; «чырвона, тоўста, круглаліца, і вочы, як на калясе, як жар, гарыць яе спадніца, істужкі ўплецены ў касе».

Паэма як народны твор стала сапраўды «першай літаратурнай любоўю Беларусі». Ведаюць яе і за межамі нашай краіны. Пераклаў паэму на рускую мову М. Ісакоўскі.

## 2. Паэзія Аркадзя Куляшова, яе тэматыка, грамадзянскі пафас, філасофскія і маральна-этычныя праблемы

Ёсць у паэта свой аблог цалінны...
*А. Куляшоў*

Не толькі для А. Куляшова, але для кожнага творцы «аблог цалінны» — душы людскія, «сэрцы цвёрдыя, быццам з камення». І каб узняць той «аблог цалінны», патрэбна напачатку кожнаму паэту, як даводзіць А.Куляшоў у вершы «Мая Бесядзь», выкапаць «рэчышча ўласнай ракі». «Рэчышча ўласнай ракі» — самабытнасць таленту кожнага творцы, якога б маштабу і ўзроўню той талент ні быў: Волга магутная ці Кама, ці хаця б Бесядзь, што на радзіме паэта. Тое ж

самае, толькі па-свойму сцвярджае і паэт У. Скарынкін: «Сапраўднаму паэту трэба мець уласны курс і вугал свой атакі».

Паэзія А.Куляшова годна вытрымлівае выпрабаванні часам. Час засведчыў, што паэт Куляшоў здолеў выкапаць «рэчышча ўласнай ракі», што яго Бесядзь мкне ў акіян сусветнай культуры. У паэта Куляшова — «уласны курс» і свой «вугал атакі».

Чытаючы адзін з самых першых яго вершаў «Бывай», нельга не здзівіцца, што такое і так мог напісаць 14-гадовы падлетак! Філасофія верша і сродкі яе выяўлення вартыя пяра не толькі таленавітага, але і мудрага, сталага творцы. Мала ў інтымнай лірыцы беларусіх паэтаў вершаў, у якіх бы з такой мастацкай сілай была выяўлена, апета і дабраславёна «светлая самота» нязбытнага кахання, якое хай сабе і не спатоліла сэрца радасцю, але будзе наталяць усё жыццё сілай і ўдзячнасцю лесу, што такое пачуццё наканавана было зведаць:

Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая. Твой светлы вобраз панясу я па жыцці. На ўсходзе дня майго заранка дагарае, Каб позна вечарам на захадзе ўзысці.

Дзівоснае, парадаксальнае спалучэнне неспалучальнага (аксюмаран «стаю на ростанях былых»), кантрастная метафара («самотным жаўранкам звініць і плача май»), мажорная мінорнасць і элегічнасць верша — усё ў ім выяўляе стан душы ўзвышанай і натхнёнай, шчаслівай і самотнай — багатай! Невыпадкава гэты верш стаў вядомай і любімай песняй. Верш варты таго, каб быць школай выхавання самых дастойных чалавека пачуццяў, каб выхоўваць «душою чулых». Асабліва карысны ён для ўратавання душ маладых, для зняверaных і скалечаных цынізмам душ.

Аркадзю Куляшову належыць галоўная заслуга ў распрацоўцы такога жанру, як балада. Баладнасць яго творчасці, асабліва перыяду вайны, — адметная ўласцівасць стылю паэта. Менавіта дзякуючы жанравым магчымасцям балады Аркадзь Куляшоў паказаў трагізм вайны і ўславіў гераізм народа, яго бязмежную любоў да Бацькаўшчыны ў самы крытычны для яе момант. У вершахбаладах «Камсамольскі білет», «Балада пра вока», «Балада аб чатырох заложніках» паэт выпрабаваў сваіх герояў выбарам паміж жыццём і смерцю ў імя Радзімы ці, як у «Баладзе аб чатырох заложніках», паміж смерцю, што была б збавеннем ад пакут, і жыццём-пакутай, але дзеля збавення ад няволі і пакут сваёй Айчыны.

Сёння не сціхаюць спрэчкі і адносна засведчаных паэтам сітуацый (а большасць яго эпічных твораў маюць жыццёвую аснову), і адносна пазіцыі паэта пры адлюстраванні самых крытычных

момантаў жыцця. Асабліва гэта датычыцца «Балады аб чатырох заложніках» і верша «Камсамольскі білет».

Некаторыя сцвярджаюць, што не могуць быць прызнанымі людскімі любыя ўчынкі, матывам якіх з'яўляецца ідэалогія. Калі тая ідэалогія мае назву «любоў да Радзімы і жаданне бачыць яе вольнай», то такая ідэалогія — святая. Яна апета і ўслаўлена, нагадаем, яшчэ сюжэтам Кнігі кніг. Падобная «ідэалогія», што стала матывам учынку Юдзіфі, і ўслаўляецца ў аднайменнай кнізе Бібліі.

Найбольшай сілы трагізму дасягае паэт у вершы «Над брацкай магілай». Гэта верш-рэквіем, выпісаны ў традыцыі народнага плачу-галашэння па нябожчыку. Эфект галашэння дасягаецца асаблівым рытмам і асанансам — мэтавым выкарыстаннем слоў з вялікай частотнасцю гукаўо,у, а:

Ногі просяцца ўстаць,
яны стомыў дарозе не чулі,
Ды ўвагналі ў магілу
Іх сілу
Варожыя кулі.

Гэта — трагедыя, але трагедыя аптымістычная: другая кампазіцыйная частка верша напісана ў форме звароту да Радзімы і адначасова клятвы ёй:

Мы клянёмся варожай крывёй
Напаіць беларускія рэкі.

Дасканала распрацаваным жанрам у творчасці Куляшова з'яўляецца паэма. Паэт схільны да эпічнага адлюстравання вызначальных момантаў гісторыі, да выяўлення, як гэта было ў баладзе (а балада, па сутнасці, —гэта паэма ў мініяцюры) моцных выключных асоб у выключных абставінах. Многа напісана ім паэм («Аманал», «Баранаў Васіль», «Хамуціус» і інш.), але найбольшую славу прынесла яму паэма «Сцяг брыгады» (1942), якую вельмі высока ацаніў сябар і таварыш па пяры А.Твардоўскі.

Цэнтральнай праблемай паэмы з'яўляецца праблема шчасця. Паэма напісана ў форме вандроўнага дзённіка, які вядзе галоўны герой Алесь Рыбка. Дзякуючы гэтай форме дасягаецца не толькі лірызм, але і панарамнасць, рэалізм у адлюстраванні часу, «калі гора разлілося слязьмі і крывёй скрозь ад мора да мора».

Вельмі моцная чалавечая прага жыцця і шчасця. Некаторыя, як Мікіта Ворчык, стомлены жудасцямі вайны, марадь пра шчасце і думаюць, што яно магчыма сярод крыві і слёз. Іншыя, як Лізавета — вясёлая кабета, перакананы, што можна «люба жыць і ў горы», адседзецца, перачакаць навалу: «будуць свяціць нам месяца рожкі —

ні вайны, табе, ні бамбёжкі». Хай пакутуюць іншыя! Але за ўсё трэба плаціць. За спакойнае сытае жыццё Мядзведскі плаціць здрадай Радзіме і народу. А за здраду яго напаткала справядлівая расплата. Пісьменніцкая філасофія і ўсведамленне шчасця выяўляюцца праз галоўнага героя:

Не хачу сабе шчасця тады,
У часы, калі гора
Разлілося слязьмі і крывёй
Скрозь ад мора да мора.

Нельга быць шчаслівым, калі пакутуе ўвесь народ, калі вакол смерць і жудасць, нагадвае паэт вечную ісціну і закон.

Твор палоніць гуманізмам, верай у вызваленне Бацькаўшчыны, у будучыню, калі сапраўды можна быць шчаслівым:

Я прайду з табой многа дарог,
Мой гадзіннік, мой браце!
І яўбачу часы перамог
На тваім цыферблаце!

Мастацкая вартасць паэмы ў многім вызначаецца гарманічным спалучэннем рэальнага і ўмоўнага, вечнасцю праблем, узнятых у паэме, дасканалай мастацкай формай іх вырашэння.

Некаторыя даследчыкі творчасці Куляшова пасляваеннага перыяду адзначаюць яе публіцыстычную накіраванасць як яшчэ адну адметнасць стылю паэта. З гэтым нельга не пагадзіцца. Так, публіцыстычнасць, але якая!

Пра асаблівасць куляшоўскай публіцыстыкі ў паэзіі хочацца сказаць асацыяцыямі яго ж радкоў.

Як «дыван вясны перацвітае ў лета», як «завея лісця у сняжынак пух», так і публіцыстыка Куляшова «перарастае» ў сапраўднаю мастацкасць і дасягае незвычайнай сілы ў выяўленні пачуццяў, думак — філасофіі. Публіцыстычны штамп «абавязаны прапіскай» становіцца ў вершы «Я хаце абавязаны прапіскаю...» сімвалам вечнасці жыцця, абарона якога залежыць ад кожнага з нас.

Праз лірычнага героя і яго парадаксальныя асацыяцыі па прынцыпе градацыі («я — матчын спеў, я — матчыны трывогі», «я — матчын гнеў, які ўздымаў на ногі...») паэт сцвярджае, што любоў да сваёй хаты, калыскі, «падвешанай пад столь», — да ўсяго таго, што называецца гняздом, Радзімай, павінна быць дзейснай. Павінна быць у крытычныя для Радзімы моманты «трацілаваю пугай перамогі»:

Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры.

Асаблівай пафаснасці паэт дасягае ў другой кампазіцыйнай частцы верша:

…Не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю ператварыў у бамбасховішча,
Мільярд прапісак — у маўклівы прысак,
Мільярд калысак — у мільярд магіл.

У паэта ёсць выдатная перыфраза (моўная загадка), што стала крылатай: «На паўмільярдным кіламетры паміж наступным і былым». Так вобразна і па-філасофску паэт вызначыў «сёння» як імгненне ў вечнасці. Наша «сёння» — мірнае. І ў тым наша шчасце. Але, як даводзіць паэт у вершы «Сябры, каго вайна скасіла кулямі…», «не ціхне вечны бой». І поле бітвы — сэрца чалавека: бітвы за перамогу праўды над няпраўдай, шчырасці — над крывадушнасцю, даравальнасці — над пометай, сціпласці — над гардыняй і пыхай, любові — над нянавісцю. Толькі такі бой — умова вечнасці. «Адзіны серп», які славіцца паэтам, — не той, пад якім загінуць каласы жыцця, а «серп над палявой дарогаю — адзіны серп на сённяшнім жніве!».

Філасафічнасць, выяўленне філасофскіх думак з дапамогай і публіцыстычных сродкаў таксама, але публіцыстыкі вобразнай, асацыятыўнай — яшчэ адна адметнасць лірыкі Куляшова пасляваеннага перыяду.

У вершы «Спакойнага шчасця не зычу нікому…» паэт-філосаф выяўляе сваё разумение шчасця. Безумоўна, не канфлікты, не звадкі і сваркі, не мітусня — ідэал лірычнага героя. Ён адмаўляе не спакой, згоду і мір паміж людзьмі (і сам паэт, і яго лірычны герой за гэта якраз змагаліся і змагаюцца), а заспакоенасць і застой у душы чалавека, якія не дазваляюць яму весці «вечны бой» за светлае ў сабе. Словаспалучэнне «спакойнага шчасця» — эпітэт, вобраз, які заўсёды ўсведамляецца ў пераносным сэнсе. Для лірычнага героя заспакоенасць, статычнасць і шчасце — паняцці несумяшчальныя. Катэгарычнае («не зычу нікому») адмаўленне «спакойнага шчасця» выяўляецца праз асацыяцыі. Ручай тады асабліва жаданы, калі неабходна спатоліць смагу. Увага толькі тады многага вартая, калі яна шчырая і заслужаная, а не зайздрослівая, крывадушная. І «лес без зязюлі» — трагедыя і абсурд, як шчасце без імкненняў і парыванняў.

**3. Прачытаць на памяць верш Аркадзя Куляшова (на выбар)**

**Бывай**
Бывай, абуджаная сэрцам, дарагая,
Чаму так горка, не магу я зразумець.

Шкада заранакі мне, што ў небе дагарае
На ўсходзе дня майго, якому ружавець.

Ці помніш першае нясмелае прызнанне?..
Над намі жаўранкам звінеў і плакаў май.
Назаўтра золкае, туманнае світанне,
Суровы позірк твой і мой нямы адчай.
    Пайшла, пакінуўшы мне золкі і туманы,
    Палынны жаль смугой ахутаных дарог,
    Каб я хвіліны боль і горыч гэтай раны
    Гадамі ў сэрцы загаушыць сваім не мог.
Пайшла, ніколі ўжо не вернется, Алеся.
Бывай, смуглявая, каханая, бывай.
Стаю на ростанях былых, а з паднябесся
Самотным жаўранкам звініць і плача май.
    Бывай, абуджаная ў сэрцы, дарагая.
    Твой светлы вобраз панясу я па жыцці.
    На ўсходзе для майго заранка дагарае,
    Каб позна вечарам на захадзе ўзысці.

**Мая Бесядзь**
Кажуць, што рэкі птушкамі створаны, —
Такімі малымі на першы пагляд, —
Капалі і ў дзюбах адносілі ў бор яны
Мяшочкі з зямлёй
І ляцелі назад.

А каня гуляла ды мыла іх здзекамі,
І птушкі паслалі ёй вечны праклён,
Таму і лятае яна над рэкамі
І просіць піць
Аж да сённяшніх дзён.
Канаючы ўлетку штодня на спякоце,
Той рэдкаю кропляй яна існуе,
Што хмарка, дажджом прашумеўшы
                                        ў лістоце,
З нябёсаў часамі пашле да яе.
Я ўпарты, не кіну пачатае справы,
Каменне крышу,
Разграбаю пяскі,
Пад кпіны аматараў лёгкае славы

Капаю рэчышча ўласнай ракі.
З надзеяй шяджу на крыніцу спатканую,
Хачу, каб яна разлілася ракой...
Не Волгай магутнай,
Не нават Камаю,
Хоць Бесяддзю, што на Радзіме маёй.
Бо прагай да працы ахоплены часта я,
І сэрца абпалена смагай радка,
Бо жыць не магу,
Як каня няшчасная,
Кропляй дажджу з лесавога лістка.
Спакойнага шчасця
не зычу нікому:
Навошта грымотам
маланка без грому,
Навошта ручай
без пякучае смагі,
Халодная ўвага,
не вартая ўвагі,
Жаданні, што прагныя крылы згарнулі,
Зязюля без лесу
і лес без зязюлі?

***

Я хаце абавязаны прапіскаю —
Калыскаю, падвешанай пад столь.
Я маці абавязан кожнай рыскаю,
Драўлянай лыжкаю, шінянай міскаю —
Усім, чым працы абавязан стол.
Я — матчын спеў, я — матчыны трывогі,
Я — матчын гнеў, які ўставаў на ногі,
Гнаў смерць на захад — у нару з нары —
Трацілаваю пугай перамогі.
Дыміліся сямі франтоў дарогі
За мной, як дынамітныя шнуры.
Пазбавіўшы ад грознага відовішча
Свет, не дазволю я, каб дым і пыл
Зямлю launch ператварыў у бамбасховішча,
Мільярд прапісак —у маўклівы прысак,
Мільярд калысак — у мільярд магіл.

# Білет № 17

**1. Творчая спадчына Цёткі. Рэвалюцьшна-публіцыстычны пафас творчасці («Вера беларуса», «Мора», «Суседзям у няволі», «Прысяга над крывавымі разорамі»)**

> Бедны той, хто апрача грошы, апрача багацця, каторае пры першым жа няшчасці счэзне дазвання, не мае скарбаў вечных — скарбаў душы. Такі скарб, каторы ніхто і ніколі адабраць ад нас не здолее, гэта любоў да бацькаўшчыны, да свайго народу, да роднай мовы...
>
> *Цётка*

Акрэсленыя і сфармуляваныя Цёткай найперш для сябе самой «скарбы вечныя» вызначылі і яе творчасць, і жыццё як жыццё асобы моцнай, выключнай, незвычайнай. Паэтэса-рэвалюцыянерка, публіцыст, празаік, асветніца, настаўніца, аўтар «Першай чытанкі для дзетак-беларусаў», рэдактар, вучоны, медыцынскі работнік— такую дачку беларускаму народу падарыла эпоха рэвалюцыйных бітваў. Гэты бурлівы час стаў для яе зорным.

Усё кароткае жыццё Цёткі — яркі прыклад адданага служэння народу. Атрымаўшы выдатную адукацыю (спачатку ў Пецярбургу, пасля на філасофскім факультэце ў Львоўскім універсітэце і нарэшце на гуманітарным аддзяленні Ягелонскага універсітэта ў Кракаве), яна цалкам і без астатку прысвяціла свае веды і жыццё народу. Яна спалучала дар палітыка-рэвалюцыянера (адна з заснавальнікаў партыі Беларускай сацыялістычнай грамады) з дарам рэдактара (заснавальніца і рэдактар першага беларускага часопіса для дзяцей і моладзі «Лучынка»), З тэатрам Буйніцкага аб'ехала ўсю Беларусь, выконвала многія ролі ў спектаклях. Калі Радзіма палыхала агнём першай сусветнай вайны, Цётка стала сястрой міласэрнасці. Выдатнай падзвіжніцы, аўтару зборнікаў «Скрипка беларуская» і «Хрэст на свабоду» В. Коўтун прысвяціла раман «Крыж міласэрнасці». Сімвалічная яго назва: да самага апошняга дыхания (у тыфозным салдацкім бараку ў Вільні працавала сястрой міласэрнасці) Цётка мужна несла крыж міласэрнасці і любові да свайго народа.

Увабраўшы ў творчасць лепшыя традыцыі свайго папярэдніка Ф. Багушэвіча (пра што сведчыць нават назва яе зборніка — «Скрыпка беларуская»), Цётка пайшла далей за настаўніка. Пафас рэва-

люцыйнай барацьбы цалкам захапіў паэтку і вызначыў ідэйную накіраванасць і мастацкія асаблівасці яе творчасці.

Тэма рэвалюцыі, тэма барацьбы з самаўладствам — асноўная ў паэзіі Цёткі. «Одна, но пламенная страсть» валодала ёю — рэвалюцыя. Толькі ў ёй яна бачыла адзіны шлях да збавення свайго змучанага няволяй народа. Рэвалюцыйная стыхія адлюстравана Цёткай рамантычнымі сродкамі. У вершы «Мора», напісаным у самы разгар барацьбы народа з самаўладствам, рэвалюцыя паўстае ў алегарычным вобразе мора:

Мора вуглем цяпер стала,
Мора з дна цяпер гарыць,
Мора скалы пазрывала,
Мора хоча горы змыць.

Анафарай і алітэрацыяй (гукавы паўтор, асабліва гука «р») дасягаецца эфект разгулу стыхіі і выключная рытмічнасць. Гэта своеасаблівы гімн рэвалюцыі, якая паказана пафасна, рамантычна:

Такі бой вякамі жджэцца,
Такі бой гігантаў дасць,
Ў такім баю толькі грэцца,
У такім баю толькі пасць.

У барацьбе з самаўладствам Цётка абяцае перамогу, і падмуркам, залогам таму — яе вера ў свой народ. Як і рэвалюцыйная стыхія, ён выпісаны ёю рамантычнымі сродкамі ў вершы «Вера беларуса»:

...Мы — не з гіпсу, мы — з камення,
Мы — з жалеза, мы — са сталі.
Нас каваліу пламенні,
Каб мацнейшымі мы сталі,
Цяпер, братцы, мы з граніту,
Душа наша з дынаміту,
Рука цвёрда, грудзь акута,
Пара, братцы, парваць путы!

Метафарычна, вобразна і палымяна выяўляе яна сваю веру ў тое, што «людзьмі станем»:

Веру, братцы: людзьмі станем,
Хутка скончыммы свой сон,
На свет божы шырэй глянем,
Век напіша нам закон.

У вершы «Суседзям у няволі» выявіўся не толькі патрыятызм і паэтычны дар Цёткі, але і яе дар палітыка, усведамленне ёю інтэрнацыянальнага характару барацьбы з самаўладствам. Цётка даводзіць, што перамога будзе забяспечана агульнымі намаганнямі

ўсіх вязняў «турмы народаў». Цётка звяртаецца да братніх народаў, якія таксама пакутуюць у няволі, з заклікам да аб'яднання ў святой барацьбе за свабоду:

Мы вам родны. Праўду знайце:
Ці у долі, ці ў нядолі —
З вамі станем ўадным полі,
Рука ў руку з нашым братом,
За свабоду перад катам.

Верш, напісаны ў форме звароту і адрасаваны братнім народам, гучыць як баявая прысяга. Эмацыянальнасць верша дасягаецца і шматлікімі паўторамі, многія з якіх анафарычныя (паўторы слоў з пачатку радкоў):

Ад сваіх хат, ад сваіх ніў,
Ад ўсіх братоў, хто толькі жыў
Нясу слязу, нясуя стогн,
Нясу нагаек царскіх звон.
У нас там ноч, у нас там стук,
Мы ацямнелі з страшных мук,
З нас пот ліецца, сохнуць грудзі.
Наскатуюць! Чуйце людзі!
Чуйце, чуйце, руку дайце!

Не менш празорлівым палітыкам паўстае перад намі Цётка і ў апавяданні «Прысяга над крывавымі разорамі». І ў гэтым творы яна выступае прапагандыстам ідэі аб'яднання і салідарнасці як абавязковай умовы перамогі ў барацьбе. Асноўным прыёмам выяўлення ідэі з'яўляецца сімвал. Сімвалаў у апавяданні шмат. Сімвалічны ўвесь сон Мацея, які і складае змест апавядання. Хворы, змардаваны Мацей прыйшоў араць, бо больш няма каму. Але знясілены, ён «як стаяў, так і лёг, так і заснуў».

Тры скрыжаваныя далоні — сімвал саюза рабочых, сялян і салдат (адзін сын Мацея — парабак, другі — салдат, трэці — пецярбургскі рабочы). Толькі калі ўсе аб'яднаюцца, стануць і сілай, і правам, змогуць даць народу зямлю і волю. Беларускі народ задыхаўся ад беззямелля. Трагедыя народа, што не быў гаспадаром на сваёй зямлі, выяўляецца праз рэфрэн: «Вузка! Цесна! Мала!» Праз рэфрэн выяўляецца і Цётчына ўсведамленне еднасці як сілы, якая здольна змяніць становішча народа: «Мы — сіла! Мы — права!» Сыны Мацея становяцца на калені і прысягаюць гэтымі словамі, скрыжаваўшы далоні над разорамі. Толькі праз адну дэталь («разоры стаяць, поўныя крыві») Цётка прарочa папярэджвае, што шлях да волі будзе крывавы. Але толькі ён адзіна правільны, бо, ідучы па ім, дойдзеш да

сілы і права. І зноў дэталь: «І раздаецца ціха ясны голас: «Мы— сіла! Мы— права!» Тымі ж словамі раней прысягалі «громка, ясна, паволі». А ў канцы апавядання — голас «раздаецца ціха». Ён ідзе быццам з неба...

Невялічкае памерам апавяданне ўвабрала ў сябе так многа! Талент Цёткі-празаіка, на жаль, да канца не рэалізаваўся з-за яе ранняй смерці. Але і тое, што яна паспела напісаць, уражвае і сваёй мастацкасцю, вобразнасцю, гарманічным спалучэннем умоўнага і рэальнага, і глыбінёй падтэксту, выяўленай праз дэталь.

Асаблівага ўздзеяння на душы чытачоў дасягае Цётка сваімі апавяданнямі пра дзяцей, паказваючы трагедыю народа праз трагедыю і пакуты дзіцяці. Апавяданне «Міхаська» не толькі рэалістычнае і трагічнае, пранізлівае, але і глыбока псіхалагічнае, тонкае. І папераджальнае. У ім пераканаўча паказана тое, што вынішчае душу, і тое, што здольна яе адрадзіць. Вынішчаюцца душы людской чэрствасцю, жорсткасцю, абыякавасцю, а лечацца — любоўю і міласэрнасцю. Цётка папярэджвае, што гора чакае тых, хто сее зло і нялюдскасць. Нагадаем, што азвярэласць Міхаські стала ўжо небяспечнай для ўсіх. Усё жывое, намі адрынутае, рана ці позна стане нашым ворагам, сцвярджае Цётка-філосаф.

Значнасць зробленага ёю для свайго народа Цётка вызначыла вычарпальна і афарыстычна: «Стану песняй у народзе!» І песня тая — бунтоўная, аптымістычная і адначасова пранізлівая, шчырая і светлая.

## 2. Васіль Дзяцел і Ганна Чарнушка як мастацкія тыпы ў рамане Івана Мележа «Людзі на балоце»

...Развеяўся настрой паганы,
Каліны зноў цвітуць мае.
І свеціць мне усмешка Ганны,
Любоў яе і боль яе.
Зямля бацькоўская, святая,
Так, гэта мы. Увесь народ...
Мне ў сэрца бусел залятае
З трывожных прыпяцкіх бал от.

*П. Панчанка*

Над вымыслом слезами обольюсь...

*А. Пушкін*

Так бывае: сіла ўздзеяння таленавітага твора такая вялікая, што чытач страчвае ўсведамленне прачытанага як факта мастацтва і ўспрымае літаратурнага героя як канкрэтнага чалавека, якога

палюбіў, як блізкага, як роднага, як самога сябе. І не можа змірыцца з воляй аўтара, бо трагедыю героя ўспрымае як трагедыю рэальнага і блізкага яму чалавека.

І забываецца чытач на тое, што ў мастацтве дзейнічаюць свае законы, часам непадуладныя нават самаму таленавітаму мастаку. Што законы мастацтва, як пра тое даводзіць не раз В.Быкаў, і законы жыцця нярэдка не супадаюць. «Больш таго, яны амаль заўсёды ў супрацьстаянні», па словах пісьменніка.

Правіла, закон жыцця такі: калі наканавана дваім сустрэцца на жыццёвай дарозе і зведаць каханне, то яны, як дзве палавінкі, павінны спалучыцца ў адно цэлае, усвядоміўшы, што ўзнагароджаны найвялікшым дарам, здрада якому — вялікі грэх. Бываюць і выключэнні з правіла: сустрэліся дзве палавінкі, але ці то не ўсвядомілі сустрэчу як падарунак лесу, ці то сіла абставін аказалася мацнейшай за сілу дару — і тады трагедыя. Але ж то — трагедыя чалавека.

Лягчэй за ўсё Мележу-чалавеку было б «ашчаслівіць» свайго чытача, дагадзіць яму і «спалучыць две палавінкі», якія, безумоўна, заслугоўвалі шчасця і былі вартыя адна другой. Аднак Мележ-творца не мог адступіць ад праўды жыцця і пераступіць законы мастацтва. У творцы была задача паказаць не толькі трагедыю чалавека, а трагедыю народа ў адзін з самых крытычных момантаў нацыянальнай гісторыі. Пісьменнік выявіў свой светапогляд, сваё разумение ўсяго, што спрычынілася з нашым народам у час «карэннага пералому» і ў выніку яго, найперш праз вобразы Васіля і Ганны.

У гэтых вобразах увасоблены не толькі характар беларуса, а яго менталітэт. А паняцце ментальнасці намнога шырэйшае за паняцце характару. Менталітэт — гэта своеасаблівы спосаб мыслення, склад розуму асобнага чалавека ці супольнасці людзей. Элементаў менталітэту любой нацыі вялікае мноства. Спынімся на некаторых, а найперш на вызначальным — на ўсведамленні каштоўнасцей, якія для чалавека і нацыі з'яўляюцца першаснымі, прыярытэтнымі.

Для беларуса такой каштоўнасцю з'яўляецца (хочацца спадзявацца, што ўсё яшчэ з'яўляецца) зямля. І ўдакладнім: зямля не толькі як тэрыторыя жыцця, але (тое засведчана навукоўцамі, даследчыкамі, творцамі ў «адбітку родных з'яў») і як «промень волі і свабоды», як «аснова ўсёй айчыне». Мару пра зямлю і яе саму Міхал з «Новай зямлі» «апісваў фарбамі паэта».

«Одной лишь думы власть» ведаў Васіль Дзяцел. Хай ён і не апісвае яе фарбамі паэта, але гаварыць пра яе не менш палка і малітоўна. «Каб той кавалачак зямлі, што за цагельняй!», — дзеліцца ён з Ганнай сваёй самай запаветнай марай. І ён бы ўжо на ёй шчыраваў, ён бы

ўжо на ёй разгарнуўся! Яна б не была ў яго недаіледжанай і няўдаліцай.

Ментальнасць чалавека і нацыі вызначаецца і шляхамі, якімі яны ідуць да акрэсленай каштоўнасці, і сродкамі, якімі дамагаюцца яе. Беларускі шлях — праца, нястомная праца, нечалавечыя высілкі— і ўсё дзеля яе, зямелькі-карміцелькі, бо яна адна «не зменіць і не здрадзіць», «яна дзяцей тваіх не кіне»... З непрыхаванай сімпатыяй і захапленнем апісвае І. Мележ свайго любімага героя ў час касьбы, прычым апісвае сапраўды фарбамі паэта, а не празаіка. Менавіта старонкі, прысвечаныя Васілю-працаўніку і куранёўскай прыгажуні Ганне («Як тая рабіна цвіла ў тое лета Ганна!»), — старонкі, на якіх Мележ-празаік уступае месца Мележу-паэту. Як зямля — аснова ўсёй айчыне, так праца на ёй — аснова жыцця, жыцця годнага, людскага. У працы выяўляецца ўся сіла і прыгажосць чалавека, рэалізуюцца лепшыя яго якасці і талент, бо працавітасць — сама па сабе ёсць талент чалавека і сведчанне яго жыццястойкасці, нязломнасці, цягавітасці.

Але адной працы на гэтай зямлі, каб авалодаць ёю і праз яе — воляй, мала. Як казаў коласаўскі герой, «тут грошы, грошы трэба». А іх няма. Змены ў жыцці, новую ўладу Васіль Дзяцел успрымае як падарунак лесу: нарэшце здзейсніцца! Але не збылося... Новыя падзеі і абставіны патрабуюць ад яго таго, што яму чужое і дзікае. Ён далёкі ад мітусні і калатнечы, якая ўсчалася навокал. Ён хоча проста жыць і працаваць на сваёй зямлі. Васіль шчыра паверыў, што савецкая ўлада прыйшла, каб даць зямлю і волю такім, як ён, спадзяваўся, што ўсё будзе па справядлівасці. Першае працверажэнне адбылося, калі пасядзеў у турме. Канчаткова пазбавіўся ілюзій, калі арганізаваўся калгас. Але гэта было пасля. Да гэтага лёс паставіў яго перад выбарам: жыць з каханай, адмовіцца ад сваёй мары пра зямлю ці Маніна пасажная зямля як крок да здзяйснення мары.

Васіль — моцная, выключная, незвычайная асоба, на сіле і незвычайнасці якой неаднаразова акцэнтуе ўвагу чытача пісьменнік. Васіль рана асірацеў і ўжо ў падлеткавым узросце ўзяў на сябе клопат і адказнасць за ўсю сям'ю, узваліў такую ношу, якую не кожны мужчына адужае. Ён жа цярпліва нёс свой крыж, цвёрда засвоіўшы галоўны ўрок жыцця: цярпі, трывай, хочаш прысесці ад стомы — ідзі, а прысеў— устань і ідзі! Злучнасць пісьменніка са сваім героем настолькі моцная, што ў чытача страчваецца ўсведамленне: выяўленне пачуццяў Васіля ў час касьбы — гэта аўтарская характарыстыка ці ўнутраны маналог героя? Мележ — майстар дэталі. Дэталі ў партрэце Васіля таксама «працуюць» на яго выключнасць. Так, Ганна, прыз-

наючыся ў каханні да Васіля, кажа яму, што ёй люба ў ім усё: «...валасы неаднолькавыя: ззаду цёмныя, а спераду, як у рабога цяляці, і вочы не адзінакія... Адно, як вада светлае, другое, як жалудок».

Вось такое незвычайнае прызнанне ў каханні, але колькі ў ім шчырасці, чысціні і мудрасці: прыгожае ўсё тое, што любае і дарагое.

У жыцці героя была вясна з камянямі на дарозе, якія «губяць сілы маладыя», было і «лета-песня, лета-свята», што перайначыла ўсё ў душы Васіля. Акрамя аднаго: не ўтаймавала ў яго душы неадольнага жадання «разжыцца новай доляй». А новую долю магла даць яму толькі ўласная зямля.

Прычына трагедыі нязбытнага кахання Васіля і Ганны многімі чытычамі ўсведамляецца як віна і здрада Васіля свайму пачуццю. Чытачы лічаць, што герой не вытрымлівае выпрабавання каханнем і выяўляе слабасць сваёй душы. Аднак модная, незвычайная асоба вызначаецца да ўсяго яшчэ і здольнасцю «пераступіць» цераз важнае і дарагое ў імя яшчэ больш дарагога, свядома зрабіць свой выбар паміж дарагім і яшчэ даражэйшым. І ў гэтым выбары выяўляецца не здрадлівасць Васіля, не яго слабасць, а, як ні парадаксальна, яго сіла. Усведамляе гэта і Ганна, робячы таксама свой крок. Не выбар, не, бо выбару ў яе якраз і не было, калі не лічыць таго, што зусім не выходзіць замуж. Ганну як моцную асобу таксама вызначае акрэсленасць каштоўнасці ў яе ўяўленні: такой каштоўнасцю для яе было каханне да Васіля. І не довады мачыхі пра выгоды шлюбу з Яўхімам, не напамін пра абавязак перад бацькамі паўплывалі на яе рашэнне даць згоду на шлюб з нялюбым. Ганарліўка і прыгажуня Ганна да ўсяго была яшчэ вельмі мудрай. Яна ведала, што няшчасныя дзеці не бываюць надзейным апірышчам для сваіх бацькоў, якім бы матэрыяльным багаццем дзеці ні валодалі. Малітва бацькоў— падмурак сям'і іх дзяцей, даводзіцца ў Бібліі і нагадваецца, што малітва — гэта не толькі словы, а найперш пабожныя справы. Шчасце дзяцей — трывалы падмурак спакойнай, дагледжанай старасці бацькоў. Доўга ўгаворвала мачыха Ганну, але згоды ад яе дамаглася, калі пацэліла ў самае сэрца. Ганна згадзілася, бо зразумела: Васіль яе не возьме.

Выбар Васіля — не здрада Ганне і каханню да яе, а вернасць сваёй мэце. Спалучыць жа адно з другім было немагчыма. Спалучыць ці зрабіць іншы выбар мог нехта іншы, але не Васіль.

Крытыкі і многія чытачы лічаць, што ў Васіля некалькі разоў была магчымасць выправіць сваю «памылку». Свядомы крок памылкай не з'яўляецца! Так, Ганна некалькі разоў угаворвае яго кінуць усё і

пачаць жыццё спачатку, пераконвае яго, што разам яны ўсё адолеюць...

У вобразе Ганны не толькі ўвасоблены пісьменніцкі ідэал жанчыны, услаўлена беларуская жанчына, але і паказана жаночая ментальнасць. Ёсць ментальнасць мужчынская і ментальнасць жаночая. Жаночая выяўляецца ў імкненні і гатоўнасці віць сваё гняздо з каханым чалавекам, быць ахоўніцай сямейнага ачага, ісці за каханым, як нітка за іголкай. І ў тым сіла жанчыны, яе прыгажосць і прызначэнне. Такая — Ганна.

Ментальнасць мужчынская (адвеку так было ў нашым народзе!)— быць адказным за звітае гняздо, якія б матывы ні ляжалі ў яго падмурку. Права выбару сваёй палавінкі належала мужчыне, але адказнасць таксама лажылася менавіта на яго. У ментальнасці нашага народа — клопат пра дзяцей. Здрада сям'і, развал яе, асірацелыя дзеці-бязбацькавічы пры жывых бацьках — неадпушчоны грэх. Усведамленне яго было падмуркам векавой народнай маралі.

Лёс Васіля надзвычай трагічны. Мары яго не суджана было здзейсніцца: на ўсякую сілу ёсць другая сіла! Тое, што рабілася ў калгасах, — не Васілёва. Здаровы розум і жыццёвая мудрасць гаварылі яму (таму такі неспакой у душы, такі ўнутраны злом), што гэта дабром не кончыцца, што ў такіх калгасах гаспадаром быць немагчыма. Тое, дзеля чаго ён пераступіў, ахвяраваў сваім «летам-песняй, летам-святам», ніштчылася на вачах. Жыць інакш ён таксама не можа, бо на шляху да іншага, другога, хай сабе і не такога, пра якое марылася, жыцця, ёсць тое, пераступіць цераз што ён не можа, бо яно — святыня, роўная зямлі і жаданню быць на ёй гаспадаром. Гэта святыня — дзіця. Нават ад нялюбай, вечна соннай Мані, але яго роднае дзіця! Ён нават у думках не дапускае, што яго сын будзе бязбацькавічам.

Так праз вобраз Васіля І. Мележ паказвае трагедию нашага народа ў часы «карэннага пералому» і нагадвае пра тыя каштоўнасці, на якіх трымалася наша зямля, доўжылася жыццё. Ментальнасць чалавека і нацыі пад уплывай часу і падзей можа змяняцца: адны яе элементы слабеюць і нават знікаюць, другія ж — наадварот, з'яўляюцца. Трылогія Мележа запрашае нас спыніцца і азірнуцца, падумаць і ўзважыць: ці варты знікнення тыя каштоўнасці, якія лічыліся нашымі продкамі першаснымі і святымі? Што будзе з намі, калі мы адрынем гэтыя каштоўнасці і святыні?

І. Мележ марыў напісаць пенталогію «Палескай хронікі», але планам яго не суджана было здзейсніцца. Паводле задумы аўтара, Васіль Дзяцел павінен быў прыйсці да здзяйснення подзвігу ў гады

вайны. І гэта было б не фантазіяй пісьменніка, а сведчаннем глыбокага псіхалагізму яго творчасці. Абараніць сваю зямлю, сваё гняздо, сваё каханне, сваё дзіця можа толькі той, хто моцна любіць і сваю зямлю, і блізкіх і дарагіх яму людзей. Любіць так, як Васіль Дзяцел.

### 3. Прачытаць на памяць верш з інтымнай лірыкі

**Прызнанне**
Як я жыў без цябе?
І не ведаў, што недзе на свеце,
За гаухімі лясамі, за сотнямі ўзгоркаў і меж,
Не на дальнім сузор'і, а ў нас, на планеце,
Ты ў зялёным і ціхім завулку жывеш.
Як я жыў без цябе?
А маглі ж не сустрэцца ніколі,
За паўкрока адно аднаго абмінуць,
Разысціся, як сцежкі расходзяцца ў полі,
І не знаў бы, за страту каго папракнуць.
Мабыць, трэба было правалiцца у пекла,
Траціць блізкіх, пакутаваць, мерзнуць, гарэць,

Ратавацца, каб лютая сцюжа не ссекла,
Каб цябе пад Палярнаю зоркай сустрэць
І пазнаць, і адразу забыцца аб крыўдзе,
Каб праменьчыкі ўбачыць у зрэнках тваіх,
Нарадзіцца ізноў і паверыць, што прыйдзе
І збавенне, і шчасце адно на дваіх.
Падабрэць, памякчэць, назаўсёды скарыцца
Непадкупнай суровай тваёй чысціні,
Каб істоты тваёй адкрываць таямніцы,
Каб душу гартаваць на высокім агні.
Час ляціць і ляціць. Завіруха завеяла скроні,
Пакідаюць насечкі гады на ілбе.
Я гляджу на цябе, я дзіўлюся і сёння,
Чым я жыў без цябе, як я жыў без цябе.
*С. Грахоўскі*

* * *
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Там заблудзімся ў хмельных травах.

Пачынаецца ўсё з любві,
Нават самая простая ява.
І тады душой не крыві
На дарозе жыцця шырокай.
Пачынаецца ўсё з любві —
Першы поспех і першыя крокі.
Прыручаюцца салаўі
Там, дзе выбеглі ўдаль канавы.
Пачынаецца ўсё з любві —
Адчужэнне, і боль, і нянавісць.
Ты пакліч мяне. Пазаві.
Сто дарог за маімі плячыма.
Пачынаецца ўсё з любві.
А інакш і жыць немагчыма.
*Я. Янішчыц*

**Раманс**
Зорка Венера ўзышла над зямлёю,
Светлыя згадкі з сабой прывяла...
Помніш, калі я спаткаўся з табою,
Зорка Венера ўзышла.
З гэтай пары я пачаў углядацца
Ў неба начное і зорку шукаў.

Ціхім каханнем к табе разгарацца
З гэтай пары я пачаў.
Але расстацца нам час наступае;
Пэўна, ўжо доля такая у нас.
Моцна кахаў я цябе, дарагая,
Але расстацца нам час.
Буду ў далёкім краю я нудзіцца,
Ў сэрцы любоў затаіўшы сваю;
Кожную ночку на зорку дзівіцца
Буду ў далёкім краю.
Глянь іншы раз на яе — у расстанні
Там мы зліём з ёй пагляды свае...
Каб хоць на міг уваскрэсла каханне,
Глянь іншыраз наяе...
*М. Багдановіч*

# Білет № 18

## 1. Жыццёвы і творчы шлях Максіма Багдановіча. Грамадзянскі і патрыятычны пафас творчасці паэта

Мы табой ганарымся — і плачам,
Мы нясём цябе ў сэрцы праз дым.
Нізка голаў схіляю, юнача,
Перад вечным глаголам тваім.
*У. Караткевіч*

«Усяго 25 свечак адпала на зямным бяседным стале Максіма Багдановіча. Калі ў маі 1917 г. пагасла апошняя, тоненькая і пахілая, побач не было ні сваякоў, ні сяброў, і выпадковыя людзі, якія паклалі ў камяністую крымскую зямлю высушанае туберкулёзам маладое цела, не здагадваліся нават, што хавалі аднаго з найвыдатнейшых беларускіх паэтаў, аднаго з самых любімых сыноў нацыі», — так пісаў Г. Бураўкін у артыкуле «І жыве сёння з намі...» пра страту, якая напаткала беларускі народ у маі 1917 г.

Якою ж «высокаю красою» трэба было валодаць, якую мець сілу і мужнасць, каб незадоўга да смерці ў сваім апошнім вершы так несамотна і светла сказаць пра зробленае ім для «краіны-бранaчкі», для свайго народа:

Ў краіне светлай, дзе яўміраю,
У белым доме ля сіняй бухты,
Я не самотны, я кнігу маю
З друкарні пана Марціна Кухты.

Кніга «з друкарні пана Марціна Кухты», — адзіны прыжыццёвы зборнік «Вянок» (1913). Засталіся рукапісы яго твораў з папраўкамі, дапрацоўкамі. Паэт рыхтаваў да выдання яшчэ тры зборнікі. «Узяў я карандаш, палавіну вершаў выкасаваў зусім, другую палавіну прабую абшадзіць. Дадам за гэтай другой палавіны лепшыя з вершаў 1912-1915 гг., і выйдзе зборнік «Маладзік» або «Красавік»... Выйдзе яшчэ адзін зборнічак — «Пярсцёнак». А з вершаў апошняга часу і трэці — «Шыпшына». «Выкасоўваў» адны радкі, «абгладжваў» другія, бо ведаў, што не мае права на слабы верш, бо па кожным яго творы будуць меркаваць пра здольнасць беларускай мовы расказаць пра свой народ, які выйдзе абавязкова на шлях самаўсведамлення і адраджэння, які дачакаецца «залацістага, яснага дня». Тыя Багдановічавы праўкі — узор таго, як «трэба з сталі каваць, гартаваць гібкі верш, абрабіць яго трэба з цярпеннем».

Зборнік вершаў Багдановіча на рускай мове называецца «Зеленя», што ў перакладзе на нашу мову азначае «ўсходы», «рунь». Ён сваім «гарачым словам рунь узняў на роднай зямлі», як вобразна сказаў пра спадчыну Багдановіча У. Караткевіч. А кожнай хвілінай свайго такога кароткага і такога яркага жыцця пакінуў нам нямы папрок і дакор, што не спраўдзілі яго надзей. Некаторыя з нас, жывучы на зямлі сваіх продкаў, так і не змаглі авалодаць іх мовай... І ўжо адным гэтым не выключылі магчымасць весці ганебныя і абразлівыя для любой нацыі спрэчкі, ці патрэбна наогул яна нам, тая мова, бо, можа, «ёй зікнуць пара»!

Ён жа, народжаны ў Менску, асірацелы ў Гродне, вывезены пяцігадовым з Беларусі, на доўгія гады адарваны ад роднай зямлі, ад матчынай мовы і бабуліных казак, вырашыў «авалодаць роднай мовай сваіх продкаў і авалодаць так, каб пісаць прыгожыя вершы і абагаціць гэтую мову новымі мастацкімі формамі», як пра тое напісана ў зборніку ўспамінаў і біяграфічных матэрыялаў пра М.Багдановіча «Шлях паэта». І вучыўся М.Багдановіч у Ніжнім Ноўгарадзе (1902-1908) іЯраслаўлі (1908-1916). Бацька паэта Адам Ягоравіч, пісьменнік, вучоны, ва ўспамінах пра сына пісаў, што ў сям'і нават размаўлялі па-руску, але звычаі, захапленні былі беларускія. Казкі і песні бацькоўскага краю, трапныя народныя прыказкі і прымаўкі жывілі паэтычную душу Максіма і настолькі захапілі яго, што ў гады вучобы ў Яраслаўскім юрыдычным ліцэі ён арганізуе і вядзе сярод ліцэістаў гурток вывучэння беларускага фальклору. Беларускую мову ён вывучыў самастойна, яшчэ калі вучыўся ў Ніжагародскай мужчынскай гімназіі. Асабліва цікавіўся гісторыяй і этнаграфіяй Беларусі, а пад уздзеяннемтвораўЯ. Купалы, Я. Лучыны, Я. Коласа, Цёткі, Ф. Багушэвіча, В. Дуніна-Марцінкевіча і сам пачынае пісаць на роднай мове.

У 1907 г. у «Нашай ніве» з'явіўся яго першы твор — лірычнае апавяданне «Музыка», галоўнай праблемай якога з'яўляецца праблема прызначэння мастака ў грамадстве і сцвярджэнне ролі духоўнага ў жыцці народа.

Эвалюцыя ўсведамлення паэтам духоўнасці дасягае свайго афарыстычнага выяўлення ў словах: «Нашто каласы, калі няма васількоў?» («Апокрыф»).

Роля біблейскіх рэмінісцэнцый у «Апокрыфе» надзвычай разнастайная — ад апоры на аўтарытэт «Бібліі» і яе ідэю, што «не хлебам адзіным жыве чалавек», да прытчавасці як асноўнага мастацкага сродку. Але галоўнае — гэта стварэнне мнагазначнасці, вобразнасці і напаўненне яе філасофскім зместам.

Модным было перакананне М. Багдановіча, што народ, які не ўсведамляе ролі духоўнага ў сваім жыцці і грэбуе духоўным, пазбаўлены будучыні, бо ўрэшце страчвае і матэрыяльнае, і духоўнае. У «Апокрыфе» гэтая вечная біблейская ісціна напоўнена нацыянальным зместам: «І хадзіў ён (Бог) па ўсяму нашаму краю: і па Міншчыне, і па Віцебшчыне, і па Магілёўшчыне, і па Задзвінскай зямлі...» М. Багдановіч усведамляў, што калі не вырашаць праблему духоўнасці, то праблематычным стане само існаванне нашай нацыі. Васількі ў «Апокрыфе» — сімвал духоўнасці наогул і мастацтва ў прыватнасці.

Вялікую надзею ў фарміраванні духоўнасці народа М. Багдановіч ускладаў на творцаў, песняроў. Нават сімвалічна, што самы першы яго твор — пра ролю музыкі і сілу яго дару.

Верш «Песняру», напісаны ў форме звароту і шчырай, даверлівай размовы з таварышамі па пяры. Гэта своеасаблівы наказ і напамін пра тое, што матывам дзейнасці творцы павінна быць не прага славы, не спадзеў яго на тое, што «напісанае застанецца» і зробіць яго неўміручым, а імкненне ўздзейнічаць на сэрцы людзей, высечы «іскры з халодных каменняў»:

Ведай, брат малады, што ў грудзях у людзей
Сэрцы цвёрдыя, быццам з камення.
Разаб 'ецца аб іх слабы верш заўсягды,
Незбудзіўшы святога сумлення.

Збудзіць святое сумленне, дапамагчы свайму народу парваць «духа путы», каб «ясны дзень да нас» наблізіўся, зможа толькі той пясняр, даводзіць Багдановіч, які не толькі клапоціцца пра тэхніку свайго «гібкага верша», але ўсяго сябе без астатку гатовы прысвяціць народу. Верш «Бывав, вада перапоўніць...» кранае нас не толькі лірызмам і адлюстраванай у ім асабістай трагедыяй паэта: «Я гэткі: пяю я з надтрэснутым сэрцам, апошні свой скарб аддаю». Верш здзіўляе і захапляе як факт мастацтва. У ім выявілася адметнасць стылю паэта М. Багдановіча: асацыятыўнасць, схільнасць да філасофскіх абагульненняў праз вобразы і біблейскія рэмінісцэнцыі.

М. Багдановіч параўноўвае творцаў са стаўкамі. Адзін ставок перапаўняецца вадой, і калі «з яго выбежыць лішак, дык далей вада не бяжыць». Калі ж вада прарве плаціну — «сохне няшчасны ставок», бо з яго выбеглі «апошнія хвалі».

З паэтамі так жа бывае:
Адзін дае людзям ізлішкі,
Другі ўсё, што мае.

Прыгадаем біблейскую прытчу пра ахвяраванні на Храм багацеем і няшчаснай удавой. Павучаючы сваіх вучняў, Ісус Хрыстос даводзіў,

што намнога большым было ахвяраванне ўдавы, бо яна аддала апошняе, што мела, а багацей — лішняе з таго, што меў...

Без астатку ўсяго сябе і «апошні свой скарб» прысвяціў Багдановіч «краіне-бранячцы» і свайму народу. У 1916 г. пасля заканчэння Яраслаўскага юрыдычнага ліцэя, стоячы на ростанях, ён выбірае для сябе шлях не чыноўніка, а слугі народа. Яшчэ ў выніку першай паездкі паэта на Радзіму ў 1911 г. ім быў напісаны цыкл вершаў «Старая Беларусь».

Яго паэзія і нарадзілася з імкнення служыць народу. Звяртаючыся да яго ў вершы «Народ, Беларускі Народ!», паэт пісаў:

Табою ўсягды пагарджалі,
Цябе не пушчалі з ярма
І душу тваю абакралі, —
У ёй нават мовы няма.

Ён даказаў, што беларуская культура «не монстр, не рарытэт, не унікум», а глыбока жыццёвая з'ява, што на беларускай мове можна выказваць самыя высакародныя пачуцці. Яна прыдатная і для такіх «вытанчаных» паэтычных жанраў, як санет, трыялет, рандо, тэрцыны. У вершах «Летапісец», «Кніга», «Перапісчык» нагадвае ўсім пра тое, што беларусы адыгралі значную ролю ў развіцці культуры ўсяго ўсходняга славянства.

Вершы пра родны край, сэнс жыцця і самае святое пачуццё — любоў да Радзімы — «Слуцкія ткачыхі», «Мяжы», «Як Базыль у паходзе канаў...», «Пагоня». Вершы «Зімой», «Добрай ночы, зара-заранiца!», «Панад белым пухам вішняў...», «Зімовая дарога» — пра непаўторную прыгажосць родныў краявідаў. Асананс і алітэрацыю паэт лічыў найбольш тонкімі сродкамі паэтычнага ўздзеяння. У яго вершах мы чуем раскаты грому, чуем, як «у бубны дахаў вецер б'е», чуем скрып снегу, пошум лесу. Хораша выяўляецца ў паэтычных радках звонкае і плаўнае гучанне беларускага слова, таму так добра кладуцца вершы паэта на музыку. Эпітэты і параўнанні ў яго творах даюць нам магчымасць і самім убачыць заснежаную прастору, убачыць поле, што «нікне ў срэбным тумане», снег, што «блішчыць, як халодная сталь», дарожкі, што «ўюцца змейкай срабрыстай», «маркотныя месяца рожкі», што «праз марозную мглу зіхацяць»...

Метафары ў творах Багдановіча выяўляюць эмацыянальны стан лірычнага героя і яго думкі. Бомы не толькі сумна гудуць, але і «запяваюць аб долі і волі, навяваюць у сэрцы спакой»; «а за сцяной смяецца поле», «і думкі мкнуцца мімаволі»...

Верай у свой народ, яго лепшую долю прасякнуты вершы «Беларусь, твой народ дачакаецца...», «Санет». Кампазіцыя санета

«Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...», выкарыстаныя ў ім параўнанне народа з жыватворнай крыніцай, асацыятыўныя сувязі паміж падзеяй, што моцна ўразіла лірычнага героя, і загадкавасцю народа, —усё спрыяе выяўленню філасофскай думкі і веры паэта ў будучыню народа. Паэт верыць, што дух народны «бясплодна не засне, а ўперад рынецца, маўляў, крыніца...», што духоўнае адраджэнне народа — гэта толькі пытанне часу, як і перамога дабра над злом.

«І прад высокаю красою» паэзіі М.Багдановіча, у якой выяўлена і апета самае дастойнае пачуццё — каханне, схіляемся і мы. Палоніць нашу душу і эпічнае, як у «Вераніцы», і лірычнае, як у рамансе «Зорка Венера ўзышла над зямлёю...», выяўленне самоты па нязбытным каханні і адначасова ўдзячнасці лесу, за тое, што яно было ў жыцці, што сустрэў свой «вечны цэль» — свой ідэал. Мы ведаем, што ў гэтых вершах і трагедыя самога паэта, што гэта яго ўласны помнік свайму трагічнаму і адначасова шчасліваму каханню:

І прад высокаю красою,
Увесь зачараваны ёй,
Скланіўся я душой маёй,
Натхнёнай, радаснай такою,
А ў сэрцы хораша было,
Там запалілася цяпло.

Выключна ўсе вершы паэта глыбока філасофскія, непараўнаныя па сіле абагульнення і мастацкасці выяўлення думак. Аднак адзін з апошніх яго твораў «Страцімлебедзь» асабліва ўражвае глыбінёй філасофскай думкі і трывожным паэтавым усведамленнем. Усведамленнем таго, што ў часы катаклізмаў, войн, эпідэмій, стыхійных бедстваў гінуць (і ў тым найпершая трагедыя народаў) самыя лепшыя, самыя гордыя, самыя таленавітыя, самыя любімыя — вынішчаецца генафонд нацыі. Вынішчаецца яшчэ і таму, што самыя дужыя першымі прымаюць на сябе ўдар, устаюць, як вобразна сказаў У. Караткевіч у вершы «Багдановічу», «на лютую сечу, бітву вечную сонца і хмар, узваліўшы на юныя плечы Святагораў народны цяжар». Выяўленню філасофскай думкі верша спрыяе зноў жа біблейская рэмінісцэнцыя на ўзроўні сюжэта пра сусветны патоп і Ноеў каўчэг, а таксама кампазіцыйна выдзеленая паэтам выснова:

Ад усіх цяпер патомкі ёсць,
Ды няма адных — Страцімавых.

«Усхвалявана, глухаватым голасам» чытаў паэт Змітраку Бядулю, які жыў з ім у адным доме ў Ялце, куды, шукаючы паратунку, паехаў «бальны, бесскрыдлаты паэт», толькі што напісаны верш. «Надломаным тонам» прагаварыў ён канцоўку, замяніўшы слова «Страцімавых»

на «Максімавых»... Так, «не вынеслі жылы напругі: знік ты, лебедзь, у хвалях сівых», загінуў «за другі», за мяне, за вас і за ўсіх...».

Максімавымі патомкамі, калі заслужым, зможам звацца ўсе мы. І ён вернецца да нас не толькі ў выдатным помніку С.Вакара непадалёку ад дома, дзе нарадзіўся паэт. Прыгожы і малады, «вечна светлы і вечна дужы, вечна юны, як наша зямля». Калі заслужым, ён вернецца ў нашы душы.

### 2. Беларуская веска ў часы калектывізацыі ў рамане Івана Мележа «Людзі на балоце»

А на Палессі ўсё нядробна:
Цяжкая спадчына вякоў,
Цяжкія рукі хлебаробаў,
Цяжкія сны палешукоў.
Якую трэба мець адданасць
І сэрца сынава, каб так
Любіць палескі край туманны
І маці бедны андарак.

*П. Панчанка*

Чалавек вялікую ласку мае і да маці сваёй, і да таго месца, дзе нарадзіўся, нават калі тое месца «богам забытае і людзьмі праклятае», ад свету адарванае. «Бацьку, маці, бацькаўскай зямлі» прысвяціў Іван Мележ сваю запаветную песню — раман «Людзі на балоце». «Палескі край туманны» апеты ў той песні з любоўю, памножанай на талент, чым і вызначаецца сіла яго ўздзеяння на нашы душы. У нашай багатай беларускай літаратуры няма другога такога твора, які па энцыклапедычнасці выяўлення ў ім нацыянальнага, так набліжаўся б да «Новай зямлі». І ў «Палескай хроніцы» паказана ментальнасць нашага народа, яго звычаі і традыцыі, яго быт і памкненні, думы і пачуцці ў адзін з пераломных момантаў гісторыі. Паказана, з якімі набыткамі людзі на балоце да яго прыйшлі, чым тыя набыткі памножылі і што страцілі.

То панарамна, то «буйным планам», партрэтна выпісаны мастаком народ і асобныя постаці. Курані і куранёўцы (а на іх вобразах увесь народ у часы калектывізацыі) паказаны І.Мележам у лепшых традыцыях нашай літаратуры — рэалістычна. Народ у рамане такі, як пра яго трапна і афарыстычна сказаў яшчэ Тарас: «Былі паны, было і зброду, як часам і на свеце ў нас». Не «часам», а заўсёды; народ — ён розны. Былі такія, як Васіль Дзяцел, на якіх трымалася і трымаецца наша зямля, якія з прыходам новага звязвалі свае надзеі, што можна

будзе працаваць на сваёй зямлі і стаць нарэшце гаспадаром на гэтай новай зямлі.

Былі і такія, як Зайчык, якіх прывабіла магчымасць працаваць яшчэ менш, хоць, здавалася б, як яшчэ менш? Прыгадаем той трагікамічны эпізод у творы, калі Міканор, шчыра ўзяўшыся за навядзенне новага ладу і парадку, абураўся страшэнным брудам у Зайчыкавай хаце і тымі «антысанітарнымі ўмовамі», у якіх Зайчыкавы недагледжаныя дзеці елі з парасятамі з аднаго карыта. І справядлівым было тое абурэнне, бо якую ўладу трэба чакаць, каб вычысціць бруд ва ўласнай хаце і вынесці смецце на сметнік. А Зайчыку — ні бяды: «Го! Яшчэ невядома, каго лепш даглядаць! Дзяцей вунь колькі, а парасят усяго двое!» І смех і грэх, як кажуць. Зайчыкам не прыйшлося пакутаваць ад абагулення лепшага на вёсцы стаенніка — такога ў іх не было. З непрытоенай радасцю такія зайчыкі чакалі моманту завалодаць суседскім. Вось яна магчымасць рэалізаваць стоеную раней зайздрасць! З уласцівым Мележу майстэрствам рэаліста і псіхолага засведчана і тое, як пад уздзеяннем часу і падзей змяняўся менталітэт народа, фарміравалася, на жаль, і не лепшае.

Час «карэннага пералому» стаў зорным для Міканора, бо рэалізаваў яго прыродныя задаткі: схільнасць да лідэрства, актыўнасць, неўтаймоўную энергію, неабыякавасць да ўсяго, што вакол яго, жаданне змяніць усё да лепшага, павесці за сабой людзей, быць для іх прыкладам. Усё новае ён убірае ў сябе, як губка, не асабліва разважаючы, ці да лепшага ўсё тое новае. Ён не вагаецца і не хістаецца. Нецярпімы да тых, хто, як яму здаецца, «не бачыць далей свайго носа». Абураецца, калі ў адказ на сваю палкасць і шчырае жаданне дабра сустракае недаверлівасць і абыякавасць да тых ідэй, якімі хоча зацікавіць усіх куранёўцаў. Вычарпальную характарыстыку Міканору пісьменнік дае праз рэпліку Сарокі: «Кеб не выбраць халеру — гарачы не ў меру».

Стрыманасць, абачлівасць, насцярожанасць да ўсяго новага, недаверлівасць нават, пачуццё меры ва ўсім, здаровы розум, вера толькі справам, а не словам — гэта таксама элементы нашай ментальнасці. Вякамі, як мудра і справядліва пра тое думае Апейка, фарміраваліся гэтыя якасці народа. Міканор жа не хоча з гэтым лічыцца. Супярэчлівым і нават вераломным у прамым сэнсе гэтага слова паказаны пісьменнікам характар Міканора. Гэта тыповы вобраз актывіста. Дзеля новага ён пераступае цераз веру сваіх бацькоў, абражае іх рэлігійныя пачуцці, патрабуе вынесці з хаты абразы, а ў рамане «Подых навальніцы» паказана, як ён наладжвае спектакль з разбурэннем гумна^ пачынаючы з уласнага. Пра супярэчлівасць

гэтага вобраза яскрава сведчыць і неадназначнае стаўленне да яго і крытыкі, і чытачоў. Па-рознаму «прачытваецца» гэты вобраз. Адны ўсведамляюць яго як сумленне куранёўцаў і вернага слугу савецкай улады. Другія бачаць у дзеяннях і ініцыятывах Міканора больш шкоды і для людзей, і нават для самой улады, даводзячы, што менавіта такія, як Міканор, тую ўладу і дыскрэдытавалі.

Антыподам вобраза Міканора з'яўляецца вобраз Апейкі, у якім, безумоўна, увасоблены пісьменніцкі ідэал кіраўніка. І зусім не схематычным, а канкрэтным, прывабным з'яўляецца гэты вобраз, у якім увасоблены лепшыя якасці сапраўднага кіраўніка: разуменне душы простага чалавека, яго псіхалогіі, любоў і павага да яго працы. Апейка выдатна разумеў, што Дзяцел зусім не вораг новай уладзе, а падмурак яе, калі яна сапраўды дэмакратычная, бо на такіх працаўніках зямля стаіць, а значыць, і любая ўлада. Пераканаўча і глыбока рэалістычна паказана ў «Палескай хроніцы», як паступова інтэлігентны, чулы і сумленны чалавек, якім быў Апейка, становіцца ахвярай жудаснай машыны таталітарызму, бо слугаваў не машыне, а людзям.

Яшчэ адным антыподам вобраза Міканора з'яўляецца Хоня, хоць апынуліся яны, як кажуць, на адным баку барыкады. Гэтым вобразам пісьменнік славіць людскасць у чалавеку, яго здольнасць зразумець і дапамагчы бліжняму канкрэтнай справай, спагадлівым словам. Нельга не здзіўляцца выхаванасці, далікатнасці і тактоўнасці простага, малаадукаванага куранёўскага юнака, з якой ён дапамагае Хадосьцы вярнуцца да жыцця. Урокі чалавечнасці і дабрыні дае нам пісьменнік гэтым вобразам.

Унутранае хараство, духоўнае багацце беларускай дзяўчыны ўслаўлена ў незабыўным і яркім вобразе «канапляначкі» Хадоські. Псіхалагічна тонка і пранізліва паказвае пісьменнік сілу, што здольна вылечыць параненую душу, здольна ўтрымаць, уратаваць чалавека ад таго, што паправіць ужо было б немагчыма. Сіла тая — любоў да жывога, да прыроды, дзяцей, вера, што жыве ў душы чалавека, з якім спрычынілася бяда. Любоў і вера ўратуе чалавека ад непапраўнага, а таксама падтрымка і спагада бліжняга. Гэтым вобразам пісьменнік дае нам урокі аптымізму і духоўнай прыгажосці, якая, як вядома, толькі адна і здольна ўратаваць свет.

І тугадум Пракоп Лясун, які гаворыць з такім намаганнем, «нібы воз сена падымае»; і балбатлівая (але якая ж дасціпная і таленавітая!) Сарока, што не толькі назапасіла ў сабе народныя «залацінкі» і сыпле імі як гарохам, але і сама іх стварае, так і стракочучы ў рыфму («Бегла, баялася спазніцца, а прыбегла— адна мая спадніца!»); і

пыхлівы, упэўнены ў сваёй выключнасці (а таму ўсё лепшае і прыгажэйшае павінна належаць толькі яму!)Яўхімз яго кучаравым чубам; і стары Глушак з яго хітрасцю, сквапнасцю і двухаблічнасцю; і кніжнік Андрэй Руды з яго цягай да ведаў; і Ганніна мачыха, карыслівая і абмежаваная; іГаннін бацька з яго шчымлівым болем за дачку, што вымушана ісці за нялюбага; і Дубадзел з яго нялюдскай, як ён сам, мовай, — усё гэта людзі на балоце, людзі зямлі беларускай. Сапраўдны вянок з незабыўных, яркіх вобразаў, створаных талентам пісьменніка і выпісаных ім як жывыя. Вымеш хоць адну кветку з гэтага вянка — і распляцецца, рассыплецца вянок. А ў аснове таго вянка — куранёўская прыгажуня Ганна і самы першы працаўнік на вёсцы, дбайны гаспадар, апора ўсёй сям'і Васіль. Трагічна склаўся іх лёс, нязбытным было і каханне. Як і трагічным быў лёс усяго народа ў той вірлівы час...

Людзі на балоце жылі, бедавалі, кахалі, радаваліся і плакалі, адчайваліся і верылі, будавалі грэблю, што нарэшце звязала іх са светам, і вучыліся жыць калгасам, чаго да гэтага не ведалі. іх продкі і чаго нідзе яшчэ ў свеце не было; спявалі новыя, прывезеныя Міканорам песні, а навальніца ўжо набліжалася. Подых яе ўжо адчуваўся ў прыродзе...

**3. Прачытаць на памяць верш «Санет» («Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі...») Максіма Багдановіча**

Паміж пяскоў Егіпецкай зямлі,
Над хвалямі сінеючага Ніла,
Ўжо колькі тысяч год стаіць магіла:
Ў гаршку насення жменю там знайшлі.
Хоць зернейкі засохлымі былі,
Усё ж такі жыццёвая іх сіла
Збудзілася і буйна ўскаласіла
Парой вясенняй збожжа на раллі.
Вось сімвал твой, забыты краю родны!
Зварушаны нарэшце дух народны,
Я верую, бясплодна не засне,
А ўперад рынецца, маўляў крыніца,
Каторая магутна, гучна мкне,
Здалеўшы з глебы на прастор прабіцца.

# Білет № 19

## 1. Жаночыя вобразы ў трылогіі Якуба Коласа «На ростанях»

На беларускую дзяўчыну,
Калі тут праўду ёй аддаць,
Ніхто йшчэ каменем не кінуў
І не наважыцца кідаць.

*Янка Купала*

Адно з назначэнняў жаночых вобразаў у трылогіі «На ростанях» класічнае: рэалістычнае адлюстраванне жыцця немагчыма без найпрыгажэйшых кветак — жанчын. Якубам Коласам наогул створана цэлая галерэя жаночых партрэтаў незвычайнай прывабнасці, хараства і сілы ўздзеяння на чытача. Большасці жаночых вобразаў пясняр даў імя сваёй маці. Прыгадаем Ганну з «Новай зямлі». Гэта, без перабольшання сказаць, самы гарманічны, самы эстэтычны вобраз жанчыны ў беларускай літаратуры, у якім увасоблены пісьменніцкі ідэал жанчыны-маці, жонкі, сябра, дарадчыка, ахоўніцы сямейнага ачага і духоўнасці сям'і. Вобраз Ганны з паэмы «Сымон-музыка» — сімвалічны вобраз Беларусі, вобраз прошчы, што дае сілы свайму дзіцяці, што здольна нават вярнуць да жыцця.

У вобразе Ядвісі з трылогіі «На ростанях» таксама ўвасоблены пісьменніцкі ідэал дзяўчыны — беларускай дзяўчыны, на якую сапраўды «ніхто йшчэ каменем не кінуў», бо беларускія дзяўчаты славіліся на толькі знешнім хараством, але і лепшымі якасцямі, уласцівымі нашаму народу: працавітасцю, мудрасцю, разважлівасцю, дабрынёй, жыццястойкасцю і, безумоўна, цнатлівасцю. Менавіта ў абмалёўцы вобраза Ядвісі яскрава выявіўся дар Коласа-філосафа. Ствараючы ёй фон вобразамі панны Людмілы і панны Марыны, прыгажосць якіх бачыцца нам вачамі Лабановіча, пісьменнік сцвярджае глыбока філасофскую думку, што знешняя прыгажосць толькі тады сапраўдная прыгажосць, калі яна «падсвечваецца» ўнутранай — багаццем душы і «мнагалучнасцю» натуры. А калі за знешняй прыгажосцю, «гэтай дзявочай шыльдай», няма духоўнасці, шчырасці і непасрэднасці, то самая бездакорная прыгажуня гасне побач з Ядвісяй.

Галоўнае ж назначэнне вобраза Ядвісі заключаецца ў тым, што каханнем і адносінамі да каханай выпрабоўваецца галоўны герой — Лабановіч. Гэта таксама класічны прыём у сусветнай літаратуры. Пісьменнік правёў свайго героя праз многія выпрабаванні. Але, бадай, найбольшага эстэтычнага ўздзеяння дасягнуў гэтым вобразам, калі выявіў да ўсяго яшчэ і здольнасць свайго героя ўбачыць не толькі

знешнюю, але і ўнутраную прыгажосць. Знешнюю пісьменнік назваў «дзявочай шыльдай»: «Адлучыўшы ад Марыны хараство, гэту дзявочую шыльду, ад яе засталося б мала, тады як Ядвіся была натура больш мнагалучная, больш жывая...» Знешнюю прыгажосць здольны ўбачыць усе, а ўнутраную — толькі відушчыя сэрцам. Існуе справядлівая думка, што мужчына выпрабоўваецца адносінамі да жанчыны. Коласаўскі герой з годнасцю вытрымлівае гэтае выпрабаванне.

Чыстыя і ўзнёслыя былі пачуцці Лабановіча да сваёй каханай, вочы якой гаварылі яму ўсё пра стан яе душы. Вочы яе смяяліся, а ў іх малады настаўнік чытаў сапраўдную драму душы тонкай, далікатнай, якая пакутуе ад нечага такога, пра што і расказаць нельга.

Вобраз Ядвісі напоўнены глыбокім філасофскім сэнсам. Чытач, уражаны сілай пачуцця (прычым пачуцця ўзаемнага), не можа змірыцца з воляй аўтара, які разлучыў «дзве палавіны», бо каханне ўзаемнае, чыстае і адначасова нязбытнае — трагедыя. Шчасце ж было так блізка, так магчыма, двое так гарманічна падыходзілі адно аднаму — чаму ж не збылося? Чаму Ядвіся так раптоўна паехала? Якой атруты, што была на дне келіха з жаданым для яе напіткам, яна так баялася і таму не захацела выпіць яго да дна?

Трагедыяй гэтага светлага і прыгожага кахання, вобразам Ядвісі пісьменнік нагадвае нам пра адзін з вечных законаў жыцця: за грахі бацькоў расплачваюцца іх дзеці. Адмоўны вопыт, урокі жорсткасці, бесчалавечнасці, набытыя чалавекам у сям'і, могуць не лепшым чынам паўплываць на яго душу, псіхіку і скалечыць усё яго далейшае жыццё. Забываюцца людзі пра тое, што зло, да якога яны спрычыніліся, абавязкова да іх жа і вернецца, толькі патрапіць у самае балючае і святое для іх. Вопыт Ядвісі, набыты ва ўласнай сям'і, скалечыў яе лёс. Бацька без пары звёў у магілу маці Ядвісі. Яна са скрухай адказала Лабановічу на камплімент, што ў яе маці таксама былі прыгожыя валасы, толькі доля нешчаслівая. На яе вачах бацька жорстка здзекаваўся з мачыхі, а на людзях быў прыгожым, абаяльным, з вытанчанымі манерамі. І ніхто, акрамя Ядвісі і бабкі Мар'і, якой даверыла сваю горкую тайну мачыха дзяўчыны, нават і не здагадваўся, якая драма разыгрываецца ў сям'і пана падлоўчага. Але нават бабка Мар'я з яе мудрасцю і шчырым жаданнем дабра маладым не магла і падумаць, што не якія-небудзь іншыя непаразуменні, а страх Ядвісі перад «атрутай» стаў прычынай трагічнага разрыву. Страх «атруты» — страх расчаравання: а што калі і за шыльдай знешняй інтэлігентнасці, прывабнасці Лабановіча хаваецца жорсткасць і бесчалавечнасць?

Ядвіся робіць свядомы выбар: лепш светлы ўспамін і светлая самота па нязбытным каханні, чым горыч і боль расчаравання, што для любога чалавека заўсёды трагедыя, бо рушацца надзеі. За сваю жорсткасць і двухаблічнасць пан падлоўчы заплаціў шчасцем дачкі, бо невядома, як складзецца лёс такой тонкай і багатай натуры, як Ядвіся. Падмурак шчасця ў доме дзяцей — справы бацькоў. А справы бацькоў былі такімі, што пасеялі недавер да ўсяго добрага ў душах дзяцей і жаданне як мага хутчэй вырвацца з дому, дзе не мір і згода пануюць, а дзе чалавек зніштчае бліжняга свайго.

Вельмі настойлівы пісьменнік-філосаф у сваім перакананні, што бацькі адказныя перад дзецьмі за свае добрыя і злыя справы, за свае грахі. У другой кнізе ён зноў звяртаецца да гэтай праблемы і вырашае яе праз вобраз старожкі Ганны, маладой яшчэ, але вельмі непрыгожай абліччам жанчыны. Знешнасць яе таксама бачыцца вачамі Лабановіча, які ўспрыняў выродлівасць няшчаснай жанчыны як «праклён за грахі бацькоў сваіх»: маленькія вочісі і бязносы твар былі «сапраўдным няшчасцем жанчыны». У яе абліччы — усе выявы спадчыннага сіфілісу. З яе нядолі нярэдка скарысталіся бяздушныя людзі. Ганна не магла заступіцца за сябе, а больш не было каму. Яна зацяжарала ад настаўніка, які працаваў у гэтай школе да Лабановіча, і жыла ў вялікім страху, што новы настаўнік прагоніць яе са школы, пазбавіць працы, а значыць, і кавалка хлеба. Якім жа вялікім было яе здзіўленне і бязмерная ўдзячнасць, калі не толькі не звольніў, а выплаціў ёй грошы за ўсе летнія месяцы, чаго ніколі не было раней. Папярэднік Лабановіча заўсёды забіраў гэтыя капейкі сабе, адбіраў, як у народзе кажуць, у жабрака апошняе.

Здавалася б, нічога асаблівага ва ўчынку Лабановіча няма, бо ён зрабіў толькі тое, што павінен рабіць кожны, і так, як трэба, па-людску. Але, на жаль, у жыцці не заўсёды так бывае. Пісьменнік, рэалістычна паказваючы жыццё, выпрабоўваў свайго галоўнага героя чалавечнасцю, здольнасцю паспагадаць няшчаснаму, дапамагчы ў бядзе, стварыў яму фон з вобразаў, што ўвасабляюць бесчалавечнасць, абыякавасць да пакут іншых.

Назначэнне вобраза старожкі Ганны — не толькі паказаць трагічны лёс жанчыны, бяспраўнае яе становішча, але і ўславіць чалавечнасць Лабановіча, яго адданасць народу, здольнасць на канкрэтныя справы для канкрэтнага чалавека. Любіць усё чалавецтва могуць усе, дапамагчы няшчаснаму, прыніжанаму, абдзеленаму, помніць заўсёды «пра лёс разуты», як вобразна сказаў Р. Барадулін, здольны не кожны.

У вобразе бабкі Мар'і славіцца мудрасць народа, яго духоўнае багацце і прыгажосць. Галоўнымі мастацкімі прыёмамі стварэння

вобраза з'яўляюцда дыялог і выпрабаванне гераіні адносінамі да іншых людзей, найперш, да Лабановіча. У адказе бабкі Мар'і на пытанне настаўніка, дзеля чаго чалавек жыве на свеце, не «абмежавана-прымітыўны», як лічаць некаторыя крытыкі, погляд «на стан рэчаў», а глыбокая мудрасць, бо на гэтае пытанне не далі адказу самыя дасканалыя філосафы за ўсю гісторыю існавання чалавецтва. Магчыма, сапраўды, сэнс жыцця — у ім самім, як шчасце — гэта само па сабе жыццё, якім бы нялёгкім і пакутлівым яно ні было. І сэнс жыцця кожны вызначае па-свойму. І не ў словах выяўляецца па-сапраўднаму чалавечае ўсведамленне сэнсу жыцця, а найперш у справах. Справы бабкі Мар'і якраз і выяўляюць яе ўласнае ўсведамленне сэнсу жыцця: паспагадаць, паспрыяць, дапамагчы чалавеку, калі таму кепска, умець радавацца прыгожаму і людскаму і не пускаць у сваю душу нялюдскае, злое. Так жыве бабка Мар'я. І хіба гэтага мала?

Выжыць у тых умовах і застацца чалавекам, жыць у добрай згодзе са сваім сумленнем і з людзьмі здольны мудры, моцны і прыгожы, а не з «прымітыўна-абмежаванымі поглядамі» чалавек. Свае адносіны да таго ці іншага героя чытач вывярае адносінамі Лабановіча да яго. Адносіны ж Лабановіча да бабкі Мар'і не проста паважлівыя — ён любіць і захапляецца сілай і духоўнай прыгажосцю гэтай простай, неадукаванай жанчыны. А для нас адносіны Лабановіча яшчэ і прыклад таго, як уважліва і паважліва трэба ставіцца да людзей.

Паказваючы шлях інтэлігенцыі ў рэвалюцыю, сцвярджаючы думку аб адзінстве лесу народа і інтэлігенцыі, Якуб Колас дасягае пераканаўчасці і праз вобраз Вольгі Віктараўны Андросавай. Гэта таксама тыповы вобраз новай жанчыны, якая пад уздзеяннем рэвалюцыйных падзей адчула ў сабе сілу, каб не толькі змяніць сваё жыццё, але і павесці за сабой іншых. «Многарэвалюцыйнага запалу ў гэтай смутай дзяўчыны», «гараць яе вочы», калі яна даводзіць Лабановічу, што царскаму ўраду ў руска-японскай вайне трэба жадаць паражэння, а не перамогі, бо паражэнне царызму паслабіць яго і паскорыць рэвалюцыйныя працэсы.

Безумоўна, гэты вобраз таксама неадназначны. Прываблівае энергія, незакамплексаванасць, шчырасць і непасрэднасць Вольгі Віктараўны. Бескампраміснасць, нецярпімасць да не такіх, як у яе, меркаванняў не проста насцярожваюць. Вобраз Вольгі Віктараўны — яркі і пераканаўчы доказ таго, як пад уздзеяннем часу і падзей можа змяняцца жаночая ментальнасць, як знікаюць многія адвечна жаночыя якасці, і найперш сама жаноцкасць. Наступствы гэтых змен

мы ў поўнай меры адчуваем у нашым грамадстве і сёння. Эмансіпацыя жанчын, на жаль, мае і свае адмоўныя выявы.

Перакануаўча, па-мастацку, без маралізавання, не навязваючы сваіх поглядаў, адлюстраваў Якуб Колас «родныя з'явы» ў вызначальныя моманты гісторыі. Каб мы самі думалі і разважалі, адхілялі нялюдскае і ўзбагачалі свае душы прыгожым.

**2. Ідэйны змест паэмы Максіма Танка «Люцыян Таполя». Праблема мастака і мастацтва ў паэме. Увасабленне свабодалюбства, таленавітасці народа ў вобразе Люцыяна Таполі**

...Тут зямля такая!
*Максім Танк*

У Максіма Танка ёсць цудоўны верш «Казка пра Музыку» з фальклорнай рэмінісцэнцыяй на ўзроўні сюжэта.

...Хадзілі мужыкі па свеце ў пошуках шчасця і прыйшлі ў чароўны край азёр і лясоў. Стаміліся, прылегаі адпачыць і прачнуліся ад нейкай дзівоснай музыкі, што лілася немаведама адкуль. Кінуцца ў адзін бок— нідзе нікога, у другі — таксама ні душы.

Адзін кажа: «Можа, гэта здань?»
Другі кажа: «Мо трава спявае?»
Толькі трэці, прылажыўшы вуха,
Кажа: «Браткі! Тут зямля такая!»

Беларуская зямля — краіна талентаў Гістарычна так склалася, што беларусу даводзілі, быццам ён ні да чаго высокага не здатны і можа быць толькі «панам сахі і касы». Сцвярджэнню таленавітасці беларускага народа прысвячаецца многа дасканалых мастацкіх твораў: паэма Янкі Купалы «Курган», Якуба Коласа «Сымон-музыка», аповесць Змітрака Бядулі «Салавей». У шэрагу лепшых твораў пра ролю і прызначэнне мастака і мастацтва — і паэма Танка «Люцыян Таполя».

Заслуга Максіма Танка ў вырашэнні праблемы мастака ў грамадстве заключаецца найперш у наватарстве. Спалучыўшы ў творы рамантычнае і рэалістычнае, паэт раскрывае асноўны канфлікт паміж таленавітым разьбяром Люцыянам Таполем з біскупам Сямашкам, носьбітам зла, на ўзроўні поўнай перамогі творцы над тым, хто замахнуўся на яго творчасць. Біскуп Сямашка ў фігурах і вобразах аформленай Люцыянам Таполем па яго заказе капліцы сярод хімер і гадаў пекла ўбачыў сатану ва ўласным аблічы. Не вытрымаўшы гэтага, Сямашка памірае. Моцная, выключная асоба, надзеленая такім незвычайным дарам, што пад яго рукамі «ажывала нават нежывое, немагчымае рабілася магчымым: гнуўся камень, а з

звычайнай цэглы, быццам з бронзы, паўставалі здані», уступае ў канфлікт з абставінамі і не гіне, як гэтага патрабуюць законы жанру паэмы, а выйграе бітву са злом.

Такое наватарскае вырашэнне канфлікту выяўляе філасофскую думку пра бяссмерце народа, пра сілу мастацтва ў барацьбе за разняволенне.

Сутнасць канфлікту заключаецца ў розных поглядах і стаўленні герояў-антыподаў да мастацтва.

Мастацтва Таполі, «па мянушцы, проста Багароб», было вельмі зямным. Ідэалам Таполі былі людзі працы, з якімі ён звязаны агульным горам і нядоляй. Каханая Тэкля, да якой калісьці сватаўся, мядзельскія плытагоны Сцяпан і Харытон — вось героі яго навагодняй батлейкі, у якой царкоўныя сюжэты паступова выцясняліся сцэнамі з народнага жыцця. Выразаныя Таполем з дрэва апосталы, прарокі і анёлы абуджалі не паслушэнства і пакору, а радасць жыцця, імкненне да волі, пачуццё гордасці за чалавека працы. Гэта быў сапраўдны гімн чалавеку працы, яго духоўнай веліччы і хараству і адначасова дзёрзкі выклік царкве.

Сюжэт у паэме дасягае сваёй кульмінацыі, калі апісваецца, як разгневаны такім «святатацтвам» Таполі біскуп Сямашка прыдумаў кару для разьбяра: «пад страхам пекла і пракляцця цэлых дзесяць год адбыць пакуты і не брацца за сваё майстэрства». Вобразна і асацыятыўна Танк паказвае пакуты мастака, пазбаўленага магчымасці несці «агонь душы і сэрца жар» людзям, рэалізаваць свой талент:

Дзесяць год!
За гэты тэрмін дрэва
Дзесяць раз убор зялёны змяніць,
Дзесяць пакаленняў салаўіных
Выкалыша на сваіх галінах,
Дзесяць залатых кругоў адложыць,
Як пярсцёнкаў каля сарцавіны.
Што тады казаць пра чалавека!

Анафара «дзесяць», клічныя сказы, паралелізмы і асацыятыўныя сувязі са з'явамі ў прыродзе — усё садзейнічае выяўленню сапраўднай драмы чалавека, у якога адабралі галоўнае, чым ён жыў. Але моцная, незвычайная асоба, якой быў Люцыян Таполя, вытрымала і гэтае выпрабаванне. Зведаўшы шмат зямель, пабачыўшы бяды і гора, ён праз дзесяць год вяртаецца ў родныя мясціны. Біскуп Сямашка, не пазнаўшы ў сівым «старцу» праклятага ім дзесяць год таму грэшніка, даручае яму пабудаваць і аформіць капліцу. Не выклік Богу, змагацца з якім — кідаць камяні ў неба, не прага помсты біскупу Сямашку, а

выклік яго цемрашальству, якое замахвалася на сілу і талент народа, надавала моцы творцу.

Праз матыў творчасці таленавітага разьбяра выяўляецца пісьменніцкае ўсведамленне матываў творчасці мастака наогул: «пакінуць пакаленням след жыцця свайго, сваіх пакут, сказ пра мары, пра свае імкненні». На гэты раз Таполя ўжо паказаў у сюжэце і вобразах пекла тыя сілы, што замахваюцца на мары і імкненні народа. Таполя змагаецца з сіламі зла і перамагае.

Легендарным сюжэтам паэмы пра далёкае мінулае, калі царква мела неабмежаваную ўладу над чалавекам, а ад творцы патрабавала выканання сацыяльнага заказу, вобразам Люцыяна Таполі паэт сцвярджае думку пра бяссмерце таленту народа, даводзіць, што народнае мастацтва — сіла, з дапамогай якой можна не толькі змагацца з крыўдзіцелямі, але і перамагаць іх.

Паслядоўны і настойлівы Максім Танк у сваім усведамленні таленавітасці народа. «Казка пра Музыку», гісторыя палескага музыкі Куліка з паэмы «Янук Сяліба», вобраз Дубягі з «Балады пра партызана Дубягу» таксама славяць беларускі народ і сцвярджаюць, што беларуская зямля — край паэтаў, музыкаў, зямля талентаў.

**3. Прачытаць на памяць верш з сучаснай беларускай паэзіі**

* * *

Мы хочам зразумець галактык мову.
А хто мне скажа,
                думае аб чым
Сняжынка ў полі,
                спелы бор сасновы,
Рачулка,
     што прыцмоквае ўначы?
Хто разгадае слёзы шэрай кані?
Хто расшыфруе для маёй душы
Аленя закаханага рыканне
І салаўіны цёхкат у цішы?
Свае званы пагойдваюць азёры.
Звініць гаёў кастрычніцкая медзь...
Мы слухаем маўклівае міжзор'е,
А блізкіх нам не можам зразумець.

*Г. Бураўкін*

# Білет № 20

**1. Жыццёвы і творчы шлях Якуба Коласа. Тэма роднага краю ў яго паэзіі**

...Жыцця адбітак, разважання,
Нязжыты след прасцяцкай долі,
Адвечны водгук праўды, волі.
*Якуб Колас*

Пра тое, кім з'яўляецца Якуб Колас для нашай нацыі і яе духоўнасці, можна гаварыць бясконца і самымі высокімі эпітэтамі, але ўсё створанае ім найперш, бадай, вызначаецца галоўным — разам з неўміручым Купалам, сваім равеснікам і сябрам, ён з'яўляецца заснавальнікам сучаснай беларускай літаратурнай мовы. У створаным ім сабраны неацэнны скарб душы народа і бяссмерце яго — мова, слова роднае адшліфавана ім як каштоўны алмаз, што пад рукой таленавітага творцы стаўся зіхоткім брыльянтам. «Абшарыўшы кішэні сваёй памяці», уклаўшы ў матчыну мову «агонь душы і сэрца жар», ён здолеў паказаць нам узнёслае ў зямным, святое ў будзённым, прыгожае ў звычайным так, як да яго і пасля яго гэтага не здолеў ніхто іншы.

Талент Якуба Коласа выключны і фенаменальны і таму непадуладны ніякаму спасціжэнню розумам, а вось адданасць яго свайму народу і Бацькаўшчыне зусім рэальная, выяўленая ў канкрэтных зямных справах. І жыццё яго — узор і прыклад усім, хто хоча пакінуць добры след пасля сябе, паслугаваць Айчыне незалежна ад таго, якой справе сябе прысвяціў.

Вытокі добрага і злога ў кожным чалавеку — у яго маленстве, у сям'і, дзе ён атрымаў самыя першыя ўрокі людскасці ці, наадварот, жорсткасці і бязладдзя.

Вытокі таленту і адданасці песняра свайму народу, «вобразам мілым роднага краю» — таксама ў яго раніцы жыцця, поўнае ўяўленне пра якую мы атрымалі, прычасціўшыся да нерушу яго слова ў паэме «Новая зямля». Гэты таленавіты твор беларускай літаратуры, справядліва названы «энцыклапедыяй народнага жыцця». Паэма — помнік паэта сваім родным і блізкім, а таксама гімн і слава ўсяму беларускаму народу. У гэтым творы нават імёны прататыпаў і герояў супадаюць. Працавіты і мудры Міхал з яго марай «прыдбаць свой кут, каб з панскіх выпутацца пут» — бацька паэта Міхаіл Казіміравіч Міцкевіч. Ганна, у вобразе якой увасоблены пісьменніцкі ідэал жанчыны-маці і жонкі, — Ганна Юр'еўна, маці песняра, якая нарадзіла яго 3 лістапада 1882 г. у засценку Акінчыцы, што непадалёку ад

Стоўбцаў. А «дзядзька, мілы наш Антоні» — родны брат бацькі. Усё сваё жыццё Антон Казіміравіч прысвяціў сям'і і дзецям брата і за шчырае слугаванне і талент чалавечнасці стаў неўміручым, як і ўсё, створанае яго пляменнікам. Чытаеш паэму і пераконваешся, што каб з маленькага чулага Кастуся, надзеленага, вядома ж, прыродным незвычайным дарам, вырас выразнік дум народных, вялікі пясняр, патрэбны былі да ўсяго яшчэ і асяроддзе, умовы, у якіх панавалі б любоў, лад і згода, што былі вызначальнымі ў сям'і Міцкевічаў. Добрае вырастае толькі на добрай глебе. Толькі тое будзе жыццястойкім, што пастаўлена на трывалым падмурку.

Праз усё жыццё на нялёгкай дарозе з камянямі, «што губяць сілы маладыя» нават, «сонцам свяціла» Якубу Коласу Панямонне. Ва ўспамінах пра «родны кут» і родных, дарагіх яго сэрцу людзей чэрпаў ён сілы, калі шчыраваў на духоўнай ніве, працуючы настаўнікам на Палессі, калі сядзеў у турме. Поўнае ўяўленне пра маладосць і сталасць песняра мы атрымалі, прачытаўшы яго рамантрылогію «На ростанях», бо і галоўны вобраз, і ўся трылогія, як і паэма «Новая зямля», маюць аўтабіяграфічную аснову.

Першы верш Канстанціна Міцкевіча «Наш родны край» быў надрукаваны ў газеце «Наша доля» ў 1906 г. пад псеўданімам Якуб Колас. І назва верша, і псеўданім аўтара былі сімвалічнымі і вызначальнымі для ўсёй творчасці песняра, якую ён, як і сваё жыццё, прысвяціў роднай зямлі і шчыраму на ёй сейбіту — народу.

Тры гады турэмнага зняволення за ўдзел у нелегальным настаўніцкім з'ездзе і рэвалюцыйную дзейнасць не зламалі волю паэта: за турэмнымі кратамі і пачалася праца над паэмамі «Сымон-музыка» і «Новая зямля».

Змест, матывы і вобразы самага першага зборніка паэта «Песні жальбы» (1910) найлепш вызначыць радкамі:

Не пытайце, не прасеце
Светлых песень у мяне,
Бо як песню заспяваю,
Жаль вам душу скалыхне.

Аднак многія вершы і першага, і другога зборніка («Родныя з'явы», 1914) сведчылі пра тое, што ў паэзію прыйшоў не толькі пясняр жальбы, але найперш — пясняр-бунтар. Доказам таму — аднайменны Купалаваму верш «Мужык». Напісаны ён таксама ў форме маналога, але бунтарская сіла коласаўскага мужыка яшчэ большая:

Я — мужык, а гонар маю.
Гнуся, але да пары.
Я маўчу, маўчу, трываю,

Але скора загукаю:
«Стрэльбы, хлопчыкі, бяры!»

У першых паэтычных зборніках выявіўся і выкрывальны дар Коласа-сатырыка. Многія яго вершы («Мікалаю II», «Канстытуцыя») — сапраўды палітычныя памфлеты, у якіх гучыць прысуд антынароднай сутнасці царызму і падманнай імперскай канстытуцыі.

Дасканалым у плане выкарыстання іроніі, сарказму не толькі дзеля выкрыцця зла, а для сцвярджэння сілы народнай з'яўляецца верш «Асадзі назад!».

Жанр сатырычнага куплета, рэфрэн-эпіфара «Асадзі назад!», востры дыялог— усё падначалена галоўнай задуме: паказаць не толькі жальбу беларуса, скаргі яго на гвалт і рабунак, але і яго здольнасць пасмяяцца са сваіх няшчасцяў, падняцца над імі і заявіць пра свае правы. Нідзе няма ходу простаму селяніну, куды б ні паткнуўся — «Асадзі назад!» І ўсё ж, як прызнаецца з горкай іроніяй герой, «два разы на жыцці выйшаў» ён «упярод»:

Узбунтаваўя вёску,
Ой, быў цяжкі год.
Прыязджае прыстаў:
Выхадзі ўпярод!

У форме звароту, выкрывальнага і пафаснага, напісаны верш «Ворагам». Здзеклівае і сатырычна гучыць зваротаксюмаран «дабрадзеі»:

Багачы і панства,
Нашы дабрадзеі!
Мы на суд вас клічам,
Каты вы, зладзеі!

Ідэя верша — у сцвярджэнкі непазбежнасці расплаты за здзекі і злачынствы:

Ўжо даўно вяроўкі
Вас, паны, чакаюць
І па вас асіны
Слёзы праліваюць...

Наколькі гнеўна і бунтоўна гучыць голас паэта, калі ён піша пра крыўдзіцеляў народа, настолькі светла, лірычна і прачула, калі піша пра родны край. Пра шырыню паэтычнага дыяпазону паэта, пра яго бязмежную любоў да Бацькаўшчыны і метафарычнасць яе выяўлення сведчыць адзін з выдатных лірычных вершаў Коласа — «Родныя вобразы», напісаны ў форме звароту сына-патрыёта да маці-радзімы. Змест верша — прызнанне ў бязмежнай любові да мацізямелькі, да яе хараства і багацця. Філасофская думка верша, парадаксальнасць і супярэчлівасць пачуццяў (тое, што М.Лермантаў назваў «странною

любовью») лірычнага героя выяўляецца найперш праз эпітэты і аксюмараны: «сумнай красы», «смутак і радасць», «смутку, жальбы і красы». Захапленне і светлае пачуццё лірычнага героя зліваецца са смуткам; прыгожаму ў душы дысануе трагічнае, бо то «краса без ауладання», як вызначыць пазней паэт прычыну гэтага супярэчлівага пачуцця ў паэме «Новая зямля».

У гэтым жа вершы віруюць пачуцці любові і захаплення разам з тугой і смуткам:

Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што мае сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я
К вам, мае ўзгорачкі раднага поля,
Рэчкі, курганы лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?

Хвалюючая, вобразная лірыка паэта. І ўсё ж па-сапраўднаму выявіўся дар песняра ў эпічным адлюстраванні «родных з'яў». Эпічнасць і рэалізм у спалучэнні з лірычным — вызначальныя адметнасці стылю Коласатворцы. Менавіта схільнасць да эпічнага і рэалістычнага адлюстравання і вялікі да гэтага дар забяспечылі яму славу летапісца жыцця народа на працягу значнага перыяду гісторыі.

Ментальнасцю нашага народа, гісторыяй абумоўлены яго лёс і імкненне да зямлі і волі. Усведамленне нашым народам зямлі як «асновы ўсёй айчыне», як промня «волі і свабоды» знайшлі свой мастацкі «адбітак» у паэме «Новая зямля» — энцыклапедыі жыцця народа. Найбольшая вартасць гэтага твора, што забяспечыла яму ўзровень шэдэўра сусветнай культуры, — мастацкае выяўленне нацыянальнага.

Усведамленне народам і інтэлігенцыяй, што шлях да «новай зямлі» — шлях рэвалюцыйны, засведчана ў самым першым буйным сацыяльна-псіхалагічным празаічным творы беларускай літаратуры — у трылогіі «На ростанях».

Пра тое, як «затраслося, закалацілася Палессе», як на барацьбу з інтэрвенцыяй падняліся «ад стара і да мала», як з печы злезлі нават сямідзесяцігадовыя Талашы, каб вызваляць свой забраны край, засведчана ў аповесці «Дрыгва» (1934). Як выйшлі «на прастор, на шырокі разлог», як крынічным струменем бруіліся маладыя здаровыя сілы, як змагалася наша моладзь, нашы Сцёпкі і Аленкі з балотнай гніллю, як настойліва авалодвалі навукай і неслі яе святло людзям — у аповесці «На прасторах жыцця» (1926). Пясняр ускладаў вялікія надзеі на моладзь. Маладым жыць на гэтых прасторах і засяваць іх дабром,

каб зелянелі рунню палеткі, каб каласіліся потым збажынной, каб вечным быў няспынны рух жыцця.

Беларускай моладзі прысвячае Якуб Колас і адзін з самых сваіх таленавітых твораў— рамантычную паэму «Сымон-музыка», быццам дакляруючы, наказваючы маладым несці свой талент, «агонь душы і сэрца жар» свайму народу

Пра яшчэ адну перажытую нашым народам трагедыю, пра тое, «як раз'ядналі, як адарвалі брата ад брата» і як браты-беларусы набліжалі 17 верасня 1939 г., злучыўшыся нарэшце ў адну сям'ю, расказваецца ў паэме «Рыбакова хата». Толькі нядоўгім было тое мірнае жыццё і кароткім шчасце. І пра гэта — у паэмах «Адплата» і «Суд у лесе». Міралюбны па характары, але даведзены да адчаю беларускі народ мужна бараніў свой край і чалавечую годнасць.

Вершы і паэмы, апавяданні і раманы, аповесці і драмы, рэалістычныя творы і алегарычныя «Казкі жыцця», тонкія, лірычныя вершы і здзекліва-сатырычныя апавяданні на бытавыя і сацыяльна-палітычныя тэмы — выключна ўсе літаратурныя жанры годна прадстаўлены ў творчасці песняра, па-філасофску мудрай і глыбока псіхалагічнай.

Якуб Колас не толькі класік нашай нацыянальнай літаратуры, але і выдатны вучоны, педагог. Доўгі час ён выкладаў методыку роднай мовы і літаратуры ў Белпедтэхнікуме і Белдзяржуніверсітэце. Будучы ўжо знакамітым, ездзіў па гарадах нашай Беларусі і выступаў з лекцыямі на настаўніцкіх курсах. Да гэтага часу не страціла сваёй каштоўнасці першая, ім напісаная «Методыка роднае мовы».

У ноч з 12 на 13 жніўня 1956 г. Якуб Колас пісаў ліст у ЦК КПСС пра тое, што яго моцна трывожыла і хвалявала, — пра стан беларускай мовы ў нашай рэспубліцы. Сэрца яго не вытрымала: ліст так і застаўся недапісаным.

Імем Якуба Коласа названы драматычны тэатр у Віцебску, Інстытут мовазнаўства Акадэміі навук. На адной з цэнтральных плошчаў сталіцы, што носіць яго імя, пастаўлены помнік песняру і яго героям. Але самым лепшым помнікам Коласу будзе, калі мы ўдумліва прачытаем яго кнігі і ўзбагацім сябе іх мудрасцю.

## 2. Сучасная беларуская драматургія, яе тэматыка і асаблівасці (на прыкладзе творчасці двух-трох аўтараў)

Канфлікт — аснова п'есы.
*Кандрат Крапіва*

Драматургія — дасканала распрацаваны род сучаснай літаратуры і найбольш эфектыўны па сіле ўздзеяння, што абумоўлена найперш самой спецыфікай драматычнага твора як факта мастацтва. Прызначаны для пастаноўкі на сцэне, ён вызначаецца маштабнасцю канфлікту, што ляжыць у яго аснове, як пра тое даводзіў яшчэ К. Крапіва. Ды і сама яго бліскучая камедыя «Брама неўміручасці» стала для сучасных драматургаў своеасаблівым праграмным творам, які шмат у чым вызначыў пошукі новых шляхоў і магчымасцей у вырашэнні многіх сацыяльных канфліктаў у грамадстве.

Як ніхто іншы, Крапіва сваёй «Брамай неўміручасці» паказаў неабмежаваныя магчымасці фантастычнага, умоўнага ў рэалістычным адлюстраванні тых праблем у грамадстве, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння. Неверагодным, фантастычным у сатырычнай камедыі К. Крапіва не толькі дасягае выключнай займальнасці (што для камедыйнага жанру немалаважна), алс і стварае звышэкстрэмальную сітуацыю, у якой максімальна дакладна вызначаецца сутнасць кожнага персанажа.

У жыцці ўсе прагнуць неўміручасці, але ўсведамленне яе немагчымасці ўсё ж стрымлівае, утаймоўвае не самыя лепшыя чалавечыя пачуцці і страсці. Фантазія камедыёграфа робіць неўміручасць магчымай і рэальнай для сваіх персанажаў. Вынаходніцтва элексіру неўміручасці прафесарам Дабрыянам стала сітуацыяй, што справакавала герояў на самае ганебнае і выродлівае: неўміручасць — любымі сродкамі! Зло становіцца злом ваяўнічым: караўкіны становяцца яшчэ больш каравымі і бруднымі ў сваім нахабстве і цынізме. Скараспеі канчаткова выспелі для таго, каб, «дапяўшы» вышынь у сваіх кар'ерысцкіх памкненнях, спусціцца з гэтых вышынь і нават лізаць спіну і «лізаць ніжэй» таму, каго ўчора яшчэ і за чалавека не лічылі. Скараспей так цынічна і гаворыць Дабрыяну: «Корпаўся там са сваімі пацукамі і на табе! — вынайшаў нейміручасць!»

Крапіва — бліскучы майстар стварэння камічных сітуацый, прычым такіх сітуацый, якімі дасягаецца кульмінацыя ў развіцці дзеяння, сітуацый, якімі пісьменнік паказвае ўсю бездань чалавечага падзення. Шусцікі і торгалы, якія не могуць спадзявацца на неўміручасць па прычыне свайго маральнага банкруцтва, вырашылі скарыстаць сітуацыю і прадаваць сваю мачу для аналізаў тым, хто па маральных якасцях яшчэ можа і праціснуцца ў вузкую браму неўміручасці, але належнага здароўя не мае. Шусцікі так захапіліся бізнесам, што пачалі гандляваць конскай мачой, бо сваёй ужо не хапала. Канфуз здарыўся, калі Дабрыян у аднаго з моцнай прагай неўміручасці пацікавіўся, «мерын ці біцюг» яго бацька.

— Як мерын?! Мой бацька быў чалавекам!
— А чаму ж тады ў вас мача конская ?
Пра ўздзеянне, уплыў гэтага камедыйнага шэдэўра на развіццё і станаўленне жанру ў сучаснай драматургіі сведчыць і той факт, што пасля яго з'явілася мноства драматычных твораў з фантастычнымі сюжэталй ці элементамі фантастычнага ў рэалістычных: «Мужчына, будзь мужчынам, або Уваскрашэнне Дон Кіхота» М. Матукоўскага, міфалагічная драма А. Вярцінскага «Хачу быць богам, або Гефест — друг Праметэя», п'есы-казкі А. Вольскага «Граф Глінскі-Папялінскі» і «Тры Іваны — тры браты». Фантастычнае, неверагоднае чэрпаецца драматургамі з міфаў, нацыянальнага фальклору, але гэта толькі сродак асэнсавання праблем сучаснасці.
Незвычайнай таленавітасцю і вастрынёй сацыяльных праблем вызначаецца камедыя Мікалая Матукоўскага «Мудрамер». Драматург б'е ў набат, што самае страшнае зло — зло, надзеленае ўладай. Выявы зла бываюць розныя, але асабліва небяспечныя для грамадства «аслы на ваяводстве» — дурні, якія дапялі пэўных вяршынь улады. Пісьменнік сцвярджае, што для нашага ж выратавання неабходна стварыць сацыяльныя бар'еры для дурняў, якія прагнуць улады і могуць яе дасягнуць. Патрэбны «дурамеры», якія беспамылкова вызначалі б інтэлектуальны ўзровень кожнага, хто прагне «вялікага хамута». Вынаходства таленавітага інжынера Мурашкі — мудрамер. Здавалася б, усе могуць цяпер уздыхнуць з палёгкай: нарэшце! Аднак і ў творы гэта толькі завязка. Дзеянні ў п'есе не раз дасягаюць момантаў высокага напружання, аднак заканчваецца камедыя... трагічна, што, здавалася б, супярэчыць усім законам жанру сатырычнай камедыі. У фінале п'есы вынаходнік Мурашка даведзены да адчаю ўсведамленнем таго зла, якое натварыў ён сам сваім мудрамерам. Яго вынаходку скарысталі бюракраты і дурні ва ўладзе, каб яшчэ больш з яго дапамогай умацавацца.
Бюракраты павялічылі і без таго непамерна раздуты штат і адкрываюць ужо «інстытут мудраметрыі», заручыўшыся тым, што мудрамер у іх ужо ёсць. І зараз дурні будуць вымяраць мудрасць іншых! У адчаі Мурашка топіць сваё вынаходства, але з вады ўжо нясуцца гукі гімна «Слаўся!», што азначае геніяльнасць яго вынаходніка. Геніяльнае ў нашым грамадстве сёння пакуль што ў адчаі, бо ваяўнічая шэрасць і дурасць правяць баль.
У камедыі «Мудрамер», як і ў камедыі К. Крапівы «Брама неўміручасці», гратэск спалучаецца з фантастыкай. Ад першага ўражання: «Такога не можа быць!» — чытач непазбежна прыходзіць да высновы: «Такое, на жаль, было ці бывае», бо яму адкрываецца

глыбокі сэнс самых смелых гратэскавых збудаванняў. Пра ўздзеянне традыцый і наватарства К. Крапівы сведчаць многія творы сучасных драматургаў, адзін з іх — трагіфарс У. Сауліча «Сабака з залатым зубам, або Сон начальніка выцвярэзніка», сама назва якога ўказвае на сімбіёз умоўнага і рэальнага ў творы.

Сучасныя драматургі даследуюць сівую мінуўшчыну, паказваюць трагедыю народа ў гады Вялікай Айчыннай вайны і судзяць «усенародным трыбуналам» зло ў розных яго выявах.

І ў драматургии У. Караткевіч заставаўся верным галоўнай тэме сваёй творчасці. Іm напісана многа п'ес: «Кастусь Каліноўскі», «Маці ўрагану». А пра п'есу «Званы Віцебска» сказаў так: «Я напісаў «Барыса Гадунова». Заслуга Караткевіча-драматурга у тым, што, асэнсоўваючы самыя вострыя моманты беларускай гісторыі, рамантычна ўзнаўляючы старонкі мінулага, ён паказвае глыбіннае ў свядомасці народа.

Гістарычнае мінулае даследуюць А. Петрашкевіч («Напісанае застаецца»), Р. Баравікова («Барбара Радзівіл»), З вялікім поспехам на сцэнах Купалаўскага і Тэатра юнага гледача ідуць п'есы А. Дударава «Князь Вітаўт» і «Палачанка».

Шмат твораў напісана і пра Вялікую Айчынную вайну. Трагікамедыя А. Макаёнка «Трибунал» вылучаецца з усіх перш за ўсё сваім наватарствам у адлюстраванні трагічных падзей, мастацкімі сродкамі ўслаўлення мужнасці і патрыятызму нашага народа ў гады вайны. Нязвыклым падаўся многім і жанр твора — трагікамедыя. Здавалася б, парадаксальнае спалучэнне неспалучальнага. Неадназначнае ўспрыманне крытыкай гэтага смелага і наватарскага твора тлумачыцца і сітуацыяй, што складае асноўны змест: «дзеці ледзь не пасадзілі ў пельку свайго бацьку!» Вось гэтым «ледзь» усё і вызначаецца на карысць аўтара, бо ён, як кажуць, не перабраў меры, а гэта і ў мастацтве і ў жыцці вельмі важна. Што да камічнага і яго назначэння ў творы, то зноў жа на карысць аўтара і тое, што самім народам паважаны і любімы такі фальклорны жанр, як лубок — разнавіднасць анекдота, у якім якраз і спалучаецца неспалучальнае: камічнае і трагічнае. Бо ў самім жыцці не раз бывае такое, пра што лепш, чым сам народ і не скажаш: і смех і грэх. Дарэчы, сітуацыя, пакладзеная ў аснову сюжэта, пісьменнікам не выдуманая, а пачутая на кірмашы ў Стоўбцах: дзеці ледзь не ўтапілі свайго бацьку, не ведаючы, што той пайшоў на службу да немцаў па заданні партызан.

Галоўны пафас твора вызначаецца, вядома ж, не словам! «ледзь роднага бацьку не ўтапілі», а ў папярэдніх словах Цярэшкі Калабка: «Ну і патрыётаў я выхаваў!» І гаворыць ён гэта не са скрухай, а з

гордасцю. I не толькі гэтымі словамі, а ўсім творам драматург сцвярджае, што ўсё лепшае ў чалавеку, у тым ліку і святое пачуццё любові да Радзімы, выхоўваецца менавіта ў сям'і. Выхоўваецца найперш ладам і згодай, любоўю бацькоў да дзяцей і адно да аднаго. Наватарскае і выкарыстанне драматургам дыялога ў творы. Класічнае, традыцыйнае назначэнне дыялога ў драматычных творах — найперш раскрыццё і выяўленне канфлікту паміж дабром і злом.

Кампазіцыя п'есы такая, што большасць дыялогаў у ёй — размова бацькі са сваімі дзецьмі па чарзе: кожнага

Цярэшка «правярае», угаворваючы развязаць яго. І перад намі паўстае прыгожы вобраз чалавека-патрыёта, клапатлівага бацькі, добрага і вернага мужа. Мы яшчэ раз пераконваемся ў справядлівасці сцверджання, што любоў да Радзімы выяўляецца найперш у клопаце і любові да сваіх родных: бацькоў — да дзяцей, дзяцей — да бацькоў. Сям'я — падмурак людской супольнасці і выток людскасці.

Заслуга Макаёнка яшчэ і ў тым, што ім у гэтай камедыі створаны надзвычай прывабны нацыянальны тып беларуса з такой яго якасцю, як здольнасць у небяспечныя моманты сцішыцца, нават прыкінуцца недалёкім, някемлівым, каб выжыць, стаіцца, прытупіць пільнасць праціўніка, які ў гэтым нехлямяжым беларусу не бачыць аніякай для сябе небяспекі. Менавіта праз гэтую Цярэшкаву хітрасць і ўзнікае многа камічных сітуацый. Камендант пагардліва кажа: «Ты ест дурань! Ты ест глюпый чэлавек», на што Цярэшка памяркоўна, але з годнасцю адказвае: «Хай сябе і глупый, абы чалавек!» Менавіта дзякуючы гумару драматург дасягае эстэтычнага ўздзеяння вобразам Цярэшкі, сцвярджае праз гэты вобраз думку пра жыццястойкасць беларускага народа. І сапраўды, пакуль чалавек здольны пасмяяцца з сябе, свайго становішча — ён непераможны!

Таленавітым праўдаўжальнікам традыцый Макаёнка менавіта ў выкарыстанні фальклорных рэмінісцэнцый, у спалучэнні трагічнага і камічнага для выяўлення канфліктаў і адлюстравання вельмі вострых праблем у грамадстве з'яўляецца А. Дудараў, творчы дыяпазон якога надзвычай разнастайны. П'есы «Вечар» і «Парог» таксама напісаны паводле народнага лубка. У аснову сюжэта трагікамедыі «Парог» пакладзена папулярная ў народзе гісторыя пра тое, як бацькі хавалі свайго сына-блакунягу і п'яніцу, труп, якога знайшлі вясной. Па знойдзеных у кішэні дакументах міліцыя адшукала яго родных, а сын... з'явіўся на ўласныя памінкі. «Падснежнікам» аказаўся яго дружок-сабутэльнік, што, надзеўшы яго паліто, у якім і былі дакументы «нябожчыка», пайшоў купляць бутэльку, бо было яму мала выпітага. Пайшоў і не вярнуўся. Вось і ўся гісторыя, што выкарыстана

таленавітым драматургам, каб з незвычайнай сілай уздзеяння нагадаць усім нам пра страшэнную бяду нашага грамадства— п'янства.

І заслуга пісьменніка нават не ў канстатацыі зла і не ў папярэджанні, што мы ўжо стаім на парозе, пераступаць які нельга, калі хочам выжыць, а ў мастацкім даследаванні сацыяльных вытокаў п'янства. Вялікай смеласцю і грамадзянскім подзвігам было такое даследаванне, бо зроблена яно не ўчора і не сёння, а тады, калі рабіць высновы пра сацыяльныя вытокі п'янства было небяспечна. Як небяспечна было нават біць трывогу пра наступствы п'янства. Нельга было нават папярэджваць пра бяду грамадства, як гэта зрабіў А. Петрашкевіч п'есай «Трывога» Таму п'еса аж два гады праляжала ў рэдакцыйным стале тэатра, яе ўпершыню паставілі на расійскай сцэне. А калі яна з'явілася ў рэпертуары нацыянальных тэатраў, трывогу біць было ўжо позна, бо бяда не проста прыйшла ў наш дом, а дом запалаў агнём... Да гэтай бяды далучыліся іншыя: наркаманія, СНІД...

Драматычнымі жанрамі наша літаратура асабліва аператыўна, амаль з хуткасцю публіцыстыкі, рэагуе на самыя надзённыя праблемы сучаснасці. І таму менавіта з драматычнымі творамі часцей здараецца так, што адны як бы сыступаюць у дзень, другія з'яўляюцца і жывуць доўга. Самыя ж таленавітыя, напісаныя даўно, зноў вяртаюцца на сцэну і жывуць новым жыццём.

**3. Прачытаць на памяць верш Якуба Коласа (на выбар)**

**Усход сонца**

На усходзе неба грае
Пераліўным блескам,
Сыпле золата над гаем
І над пералескам.

Чуць-чуць дрогне, праліецца
Чырвань на усходзе —
Гэта неба усміхнецца
Людзям і прыродзе.

Смех адказны, смех шчаслівы
Ходзіць на пагорках.
Час світання — час зычлівы...
Гаснуць, нікнуць зоркі.

Шырай, шырай зараніца

Разнімае крылле,
Нібы пожар б'е крыніцай
Там, на небасхіле.

Сноп праменняў, пышна ўзняты,
Сее бляск-чырвонцы —
Гэта неба сцеле шаты
На дарогу сонцу.

Над палямі мрок прарваўся,
Па нізах расплыўся,
Лес туманам заснаваўся,
Луг расой абмыўся.

Агнявыя валаконцы
Ткуцца ў шоўк чырвоны —
Гэта хмаркі ладзяць сонцу
І дзяньку кароны.

Як прыемна пахне збожжа!
А вакол — спакойна!
Эх, як слаўна, як прыгожа,
Хораша, прыстойна!

І сабрала неба фарбы
Колераў дзівосных...
І дзе ёсць такія скарбы
Гожства, суталосся?!

**Родныя вобразы**
Вобразы мілыя роднага краю,
Смутак і радасць мая!
Што маё сэрца да вас парывае?
Чым так прыкованы я
К вам, мае ўзгорачкі роднага поля,
Рэчкі, курганы, лясы,
Поўныя смутку і жальбы нядолі,
Поўныя сумнай красы?
Толькі я лягу і вочы закрыю,
Бачу я вас прад сабой.
Ціха праходзіце вы, як жывыя,

Ззяючы мілай красой.
Чуецца гоман мне спелае нівы,
Ціхая жальба палёў,
Лесу высокага шум-гуд шчаслівы,
Песня магутных дубоў...
Вобразы мілыя, вобразы смутныя,
Родныя вёскі і люд,
Песні цягучыя, песні пакутныя!..
Бачу і чую вас тут.

# Білет № 21

**1. Апавяданні Максіма Гарэцкага ранняга перыяду («Роднае карэнне», «Літоўскі хутарок»)**

Той чалавек шляхетны, які, жывучы на гэтым свеце, слухае адно загады Божыя.

*Я. Баршчэўскі*

Можна прытварыцца на пэўны час кім заўгодна: добрым, шчырым, нават разумным. І толькі інтэлігентным прытварыцца нельга нават на кароткі момант. Паняцце інтэлігентнасці — неадназначнае, філасофскае паняцце. Нехта ўсведамляе яе як адукаванасць і дасведчанасць у многіх ці хоць бы асобных галінах; нехта — як далікатнасць, тактоўнасць і выхаванасць; нехта— як прафесіяналізм і адданасць справе... І кожны мае рацыю, бо элементаў інтэлігентнасці мноства, але ўсе яны аб'яднаны вызначальным — духоўнасцю.

Заслуга Максіма Гарэцкага перад нашым народам найперш у тым, што ён пакінуў пасля сябе духоўную спадчыну, канкрэтызаваць якую можна такімі паняццямі, як інтэлігентная і інтэлектуальная літаратура.

Галоўны герой апавядання «Роднае карэнне» дзед Яхім даводзіць студэнту-медыку Архіпу Лінкевічу: «Помні, што каб другога вызваляць, трэба самаму крэпкім быць». Вечная ісціна: нельга даць другому таго, чым сам не валодаеш. Інтэлігентную літаратуру здольны ствараць толькі інтэлігентны пісьменнік. Гарэцкі і з'яўляецца інтэлігентам у нашай нацыянальнай літаратуры, чым і вызначаецца яго творчасць.

Адно з ранніх апавяданняў М. Гарэцкага «Роднае карэнне» — праграмны і шмат у чым канцэптуальны твор пісьменніка. Гэта своеасаблівы статут інтэлігентнасці і кодэкс інтэлігента.

Студэнт-медык Архіп Лінкевіч «размеркаваў, што доктарам будзе служыць на Беларусі і будзе збіраць матэрыялы аб духоўным жыцці свайго народа» (да ўсяго «за права вучэння» ён зарабляе прыватнымі ўрокамі). Пасля размоў з дзедам Яхімам Архіп прыйшоў да ўсведамлення, што ён пакуль інтэлігент толькі па сваёй сацыяльнай прыналежнасці, але не па сутнасці. Хто ж ён, сапраўдны інтэлігент?

Парадаксальна, што цэнтральная філасофская праблема твора — праблема інтэлігентнасці — вырашаецца не толькі і не ў першую чаргу праз вобраз інтэлігента Архіпа, а праз вобраз дзеда Яхіма. Менавіта ён з'яўляецца выразнікам аўтарскай пазіцыі. Пісьменнік настойлівы ў сваім перакананні, што толькі той чалавек інтэлігентны,

які, жывучы на гэтым свеце, увабраў у сябе духоўную спадчыну народа і таксама, як біблейскі герой, памножыў дадзеныя яму строгім гаспадаром таланты.

Галоўныя прыёмы рэалізацыі філасофіі твора — дыялог паміж маладым і старым, а таксама маналогі Яхіма. Ён здзіўляе Архіпа сваёй мудрасцю: «чаго ён ні раскажа, ні нагаворыць, а ўсё разумна, к толку», «лішняга не нагаворыць».

Яхім дакляруе Архіпу сакрэты вечнасці і неўміручасці, сакрэты памнажэння скарбу, дадзенага строгім гаспадаром і кожнаму з нас.

Першы, самы галоўны і вызначальны, без якога «і навука ніякая не дапаможа, а зможа», калі «карэння нашага роднага» не мець у сабе. Каб «карэнне роднае» не страціць, даводзіць захавальнік вечнасці дзед Яхім, трэба «ў кніжках і ў разумных людзей» пытацца, «як жылі даўней нашы тутэйшыя людзі»,— і будзеш «ведаць, што рабіць трэба». Мудрасць тоесная мудрасці шляхціца Завальні: «Мінулае вучыць нас, як жыць сёння».

«Ніякія думы чорныя не змогуць», даводзіць муцрэц, калі будзе моцнай сувязь з родным карэннем, калі «часцей у роднае гняздзечка» залятаць і чэрпаць там, у гэтай святой прошчы, сілы, якія дапамогуць выстаяць у любыя буры і віхуры. Запаветы дзеда Яхіма не дэкларатыўныя. На яркіх запамінальных і ўражлівых прыкладах ён даводзіць неабвержнасць вечных ісцін, так трапна, мудра і хораша ім сфармуляваных: «Мінуўшчына, як у люстры, праходзіла прад вачамі студэнта ў час Яхімавых апавяданняў аб старыне».

Толькі той можа лічыцца інтэлігентам, даводзіць пісьменнік праз маналогі Яхіма, хто служыць народу, вучыцца ў яго, на якую б вяршыню вучонасці ён ні ўзышоў. Яхім расказвае пра свайго знаёмага пана Беляеўскага з Пецярбурга, які «вучаны многа, кніжкі сам складае, друкуе», а не грэбуе мудрасцю народа. Не лішне, на думку дзеда Яхіма, павучыцца і ў суседзяў: «у палякоў і латышоў» палюдску, бо «радні не адракаюцца, братнюю руку заўсёды дзержаць».

Любоў інтэлігента да Бацькаўшчыны і народа павінна быць дзейснаю. Інтэлігентны не той, хто абураецца непарадкам, а хто наводзіць парадак. «І ведай тады, што адным енкам ды стагнаннямі людскай бядзе не дапаможаш. Помні, што каб другога вызваляць, трэба самаму крэпкім быць».

Надзвычай прывабны і эстэтычны ў апавяданні і вобраз юнака Архіпа. Ён пакуль што ў той «апаслівай пары», як трапна назваў Яхім маладосць. «Апаслівая» гэта пара, бо на дарозе маладых будзе не толькі шмат камянёў (з імі якраз лягчэй справіцца!), але і спакусаў, будзе абавязкова на іх шляху і балотная вада... Пісьменнік здолеў

няхітрым сюжэтам паказаць гэты вобраз у эвалюцыі. Сюжэт уяўляе апісанне вандроўкі Архіпа дадому, каб разабрацца з гэтай «чартаўнёй» і дапамагчы родным набыць спакой, і вяртанне зноў на вучобу. Пакуль што Архіп толькі назапашвае духоўнасць, ён яшчэ нічога канкрэтнага не зрабіў, нават не дапамог бацькам, не разабраўся з «чартаўнёй» — новая хата, пабудаваная на праклятым месцы, згарэла. Аднак удумлівы і чуйны душой чытач заўважыць, што адбылося самае важнае ў душы героя на шляху да інтэлігентнасці. Ехаў ён дадому катэгарычным, нецярпімым, яму ўсё было ясна і зразумела (як таму «вучыцелю Балазевічу», які здзіўляе Яхіма тым, што «на ўсё адтадкі знайшоў»), а вяртаецца зусім іншым. Ашаломленым, здзіўленым і нават разгубленым вяртаецца ён у горад, але гэта тая разгубленасць, што сведчыць пра працу душы і розуму. Інтэлігентнасць — гэта здольнасць сумнявацца, здольнасць перагледзець свае каштоўнасці і ўбачыць высокае неба ідэала. Катэгарычнасць і інтэлігентнасць — несумяшчальныя. Архіп глядзіць — і бачыць, слухае — і чуе. Душа яго поўніцца і шчымлівым болем за маму, якая вельмі пастарэла, і захапленнем і любоўю да родных мясцін, да роднага карэння, і ўсведамленнем таго, што ёсць у свеце загадка, без якой «не было б чалавечага жыцця».

Адзін з законаў вечнасці, усвядомлены пісьменікамінтэлігентам Гарэцкім і дакляраваны нам з найбольшай палкасцю і незвычайнай сілай яго таленту, — не забі!

Асноўная тэма ўсёй яго шматграннай і багатай на самыя розныя тэмы творчасці — антываенная. Творчасць яго — праклён вайне, вайна — вайне, заклік спыніцца і адумацца, сцвярджэнне філасофскай думкі, што вайна забівае выключна ўсіх: і таго, хто загінуў, і таго, хто перамог. Чалавек, які па сваёй ці якой іншай злой волі пазбавіў жыцця другога, знішчае і сваю душу.

У апавяданні «Літоўскі хутарок» антычалавечая сутнасць вайны паказана праз трагедыю адной мірнай сям'і. Сюжэт апавядання просты: хутарок, дзе жыве сям'я Яна Шымкунаса, за кароткі час некалькі разоў пераходзіць то да немцаў, то да рускіх і з'яўляецца полем бою дзвюх армій. А баі былі такія, што, як казаў палкоўнік па тэлефоне, забітых «няма сілы падабраць»: «Ляжаць цэпкамі, калонамі. Бог іх ведае, ці забіты так, ці параненыя спаўзліся ў адзін груд. Трупаў не менш трох тысячаў на адной маёй пазіцыі». Вайна паказана Гарэцкім не толькі як трагедыя вынішчэння жыцця, яго плоці. Нікому з пісьменнікаў да Гарэцкага не ўдалося з такой пераканаўчасцю і мастацкай сілай паказаць вынішчэнне вайной душы, прычым масавае вынішчэнне.

Глыбіні філасофскай думкі садзейнічае кампазіцыя апавядання і вобраз Шымкунаса. У пачатку апавядання добры і далікатны, мудры Шымкунас паказаны як чалавек, які перакананы, што і рускія, і кайзераўскія салдаты такія ж людзі, як яго Блажыс, што недзе таксама вымушаны ваяваць і разам з іншымі пайшоў «спраўляць крывяныя хаўтуры». Таму на пытанне феерверкера Сініцы, «куды паненкі схаваюцца, як прыйдзе германец», дачка Шымкунаса адказвае, што не будзе хавацца, бо «прусы — народ дужа прыгожы». Так думае не толькі наіўнае дзяўчо, але і мудры Шымкунас, лічачы, што пагроза лесу можа прыйсці толькі ад шалёнага снарада. Мудры Шымкунас не ведаў, што калі «два ворагі-асілкі» сыходзяцца, то перастаюць дзейнічаць, руйнуюцца і ўсе векавыя законы людскасці. Сапраўды, няма добрых ці кепскіх народаў, ёсць людзі, якіх вайна справакавала на нялюдскасць. Той, хто, як Шымкунас, не толькі пабачыў «ашклянелыя вочы, рукі са сціснутымі кіпцямі і ўзнятыя ўгору, кроў», але сам прайшоў праз пекла вайны і не раз зазіраў смерці ў вочы, аддае ёй спачатку сваю душу, хаця плоць яго пакуль яшчэ жыве.

Сапраўды, і рускія, і кайзераўскія салдаты да блізкай сустрэчы са смерцю — яшчэ людзі, нават «добрыя людзі». Шчыра супакойвае Шымкунаса рускі салдат, што «мірных жыхароў чапаць забараняецца» і што за ўсе панесеныя страты ім заплацяць. А нямецкі салдат праз перакладчыка Глюкмана прапануе Шымкунасу пакаштаваць іхняга хлеба. У пятым раздзеле апавядання пераканаўча паказана, як чалавек на вайне, кіруючыся яе законамі, пераступае парог, за якім ужо перастае быць чалавекам. Ні баяцца, ні саромецца больш няма чаго — вайна ўсё спіша. «Ці магу я саромецца гэтых дзікароў», — кажа адзін. А другі свае брыдкія, жывёльныя намеры апраўдвае нават тым, што гэта будзе садзейнічаць «паляпшэнню заняпалых народаў» і прывіццю «высшай культуры фізічным шляхам». І наладжваюць пір у час чумы: «танцуюць немцы ў Марыампалі пад грамафоны, мірным людзям за ўсё-усякае штых да грудзей, а дзяўчын ды маладзіц крыўдзяць».

Вобраз прыгажуні Монці, дачкі Шымкунаса, у апавяданні не толькі трагічна-канкрэтны, але і сімвалічны. Як прыгажосць — тая сіла, што здольна ўратаваць свет, так і вайна — сіла, што здольна яго знішчыць. Асаблівага трагізму дасягае пісьменнік у апошнім раздзеле апісаннем «раскіданага гнязда» Шымкунаса і зруйнаваных людскіх душ. Самае страшнае, даводзіць у фінале апавядання Гарэцкі, калі жывыя не хочуць жыць. «Не магу я маліцца і жыць не хачу», — вось вынік страшнай трагедыі, што нясе любая вайна.

Традыцыі М. Гарэцкага ў паказе вайны прадоўжаны лепшымі майстрамі слова сучаснасці. Асаблівага ўздзеяння на людскія пачуцці ў сцвярджэнні той жа філасофскай думкі, што вайна вынішчае душы, дасягаюць В. Быкаў у аповесці «Пакахай мяне, салдацік» і А. Дудараў у п'есе «Радавыя».

Кожным радком, кожным словам усіх сваіх твораў В. Быкаў, прадаўжальнік традыцый М. Гарэцкага ў паказе вайны, таксама папярэджвае і даводзіць, што найвялікшая трагедыя вайны заключаецца ў вынішчэнні духоўнасці і разрыве повязяў паміж вякамі і пакаленнямі, без чаго само існаванне жыцця на зямлі становіцца праблематычным.

## 2. Матывы і вобразы паэзіі Максіма Танка

... Уласны курс і вугал свой атакі.

*У. Скарынкін*

Мабыць, ёсць нешта знакавае і у самым дні, калі Максім Танк (Яўген Іванавіч Скурко) з'явіўся на свет, бо дзень яго нараджэння — 17 верасня (у 1912 г.) — супаў з днём вызвалення яго радзімы ад белапольскай акупацыі і ўз'яднання Заходняй Беларусі з Усходняй — з днём, які ён набліжаў, дзеля якога ішоў па этапах, сядзеў у турмах. Не лірычны герой, а сам паэт меў поўнае права сказаць пра сябе і сваіх сакамернікаў з Лукішскай віленскай турмы для палітвязняў і Картуз-Бярозскага канцлагера, што святы для Беларусі дзень уз'яднання яны не проста чакалі, а «начамі паўзлі да калючага дроту» — змагаліся.

Асноўная тэма яго даверaснёўскай творчасці — рэвалюцыйна-вызваленчая. Галоўны герой вершаў першага зборніка «На этапах» (1936) — рэвалюцыянер, змагар, які зрабіў для сябе выбар: лепш нягоды, чым няволя Бацькаўшчыны. Пра каштоўнасць зборніка сведчыць высокі «ганарар», які атрымаў і аўтар, і выдавец зборніка — па шэсць месяцаў турмы кожнаму. І зноў — у Лукішкі, зноў у тую турму, якая вызначалася асаблівай жорсткасцю ў адносінах да палітвязняў.

Другі («Журавінавы цвет», 1937) і трэці («Пад мачтай», 1938) зборнікі таксама напісаны на высокай ноце грамадзянскасці, публіцыстычнасці і лірызму.

Ужо ў даверaснёўскіх творах М. Танка вылучаецца вызначальная адметнасць усёй яго творчасці і мастацкага стылю — метафарычнасць. Нельга не здзіўляцца дару маладога песняра напаўняць вобразнасцю вершы з відавочна палітычным зместам. У пейзажы ці пабытавай замалёўцы, ці, як у вершы «На пероне», які нагадвае рэпартаж з

чыгуначнага вакзала, — што ні радок, то метафара: «гарыць памалу ноч даўгой лучынай, зайцамі крадуцца цені па сцяне»; «пеніцца, сярдзіта бульба закіпае снежнаю завеяй ў чорным сагане» («Песня кулікоў»); «павязлі цягнікі восень з вёсак у горад» («Павязлі цягнікі»); «вячэрні перон абмыла мова чужая»; «Наша юнацтва вывозяць» («На пероне»).

17 верасня 1939 г. здзейснілася мара паэта-змагара: родная Беларусь стала свободнай, але шчасце было нядоўгім, радасць вызвалення азмрочылі «хмары з захаду». І Радзіму, і самога М. Танка чакалі новыя, яшчэ цяжэйшыя выпрабаванні.

Асноўная тэма лірыкі М. Танка перыяду вайны — патрыятычная. Сапраўдным шэдэўрам, узорам патрыятычнай лірыкі з'яўляецца верш «Родная мова».

Верш напісаны ў 1943 г., у крытычны і трагічны для Радзімы час, калі над ёй стаяў «акрываўлены вораг з пятлёй», стаяў «над спаленай хатай, над родным загонам, над будучыняй...». Філасофскае ўсведамленне паэта, што ў гэтай бітве святла з цемрай усё вызначыць сіла духоўнасці, знайшло незвычайнае вырашэнне ў вершы. Галоўная думка яго такая: пакуль жыве мова — жыве народ, бо мова — ёсць выяўленне духоўнасці народа, яго сілы і непераможнасці.

Верш напісаны ў форме лірычнага прачулага звароту да мовы, змест якога — прызнанне ў любові, выяўленне душы, што поўніцца пачуццямі захаплення, удзячнасці, веры і надзеі. Анафарычая першая страфа верша (аж дзевяць радкоў) уяўляе сабой адну сінтаксічную адзінку — перыяд. Першая частка перыяда— мноства аднародных членаў сказа і адзін даданы сказ. Другая частка— граматычная аснова «ты выткана» са зваротkам «дзіўная родная мова». Такая складаная сінтаксічная канструкцыя спрыяе выяўленню думкі на ўзроўні малітоўнасці пра багацце роднай мовы і яе вытокі, пра тое, што тварэц мовы — народ, што ў мове — яго гісторыя, яго традыцыі, яго душа. Мова — святыня народа, бяссмерце яго.

Другая страфа і адначасова кампазіцыйная частка верша складаецца з двух сказаў, другі з каторых — таксама перыяд, якім паэт дасягае пафаснасці ў выяўленні думкі пра магутную сілу слова, натхняльную сілу. У гэтай сваёй частцы верш гучыць як клятва вернасці Радзіме і мове — усяму таму, «што было і што век будзе вольным». Багатая наша родная мова («Няма на зямлі таго шчасця і гора, якога б ты нам перадаць не змагла»), вялікая і натхняльная яе сіла:

Няма такіх нетраў, глыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла

Мяне на Радзіму, туды, дзе сягоння Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй Над спаленай хатай, над родным загонам, Над будучыняй і над песняй маёй, — Над тым, што было і што век будзе вольным.

Трэцяя частка верша — акордная, жыццесцвярджальная і аптымістычная:

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.

Ужо ў гэтым вершы акрамя метафарычнасці назіраецца і схільнасць паэта да выяўлення багатага духоўнага свету свайго лірычнага героя праз складаныя сінтаксічныя канструкцыі, і найчасцей — перыяд. Паэт быццам самой будовай сваіх вершаў сцвярджае адзін з законаў жыцця: любая існасць, любая думка патрабуе і адпаведнага зместу выяўлення. Праўда, паэту падуладны выключна ўсе элементы сінтаксісу, як падуладны ўсе вершаваныя памеры. Аднак у яго паэзіі дамінуе верш-верлібр — свабодны верш, сапраўды свабодны і ад традыцыйнага рытму, і ад рыфмы, але не свабодны ад самых асноў паэзіі.

Вонкавая адсутнасць рытму і рыфмы кампенсуецца і ўмоўнаасацыятыўнай вобразнасцю, і філасафічнасцю твора, яго падтэкстам, які патрабуе ад чытача «садумання», «сатворчасці». Гэта паэзія інтэлектуальная, філасофская. Менавіта такая паэзія Максіма Танка. Вонкавая прастата яго вершаў не мае нічога агульнага са спрошчанасцю, свабода — з хаосам.

Узорам філасофскай лірыкі Танка і адначасова яркім прыкладам і ілюстрацыяй адметнасці яго творчай манеры, стылю з'яўляецца верш з метафарычнай назвай «Перапіска з зямлёй». Ды і сам верш — разгорнутая метафара, да ўсяго яшчэ — перыфраза (моўная загадка, апісанне з'яў, прадметаў, без называння іх). Разгадаць гэтую загадку (што само па сабе цікавая і карысная для чалавечага розуму і душы праца) — усвядоміць ідэю, філасофію твора. У пэўным сэнсе гэта і ёсць «сатворчасць» чытача і пісьменніка. Метафарай «пісаў зямлі многа лістоў» і яе канкрэтызацыяй («пісаў смыкамі ўсіх скрыпак»; «пісаў спіцамі дрогкіх калёс, якарамі і мачтамі караблёў») паэт славіць усе людскія справы і прафесіі. Ідэя верша, філасофія яго ў другой кампазіцыйнай частцы:

Але пакуль што
Адказ атрымаў я
Толькі на ліст мой,
Напісаны плугам.
Вось ён.
Паржэце на скібы яго.

Частуйцеся.
Ешчe.

Паэт катэгарычны ў сваім перакананні: усе працы — добрыя, але важнейшая за ўсе, вышэйшая за ўсе — хлебаробская. Яна — усяму аснова, як хлеб — усяму галава.

Метафарычнасць дазваляе паэту пазбегнуць маралізавання і публіцыстычнасці, што несумяшчальнае з паэзіяй.

Вершам «Помню» Танк даводзіць, што сутнасць чалавека вызначаецца справай, якой ён прысвяціў сваё жыццё, праз якую рэалізаваў свой дар і якою пакінуў пасля сябе след на зямлі:

Я помню звычай старадаўні:
Калі каго ў сяле хавалі,
Таму любімыя прылады
Заўсёды ў дамавіну клалі.
Аратаму — яго сявеньку,
Стральцу — рог, што будзіў дубровы,
Музыку — бубен ці жалейку,
А кавалю — гвозд ці падкову,
Шаўцу — капыл ці скрутак дратвы,
А вінакуру — коўш з дубіцай, —
Каб не з пустымі ім рукамі
Перад святым Пятром з 'явіцца.

Аднак галоўная ідэя і філасофія верша заключана ў чацвёртай, апошняй, страфе і вызначае асноўную яго тэму — прызначэння паэта і паэзіі:

Таліу імнеў час развітання
Пяро з грамніцай дайце, дзеці,
Каб напісаў я вам пра тое,
Штоўсіх чакае на тым свеце.

Фальклорный рэмінісцэнцыіі таксама адметная асаблівасць творчасці Максіма Танка, пра што сведчыць і гэты верш, аднак у апошняй страфе відавочная і біблейская рэмінісцэнцыя. Прыгадаем біблейскую прытчу пра багацея і Лазара. Першы пасля смерці быў кінуты ў пекла, а праведнік Лазар узнесены ва ўлонне Аўраамава —у рай. Багацей узмаліўся, каб Аўраам паслаў Лазара змачыць яго сасмяглыя вусны, але Аўраам адказаў, што паміж багацеем і Лазарам ужо велізарная прорва, якую нікому не дадзена пераступіць.

— Дык прашу цябе, ойча, пашлі тады Лазара ў дом майго бацькі, бо ў мяне там пяць братоў, якія таксама пагрузлі ў грахах і блудзе. Хай засведчыць ім, каб не прыйшлі і яны ў гэтае месца пакуты. Калі хто з мёртвых прыйдзе да іх — паслухаюць і пакаюцца.

—У іх ёсць Маісей і прарокі — хай слухаюць іх, бо калі не слухаюць і іх, то і ўваскрэслага не паслухаюць.

Апошняй страфой Танк сцвярджае, што паэт — гэта прарок, якому дадзена тое, чаго не дадзена іншым. Бачыць, чуць, разумець лепш за іншых дадзена яму. Яму падуладна немагчымае — напісаць і папярэдзіць усіх, што іх чакае, каб помнілі пра будучае, «каб ведалі».

У народзе не раз можна пачуць: калі б хто змог адтуль вярнуцца і расказаць, «як там жывецца», то адразу вырашылася б мноства праблем у гэтым свеце. Людзі ведалі б, дзеля чаго жывуць, чым толькі і трэба даражыць, жывучы імгненне на гэтай зямлі. І гэта паўплывала б на іх думкі, паводзіны, справы — тут і цяпер.

У нас, як пра тое даводзіць Біблія, ёсць тыя, хто не з таго свету, а тут, жывучы, як і мы, на гэтай зямлі, можа нас перасцерагчы, папярэдзіць, бо ім дадзены вялікі і незвычайны дар. Нам дакляравана слухаць сваіх прарокаў.

Дар гэты — як бліскавіца, як кветка, як след разведчыка, як сок вінаграду, як «кроў, што пульсуе ў жылах», як маці, як радзіма, без якіх «ні нараджацца, ні жыць на гэтай зямлі немагчыма!» (верш «Паэзія»).

У філасофскай лірыцы Танка відавочная схільнасць паэта да выкарыстання вялікіх магчымасцей такога мастацкага прыёму, як градацыя, асабліва ў спалучэнні з анафарай:

Ты яшчэ толькі намёк на чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на маці;
Ты яшчэ — чвэрць чалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на дружбу;
Ты толькі — паўчалавека,
Калі ва ўсім спадзяешся на любоў, —
І толькі тады становішся чалавекам,
Калі ўсе могуць спадзявацца
На цябе.

У вершаваных радках групуюцца словы і выразы з нарастаннем іх эмацыянальна-сэнсавай выразнасці («намёк на чалавека», «чвэрць чалавека», «паўчалавека», «становішся чалавекам» — «спадзяешся на маці», «на дружбу», «на любоў», «усе могуць спадзявацца на цябе»), чым узмацняецца экспрэсія выказвання. Чалавек толькі тады адбыўся як чалавек, калі ён можа дапамагчы іншаму, калі ён патрэбны людзям.

Групоўкай слоў і выразаў з нарастаннем іх сэнсавай выразнасці («незнаёмага», «друга», «любай», «маці» — «здзівіць», «спыніць», «сагрэць сонцам лета», «вярнуць з таго свету») у вершы «Голас» паэт дасягае афарыстычнасці ва ўслаўленні маці і яе бязмежнай любові да дзяцей.

Голас незнаёмага можа здзівіць,
Голас друга — на хвіліну спыніць,
Голас любай — сагрэць сонцам лета,
Голас маці — вярнуць з таго свету.

... Адзін мудры чалавек на пытанне, што ён у жыцці любіць больш за ўсё, адказаў: «Само жыццё». Лірычны герой вершаў Танка не толькі шчыры, чулы, высакародны, але і мудры. Праз усведамленне лірычным героем шчасця Танк у вершы «Шчасце» сцвярджае простую і вечную ісціну: шчасце — гэта само жыццё, бо ўсё пералічанае паэтам — выявы жыцця. Верш насычаны аднароднымі дапаўненнямі («з солі, з хлеба..., з поту, з дарожнага пылу, з роднага небасхілу, з дружбы..., з песні»), пасля якіх — шматкроп'е: кожны можа прадоўжыць гэты пералік жаданымі для сябе выявамі жыцця. Але ўсведамленне таго, што «простае шчасце людское», аб'ядноўвае нас усіх, усведамленне жыцця самога па сабе, ва ўсіх яго праяўленнях, як шчасця— сведчанне мудрасці, аптымізму і жыццястойкасці чалавека наогул і лірычнага героя Танка ў прыватнасці.

У вершы «Шчаслівы дзень» выяўлена філасофская думка, што якім бы мудрым ні быў чалавек, якімі б здольнасцямі ўбіраць у сябе вопыт папярэднікаў ні валодаў, — адкрыццяў на ўласным шляху яму не пазбегнуць. Чалавеку не ўхіліцца ад вырашэння праблем «праўды, няпраўды, дружбы, кахання, жыцця і смерці». Шчаслівы той дзень, лічыць паэт-філосаф, калі чалавек пераасэнсаваў раней асэнсаванае, калі змог перагледзець свае каштоўнасці. Шчаслівы дзень вызначаецца словамі «І аказалася», бо чалавек на сваё ранейшае «Я думаў» глядзіць ужо з вышыні вопыту, сталення розуму і душы.

Вершы «Нашто ты косы заплятаеш...», «Ave Maria», «Працягласць дня і ночы» — гімн жаноцкасці, прыгажосці, гімн жанчыне, якая здольна не толькі «дзень укараціць і ноч прадоўжыць, але ашчаслівіць на ўсё жыццё».

Багатую духоўную спадчыну пакінуў нам паэт у сваіх зборніках «Каб ведалі», «На камні, жалезе і золаце», «След бліскавіцы», «Мой хлеб надзённы», «Дарога, закалыханая жытам», «Прайсці праз вернасць», «Нарачанскія сосны».

Стыль Танка вызначае схільнасць пісьменніка да філасофскага ўспрымання і адлюстравання жыцця, выкарыстання фальклору, метафарычнасці і пры ўсёй разнастайнасці метрыкі да выкарыстання вялікіх магчымасцей менавіта свабоднага верша з усімі характэрнымі для гэтага жанру лірыкі асаблівасцямі.

**3. Прачытаць на памяць верш Максіма Танка (на выбар)**

**Родная мова**
З легендаў і казак былых пакаленняў,
З калосся цяжкога жытоў і пшаніц,
З сузор'яў і сонечных цёплых праменняў,
З грымучага ззяння бурлівых крыніц,
З птушынага шчэбету, шуму дубровы,
І з гора, і з радасці, і з усяго
Таго, што лягло назаўсёды ў аснову
Святыні народа, бяссмерця яго, —
Ты выткана, дзіўная родная мова.

Няма на зямлі таго шчасця і гора,
Якога б ты нам перадаць не змагаа.
Няма такіх нетраў, шыбокага мора
І гор, праз якія б ты не правяла
Мяне на Радзіму, туды, дзе сягоння
Стаіць акрываўлены вораг з пятлёй
Над спаленай хатай, над родным загонам,
Над будучыняй і над песняй маёй, —
Над тым, што было і што век будзе вольным.

Народ пранясе цябе, родная мова,
Святлом незгасальным у сэрцы сваім
Праз цемру і годы змаганняў суровых.
Калі ж ападзе і развеецца дым
І нівы васкросшыя закаласяцца, —
Ізноў прашуміш ты вясновым дажджом,
Ізноў зазвініш ты у кожнай у хаце,
Цымбалам дасі іх сярэбраны гром
І вусны расквеціш усмешкай дзіцяці.

**Помню**
Я помню звычай старадаўні:
Калі каго ў сяле хавалі,
Таму любімыя прылады
Заўсёды ў дамавіну клалі.
Аратаму — яго сявеньку.
Стральцу — рог, што будзіў дубровы,
Музыку — бубен ці жалейку,

А кавалю — гвозд ці падкову,
Шаўцу — капыл ці скрутак дратвы,
А вінакуру — коўш з дубіцай, —
Каб не з пустымі ім рукамі
Перад святым Пятром з'явіцца.
Таму і мне ў час развітання
Пяро з грамніцай дайце, дзеці,
Каб напісаў я вам пра тое,
Што ўсіх чакае на тым свеце.

# Білет № 22

## 1. Жыццёвы і творчы шлях Янкі Купалы

> Цяпер маймі скарбамі — думы-саколы,
> Цяпер беларускай я песні ўладар.
> *Янка Купала*
>
> ...Там народ найболей любіць вершы Янкі.
> *П. Панчанка*

Лёс быў і літасцівы да нашай Маці-Беларусі, калі ў 1882 г. паслаў невымоўнаму народу адразу двух прарокаў, двух песняроў — рамантыка і рэаліста, такіх розных, але аднолькава вартых свайго народа. Каб «сярод цемры і мук» беларусы маглі іх галасам «на свет цэлы» сказаць пра сваё жаданне і права «людзьмі звацца».

Міншчына — край паэтаў. Вязынка, як і Акінчыцы на Стаўбцоўшчыне, — таксама «куточак запаветны», дарагі сэрцу кожнага беларуса. Вязынка — калыска Купалавай паэзіі, месца, дзе ў ноч на Івана Купалу з'явіўся на свет чалавек, што стаў уладаром беларускай песні. І зноў быццам знак зямлі і неба, каб беларусы не гнулі плеч, каб узнялі галовы, каб усталі і ішлі шукаць папараць-кветку.

У лірыцы Купалы амаль не знайшлі адлюстравання факты яго жыццёвай біяграфіі. Але затое ў ёй выразнаўвасобіліся яго духоўныя памкненні і пошукі. Лёс песняра ад пачатку і да самага трагічнага завяршэння, як гэта ні банальна гучыць, — адбітак жыцця ўсяго нашага народа ў той перыяд, калі наканавана было жыць паэту. Ад імя лірычнага героя верша «Я не для вас...» метафарай «з імі мучыўся ўраўне, у адны закут з імі кайданы» сказаў паэт і пра свой уласны лёс. У 70-я гг. XIX ст. Ануфрый Луцэвіч, дзед будучага паэта, быў выгнаны з зямлі князямі Радзівіламі. З таго часу Луцэвічы сталі арандатарамі і блукалі па свеце ў пошуках працы і хлеба. Такі ж лёс выпаў і бацькам Янкі — Даменіку Ануфрыевічу і Бянігне Іванаўне. У 1902 г. сям'ю напаткала вялікае гора — смерць бацькі, брата і дзвюх сясцёр.

Узваліўшы на свае плечы клопат за ўсю сям'ю, Янка Купала пайшоў шукаць сабе службы, бо пераканаўся на горкім вопыце сваіх родных і сваім уласным, што праца на чужой зямлі не пракорміць. І зноў працягвалася запятая барацьба за кавалак хлеба. Чаго толькі не зведаў юны Купала! Быў і хатнім настаўнікам, і перапісчыкам у судовага следчага ў Радашковічах, і прыказчыкам у маёнтку, што на Магілёўшчыне. А за тры гады працы на памешчыцкіх бровараx «зазнаў такога пекла, якога яшчэ дагэтуль не меў». Яго пакутніцкі шлях да вяршыні валадарства беларускай песняй і, вядома ж,

адпаведнага матэрыяльнага дабрабыту можна параўнаць, бадай што, толькі са шляхам Джэка Лондана.

Пісаць вершы ён пачаў рана, але пачаткам літаратурнай дзейнасці лічыцца 1905 год, калі ў прагрэсіўнай рускай газеце «Северо-Западный край» з'явіўся яго першы верш «Мужык», адкрыўшы тым самым талент такой велічыні, якога не ведала яшчэ беларуская літаратура.

Велізарная заслуга Янкі Купалы, які ўвабраў у сваю творчасць лепшыя традыцыі папярэднікаў — Ф. Багушэвіча, Цёткі, у тым, што «мужыцкая тэма загучала ў яго творах як агульнанацыянальная і агульначалавечая. Ніхто да яго з такой сілай голасу не сказаў «на свет цэлы» пра наша імкненне і права «людзьмі звацца», а пазней і пра тое, што «і беларус можа змясціцца ў сям'і нялічанай славян», што «жыў беларус — і будзе жыць!»

Ужо ў першым зборніку «Жалейка» (1908) намецілася, а ў наступных зборніках («Гусляр», 1910; «Шляхам жыцця», 1913), у шматлікіх паэмах з незвычайнай сілай выявілася рамантычнае светаўспрыманне паэта.

І самае адметнае ў яго творчым метадзе тое, што ў ім дзівосным чынам спалучыліся дзве плыні, дзве тэндэнцыі — глыбока рэалістычная і ярка романтичная.

Крытыка неаднаразова адзначала вельмі важную рысу купалаўскага верша — разнастайнасць і багацце рытму, гэтага жывога нерва паэзіі. «Незвычайная рытмічнасць — вось галоўная, магічная асаблівасць Купалы, — пісаў у 1914 г. М. Багдановіч. — Яго бурныя, імклівыя рытмы захапляюць, гіпнатызуюць чытача, не даюць яму затрымацца, апомніцца, палоняць яго сваёй уладай».

Рытм для Купалы — не самамэта: ён прадыктаваны неабходнасцю творчага імкнення як мага паўней, дакладней перадаць плынь жыцця ва ўсёй яе зменлівасці, імклівасці і месцамі нават бурлівасці (верш «Там»):

Там кроў ліецца, там за волю
Барцы на віселькі ідуць,
А вы, вы мучаны найболей,
Спіцё, хоць вас даўно там ждуць.
...До спаць! Паўстаньце громадою
І йдзіце ім там памагаць,
Паўстаньце крэпасцю такою,
Каб вораг вас не мог зламаць.

Паэт здолеў дасягнуць гармоніі мелодыкі народнай песні са строгай вытанчанасцю класічнага верша. Верш Купалы элегічны, музычны, калі выяўляе сумны настрой лірычнага героя. Верш Купалы

энергічны і пругкі, бунтоўны і палымяны, калі кліча на вялікі сход па Бацькаўшчыну. Лірычныя маналогі і звароты («Мужык», «Песняру-беларусу», «Мая малітва»), дыялогі («А хто там ідзе?», «Сын і маці»), аблічальныя і бязлітасна іранічныя, нават саркастычныя водпаведзі («Слугам алтарным», «Ворагам беларушчыны», «Адповедзь», «Я не для вас...»), урачыстыя гімны («Маладая Беларусь», «Роднае слова»), заклікі («Там», «Час!») — выключна ўсе формы выяўлення душы багатай, чулай і чуйнай падуладны таленту песняра.

1909-1913 гады — пецярбургскі перыяд жыцця і творчасці паэта. Выключна ўсё напісанае паэтам за жыццё адзначана грыфам таленавітасці. Але нельга не пагадзіцца з даследчыкамі яго творчасці, што пецярбургскі перыяд — яе вяршыня, самы пленны і па колькасці напісанага паэтам. Менавіта ў гэты перыяд выявіўся і яго эпічны дар, што лагічна вяло да паэмы, і дар драматурга.

У гэты перыяд Купала рэалізаваў і сваё імкненне да «мудрасці кніжнай», бо атрыманых яшчэ ў дзяцінстве ведаў (год вучобы ў Сенніцкім народным вучылішчы, вучоба ў прыватнай падрыхтоўчай школе ў Мінску, у Бяларуцкім народным вучылішчы, што за 25 кіламетраў ад Мінска) і ведаў, набытых нястомнай самаадукацыяй, як лічыў паэт, было мала. Чатыры гады вучобы на агульнаадукацыйных курсах Чарняева і спатолілі яго прагу ведаў, і сістэматызавалі раней набытыя, і па-сапраўднаму далучылі яго да сусветнай культуры.

У гэты перыяд у Пецярбургу выйшлі другі і трэці зборнікі яго паэзіі, напісаны драматычныя паэмы «Сон на кургане», «На папасе» (першая драматычная паэма «Адвечная песня» напісана яшчэ ў перыяд яго працы ў газеце «Наша ніва» ў 1908 г.), рамантычныя паэмы «Курган», «Бандароўна», «Магіла льва», паэма-ідылія «Яна і я», п'есы «Паўлінка» і «Раскіданае гняздо» (а ўсіх драматычных твораў ім напісана чатыры; «Тутэйшыя» ў 1922 г. і «Прымакі» ў 1923 г.).

П'еса «Паўлінка», цесна звязаная з п'есамі В. Дуніна-Марцінкевіча, была наватарскім творам і этапным ва ўсёй беларускай драматургіі, бо ў ёй гарманічна спалучыліся змест і форма; відавочная і сацыяльна-палітычная сутнасць канфлікту. У драматургію прыйшоў новы герой з яго настойлівасцю ў імкненні да новага жыцця і рашучасцю ў барацьбе за асабістае шчасце, што з'яўляецца найважнейшымі рысамі характару Паўлінкі.

Эпічна-былінная паэма «Курган», легендарна-баладная «Магіла льва», песенна-лірычная «Бандароўна» засведчылі, што ў літаратуры нашай з'явіўся самы буйны, самы таленавіты рамантык і адзін з выдатных рэалістаў. Да яго яшчэ нікому не ўдалося падняць асобны факт з жыцця простага чалавека на вяршыню героіка-трагедыйнага

гучання. Звярнуўшыся да нацыянальнага фальклору і паклаўшы фольклорное ў аснову сюжэтаў паэм, ён здолеў захаваць характэрныя для рамантычнай паэмы асаблівасці.

Галоўнымі героямі ўсіх яго рамантычных паэм з'яўляюцца асобы выключныя, моцныя, надзеленыя незвычайным дарам: ці талентам (як Гусляр), ці прыгажосцю, гармоніяй знешняга і ўнутранага хараства (як Бандароўна: «Хараства такога ў свеце не было й не будзе»), ці фізічнай сілай (як Машэка). Усе яны кідаюць выклік абставінам, уступаюць у канфлікт, выпрабоўваюцца крытычнай сітуацыяй, нават сітуацыяй выбару. «Ну, што воліш сабе выбраць, пышная паненка...»; «Запяеш па душы, дасі ўцехі гасцям — поўны гуслі насыплю дукатаў! Не пад мысль будзе песня каму-небудзь нам — канапляную возьмеш заплату!»

Трагедыйная развязка сюжэтаў адначасова і аптымістычная, жыццесцвярджальная: героі загінулі, але песня і прыклад слугавання народу і Айчыне неўміручыя.

Зусім іншым філасофскім зместам напоўнена паэма «Магіла льва». Паэт папярэджвае сюжэтам яе і вобразам Машэкі пра наступствы філасофіі моцнай асобы, якая для дасягнення мэты кіруецца прынцыпам «усе сродкі добрыя». Аднойчы пераступіўшы маральную мяжу, герой не заўважае, як нават самыя высакародныя матывы ператвараюцца ў зло незвычайнай разбуральнай сілы, бо і сам матыў ператвараецца ў сваю супрацьлегласць — нянавісць. Страшная яе сіла, бо яе носьбіта аднолькава ап'яняе кроў багатага і беднага, злодзея і ахвяры, дарослага і нявіннагадзіцяці.

Шчаслівым і адначасова глыбока трагічным быў лёс нашага песняра ад пачатку і да самага канца яго дзён і хвілін.

Шчаслівым, бо здзейснілася самая запаветная яго мара — «з цэлым народам гутарку весці, сэрца мільёнаў падслухаць біцця». І якім жа сціплым быў наш паэт у сваіх парываннях да валадарства душой толькі свайго народа! Песня Купалы мела такія магутныя крылы, валодала такой вялікай сілай і энергіяй, што ўжо ў самым пачатку выйшла за абсягі роднай зямлі, загучала на рускай, украінскай, польскай, чэшскай, літоўскай і іншых мовах. У гісторыі літаратуры не такія частыя выпадкі, каб творчасць маладога паэта станавілася здабыткам культуры іншых народаў. А купалаўскія творы сістэматычна перакладаліся, пачынаючы з 1910 г., такімі знакамітымі майстрамі слова, як М. Горкі, В. Брусаў, пазней — М. Ісакоўскім.

А хіба не доказ незвычайнага дару песняра і адначасова нашай значнасці ў свеце той факт, што першы пераклад помніка старажытнай культуры — «Слова пра паход Ігаравы» — на адну з сучасных

моў свету быў зроблены ім, Купалам? І мова тая была наша — беларуская. Толькі пазней былі зроблены пераклады «Слова...» Дз. Ліхачовым і М. Забалоцкім на рускую мову, а М. Рыльскім — на ўкраінскую. Паэт не толькі верыў, не толькі заклікаў Беларусь заняць «свой пачэсны пасад між народамі», але і сам многа рабіў дзеля гэтага.

Трагічным быў яго лёс, бо і ён, як яго прыгожыя рамантычныя героі, зрабіў раз і назаўсёды выбар і ніколі не адступіўся ад галоўнай і самай вызначальнай для ўсёй яго творчасці ідэі нацыянальнага адраджэння і дзяржаўнага суверэнітэту. І вельмі дорага заплаціў за свой выбар і вернасць яму да канца.

І ў савецкі перыяд ён з новай і новай сілай, усімі жанрам! сваёй творчасці, у тым ліку і публіцыстычным, папярэджваў, што і перад гісторыяй («А суд гісторыі цяжкі!»), і перад новымі пакаленнямі давядзецца трымаць адказ:

Ці аб свой гонар дбайна дбалі,
І дабравольна, без прынук,
Сам і сабой не гандлявалі,
Не несліў петлі дум і рук?
Іці пакінуці на памяць
Мы песень гэтакіх змаглі,
З якіх бы можна было ўцяміць,
Што мы свабоднымі былі?..

(«І прыйдзе»)

Не толькі ідэяй нацыянальнага адраджэння, але і трывогай за суверэнітэт Бацькаўшчыны прасякнуты і яго зборнік «Спадчына» (1922), і трагікамедыя «Тутэйшыя» (1922). Спадзеў паэта на тое, што яго Беларусь нарэшце «сама сабе гаспадыня», засведчаны ў зборніку «Безназоўнае» (1925), куды ўвайшла аднайменная паэма. Самай ненавіснай для паэта была «пашана да пакут», самай страшнай бядой — страта волі. Перыяд беларусізацыі ўліў новыя сілы ў душу паэта, і ён паверыў, што гэта назаўсёды:

Беларусь на куце
У хаце сваёй села,
Чарка мёду ў руцэ,
Пазірае смела...

Такую савецкую ўладу, якой яна была ў 20-я гг., такую нацыянальную палітыку Купала прымаў і розумам, і сэрцам.

Аднак машына таталітарнай сістэмы пастурова набірала абароты і кацілася да мілітарызацыі і гулагізацыі ўсяго жыцця.

У 1930 г. было арыштавана 86 пісьменнікаў, у тым ліку В. Ластоўскі, С. Некрашэвіч... Адна за адной фабрыкаваліся справы. На

чале міфічнай арганізацыі «Саюз вызвалення Беларусі» шчырым служакам таталітарнай сістэмы трэба было «паставіць» самага ўплывовага, самага аўтарытэтнага чалавека, каб справа атрымалася гучнай, эфектнай і адначасова сваімі маштабамі наводзіла жах на ўсіх астатніх. Выбар паў на Купалу, які, паводле даносу тагачаснага сакратара ЦК КП(б)Б Гея, «з'яўляўся ідэйным цэнтрам нацдэмаўскай контррэвалюцыі, што знайшло адлюстраванне і ў яго творчасці». Вярнуўшыся дадому пасля чарговага допыту, не даўшы магчымасці органам ДПУ справакаваць сябе, ён у лістападзе 1930 г. зрабіў спробу самагубства.

Трагедыя Купалы засведчана ў перадсмяротным лісце да Чарвякова, старшыні ЦВК СССР і БССР, дзе ён піша пра свой выбар: «Лепей смерць фізічная, чымся... палітычная». Лекары адратавалі паэта! Улады пакінулі яго ў спакоі: груган чакаў свайго часу...

Паэзія 30-х гг., асабліва так званы ляўкоўскі цыкл, — таксама сведчанне трагедыі Купалы — чалавека і творцы. У той пракляты час, калі, як пісала Л. Геніюш, «крывёй напоўніліся поймы рэк», калі бурліла «адчаем слёз людскіх разводдзе», у паэзіі Купалы — «гармонік грае, грае», а «калгасніца маладая» жыве «весела, ані дбае». Толькі памыляюцца тыя гора-крытыкі, што лічаць вершы ляўкоўскага перыяду («Лён», «Хлопчык і лётчык», «Алеся», «Сыны») вершамі «слабымі». І ў гэтых вершах Купала заставаўся душою нацыі, хоць не мог ужо быць Прарокам нацыянальнага адраджэння. Але гэта не сведчанне Купалавай слабасці, а сведчанне сілы таталітарнай машыны. І папярэджанне ўсім нам, асабліва тым, хто спадзяецца, «што нехта прыйдзе і выратуе нас з нашай бяды», вырашыць за нас нашы праблемы. Хай нам усім наказам стануць мудрыя словы песняра: «Гэта ж не можа быць, каб нехта быў лепшым прыхільнікам да нас, як мы самі для сябе».

У перыяд вайны паэт зноў «зваў з путаў на свабоду, зваў з цемры да святла». Яго палымяныя, таленавітыя публіцыстычныя артыкулы, яго вершы (верш «Беларускім партызанам» быў размножаны і скінуты над беларускімі лясамі як лістоўка) набліжалі святы Дзень Перамогі. Верай у перамогу дабра над злом прасякнуты верш «Зноў буцзем шчасце мець і волю». Сам жа паэт не дажыў да светлых дзён шчасця і волі: 28 чэрвеня 1942 г. ён трагічна загінуў пры загадкавых абставінах у маскоўскай гасцініцы. Груган дачакаўся свайго часу...

Але ніхто не змог (і ніколі не зможа!) пазбавіць беларусаў іх несмяротнай душы. Купала быў і застаецца нашым Песняром, Прарокам нацыянальнага адраджэння — Уладаром беларускай песні.

## 2. Духоўны свет лірычнага героя ў паэзіі Пімена Панчанкі

> Без чалавечнасці не будзе вечнасці.
>
> *П. Панчанка*
>
> Настаўнікі не паміраюць,
> А аддаляюцца ад нас
> І зверху строга назіраюць,
> Як мы вядзём свой рэй і час.
>
> *Г. Бураўкін*

Лірычны герой — асноўны мастацкі прыём, з дапамогай якога і праз які Панчанка-патрыёт, Панчанка-філосаф выяўляе сваё светаўспрыманне, прапануе нам сваё вырашэнне праблем, што хвалююць нас усіх.

Багаты духоўны свет лірычнага героя паэзіі П.Панчанкі, але вызначальная якасць яго душы, матыў усіх яго ўчынкаў — чалавечнасць. Ён глыбока перакананы, што «без чалавечнасці не будзе вечнасці», што «лечыцца трава ад спёкі ліўнямі — людзі ласкай лечацца людской».

Што б ні рабіў, якія б учынкі ні здзяйсняў лірычны герой Панчанкі, — усе яны ў імя чалавечнасці, у імя таго, каб вечным быў няспынны рух жыцця, каб перамагла праўда, дабро і святло.

У лірычных вершах перыяду вайны «Краіна мая», «Сінія касачы» П. Панчанка сцвярджае, што любоў да Радзімы павінна быць дзейснаю. Абодва вершы напісаны ў форме лірычнага маналога, у якім боль сына за пакуты маці-зямлі і прысяга:

Я кроў да апошняе кроплі пралью,
Каб толькі табе палягчэла.

Адметнасць стылю, творчай манеры паэта— асацыятыўнасць, вобразнасць яго паэзіі. Менавіта асацыятыўнасцю паэт дасягае асаблівага ўздзеяння на чытача і пераканаўчасці створаных ім вобразаў.

У вершы «Сінія касачы» намаляваныя ім карціны мірнага жыцця ўзмацняюцца сімвалічным вобразам сініх касачоў, што асацыіруюцца лірычным героем з самым дарагім і светлым у жыцці і кантрастуюць жудасцям вайны:

Не паспеліў шчасці як след накупацца мы —
Бомбы свіснулі, пырснула першая кроў...
Хата вокны закрыла дашчанымі пальцамі,
Каб не бачыць гора гаспадароў.

Лірычны герой верыць, што «прыйдзе час, зноў збудуем мы хаты утульныя», але за гэта трэба змагацца.

У паэзіі П. Панчанкі ваенных гадоў шмат вершаў эпічнага складу. «Вока снайпера», «Падбіты танк», але творам выключнай мастацкай сілы з'яўляецца верш «Герой», у самой назве якога і сутнасць апісанай крытычнай сітуацыі, і аўтарскія пачуцці да таго, хто «лёг на змяіныя скруткі дроту», каб «дзвесце салдацкіх прапыленых ботаў прайшлі па яго спіне».

Каб паказаць і жудасць бою, і значнасць гераічнага ўчынку салдата, паэт карыстаецца гукапісам, інструментоўкай тых гукаў, якія дазваляюць асацыятыўна ўзнавіць карціну бою:

Не ён, а другія ішліў атаку,
Гранаты кідаліў бліндажы,
Калолі фрыцаў, палілі танкі
І сцяг перамогі ўздымалі ранкам
На заваёваным рубяжы.

Зусім іншая па танальнасці трэцяя страфа і адпаведная кампазіцыйная частка верша. Яна ўжо не пафасная, а мінорная, напісаная ў традыцыях народнага плачу, галашэння. Таму ў гэтай страфе інструментоўка ўжо галосных гукаў, якой паэт і дасягае асаблівага трагізму ў паказе вайны:

...Зваліўся на травы, і стала балюча
І травам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з валдайскіх азёр.

Агульначалавечыя, інтэрнацыянальныя і нацыянальныя матывы гучаць у лірыцы Панчанкі асабліва прачула і шчыра. Ён «славіў каханне, паходы, баі, гарачае летняе сонца»,

але з асаблівым пачуццём услівіў дружбу паміж народамі як адно з праяўленняў чалавечнасці і ўмову вечнасці. Ад апісання факта з уласнага жыцця (паэт нарадзіўся ў Таліне ў 1917 г., куды яго бацькі паехалі ў пошуках кавалка хлеба) у вершы «Шапка эстонца» ён падымаецца да філасофскага абагульнення, што чалавечнасць, дабрыня, здольнасць паспагадаць і дапамагчы ў бядзе — катэгорыі агульначалавечыя, што зямля — наш агульны дом:

Хай будзе праслаўлена вершам маім
І простая шапка эстонца.

Усведамленню ж паэтам нацыянальнай годнасці, выяўленню нацыянальнай адметнасці нашага народа прысвячаюцца вершы «Бульба», «Край паэтаў».

Чалавек той, хто шануе сваё і паважае чужое — вось галоўная думка гумарыстычнага верша «Бульба», большую частку якога складае

палкі і адначасова жартаўлівы маналог салдата-беларуса пра нашы нацыянальныя стравы з бульбы:

«...З нашай бульбы тысячу, неменей,
Смажаць і гатуюць розных страў...»
Я ўсхапіўся з месца і з натхненнем
Песню ім пра бульбу праспяваў.

Сапраўдным гімнам роднаму краю, яго красе і багаццям, галоўнае з якіх —таленты, з'яўляецца пафасны верш «Край паэтаў». I сама назва, і ўвесь гэты вялікі памерам верш уяўляюць сабой перыфразы. Гэта верш-загадка, бо ў ім мастацкае, вобразнае, узнёслае і пафаснае апісанне Беларусі, — і ні разу не названа слова «Беларусь». Што ні радок — то метафара. Выключная рытмічнасць, мажорнасць верша дасягаецца анафарай «там» і анафарычнай будовай сказаў.

Парадаксальна тое, што ў такім пафасным, экспрэсіўным вершы выкарыстоўваюцца фразеалагізмы, эўфемізмы, выразы тыпу: «сто разоў цалуюць там і яшчэ трошкі»; «бо красуня перад ім не здаецца»; «там зубрыная гарэлка прадаецца»; «выдаўцы там не бяруць у рот ні кроплі». Усё пералічанае надае твору адначасова і гумарыстычнае гучанне. Валадарства гумару вялікае, і ў тым пераконваешся, чытаючы таленавіты верш П. Панчанкі. Спалучыўшы, на першы погляд, неспалучальнае, паэт дасягае найбольшага эстэтычнага і эмацыянальнага ўздзеяння на чытача.

Панчанка пасляваеннага перыяду, асабліва 70-80-х гг., — гэта паэт-максімаліст.

Ці піша ён пра высакароднае і чалавечнае, ці пра мярзотнае і вычварнае, — для яго няма гіаўтонаў: толькі белае ці толькі чорнае.

Верш «Сэрца і крыж», у якім дзівосна спалучаецца рэалістычнае і фантастычнае для ўслаўлення чалавечнага ў чалавеку, пачынаецца катэгарычным сцверджаннем:

Жыў доктар у нашай мясціне —
Няма ўжо такіх дактароў:
Паставіць ён банкі ці п 'яўкі —
І заўтра ты жыў і здароў.

А вось прыклад максімалізму і катэгарычнасці з другім знакам. У вершы «Ратуйце нашы душы» таксама гіпербалізавана, праз павелічальнае шкло, па-максімалісцку паказана бездухоўнасць і самая страшная, на думку паэта, яе выява — разбэшчанасць моладзі і яе дэградацыя. У вершы з публіцыстычнай палкасцю паказана поўнае бязладдзе і поўная перад ім капітуляцыя, адсутнасць сіл, здольных процістаяць злу:

Але, каб выбраць лепшую з дарог,

Патрэбна мудрасць працы,
Нашых сэрцаў;
Патрэбны маці, бацька, педагог.
А іх няма.
Альбо ў мізэрнай дозе.
Разлад.
Развод.
Сіроцтва ўсё часцей.
Іходзяць беспрытульна па дарозе
Мільёны нашых страчаных дзяцей...

Эфект катэгарычнасці дасягаецца спалучэннем гіпербалы і парцэляцыі: «А іх няма».

Безумоўна, у жыцці такія якасці чалавечага характару, як катэгарычнасць, максімалізм, бескампраміснасць, непажаданыя, а часам і заганныя, бо вядуць да канфліктаў у людской супольнасці. У жыцці якраз патрэбна вучыцца бесканфліктнаму існаванню, што, вядома, не мае нічога агульнага з капітуляцыяй перад злом.

Але ў мастацтва свае законы, як пра тое не раз даводзіць В. Быкаў. Гіпербалізаванае адлюстраванне зла — гэта мастацкі прыём «павелічальнага шкла», сродак уздзеяння на чытача, жаданне Прарока папярэдзіць усіх, «дзе патоп, дзе пажар, дзе вораг на межах» (У. Някляеў).

«Ратуйце нашы душы!» — б'е ва ўсе званы Панчанка-прарок. — Прачынайцеся! Пажар ужо шугае ў вашым доме!»

*Публіцыстычная накіраванасць* — таксама адметнасць творчасці П. Панчанкі, асабліва апошніх яе гадоў. Здавалася б, публіцыстычнасць зніжае мастацкія вартасці паэзіі. І гэта правіла. Але ў кожным правіле ёсць выключэнні. Публіцыстыка П. Панчанкі не проста мяжуе з мастацкасцю, а перарастае ў яе, становіцца сапраўды вечавым звонам.

Публіцыстыка ў паэзіі П. Панчанкі найперш філасофская, а не інфармацыйна-павучальная. У выяўленні філасофскіх думак Панчанка дасягае афарыстычнасці:

Той дзень прапаў і страчаны навекі,
Калі ты не зрабіў таго, што мог;
Калі не паспрыяў ты чалавеку,
Няшчыры быў, зманіў, не дапамог.

Лірычны герой Панчанкі асабліва прываблівае нас сваёй здольнасцю да пераасэнсавання свайго жыцця, учынкаў, да ўсведамлення найперш уласнага граху, гатоўнасці да пакаяння:

Яне святы, хоць і не сквапны злыдзень.

Даруйце, калі часам быў глухі
Ці чалавека грубасцю пакрыўдзіў...
Грахі мае, бясконцыя грахі.

У вершы «Гнеў і літасць» паэт сцвярджае глыбока чалавечную думку пра тое, што ўсе мы павінны быць больш цярплівымі і памяркоўнымі адзін да аднаго:

Пакаўзнецца
Нехта незнарок,
Наламае дроў
З малога розуму,
Будзе хай урок,
А не курок,
І не трэба
Прыгавору грознага.

Але ж ёсць і тое, што лірычны герой вызначыў для сябе як несумяшчальнае з воблікам чалавека: «п'янае дзікунства і паклёп, гвалтаванне, цёмнае грабежніцтва, падхалімства подлае ўзахлёб — ім заўсёды кара непазбежная».

Актыўная пазіцыя лірычнага героя, яго асноўнае жыццёвае крэда выяўлена ў радках, што таксама сталі афарыстычнымі:

Мала сказаць: ненавіджу,
Мала сказаць: признаю.
Біцца за праўду і выжыць,
Нібы салдат у баю.

Аднак асноўная філасофская думка верша заключаецца не ў сцвярджэнні неабходнасці змагання са злом. Паэт папярэджвае, што зло «хітра маскіравацца» вучыцца «спрытна штодня». Дэвіз дабра — «біцца за праўду і выжыць, нібы салдат у баю» — і зло бярэ на ўзбраенне і кіруецца ім у барацьбе з праўдай, святлом, якія для зла найпершыя ворагі.

Зборнікі апошніх гадоў жыцця («І вера, і вернасць, і вечнасць», «Горкі жолуц», перадсмяротны зборнік «Высокі бераг») прасякнуты шчымлівым болем паэта за нашу сучаснасць, трывогай за будучыню. Змагаючыся са злом, ён здзейсніў сапраўдны подзвіг і тым увекавечыў сваё імя.

**3. Прачытаць на памяць верш Пімена Панчанкі «Мала сказаць: ненавіджу...»**

Маласказаць: ненавіджу,
Мала сказаць: прызнаю.

Біцца за праўду — і выжыць,
Нібы салдат у баю.

Дрэннаму — не пакарыцца,
Добрае — не празяваць.
З дробнай хлуснёй не мірыцца,
З буйнай хлуснёй ваяваць.

Гэтым бы і кіравацца...
Толькі і зло, і хлусня
Хітра маскіравацца
Вучацца спрытна штодня.

Нехта і подлы, і хіжы
Клятву паўторыць тваю:
З ворагам біцца — і выжыць,
Нібы салдат у баю.

# Білет № 23

## 1. Жанр твора Вінцэнта Дуніна-Марцінкевіча «Пінская шляхта». Характарыстыка дзеючых асоб п'есы. Мова персанажаў

А судьи кто?
*А. Грыбаедаў*

Яркім прыкладам таго, як светапогляд вызначае дзейнасць чалавека наогул і пісьменніцкую ў прыватнасці, як эвалюцыя, што адбылася ў свядомасці чалавека, можа карэнным чынам змяніць накірунак яго дзейнасці, з'яўляецца п'еса «Пінская шляхта».

Надзеі, якія ўскладаў В. Дунін-Марцінкевіч на рэформу 1861 г., не спраўдзіліся. Да таго ж пісьменнік больш за год знаходзіўся пад следствам у мінскай турме па падазрэнні ва ўдзеле ў паўстанні 1863 г. і на горкім вопыце пераканаўся, што «не надта свабодна ў гэтай свабодзе» (Ф. Багушэвіч). І творчасць яго з ідылічнай, рамантычнай становіцца не проста рэалістычнай, а рэзка сатырычнай, аблічальнай.

Пра тое, куды патрапіла зброя сатырыка, яскрава сведчыць рэакцыя віленскага губернатара на спробу надрукаваць у 1890 г. «Пінскую шляхту». Здавалася б, такая смешная камедыя, з куплетамі, з любоўнай інтрыгай (дзве сям'і варагуюць, а дзеці ворагаў пакахалі адно аднаго і хочуць пажаніцца), але губернатар рашуча запратэставаў. Ён заявіў, што твор, дзе «ў непрыглядным выглядзе паказана асоба станавога прыстава, які пры гэтым усюды называецца «найяснейшая карона», друкаваць нельга.

Некаторыя і сёння ўсведамляюць гэты твор як сатыру «не толькі на станавога прыстава, але і на ўсю сістэму царскага суда і законнасці». Не, гэта сатыра і адмаўленне не толькі «сістэмы суда», а самой сістэмы самаўладства. А «сістэма суда» як мішэнь — гэта толькі прыём, якім зручней паказаць нежыццяздольнасць, асуджанасць усёй імперскай сістэмы. Нагадаем, што такі прыём ужо быў рэалізаваны ў рускай літаратуры. Сучаснік В. Дуніна-Марцінкевіча Дз. І. Фанвізін паказаў крах сістэмы праз адзін з яе важнейшых інстытутаў — праз адукацыю. Фанвізінскі Мітрафанушка не толькі смешны, а знакавы для ўсёй сістэмы, бо адукацыя, яе стан — люстэрка грамадства і дзяржавы. Суд і наогул органы правасуддзя — таксама люстэрка любой дзяржаўнай машыны, толькі, бадай, яшчэ большае памерам, бо гэтыя органы непасрэдна забяспечваюць яе жыццяздольнасць. Пераканаўчасць гэтага сцверджання выверым, звярнуўшыся да

паэмы «Песня пра зубра» М. Гусоўскага, дзе зроблены акцэнт на ўвагу і клопат князя Вітаўта менавіна пра гэты інстытут дзяржаўнасці:

Прагнасць нажыцца пад шыльдаю варты закона,
Сквапнасць — загрэбці кавалак у бліжняга з рота —
Ён тыранічнымі сродкамі так пратараніў,
Што на вякі нават завад іх вывеўся ў княстве.
Кім бы і чым бы ні быў ён пры іншых заслугах,
Нават за гэта адно я пяю яму славу.

Зусім іншую «славу» рэжыму «праспяваў» сваёй камедыяй «Пінская шляхта» В. Дунін-Марцінкевіч. Нотамі ў гэтай «песні» з'яўляюцца жанравыя асаблівасці твора.

Сам камедыёграф вызначыў яго жанр як фарс-вадэвіль. Вызначальнае ў камедыі — фарсавае, гратэскавае, моцнае, часам даведзенае да абсурду, адлюстраванне рэчаіснасці. Настолькі моцнае, што мяжуе з фантастыкай. «Такога не можа быць!» —усклікне чытач, пабыўшы сведкам «скорага і справядлівага» суда «найяснейшай кароны». «Такое, на жаль, было ці бывае», — прыйдзе чытач да высновы, калі яму адкрыецца глыбокі сэнс самых смелых гратэскавых збудаванняў.

У сюжэце гэтага твора абсурднае, бадай, усё, акрамя любоўнай інтрыгі, што пакладзена ў яго аснову.

Абсурдны канфлікт, з-за якога «заварылася ўся гэта каша»: Іван Цюхай-Ліпскі назваў Ціхона Пратасавіцкага мужыком. Такой абразай «гонару» нанесена «смяротная» крыўда. Пыхлівыя шляхціцы выкінулі пальчатку адзін аднаму — і каша варыцца. В. Дунін-Марцінкевіч — выдатны майстар стварэння эфекту абсурду. Эфект дасягаецца найперш камічнымі сітуацыямі, якія выдатна вызначаюць цану «гонару і годнасці» пыхлівых шляхціцаў Кручкоў назначае Ціхону Пратасавіцкаму «как угалоўнаму прэступніку» «25 лоз на голой земле без дывана» (вядома ж, які дыван таму, каго абазвалі мужыком!); Івану Цюхаю-Ліпскаму «как нанёсшаму лічнае аскарбленіе Протасавіцкаму» «15 лоз на дыване». Да ўсяго ж і штрафы заплацілі «в пользу врэменнаго прысуцтвія». Але самым вялікім выдаткам для сябе з усяго гэтага «дзела» Ціхон лічыць той, што кару давядзецца адбываць на сырой зямлі: «Даў бы сто рублёў, каб дыван падаслалі». Вось такое бязладдзе, што заўсёды ідзе ад безгалоўя, паказана ў сатырычнай камедыі.

Мы яшчэ раз пераконваемся, што канфлікты і страсці чалавечыя заўсёды такія, якія самі людзі. Паражэнне паўстання К. Каліноўскага выявіла да ўсяго яшчэ і поўнае банкруцтва шляхты як грамадскай сілы. А паказаная В. Дунінам-Марцінкевічам шляхта была наогул

самай інертнай і кансерватыўнай часткай грамадства. Клопаты і страсці, якія валодалі шляхтай, выдатна яе характарызуюць.

Але самым гратэскавым у п'есе з'яўляецца вобраз Кручкова. Гэта здзеклівая пародыя на правасуддзе. Прыёмам давядзення ўчынкаў галоўнага героя да абсурду («свідзецелям, каторыя відзелі драку і не разнялі дзерущыхся, — па 10 лоз на дыване і па 10 руб. штрафа в пользу врэменного прысуцтвія; всей прочэй шляхце, каторая не відзела дракі, за то, што не відзела, а цем самым не магла і разняць дзерушчыхся — па 5 лоз на дыване і па 5 руб. штрафа...») сатырык дасягае ўжо зусім іншага эфекту.

Гэта ўжо нават не смешна, бо ў чытача ўзнікае пытанне: а суддзі хто? А ад гэтага пытання адзін крок да ўсведамлення, што сістэма, улада, у якой такія, з дазволу сказаць, «слугі», не толькі не мае права на існаванне, але і асуджана на крах. Сістэма, якой служаць прайдзісветы, авантурысты, хабарнікі і невукі, рана ці позна павінна абваліцца. Кручкоў нават не ведае, колькі дзён у месяцы, блытае ўказы, правіцеляў і нават эпохі: «марта 69-га дня», «49-га апрэля», Екацярына Вялікая, паводле яго «вучонасці», царавала ў 1903 г. Якая ўлада— такія і слугі; і наадварот гэты алгарытм таксама правільны. Нездарма ж Кручкоў увесь час падкрэслівае, што ён дзейнічае ад імя «найяснейшай кароны».

Заслуга В. Дуніна-Марцінкевіча як драматурга заключаецца яшчэ і ў тым, што ён персаніфікаваў мову дзеючых асоб. Мова кожнага персанажа індывідуальная і служыць выдатным сродкам яго характарыстыкі. Духоўная абмежаванасць, грубасць Ціхона Пратасавіцкага і Івана Ліпскага выяўляецца не толькі ў камічных сітуацыях, але і праз іх мову, любімыя іх слоўкі: «хрэн табе ў вочы», «чортаў сын», «сабака».

Зусім іншая мова Куторгі — «хітрага ліса», што перахітрыў самога сябе і «ўехаў у нерат — ні ўзад, ні ўперад». Пацярпеўшы фіяска, Куторга самакрытычна зазначае: «Які тут у чорта розум, калі так неасцярожна папаўся ў бяду, вось швед пад Палтавай!» Усё сваё пісьменніцкае і чалавечае захапленне найбагацейшым скарбам народным — мовай — В. Дунін-Марцінкевіч выявіў праз вобраз Куторгі. Мова яго надзвычай багатая на трапныя народныя залацінкі: «млын меле — мука будзе, язык меле — бяда будзе»; «здаровы, як рыжкі баровы». І куплеты Куторгі — таксама фальклорная рэмінісцэнцыя, што з'яўляецца яшчэ адным сведчаннем увагі пісьменніка да творчасці народа і шырокага выкарыстання фальклору ва ўласных творах. Гэта адна з асаблівасцей творчага метаду пісьменніка.

Мова Кручкова такая ж вычварная, скалечаная, як і яго душа. Нахабству і цынізму яго няма межаў. І каб паддаць больш жару, каб яшчэ больш запалохаць і без таго запалоханую шляхту, ён свае «ўказы і законы» стараецца выдаць на «панскай» мове, каб касаваць усіх яшчэ і сваёй вучонасцю. Але мова яго — найгоршы з варыянтаў так званай «трасянкі». Традыцыі В. Дуніна-Марцінкевіча ў абмалёўцы вобразаў з дапамогай персаніфікаванай мовы прадоўжылі Янка Купала, Кандрат Крапіва, А. Макаёнак.

В. Дунін-Марцінкевіч вельмі ўдала выкарыстаў у п'есе жанравыя асаблівасці вадэвіля, каб зрабіць свой твор не толькі сацыяльна значным, надаць яму палітычнае гучанне, але і цікавым, вясёлым. Пад пяром майстра даволі банальны сюжэт набыў нацыянальную афарбоўку. Вырашэнне ж канфлікту бацькоў і дзяцей іншымі сродкамі і іншым шляхам (скажам, у духу Шэкспіра) не толькі дысанавала б жанру твора, паграшыла б супроць праўды жыцця, але і супярэчыла б гуманістычным прынцыпам самога пісьменніка. Змагацца за сваё шчасце па-іншаму — не толькі з бацькамі, але і з кручковымі! — было немагчыма. Цынічнай рэплікай Кручкова ў фінале п'есы — «Я вам родны, я вам брат» — пісьменнік папярэджвае і пра небяспечнасць такіх «братоў», што толькі і чакаюць зручнага моманту, каб «абдзерці ўсіх дачыста». А момант такі справакаваны зноў тымі ж «юрыстамі».

Куплетам Куторгі і яго ўступам: «Добра прыпавесць кажа: пінска шляхта як нап'ецца, то напэўна падзярэцца» п'еса і заканчваецца. Статкевічаў і альпенскіх вайна паміж Ліпскім і Пратасавіцкім за «гонар» не навучыла нічому. А раз так — зноў «будзе добрае жніво» для кручковых і пісулькіных. Усё паўторыцца зноў! Развязка камедыі выпісана драматургам з не меншым майстэрствам, чым экспазіцыя, завязка і кульмінацыя.

### 2. Маральна-этычная праблематыка ў рамане Івана Шамякіна «Сэрца на далоні»

> Людзі— гэта самая каштоўнае, астануцца людзі — гісторыя не спыніцца і не пойдзе назад. Будуць жыць людзі — будзе жыць краіна і тая ўлада, якой народ даражыць.
>
> *І. Шамякін*

У мастацкім даследаванні сучаснага — а яно віруе ў творчасції. Шамякіна! —на ўзроўнігеданістычнагароўнага яму ў нашай літаратуры няма. Усе яго шматлікія раманы і аповесці (а па

прадукцыйнасці і хуткасці рэагавання на ўсе значныя падзеі і змены ў нашым жыцці з ім таксама нікому не параўнацца) надзвычай цікавыя. Чым жа так прывабліваюць, палоняць чытача кнігі І. Шамякіна? Сам пісьменнік так гаворыць пра сваё творчае крэда: «Мой метад: я не магу сесці за стол і «будаваць» з усімі «аддзелкамі» да таго часу, пакуль не маю ў галаве «сюжэтнага каркаса».

Сюжэты яго твораў займальныя, вобразы не толькі пераканаўчыя, але эстэтычныя. Займальнасць, дынамічнасць і вастрыня сюжэтаў дасягаецца тым, што пісьменнік праводзіць сваіх герояў праз усе тыя выпрабаванні, якімі штодзённа выпрабоўваемся мы: працай, адносінамі да справы, якой служым, бытам, каханнем, сям'ёй, сяброўствам, выбарам — сумленнем.

Герой рамана «Сэрца на далоні» Славік Шыковіч, ашаломлены тымі праблемамі, якія абрынуліся на яго сям'ю, на яго самога ў першую чаргу, пачуццямі і страсцямі, што закіпелі ў ім і побач з ім, абураецца «боханам» і «старым канём» (ён так «пяшчотна» называе свайго бацькупісьменніка): «Усё пераблыталася! Самчорт нагузломіць. А «стары конь» скардзіцца, што няма цікавых сюжэтаў. Залез у нейкія архівы і нічога вакол сябе не бачыць. А тут такія трыкутнічкі будуюцца! Пра любоў трэба пісаць, стары, калі хочаш, каб цябе чыталі».

Менавіта «пра любоў» (таму і чытаюць!) піша І. Шамякін: пра любоў да справы, да жанчыны, да дзяцей, да бацькоў, да людзей...

Апісваючы канкрэтны перыяд у жыцці нашага народа («шэсць гадоў пасля XX з'езда партыі», на якім быў асуджаны культ асобы Сталіна), пісьменнік ставіць у рамане найважнейшыя філасофскія праблемы: адказнасці чалавека за сябе і свае ўчынкі; удзячнасці і чалавечнасці; служэння людзям і вернасці сваёй сям 'і, сяброўству; праблему бацькоў і дзяцей; проблему выхавання дзяцей і адказнасці за будучыню нацыі — моладзь...

Пісьменніцкае светаўспрыманне, канцэпцыя і пазіцыя рэалізуюцца ў рамане найперш праз станоўчыя вобразы інтэлігентаў доктара Яраша і пісьменніка-журналіста Шыковіча. Трэба зазначыць, што героі кніг Шамякіна — людзі самых розных прафесій, але канцэптуальнымі вобразам! з'яўляюцца пераважна вобразы інтэлігентаў: настаўнік Лемяшэвіч («Крыніцы»), настаўніца Міхаліна («Ах, Міхаліна, Міхаліна...»), Пятро Шапятовіч і Сеня Пясоцкі з пенталогіі «Трывожнае шчасце», архітэктар Карнач («Атланты і карыятыды») і інш.

Адзін з лірычных герояў паэзіі Танка сцвярджае, што самае складанае для чалавека — «прайсці праз вернасць». Інтэлігент Яраш прайшоў праз вернасць сваёй справе і дасягнуў у ёй такога

прафесіяналізму, што змог нават трымаць на сваіх далонях сэрца чалавека. Гэты мастацкі вобраз, што даў назву твору, — метафарычны. У прамым сэнсе трымаць сэрцы на далонях здольны толькі прафесіяналы ўзроўню Яраша. Аднак сэрца бліжняга можа быць на далонях кожнага чуйнага і чулага до болю, трывог у сэрцы іншых людзей. Трэба толькі зразумець боль другога чалавека і паспець дапамагчы. Пакутуе Яраш, што не паспеў (хоць не яго ў тым віна) выратаваць двух хлопчыкаў, якія падарваліся на міне.

Яраш прайшоў праз вернасць людзям, якія выратавалі яму жыццё, рызыкуючы сваім, і аддзякаваў усім, чым толькі мог. Ён ўратаваў ад магчымай блізкай смерці Зосю Савіч і зрабіў усё, каб забяспечыць ёй годнае жыццё, вярнуўшы тое, што належала ёй. У яе як «ворага» народа і дачкі «ворага» народа забралі ўсё: здароўе, добрае імя, дом. Яраш з Шыковічам вярнулі ёй усё, зрабілі ўсё, што ад іх залежала. Так і павінна быць! Але, на жаль, так не заўсёды і ўсюды бывае.

Рэтраспекцыямі і вобразам Гукана пісьменнік дасягае не толькі рэалізму і глыбокага псіхалагізму ў адлюстраванні рэчаіснасці, але і ўзводзіць свайго галоўнага героя на высокі эстэтычны п'едэстал. Таму чытача і палоніць духоўнае багацце і высакароднасць доктара Яраша. Кантрастны гэтаму вобразу вобраз Гукана выклікае агіду і абурэнне: ён не толькі не аддзякаваў добрым людзям, як тое абяцаў («Мы яшчэ сустрэнемся», -— сказаў ён на развтайне Зосі Савіч), але «аддзячыў» чорнай няўдзячнасцю. Ужо пасля вайны, будучы сакратаром райкома партыі, напісаў не проста данос, а ўзвёў паклёп на свайго збавіцеля, тым самым вырашыў лёс Зосі. Вярнуўшыся з фашысцкіх канцлагераў, яна зазнала пекла і гулагаўскіх. Дзікунскі, жудасны ўчынак. Чытач уражаны подласцю Гукана. Але, на жаль, і такое можа быць, і гэта ўжо не прыём гіпербалізаванага паказу зла, а праўда жыцця. Настойлівы і паслядоўны пісьменнік у сцвярджэнні думкі, што кар'ерызм — невымернае зло. Дзеля дасягнення сваіх кар'ерысцкіх намераў гуканы-кідалы (Кідала — герой пенталогіі «Трывожнае шчасце») не спыняюцца ні перад чым. Асабліва небяспечная гэтая з'ява ва ўмовах таталітарнага рэжыму, бо сам рэжым спрыяе таму, што свінтусы становяцца грандыёзусамі, небяспечнымі для грамадства і сумленных людзей.

Праз дыялог Гукана з Тарасавым, сакратаром райкома партыі, пісьменнік даводзіць ісціну, што здольны перагледзець свае ўчынкі, пакаяцца, змяніцца да лепшага толькі людзі. Нелюдзі ж (а такім нелюдзем і з'яўляецца Гукан-Сажань) ніколі не мяняюцца. Яны баяцца толькі аднаго — кары, страты пасады, да якой ішлі, пераступаючы праз усё і ўсіх. Усе намаганні Тарасава абудзіць у Тукане сумленне,

прымусіць яго прызнаць сваю віну і пакаяцца — марныя. Тукан здольны толькі на самаапраўданне, а не на пакаянне. Гэты дыялог выпісаны ў сцэнарным жанры. У дыялогу няма ніводнай аўтарскай рэплікі, бо мова персанажаў вычарпальна іх характарызуе. Дыялог знакавы, канцэптуальны для твора, у якім адлюстраваны працэсы рэабілітацыі ахвяр сталінскага і бальшавіцкага генацыду.

За самае страшнае ў гісторыі чалавецтва злачынства не пакаяўся да гэтага часу яшчэ ніхто: ні канкрэтныя гістарычныя асобы, што кіравалі жудаснай машынай таталітарызму ці забяспечвалі яе шалёны бег, ні нават шамякінскі літаратурны персанаж. І ў гэтым Шамякін-творца не паграшыў супраць праўды. Так і жывём без пакаяння, множачы ўсё новыя і новыя грахі...

Праз вернасць сяброўству, сумленню і прафесійнаму абавязку правёў пісьменнік і другога свайго героя — журналіста Шыковіча. Асабліва выдатна вытрымаў гэты герой выпрабаванне сяброўствам. І зноў трэба зазначыць, што пісьменнік з незвычайнай мастацкай сілай і пераканальнасцю ўмее ўславіць сапраўднае сяброўства паміж людзьмі. Прыгадаем вялікае і кранальнае сяброўства Сені Пясоцкага і Пятра Шапятовіча з пенталогіі «Трывожнае шчасце».

Наша захапленне сяброўствам Яраша і Шыковіча нельга лепш выказаць, як праз усведамленне Зосі: «Заўсёды хораша ад іх вось такой дружбы». Так думае Зося, назіраючы цёплыя, шчырыя адносіны паміж сябрамі, знешне такімі рознымі. Назіраючы, пагаджаемся з думкаю пісьменніка і мы. Сапраўды, шчырае сяброўства можа быць паміж тоўстым і тонкім, высокім і нізкарослым, імпульсіўным і стрыманым, але галоўнае паміж імі павінна быць агульным — сумленнасць. Не толькі прафесійны «сверб» і жаданне аднавіць парушаную с г ыядлівасць, але і жаданне дапамагчы свайму сябру Ярашу было матывам нястомнага пошуку і «корпання» Шыковіча ў архіўных дакументах. Дорага заплацілі Яраш і Шыковіч за свае чалавечныя памкненні і парыванні. Абодва пазбавіліся дачаў; Шыковіча «выкачалі» ў брудзе, выявіўшы яго ахілесаву пяту (мярзотнікі заўсёды пацэльваюць у самае балючае); а ў Яраша ледзь не разваліласся сям'я.

Усімі сваімі творамі, а раманам «Сэрца на далоні» з асаблівай мастацкай сілай, І. Шамякін даводзіць, што сям'я — найвялікшы скарб чалавека і адначасова падмурак людской супольнасці. Рушыцца сям'я — рушыцца ўсё ў грамадстве. Добрая сям'я — надзейны тыл і прыстанак чалавека, выток усяго людскага ў ім. Аднак пісьменнік мудра папярэджвае ўсіх нас, што сям'я, каханне — адначасова і надзвычай далікатны, тонкі, дарагі крышталь. Трэба

быць вельмі мудрым, асцярожным і дбайным, каб піць з таго крышталю ўсё жыццё.

Функцыя жаночых вобразаў у рамане вельмі важная. Вобразамі Галіны Адамаўны і Валянціны Андрэеўны пісьменнік славіць жаноцкасць, пяшчоту, любоў, клопат пра дзяцей, сцвярджае, што ахоўніцай сямейнага ачага з'яўляецца жанчына. Лад, згода ці, наадварот, бязладдзе ў сям'і ў многім залежыць ад жанчыны, яе мудрасці.

Пісьменніцкае захапленне і ўяўленне пра тое, якой павінна быць дзяўчына, увасоблена ў вобразе «залатой» Машы. Эпітэт «залаты» ў дачыненні да яе валасоў, нават павек з'яўляецца той дэталлю, што вызначае сутнасць вобраза. Пісьменніцкая выснова, што хараство чалавека, асабліва дзяўчыны, вызначаецца ўнутраной, духоўнай «падсветкай», не новая ў нашай літаратуры. Прыгадаем, што тыя ж урокі духоўнай відушчасці дае нам Лабановіч сваім бачаннем прыгажосці Ядвісі. Аднак нельга не захапляцца і майстэрствам Шамякіна, з якім ён дае ўрокі моладзі: духоўная прыгажосць дзяўчыны, яе паводзіны, яе мудрасць у многім вызначаюць паводзіны мужчыны, здольны паўплываць на яго душу, садзейнічаць яго сталенню. Як мужчына вызначаецца адносінамі да жанчыны, так жанчына вызначаецца сваімі паводзінамі, сцвярджае ўсім сваім творам пісьменнік. З яго мудрасцю нельга не пагадзіцца. Жаночая прыгажосць здольная ўплываць на свет і ўдасканальваць яго.

Усе мастацкія вобразы ў рамане, праз якія, як і праз «сюжэтны каркас», пісьменнік выяўляе сваё светаўспрыманне, вельмі пераканаўчыя. Але найбольшым пісьменніцкім майстэрствам, сапраўднай мастацкасцю вылучаецца вобраз Славіка Шыковіча. Гэта самы нестатычны вобраз. У ім увасоблена пісьменніцкая думка пра тое, як нялёгка быць маладым, нават калі твае бацькі сапраўды прыстойныя і сумленныя людзі, як цяжка расці чалавеку, як на рост ці на яго запаволенне можа паўплываць выключна ўсё, нават нейкая, здавалася б, дробязь. Самае цяжкае ў гэтым свеце — расці, змяняцца да лепшага, быць здольным перагледзець і свае ўчынкі, і свае каштоўнасці.

Менавіта праз гэты вобраз вырашаецца адна з галоўных праблем рамана — праблема бацькоў і дзяцей. Сям'я Шыковічаў у роспачы, пакутліва шукае адказу на пытанне, чаму так атрымалася, што іх сын расце пустадомкам, цынікам і хуліганам. Бацька — інжынер чалавечых душ, а на душу сына амаль ніякага ўплыву не аказвае. Маці — сейбіт разумнага, добрага, вечнага. Якое яшчэ лепшае выхаванне акрамя прыкладу сумленнага жыцця і сумленнай працы бацькоў

патрэбна, каб чалавек рос не так пакутліва і без такіх, як са Славікам, праблем? Пра тое палка і з абурэннем даводзіць і Шыковіч на бюро райкома, дзе за кепскае выхаванне сына яму аб'явілі вымову. Сапраўды, у нашых продкаў, якія кіраваліся галоўным прынцыпам народнай педагогікі — прыклад і праца, такіх праблем і ў такой ступені не было. Тады і адвечны мацярынскі клопат, як дасціпна яго вызначаў Славік, «каб лішняе з'елі і лішняга не выпілі», таксама быў толькі на карысць дзіцяці.

Але час мяняецца. Сёння аднаго прыкладу і аднаго такога мацярынскага клопату мала. Неабходна і такая ўвага, і такое дбанне менавіта пра духоўнасць дзяцей, а не толькі «каб лішняе з'елі і лішняга не выпілі», як у сям'і Яраша. Уражвае эпізод, калі Яраш забараняе жонцы гаварыць пры дзецях пра «гнілыя зубы» пацыентаў, што так раздражняюць стаматолага Галіну Адамаўну. «Каб мне дзеці былі у слуху, каб я бацькам для іх век дажыў» (Ф. Багушэвіч) — гэта пра Яраша. Тады і дзеці здольныя будуць паўплываць на бацькоў, калі ў сям'і ўзнікнуць (а ў якой сям'і іх не бывае?) нейкія непаразуменні. «Я дапамагу ім. Я паміру іх», — цвёрда ўпэўнены Тарас, калі прыёмныя яго бацькі моцна пасварыліся.

Вядома ж, праца, годнае акружэнне (з кім павядзешся, ад таго і набярэшся) таксама паўплывалі на Славіка. Гэта пераконвае ў рамане. Але наўрад ці «партыйны дакумент захапіў юнака», наўрад ці ў Славіка, як сцвярджае пісьменнік, магло наогул з'явіцца «захапленне велічнасцю праграмы» пабудовы камунізму. Славік быў уражаны, як зноў падкрэслівае пісьменнік, што «ўсе гаварылі з такой палымянасцю пра маральны кодэкс». Але ж у Славіка заўсёды ў душы быў справядлівы пратэст супраць неадпаведнасці паміж тым, што чуў і што бачыў. Ці не гэта і стала прычынай злому ў яго душы, а юначы максімалізм і цынізм — ахоўнай рэакцыяй і формай пратэсту? І наўрад ці словы, што пачуў ён на камсамольскім сходзе, «прымушалі яго працаваць па-новаму».

І ўсё ж публіцыстычнае, сацыяльна заказанае, пафаснае, якога нямала ў рамане, не здольна зацьміць яго галоўных мастацкіх вартасцей. Галоўная вартасць кніг І. Шамякіна — займальнасць сюжэтаў, эстэтычнасць вобразаў, праз якія пісьменік ставіць і вырашае тыя праблемы, што з'яўляюцца вечнымі і хвалююць нас сёння. Менавіта гэта ў творчасці пісьменніка вытрымала выпрабаванне часам, а час — галоўны суддзя ўсяму.

**3. Прачытаць на памяць верш Алеся Гаруна «Ты, мой брат...»**

Ты мой брат, каго зваць Беларусам,
Роднай мовай сваей не цурайся;
Як не зрокся яе пад прымусам,
Так і вольны цяпер не зракайся.
Ад дзядоў і ад прадзедаў, браце,
Гэта скарб нам адзін захаваўся,
У сялянскай аграбленай хаце
Толькі ён незабраны астаўся.
Ў старыну Беларус, не падданы,
Гаспадарыў, быў сам над сабою
І далека у свеце быў знаны
За літоўскай і ляшскай зямлёю.
Але час прамінуў, і нядоля
На народ, як бы камень звалілась;
Беларуская слава і воля
Адышла, адцвіла, закацілась.
Не змяняючы шэрай апраткі,
Працаваў ты, як вол, гаратліва,
А у хаце тваёй недастаткі,
А на ніве тваёй неўрадліва.
А чаму? ты не здольны, ці хворы,
Ці благі гаспадар, ці п'яніца?
Мусіць, не! Бо і іншым у пору
У цябе гаспадарыць навучыцца.
Светлы розум твой, брат, але дзетак
Ад цябе, як і ўсё, адбіралі
І на бацькаўскі родны палетак
Працаваць-памагаць не пушчалі.
Хто хацеў, той і смеў рабаваці,
Без прыпросу з'язджаліся госці —
Абдзіраць, аб'ядаць, апіваці
І крышыць гаспадарскія косці.
Можа б, ты і памёр і загінуў,
Каб не вешчая мова Баяна.
Хто ж быў добры, яе хоць пакінуў?
Як жа так, што яшчэ не забрана?
Бо што бачылі госцікі-герцы —
І зямлю, і лясы, і кілімы, —
Усё забралі. А мову у сэрцы,
Ў сваім сэрцы хавалі-няслі мы.
Дык шануй, Беларус, сваю мову —
Гэта скарб нам на вечныя годы;
За пашану радзімаму слову
Ушануюць нас брацця-народы!

# Білет № 24

**1. Пошукі героямі шляхоў да шчаслівага жыцця ў драме Янкі Купалы «Раскіданае гняздо». Сэнс назвы твора**

Я ўклаў у гэту п'есу лепшае, што было ў маёй паэзіі.
*Янка Купала*

...Зваў з путаў на свабоду,
Зваў з цемры да святла.
*Янка Купала*

І гэты твор, так любімы і самім Купалам, вызначаецца, як усё ім створанае, самай галоўнай, самай запаветнай і пальмянай ідэяй усяго жыцця песняра — ідэяй нацыянальнага вызвалення і адраджэння, якую ён нястомна і настойліва рэалізаваў і ў паэзіі, і ў драматургіі, і ў публіцыстыцы.

Некаторыя крытыкі лічаць заслугай Купалы тое, што ён на прыкладзе трагедыі адной сям'і паказаў трагедыю ўсяго беларускага сялянства, якое з развіццём капіталізму перажывала трагізм абеззямельвання і галечы. Раскіданае гняздо сям'і Зяблікаў— бясспрэчна, сімвал трагічнага лесу Беларусі ў пачатку XX ст., напярэдадні першай рускай рэвалюцыі. Уся Беларусь была раскіданым гняздом, бо яе народ, ствараючы ўсе зямныя багацці, задыхаўся ад беззямелля і не быў гаспадаром на сваёй зямлі. Аднак сваё прызначэнне як мастака Янка Купала бачыў не толькі ў канстатацыі зла і трагедыі і не толькі ў рэалістычным адлюстраванні рэчаіснасці.

Нацыю, у якой вякамі фарміравалася агідная Купалу «пашана да пакут», выратаваць маглі не стогны, спачуванні і галашэнні. Заслуга Купалы ў тым, што ён «тварыў» нацыю: фарміраваў яе самабытны духоўны воблік, пашырау нацыянальную самасвядомасць, надзяляў беларусаў скарбамі сусветнага ўзроўню, вызначаў духоўныя арыенціры народа. Нацыя і яе жыццястойкасць у многім вызначаюцца менавіта духоўнымі і каштоўнаснымі арыенцірамі.

Што чалавек лічыць для сябе найважнейшым, да чаго імкнецца, у чым бачыць сваё шчасце, у многім вызначае яго сутнасць. Тое ж самае і з народам.

Цэнтральнай філасофскай праблемай драмы «Раскіданае гняздо» з'яўляецца праблема шчасця. Усё ў творы: кампазіцыя, сюжэт, вобразы, насычанасць рамантычнымі сродкамі пры глыбокім рэалізме — падпарадкавана цэнтральнай філасофскай праблеме.

З экспазіцыі мы даведваемся, што Лявон Зяблік аж пяць гадоў судзіўся з панам за зямлю, на якой жылі і працавалі яго продкі і «вечна думалі жыць. Чынш плацілі, талаку рабілі ў двор, як паншчыну якую; карчавалі, будаваліся». Прадалі «апошнюю кароўку!», каня, цялушку, што гадавалі Зосьцы на пасаг. Марыля са скрухай зазначае, што ў Лявона быў выбар: «служыць ісці ў чужую хату, на чужых людзей», а не судзіцца, «дык хоць гаспадарка засталася б». Страта зямлі для Лявона — страта Волі, як і для коласаўскага Міхала. Лявон бачыць у гэтай трагедыі наканаванне і на папрок Сымона, што апошняе аддаў двару на здзек, пярэчыць: «Не я аддаў, а зямля сама сябе аддала ім на здзек. Я, ты, пяты, дзесяты штосьці ёй не ўгадзіў, ну, дык і чураецца сваіх дзяцей».

Знясілены бадзяннем па судах, пераканаўшыся, што з багатым беднаму не судзіцца, што «пакуль з багатага пух, то з беднага дух», даведзены да адчаю, ён не знаходзіць іншага выйсця са становішча, як пазбавіць сябе жыццём. Дорага заплаціў Лявон за тое, каб звесці рахункі з наіўнай верай у «дабрадзеяў», — жыццём заплаціў. Лявон наказвае Сымону «праўды шукаць не тапаром, а розу мам», каб яго і дзяцей не ганялі гэтак, як сягоння. Шчасце для Лявона — жыць і працаваць на зямлі, быць на ёй гаспадаром, але абставіны аказаліся мацнейшымі за чалавека і яго мару. Вобразам Лявона пісьменнік не толькі паказвае трагедыю чалавека, крах яго мары, але і даводзіць, што шлях Лявона да шчасця, праўды і волі быў памылковы.

Знешні і ўнутраны канфлікт раскрываецца драматургам праз сутыкненне розных думак, поглядаў на жыццё, лёс, шчасце. Усе героі п'есы прагнуць шчасця, але кожны разумее яго па-свойму і прапануе свой выхад са становішча, каб «бяды пазбыціся». Сапраўды, часам пазбавіцца бяды — гэта ўжо і ёсць шчасце.

«Няшчасце на шчасце змяніць» марыць і Зоська, натура тонкая, уражлівая, сентыментальная. Яе душа рвецца да прыгожага. Але разлад мары з суровай рэчаіснасцю вызначае і яе асабістую трагедыю. Рамантычнымі сродкамі выпісаны гэты вобраз. Яе маналогі паэтычныя, мова багатая, вобразная: «Праз быстрыя рэчкі, праз шчырыя бары, праз сухія пяскі паплыву к яму...» Мройная, летуценная, яна жыве ў казачным свеце, ёй самой створаным, прыдуманым. Яна нікога не хоча слухаць, даводзячы, што ў іх свая праўда, а ў яе свая. Яна марыць пра свет, дзе ўсе будуць жыць у згодзе, «будуць усе паміж сабой браткі ды сестры родныя!». Не пратэст і абурэнне выклікае ў яе зло, што прычыніў усёй сям'і паніч, а жаданне памірыць брата з ім. Зоська становіцца паміж імі і наіўна даводзіць: «Адна сякера пабудавала, а другая раскідала, — пры чым жа тут паніч?»

У супярэчлівым вобразе Зоські Купала славіць паэтычнасць душы, улюбёнасць у прыроду, чуйнасць да яе, славіць імкненне да шчасця, святла, прыгажосці і адначасова адмаўляе ідэал шчасця Зоські, бо ён гуманны, але ўтапічны. Пасля перажытага ў яе абуджаецца пачуццё ўласнай годнасці, яна не дазваляе надзець на сябе торбы і з гордасцю гаворыць: «Сярпы мае сталёвыя дабро цэламу свету жнуць, а палотны мае шаўковыя цэлы свет адзяваюць, а яны ў торбы хочуць мяне прыбраць!» Праз эвалюцыю вобраза Зоські пісьменнік адмаўляе пакорлівасць лёсу і «пашану да пакут». У апошняй сцэне паказана, як Зоська разам з Сымонам ідзе «на Вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!».

У вобразе Данілкі Купала паказаў таленавітасць народа, яго імкненне да духоўнага. Як асоба незвычайная, надзеленая дарам, ён верыць, што, калі змайструе скрыпку і зайграе — «цэлы свет дзіву дасца». А пакуль што гэты свет мала шануе свайго музыку: бацька ад злосці паламаў скрыпку, Сымон пагражае зламаць новую, але Данілка не ўяўляе свайго жыцця без скрыпкі. Яго нічога ў гэтым свеце, апроч музыкі, не цікавіць. Толькі некаторымі дэталямі драматург акрэслівае і праблему незвычайнай асобы ў грамадстве, прарочыць Данілку нялёгкі шлях служэння мастацтву: «Няхай сабе кажуць, што я дурнаваты, што я такі, што я гэтакі, але я ўсё бачу, усё разумею».

Жыццястойкасць, вынослівасць, мудрасць, самаахвярнасць і бязмежную любоў да дзяцей, клопат пра іх долю ўвасобіў Купала ў вобразе Марылі. Яе пакорлівасць, цярпімасць і цярплівасць не асуджаецца драматургам, як утапічная і згодніцкая філасофія Зоські. Марыля — маці, яна ў адказе за сям'ю, дзяцей. У яе просьбе: «Пакарыся ты ім» — адвечная жыццёвая мудрасць і прага жыцця, а ў бесчалавечных абставінах і ўмова яго. Абраны ёю шлях жабрацтва ўсведамляецца намі не як прыніжэнне, а як сведчанне менавіта жыццястойкасці.

Пісьменніцкае ўсведамленне адзіна правільнага шляху да праўды, волі, шчасця рэалізаваны ў вобразе Сымона. Пакарыцца ім, як таго просіць Марыля, азначае для Сымона «прадаць, утапіць сябе, цябе, нас усіх у няволю ім на векі вечныя — запрасіцца ў вечнае рабства, з якога выхаду ніколі не знойдзем ні мы, ні тыя, што пасля нас гэта рабства ў спадчыну атрымаюць». У гэтым маналогу чуецца голас аўтара. Уся драма прасякнута думкамі і пачуццямі аўтара. Вобраз Сымона паказаны ў эвалюцыі: расце яго свядомасць, мяняюцца погляды на жыццё, пад уздзеяннем Незнаёмага Сымон знаходзіць сваю сапраўдную мэту ў жыцці — ступае на шлях барацьбы.

Сымон — натура моцная, асоба выключная і незвычайная. Рамантычнымі сродкамі выпісаны гэты вобраз. Ён раскрываецца і ў канфлікце з панічом, і ў дыялогах з Зоськай, Марыляй, Незнаемым. «Хоць

галавой наложыць, а свайго мусіць дапяць», — гаворыць пра сына Марыля. «Птушкаю-арлом быць бы табе і лётаць па паднябессі, як лётае вецер гэты вольны!» — гаворыць пра брата Зоська. І Незнаемы параўноўвае Сымона з вольнай птушкай, з арлом магутным.

У вобразе Сымона ўвасоблены аўтарскі ідэал чалавека-змагара. Пачуццём уласнай годнасці і свабодалюбствам надзяліў свайго героя Купала. Сымон лічыць, што прымірэнне героя з панам было б здрадай, адступніцтвам, прыніжэннем чалавечай годнасці. Жыццёвы арыенцір у яго той жа, што і ў бацькі: «Без зямлі, без свае хаты чалавек, што шалёны сабака, адна цана: ні яму прыстання, ні яму скарынкі хлеба, ні яму добрага слова». Арыенціры адны — шляхі да іх розныя ў бацькі і сына. Спачатку, як і Лявон, Сымон збіраецца судзіцца з панам: «Вось такім проці хачу ісці!» Пад уздзеяннем Незнаёмага ён прыходзіць да высновы, што шчасця і праўды шукаць сапраўды, як і бацька наказваў, трэба розумам. Маналогі Незнаёмага носяць алегарычны, іншасказальны характар: «Час не спіць! Там чакаюць цябе сотні, тысячы, мільёны такіх, як ты... Час прачнуцца, Сымоне! Час!»

Сход склікаецца для таго, каб выгнаць смока-ўпыра, які «ад даўняга часу пасяліўся на нашай зямлі...» і «пошасці ўсялякія сее жменяй сваёй каршуновай». Разам з Незнаемым Сымон ідзе «на Вялікі сход! Па Бацькаўшчыну!»

Канцэптуальным у драме з'яўляецца вобраз Старца. Ён — увасабленне адвечнай мудрасці і духоўнай сілы народа, народнага аптымізму: «Ніколі не трэба здавацца. Ганьба таму, хто, радзіўшыся ў ярме, валочыць яго пакорна, як вол стары, не парываючыся нават хоць на час выпрагчыся з гэтага ярма, паганячага яго пачуццё чалавечае! Ганьба таму!»

Вобраз Старца — самы парадаксальны і філасофскі вобраз у драме. Здавалася б, ненатуральна, нават алагічна надзяліць жабрака такім светаўспрыманнем, а нам, чытачам і гледачам, пачуць такія словы ад таго, хто апынуўся за мяжой дапушчальнага. Аднак жабрацтва і Старца, і Марылі — таксама сімвал у драме. Наогул, твор адметны спалучэннем у ім глыбока рэалістычнага і ўмоўнага, сімвалічнага, што з'яўляецца сведчаннем яго адпаведнасці высокай мастацкасці, бо спалучэнне рэальнага і ўмоўнага — адзін з крытэрыяў яе.

Жабрацтва Старца і Марылі — філасофскае ўсведамленне паэтам і яго настойлівае сцвярджэнне, што ў сітуацыі, калі разбурана ўсё: гняздо, нават мара — чалавек павінен скарыстаць любую магчымасць, каб выжыць. Найвялікшай яго мужнасцю і мудрасцю будзе выснова: жыць! проста жыць! Нагадаем, што гісторыя трагедыі

Старца тоесная Лявонавай, але яна аптымістычная. Старац не пазбавіў сябе магчымасці калі-небудзь дайсці да Вялікага сходу. Калі на Сходзе павінен быць кожны, калі Сход не адбудзецца без кожнага, то ўсе, хто пайшоў рознымі шляхамі, усё роўна прыйдуць на Сход, дойдуць да Беларусі, толькі абавязкова трэба ісці. Вобразам Старца паэт-філосаф дакляруе нам мудрасць, што ўсё змяняецца; што цемра ночы абавязкова развеецца; што сілы ва ўсіх, хто чакае раніцы, розныя: адны і ноччу ў дарозе, другім трэба прысесці адпачыць, каб набрацца новых сіл, але абавязкова— жыць! Каб аднавіць разбуранае гняздо, першая ўмова— жыць!

У драме «Раскіданае гняздо» ўвасоблена і душа Песняра, і самая галоўная ідэя яго жыцця — ідэя нацыянальнага адраджэння, і вялікая мудрасць. Увасоблена і нам дакляравана.

**2. Тэма Вялікай Айчыннай вайны ў сучаснай беларускай прозе (на прыкладзе творчасці двух-трох аўтараў).**

> Беларусы стварылі самую таленавітую і хвалюючую літаратуру пра вайну.
>
> *В. Астаф 'еў*

В. Астаф'еў зазначае, што стварэнню беларусамі «самай таленавітай і хвалюючай літаратуры пра вайну» ёсць аб'ектыўныя прычыны: ніхто больш за беларусаў не напакутаваўся ў той самай жудаснай у гісторыі чалавецтва вайне. У полымі вайны загінуў кожны трэці беларус, а не кожны чацвёрты, як доўгі час даводзілася прапагандай таталітарнай сістэмы.

Беларусамі створана не толькі мастацкая, але і дакументальная літаратура пра вайну, бо з'явілася неабходнасць, каб пра ўсенародную трагедыю на «свет цэлы» сказаў сам народ, бо ніхто лепш пра яго пакуты не здолее расказаць, чым ён сам.

Дакументальныя кнігі А. Адамовіча, Я. Брыля, У. Калесніка «Я з вогненнай вёскі...», А. Адамовіча «Карнікі», С. Алексіевіч «У вайны не жаночае аблічча», «Апошнія сведкі» сапраўды даказваюць мудрасць сцверджання К. Сіманава, што ўсю праўду пра вайну «ведае толькі народ». У гэтых кнігах сабраны маналогі і пакутнікаў, якія цудам ураталаліся ў тым пякельным полымі вайны і сталі апошнімі яе сведкамі, і барацьбітоў са смерцю дзеля жыцця, і нават тых, як у кнізе «Карнікі», хто пераступіў праз запавет «не забі».

Беларуская літаратура пра вайну не толькі засведчыла трагедыю народа і ўславіла яго подзвіг у выратаванні чалавецтва ад фашызму,

але і даследавала прычыны сусветнай трагедыі. Тым самым яна папярэджвае ўсіх нас пра наступствы таталітарнай сістэмы, пра тое, што лёс беларускіх Хатыняў мае ўсечалавечае значэнне, што мінулае можа паўтарыцца, толькі ў горшым варыянце.

Асабліва вялікая заслуга ў мастацкім і філасофскім даследаванні прыроды таталітарных рэжымаў і вайны як нацыянальнай трагедыі беларускага народа належыць А. Адамовічу і В. Быкаву. Твор А. Адамовіча «Апошняя пастараль» — твор-папярэджанне пра апакаліпсіс, які чакае ўсё чалавецтва, калі яно не пераасэнсуе свае адносіны да жыцця. Безыменныя героі твора Ён і Яна перажываюць шчасце кахання і гармоніі, але ў іх жыццё ўрываецца катастрофа і свет гіне ў апошніх канвульсіях нянавісці і варожасці.Камандзір савецкай падлодкі, якая ўжо выпусціла ядзерны зарад у адказ на атамную атаку ворага, з жахам зразумеў згубнасць ваеннага супрацьстаяння ў сучасным свеце. Але ўжо позна...

Не фантастычны, а рэалістычны сюжэт у адным з найноўшых твораў пра вайну— аповесці В. Быкава «Пакахай мяне, салдацік». Галоўныя яе героі — таксама ён і яна: камандзір узвода лейтэнант Змітрок Барэйка, ад імя якога вядзецца апавяданне, і яго зямлячка Франя. І гэтыя двое сярод пекла вайны зведалі шчасце кахання і гармоніі. Аднак шчасце было кароткім: забойства Франі і яе нямоглых гаспадароў — прафесара біялогіі Шарфа і яго жонкі фраў Сабіны, якіх Франя паспела палюбіць як родных, —абарвала надзеі на шчасце ў душы Змітрака. Усё можна змяніць і паправіць, нельга толькі вярнуць загубленае жыццё. Змітрок праклінае забойцаў: «Хто б яны ні былі — нашыя ці немцы! Бальшавікі ці фашысты!» Небяспечнасць і фашызму, і бальшавізму, на думку В. Быкава, у тым, што яны непазбежна вядуць да вайны, вынішчаючы ўсё людскае ў чалавеку, сеючы помслівасць і жорсткасць, пакідаючы на сваім пол і нявінныя ахвяры.

Творы Быкава — гэта не толькі абеліск загінуўшым, напамін жывым. Проза Быкава — гэта «проза ідэй», галоўная сярод якіх тая, што вайна для нашага народа — нацыянальная трагедыя. Трагізм вайны ў тым, што яна забірае самых лепшых, самых таленавітых, самых любімых і дарагіх, а значыць, і вынішчае генафонд нацыі, раз-

рывае повязь паміж вякамі і пакаленнямі, тым самым вынішчае векавую народную мараль, духоўнасць. Менавіта ў вынішчэнні векавой народнай маралі бачыць В. Быкаў самае галоўнае злачынства і фашызму, і бальшавізму, пра што не раз даводзіў сам пісьменнік не толькі сілай мастацкага слова, але і «пяром аналітыка», сілай публіцыстычнага слова.

Што ёсць подзвіг?

Ці бываюць сітуацыі, якія мацнейшыя за самага моцнага чалавека? Што ёсць чалавек перад няўмольнай сілай абставін? Што залежыць ад чалавека ў сітуацыі, якая мацнейшая за чалавека?

Што ёсць віна, а што бяда? Што ёсць памылка, а што злачынства і здрада? За што чалавек заслугоўвае пакарання і пагарды, а за што — літасці і спачування? Ці мае права чалавек судзіць іншых і распараджацца іх лёсамі?

У чым сіла і слабасць чалавека?

Чым вызначаецца сутнасць чалавека?

Што самае трагічнае для нацыі, народа?

Дзе вытокі нашых сённяшніх бед і няшчасцяў, нашай бездухоўнасці?

Вось далека не поўны пералік філасофскіх праблем, што ставіць В. Быкаў у сваіх творах. Заслуга яго перад нашай нацыяй менавіта ў тым, што, узнаўляючы старонкі трагічнага мінулага, ён напаўняе сваю прозу ідэй сучасным і адначасова вечным — тым, што хвалюе сёння кожнага з нас, што павінна хваляваць, калі хочам жыць і не знікнуць у гэтым свеце. Многія яго творы на ваенную тэму не толькі вострасюжэтныя, што дасягаецца выпрабаваннем моцнай выключнай асобы выключнымі абставінамі і сітуацыяй выбару, але і вострапалемічныя, як «У тумане», «Сотнікаў», «Пайсці і не вярнуцца».

Так, да прыкладу, сюжэт аповесці «Абеліск» пабудаваны на вострай палеміцы паміж Ткачуком і Ксяндзовым наконт таго, што ёсць подзвіг, ці можна лічыць учынак Мароза, які не забіў ніводнага немца, гераічным. Ткачук настолькі неўтаймоўны і катэгарычны ў сваіх перакананнях, што працягвае тую спрэчку, нават калі перад ім няма яго апанента, а даводзіць ён сваю пазіцыю карэспандэнту. Справай свайго жыцця ён лічыць дамагчыся, каб імя настаўніка было на абеліску разам з імёнамі яго вучняў, з якімі і за якіх ён і загінуў.

Назва твора сімвалічная. Абеліск — сімвал чалавечай памяці. Памяць — гэта інфармацыя пра мінулае, адзін з наймагутнейшых сродкаў повязі вякоў і пакаленняў. Бяспамяцтва парве гэтую повязь — і тады канец. Назначэнне рэтраспектыўнага, перамежаванага паказу сучаснага і мінулага ў тым, што пісьменнік выпрабоўвае сваіх герояў-сучаснікаў не экстрэмальнай, як Мароза, сітуацыяй, а памяццю, адносінамі да мінулага. Цынізм і бездухоўнасць Ксяндзова выяўляецца найперш праз гэтае выпрабаванне памяццю.

Вастрыня сюжэту ўзмацняецца тым, што герой аповесці Мароз Алесь Іванавіч свядома, наперакор угаворам не рабіць гэтага, ідзе на верную смерць, добра разумеючы, што не выратуе сваіх вучняў і загіне сам. Гэта і дае падставу некаторым, напрыклад загадчыку

райана Ксяндзову, лічыць учынак Мароза не подзвігам, як таго дамагаецца Ткачук, а недарэчнасцю, глупствам, бо ніякага канкрэтнага выражэння карысці, сэнсу ў той смерці не было.

Пісьменнік жа ўсімі сваімі творамі, а «Абеліскам» асабліва, сцвярджае сілу духоўнага, хоць духоўнае нельга ні пералічыць, ні ўзважыць, ні вымераць. Вось немцы выдатна разумелі сілу ўздзеяння Мароза на душы людзей, калі аб'явілі: з'явіцца настаўнік — вучняў адпусцім. Ім намнога выгодней было б, каб ён не з'явіўся, на што яны і разлічвалі, прапанаваўшы такі «выбар».

Аповесць «Абеліск» да ўсяго яшчэ з'яўляецца гімнам Настаўніку. Больш эстэтычных, больш прывабных вобразаў настаўнікаў у нашай літаратуры, чым коласаўскі Лабановіч і быкаўскі Мароз, мабыць, і няма.

Пісьменніцкае усведамленне ролі духоўнага і ролі настаўніка ў грамадстве выяўляецца і праз вобраз Мароза, і праз маналогі Ткачука, адзін з якіх утрымлівае афарыстычнае вызначэнне: «У тым, што мы ёсць як нацыя і грамадзяне, — найпершая заслуга сельскіх настаўнікаў».

Вялікага ўздзеяння на душы людскія дасягаюць пісьменнікі, якія карыстаюцца ў адлюстраванні вайны класічным прыёмам: паказваюць трагедыю і пакуты народа праз трагедыю і пакуты дзяцей. Дзеці вайны — апошнія яе сведкі. Да такога пакалення пісьменнікаў у нашай літаратуры належыць Віктар Казько. Яго «Хроніка дзетдомаўскага сада» — гэта хроніка і ўласнага жыцця. Большасць яго глыбока псіхалагічных твораў маюць аўтабіяграфічную аснову: «Аповесць аб беспрытульным каханні», «Суд у Слабадзе», «Высакосны год».

Філасофска-публіцыстычнае асэнсаванне жыццёвага матэрыялу вызначае аповесць «Суд у Слабадзе». Незвычайнага трагізму і сілы ўздзеяння дасягае аўтар, апісваючы зверствы фашыстаў у дачыненні да дзяцей. Галоўны герой падлетак Коля Лецечка ў гады вайны знаходзіўся ў групе дзяцей, у якіх немцы бралі кроў для раненых. Таленавіты Лецечка (і гэта вельмі пераканаўча паказана ў творы) асуджаны на пакутніцкую павольную смерць. «Колькі талентаў звялося» ў гады вайны, а колькі, «раны не залячыўшы, рана паміралі»! І ці не ў гэтым адна з прычын нашых сённяшніх праблем, нашай бездухоўнасці?

Лёс усё ж і літасцівы да нашага народа, калі, правёўшы праз пякельны агонь вайны, збярог нам такіх прарокаў, як В. Быкаў, каб мы слухалі іх. Але, на жаль, як сцвярджае лірычны герой верша З. Марозава:

Мы геніяў не слухалі ніколі.

Ці ж не таму асот буяе ў полі
І множыцца напасцяў злых клубок?

**3. Прачытаць на памяць верш з лірыкі перыяду Вялікай Айчыншай вайны**

**Герой**
Злосна сказаў: «Уставай, пяхота!
Ты не на пляжы, а на вайне».
І лёг на змяіныя скруткі дроту.
І дзвесце салдацкіх запыленых ботаў
Прайшлі па яго спіне.

Не ён, а другія ішлі ў атаку,
Гранаты кідалі ў бліндажы,
Калолі фрыцаў, палілі танкі
І сцяг перамогі ўзнімалі ранкам
На заваёваным рубяжы.

А ён свае косці з іржавыў калючак
Сваімі рукамі без стогну аддзёр,
Зваліўся на травы, і стала балюча
І травам, і росам, і ветрам гаючым,
Што прыляцелі з валдайскіх азёр.
*П. Панчанка*

**Бульба**
Так ісці на захад, гэтак перці
За эпоху можна толькі раз.
Есці захацелася да смерці,
Ну, а повар з кухняю заграз.
Падцягнулі рамяні з тугою,
Леглі адпачыць пад сіняй хвояй,
На сухой абочыне шашы.
Рай — для ног, цыгарка — для душы…
Спрэчка пачалася нечакана:
Што смачней з усіх вядомых страў?
«Хаш і лобі! — першым крыкнуў Вано, —
Я б сем місак зараз увабраў».
«Плоў, — сказаў Ахмет. —
Калісьці дома...»

І пацмокаў смачна языком.
А Гурген ускочыў: «Вы знаёмы
З ерэванскім сочным шашлыком?»
Я тут узгарэўся не на жарты:
«Вашых страў я ганіць не хачу:
І яны што-кольвек, пэўна, варты,
Як хвалілі знаўцы іх — я чуў.
Сорам пра найлепшае не ведаць, —
Рынуўся я ў наступ на байцоў,
— Калі смачна хочаце паснедаць,
Закажыце бульбы з селядцом.
Печаная бульба — гэта казка,
Паскрабеш нажом — і калі ласка.
Жоўтая скарынка, як пірог,
Будзеш уплятаць яе за трох.
Трапіш да кабеціны рахманай —
Паспытаеш, друг мой дарагі,
Дранікі са свежаю смятанай,
Бабку, клёцкі, нават пірагі.
З нашай бульбы тысячу, не меней,
Смажаць і гатуюць розных страў...»
Я ўсхапіўся з месца і з натхненнем
Песню ім пра бульбу праспяваў.
Бачу: праняла мая прамова,
Зараз крыкнуць: «Дзе яна? Гарні!»
...Добра, што пад'ехаў ротны повар
На рудым запараным кані.

*П. Панчанка*

© OCR: Камунікат.org, 2011 год
© Інтэрнэт-версія: Камунікат.org, 2011 год
© PDF: Камунікат.org, 2011 год